- Міхась, родны мой, любы мой, жаданы мой. Каханьне маё, - шэпчуць яе вусны. Яго чэлес проста разрывае яе, напаўняючы цалкам, бяз рэштку. Ён вызваліў са штаноў толькі яго, але ж яна хоча адчуваць яго ўсяго, і асьцярожна прабіраецца рукой пад тканіну, дакранаючыся да яго плоці за чэлесам. Яе пальцы блытаюцца ў яго валасах там – густых, чорных, яна ведае. У яе ніводнага валаску няма, гэта выключан: валасы на целе жанчыны – ганьба. Ён нахінаецца да яе, цяжка дыхаючы, і

глядзіць ёй у твар. Яна запракідвае галаву, і бачыць яго над сабой – цёмныя, шалёныя вочы, вусны сьціснуты, быццам бы ён фехтуе, а не бярэ жанчыну, рубіць мячом дасьпех, сакрушае жылы і косткі, працінае плоць. Зь яго вуснаў зрываюцца стогны, і яна шэпча і шэпча яму ласкавыя словы, але ж ён, здаецца, яе ня чуе, і ўсё мацней працінае яе. Нарэшце па яго твары прабягае сутарга і цела напружваецца, і ён з рычаньнем уганяе сябе ў яе, каб дайсьці да самай глыбокай яе глыбіні, каб выліцца так поўна, як гэта толькі магчыма.

Ён апускаецца на яе, і яна ахоплівае яго за шыю.

– Каханая, - шэпчуць яго вусны. - Жаданая мая. Жыцьцё маё. Анёлачак мой прыгожы. Я табе ўвесь строй сапсаваў. Прабач, ня мог трымацца. Ты такая, што ў мяне сэрца зашлося. Я цярпеў, цярпеў, ня ведаў, як высіжу гэтую клятую прэм'еру. Ён усьміхнуўся. Зашпіліў штаны. Яна паправіла сукенку. У перагародку пастукалі. Ён апусьціў пластык уніз.

- Пад'язжаем, - вымавіў Джаваньні. – Праз хвілін дзесяць будзем на месцы. Яны ўзяліся за рукі, і моўчкі назіралі, як за вокнамі праплываюць краявіды – справа мора, а зьлева – горы. Наперадзе былі бачныя вагні вялікай вілы, схаванай у густым, нагадваючым лес парку.

- Мая радавая віла, - вымавіў Джаваньні, ёй болей за пяцьсот год ужо. Старая. Яшчэ першы мой продак жыў тут, той, што прыехаў сюды аднекуль з поўначы. Паданьне кажа, зь Ліцьвы. Ён хацеў вымавіць яшчэ нешта, але ж кіроўца плаўна зьвярнуў на алею, засыпаную шапочучымі каменьчыкамі, і яны спыніліся перад вялікай чырвонай дарожкай, па якой марудна рухаўся нягусты, але ж трывала папаўняючыйся натоўп.

Яны выйшлі з машыны, і яна ледзь стрымала выклік захапленьня.

Па дарожцы, засланай чырвоным, як кроў, дыванам, рухаліся постаці – мужчынскія і жаночыя. Жанчыны пабліскваліі каштоўнымі камянямі, шапацелі шоўкам і атласам адзеньня, мужчыны выглядалі стрымана і высакародна, апранутыя ў чорныя касьцюмы, дорага пашытыя, у белых кашулях – уайт

тай, зразумела яна: найвышэйшы ўзровень урачыстасьці. Цёмныя веткі высокіх платанаў сьхіляліся над імі. Кедры ўзвышаліся ўздоўж дарожкі, упрыгожаныя міргатлівымі вагеньчыкамі, нагадваючы шэрагі сьвечаў перад выявай на алтары. Здавалася, што зараз па гэтай дарожцы зашапаціць чырвоная кардынальская мантыя, і сьвятар, памахваючы духмяным кадзілам, ціха сьпяваючы сумныя гімны, уторачы хору, пройдзе да накрытага парчовым абрусам сталу, і пачне чытаць таямнічыя палуночныя часы нейкай старой месы, якую з жывучых ужо ніхто і ня памятае.

Пары праходзілі, ўзьнімаліся па высокіх ступеньках старой вілы, аграменнай, раскошнай, упрыгожанай тоўстымі калёнамі, і зьнікалі ў ярка асьвечаным праходзе, упрыгожаным гірляндамі кветак.

Яна спынілася ў нерашучасьці, ня ведаючы, ці маюць яны права ступіць на гэтую чырвоную аксамітную паверхню, прайсьці за тымі, хто, бачна, каштаваў мільёны, калі ні мільярды еўра, і быў, відавочна, аднымі з тых, каго завуць уладарамі сусьвету.

Ён крэпка ўзяў яе за руку, і прыцягнуў да сябе.

- Ня бойся, красуня мая, - ціха вымавіў ён. – Усе людзі вакол – толькі цені, і князі гэтага сьвету – цемра, якая пачціва саступае перад самым танюткім праменьчыкам сьвятла. Што яны ўсе перад тым, як сьвеціць тваё гарачае сэрца? Сьвет самай маленькай зоркі мацней за ўсю цемру пустэчы, і вандруе ў ёй, не сустракаючы перашкодаў, пакуль яго не ўспрыме чульлівае вока.

Тваё сэрцайка запалена боскім полымем, моц якога нельга параўнаць ні з чым у гэтым створаным сьвеце, і затушыць гэтае сьвятло ня мае моцы ніхто з народжаных, і ненароджаных таксама.

Ён крануў яе валасы вуснамі, і яны зрабілі крок на чырвоны аксаміт. Нібыта рака крыві раптам разьлілася пад яе ступнямі, па якой яна плыла, як маленькі зьзяючы караблік, тонкі сілуэт супраціў вячэрняга небу. Ён ішоў побач зь ёй, і натоўп ціха разыходзіўся ў бакі, і станавіўся па старанах дарожкі, даючы ім

ход, і з пашанай нахінаючы галовы. Гэтыя цёмныя цені, здаецца, ведалі нешта, што ня ведала яна, але ж ведаў ён, і ціха стаялі па баках чырвонае дывана, робячы нібыта варту, якая салютуе ўладару, вяртаючамуся з далёкай зямлі, дзе ён атрымаў перамогу ў рашучай бойцы. Яна ж была побач зь ім яго каралевай, яго паловай, той, перад кім сьхіляліся самыя магутныя ўладары сусьвету.

Усе яны былі толькі люстрамі, адлюстроўваючымі яго славу і веліч, а яна сьвяцілася яго сьвятлом, якое запаліла яе, і гарэла, не даючы ёй сгарэць бяз рэштку, бо яно было дзіўным і мяккім – сьвятлом яго каханьня.

Яны ціха ішлі па дарожцы, сярод расступіўшагася натоўпу, і узышлі на ганак, дзе іх сустрэў Паола, які ўжо быў тут, напэўна, з'явіўшыся значна раней, чым яны з Джаваньні.

- Сіньёре Мікеле! Прыўкрасная донна! Я рады бачыць вас ізноў. Нечакана ён нізка нахіліўся перад імі, і адышоў убок.

- Прайдзёмце далей, сіньёры, - зьвярнуўся Джаваньні да іх.

- Гэтая ноч – наша. І, абяцаю, яна шчодра адкрые перад намі сваю скарбонку таямніцаў, якія вартыя таго, каб чакаць, хоць бы і ўсё жыцьцё.

Але ж мы з вамі так доўга чакаць ня будзем, бо ўсё ужо прыгатавана. З гэтымі словамі ён саступіў, і пакрочыў зь Міхасём побач, зьлева ад яго, паказваючы накірунак.

Яны ўвайшлі ў вялікую залу кінатэатра, якая здавалася агромністым правалам-расколінай, якая праніцала зямную кару, абрываючыся ў бездані, дасягаючы самога пекла. Рады скураных крэслаў ішлі і ішлі, угару і ўніз. Яны апынуліся перад самым першым радам, уздоўж якога прайшлі, і паселі на паказаныя Джаваньні месцы, якія нагадвалі два каралеўскія троны, чорныя і высокія, зь нейкімі выявамі наверсе, мяккімі скуранымі падлакотнікамі, у якія яны паселі побач. Ён накрыў яе руку сваёй, і сьвятло згасла. На экране з'явіліся тытры, і загучэла ціхая, меладычная, а потым – усё грамчэйшая музыка, якая наплывала на іх, як вялізныя хвалі, спачатку – ціхія і

пяшчотныя, а потым – усё больш і больш магутныя, заліваючыя сабой сусьвет. Сусьвет сьпяваў дзеля іх, і сьпеў гэты быў голасам цемры, калі яна саступае сьвятлу.

Глядачы за іх сьпінамі змоўклі. Раптам стала так цёмна, што ні яго, ні сябе яна ня бачыла, і ў гэтай цемры, якая, здаецца, лілася з экрану ў зал, гучны голас вымавіў:

- Я ёсьць Цень, і я ёсьць Сьвятло, Альфа і Амега, першы і апошні, ветхі і вечны, той, хто стварыў неба і зямлю, і саступіў у цемру, каб назіраць зь яе гульню сусьвету. О, відушчы, ты ўбачыш тое, што схавана ад прафанных вачэй, бо толькі вочы зоркія ўбачаць, душы прыгатаваныя зразумеюць, і сэрцы жывых адгукнуцца.

- Хто ты? – ціха вымавіў голас у цемры, у якім яна спазнала яго голас.

- Я – гэта ты, сын мой. Я прыйшоў да цябе, бо ты клікаў мяне, і я ня мог не адгукнуцца. Бо калі душа кліча Бога, гэты голас скаланае сусьвет, і рушыць яго, як храм, пабудаваны на пяску, бо голас, заклікаючы да Бога, гучней Іерухонскіх трубаў і ўсіх галасоў на зямлі, пад зямлёю, і на нябёсах, будзь то чалавечых, дземанскіх, ці анёльскіх.

- Як спазнаю цябе, што гэта ты, Госпадзі? – рашуча запытаў голас, набраўшыся моцы, і ў ім пачуліся сапраўдны боль і адчай.

- Спазнаеш мяне так, як Сын спазнае Айца. І як душа спазнае таго, хто яе стварыў, зь кім яна сродная ад нараджэньня. Спазнаеш па тым, што ня зможаш спыніцца несьці маё слова. І слова гэтае будзе – Сьмерць. Смерьць і гібель усяму старому і спарахнеламу, што трымае душу, як церні за адзеньне, перашкаджаючы прайсьці да мяне. Выпалі гэты калючы сад, і не пакінь яго і рэштку, каб на гэтым месцы, чыстым і прыгатаваным, вырасьлі мае ружы, напітаныя крывёю абраных. Калючкі іх – вастрыя цярновага вянку, а пялёсткі – плоць, прынесенная ў ахвяру душы. Праз іх пралажы шляхі абраным, каб душы ішлі да мяне, кіруючыся адзіным маім сьвятлом – каханьнем. Калі душа кахае, спыніць яе не магчыма. Яна

знойдзе шлях да мяне, і пройдзе праз усе пакуты і перашкоды, якія стварае сусьвет. Вярні да мяне Шхіну, Сафію, якая згубілася ў цемры, і пакутуе ў вязьніцах, акаваная ланцугамі, што стварылі для яе ўладары гэтага сьвету, і ўсіх яго частак і накірункаў. Спыні бег планетаў і патушы самое сонца, каб вочы ўбачылі сонца сапраўднае, якое не належыць зямному. Бо на зямлі мяне няма, і закону я не падпарадкоўваюся. Так і ты будзь вышэй зямлі, і вышэй закону, і ад гэтага моманту слухай толькі мой голас, які павядзе цябе за сабой.

Цемра раптам абрынулася, і на экране ўзьнік твар, закрыты рукамі. Чалавек марудна адвёў іх, і ўзьняў галаву. Яго твар быў худым і спакутваным, вочы гарэлі чорным полымем, валасы, доўгія, як у пустэльніка, лажыліся на шырокія плечы, пакрытыя лахманамі.

- Я чую цябе, Госпадзі, - ціха вымавіў ён. – Я іду за табой. І раптам грамыхнуў гром, і сьвятло ізноў пагасла.

- Ступаючы на шляхі праклятых, не аглядайся назад, - гучна вымавіў голас, дзіўна знаёмы, глухі і нізкі. – Бо шлях твой ляжыць у бездань, і праз яе. Адчыні браму, і вызвалі сябе.

Голас замаўчаў, і яго зьмяніла музыка. На экране з’явілася сцэна, у якой Шымон сьведчыць есеям аб сапраўдным Богу, якога ён знайшоў, і кідае на падлогу скруткі з Торай.

Увесь фільм яны праглядзелі моўчкі. Відовішча зачароўвала. Паола і сапраўды апынуўся майстрам свайго дзела. Нарэшце, Шымон, які вячэраў з вучнямі, пачуў крокі, і грукат у дзьверы.

Пакуты пачаліся. Яна адчула, як скаланулася яе сэрца, і сьціснула яго далонь, на якой сваёй тонкай скурай намацала няроўны шнар.

- Ня бойся, каханая, - ціха вымавіў ён. – Глядзі, як гуляе Сусьвет па волі нашага нябёснага айца. Здаецца, я на крыжы, але ж там мяне няма. Я – тут, побач з табою. Праўда, золатка маё? Ён нахінуўся, і крануў яе шчаку вуснамі, і яна адказала на іх, павярнуўшыся да яго. Іх губы на імгненьне сустрэліся, і на экране разявіла пашчу турэмная камора, у якой, скаваны

ланцугамі, ён ляжаў на бруднай саломе.

- Усё – толькі ілюзія і сон. Праўда ж у тым, што мы – з табой побач, - ціха вымавіў ён, і яго рука пяшчотна, але ж крэпка сьціснула яе руку.

Глава 11: Айцец

У цёмны зал за імі з экрану наплывалі патокі крыві. Здавалася, яны зараз зьнясуць іх, змыюць, не пакінуўшы і рэштку, і яны растворацца ў чорным, ліпкім марыве, зацягнутыя на дно цяжарам граху, які сваімі пакутамі змываў ён. І грэх гэты быў адзіны – няведаньне. Цемра розуму і душы – першародны грэх, страшнейшы за ўсялякі іньшы, бо менавіта праз яго ўзьнікаюць і ўсе астатнія.

Ён жадаў, каб яны ведалі, і каб яны не баяліся. Нічога і нікога. Не баяліся нават і Бога – не баяліся, а кахалі. Ён увесь час казаў ім аб каханьні – яно павінна было быць паміж імі, і паміж імі, і Богам. Той, хто кахае, ніколі ня зробіць злачынства, бо ён – міласэрны, і ва ўсім бачыць адлюстраваньне сьвятла, якое выліваецца зь яго сэрца. Неўзаемнага каханьня не існуе, казаў ён. І Бог ня можа не адказаць на яго. Каханьне заўсёды бачыць, яно выбачае, яно мудрае і цярплівае. Яно настолькі высокае, што яму не патрэбна гардыня як сродак узьвялічыць сябе. Вышэй за каханьне няма нічога. І нікога няма вышэй за таго, хто кахае. Ён адкрываў ім вочы і сэрцы, а ўзамен атрымаў крыж. Так павінна было адбыцца, і ён гэта ведаў. Толькі ў адным памылілася паданьне. На крыжы ён паклікаў імя – але ж не імя Бога. На крыжы ён паклікаў жанчыну, якую кахаў. Ён зваў яе, як маці, як адзінае, што ў яго засталося ад сьвету, які зварочваўся перад ім у кола, калі цямнелі яго вочы, і спынілі бачыць зямное, а назіралі нябёснае сьвятло. Губляючы сувязь з сусьветам, ён паклікаў яе за сабой, адчайна і громка, пранізьліва і ціха, і гучна так, что сусьвет вакол скалануўся, і разышоўся, калі яна кінулася да яго. Вакол іх не было нічога, і яны схамянуліся і застылі – ён – на сваім крыжы, а яна – у яго ізножжа, прыціснуўшыся да яго шчакой. Яе рука цягнулася да яго, і не магла дацягнуцца. Толькі коньчыкі пальцаў кранулі яго ступню, і паміж імі пацякла яго кроў – чырвоная і салодкая, калі яна паднесла руку да вуснаў.

- Забяры мяне, - прашаптала яна.

- Сьмерці няма, дзяўчынка мая, - вымавіў ён, і абняў яе за плечы. Ён стаяў побач зь ёй і за ёй, і яна яго ня бачыла. Яго цела было не кранутым, цэлым, ня маючым сьлядоў цвікоў і удараў. Ён быў чысты і сьветлы, і магутны такі, што ў яе зацямніўся позірк. Яна не магла бачыць яго сьвятло, такое яно было яркае, і бачыла яго як змрок ў вачах, як адсутнасьць усякага сьвятла, ціхую, песьцячую яе цемру, зь якой да яе паўставала яго постаць. А можа, гэта былі навальнічныя хмары, якія грувасьціліся за яго сьпіной. Навальніца напаўзала на Кальварыю, зацягвала неба смугой.

- Пайшлі адсюль, каханая, - ціха вымавіў ён. – Нам болей няма чаго рабіць тут. Пакінем мёртвае мёртвым, бо ж мы з табой – жывыя. Будзем несьці Слова Божае так далёка, як гэта толькі магчыма. Пойдзем да жывых – нам няма чаго рабіць сярод памерлых, бо Слова яны не пачуюць. Мы ж з табой выпілі вады жыцьця, і набылі жыцьцё адвечнае. Паглядзі! Ён узьняў яе руку, і яна ўбачыла прамені, выходзячыя зь яе. Яе рука зьзяла. А можа, гэта былі толькі рэшткі сонечнага сьвятла, якое прабліскавала з-за хмараў. Яно амывала яе твар, як жывая вада, і напаўняла яе сэрца радасьцю.

- Тут няма сьмерці, каханы, - громка, у захапленьні вымавіла яна.

- Тут ёсьць толькі жыцьцё адзінае, адвечнае, і альфа, і амега, і канец, і пачатак, і ўсё замкнутае ў кола, якое круціцца перад намі, як кола ў калясьніцы. Мы ж с табой стаім збоч яго, і над ім, і яно не кранае нас. Як гэта магчыма, каханы?

- Таму што Бог – кіроўца, - ціха вымавіў ён, і яго каханая, Шхіна, трымаецца яго пляча, седзячы ў залатой павозцы, якую відушчыя завуць сонцам, а ведаючыя – Богам. Бо не ўсякі, хто відзіць, ведае, але ж усякі, хто ведае, відзіць. І сонца ёсьць Бог сусьвету – адзінае і сапраўднае, але ж ня тое сонца, што зьзяе ў дзень на нябёсах. Гэта сонца нябачнае, сонца, схаванае для вачэй асьлеплых, але ж там, дзе яго сьвятло, толькі там ёсьць жыцьцё, бо менавіта яно спасылае прамені сапраўднага сьвятла. Сонца ж нябёснае – сонца мёртвае, і проста грэе глебу. Яно ня можа пасеяць жыцьцё, якое сыходзіць на зямлю з праменямі сонца Бога. Геліёс сее, а Сет жне, і разам яны служаць

усявышнему, які ёсьць вялікі Ра, і адкуль выходзіць усё схаванае і патаемнае, набываючы на зямлі плоць.

Ра ж неспазнаваемы, Амон, які працінае ўсё, і ўсюды. Гэтую мудрасьць мне адкрыў чалавек зь Егіпту, зямлі далёкай і таямнічай, якая ляжыць за морам і пяскамі, і дзе веды сьпяць, захаваныя ў далёкіх пустэльных храмах і скалістых пячорах. Туды мы адправімся, каб несьці сваё слова. У Александрыю, горад малады і адкрыты, дзе Богу роўны Аляксандр сабраў маладыя душы, гатовыя прыняць слова ісьціны. Сын Зеўса прыйшоў на зямлю, каб прыгатаваць чалавецтва да з'яднаньня ў Слове, я ж умацую сабраны перада мной статак, пераўтварыўшы пяшчынкі у зьлітак, якому час толькі дадасі бляску.

Веды разьлітыя ўсюды, толькі працягні руку. Там, на алтары Сету, я ахвярую сваё сэрца Богу, і ён адчыніць перад намі ўваход, праз які мы выйдзем да яго. Бо там, дзе мы ёсьць, мы толькі пачынаем даведвацца. Сапраўдную ж моц і веліч Айца можна спазнаваць бясконца, і гэта цудоўна, любая. Каханая мая. Нічога ня бойся, пакуль я з табою. А я буду з табою заўсёды, бо Сын ёсьць Айцец, памятай пра гэта, я – яго рука правая, а ты – яго сэрца, якое мая рука закрывае сабой. Глядзі на мяне. Глядзі. Адкрый вочкі. Каханая, прачніся.

Ён трымаў яе за плечы рукамі, углядаючыся ёй у твар, яна ж, здаецца, зьнепрытомнела ў яго руках, і цяпер набыла сьвядомасьць.

Па экрану беглі тытры. Зал паўстаў, і гучна хлопаў, але ж ніхто не запальваў сьвятла.

- Што гэта было, каханы? – запытала яна разгублена. – Здаецца, я была там, з табою. І ты казаў мне пра таямніцы сонца, якое было такім гарачым, што, пэўна, я страціла прытомнасьць ад яго промняў.

- Ты бачыла нябачнае, каханая, - ціха вымавіў ён. – Тое, што наогул ня можа бачыць чалавек, каб не згарэць нажыва.

Але ж цяпер нам пара йсьці. Джаваньні сказаў, нас чакаюць.

Там, у прыватнай зале для нас будзе арганізавана асобная сустрэча.

- А госьці? – ціха запытала яна. – Хто яны? І куды яны пойдуць цяпер?

- Сыйдуць туды, адкуда прыйшлі – у цемру. Ён махнуў галавой. Тую, якая іх нарадзіла. Бо яны – ня людзі, каханая. Напалову – дземаны, напалову – анёлы. Тыя, хто прыходзіць у сусьвет рабіць пэўныя справы. Некаторыя зь іх тут ад пачатку сутварэньня. Некаторыя ўжо сышлі, і вярнуліся толькі на пэўны час, каб паглядзець на Ўкрыжаваньне Боскага Сына. Некаторым яшчэ толькі належыць прыйсьці, але ж яны таксама тут. Гэта – тыя, што будуць сьведчыць напрыканцы, і будуць скараць народы, выліваючы на іх кубак Боскага гневу.

Семьдзясят два твару бездані і семьдзясят два твару нябёсаў, грыгары і шмат іньшых, якія зьзяюць мацней за прамені ўсіх зямных каштоўнасьцей.

Яны велічныя і магутныя, але ж не магутнее Айца і Сына, і ўсе яны сьхіляюцца перад Шхінай, якая ў сьціпласьці сваёй прыгажосьці зацямняе іх усіх, бо яна стаіць бліжэй за ўсіх да Богау, зьяўляючыся подыхам на яго вуснах.

- Але ж як гэта можа быць, - ціха прашаптала яна. – Мы ж с табой на віле Джаваньні, і я думала, гэта тыя, каго звычайна прынята запрашаць на прэм’еры – арыстакратыя, эліта дзелавога сьвету, мастацтва і навукі.

- Гэта яны, і не яны, каханая. У кожнага такога чалавека ёсьць свой асабісты твар у тонкім сьвеце. Як ён ёсьць і ў цябе, і ў мяне – бо мы тут, на зямлі, тыя, хто мы ёсьць, і адначасова мы ёсьць там, у нябёсах. Мы ёсьць і ў пекле, і ўсюды, як і ўсе яны, тыя хто дасягнуў мяжы і перайшоў яе. Бо мы сталі адным зь Ііім, і самі з’ядналіся паміж сабою. Цяпер жа пайшлі любая. Бо Ён чакае, - ціха вымавіў ён, і ўзяў яе за руку. Яго далонь крэпка трымала яе, і яна прайшла зь ім уздоўж шэрагу чорных крэслаў некуды, куды іх вёў за сабой Джаваньні. Хутка электрычнае сьвятло, хоць і кволае, згасла, і яны апынуліся ў цемры, асьветленай толькі сьветам паходняў, якія шыпелі смалой у

дзяржальнях у сьценах. Сцены зрабіліся чыстымі і гладкімі, белымі, нагадваючымі склеп, а потым – чорнымі і адпаліраванымі, вылажанымі гладкім оніксам, у якіх іх постаці, чорныя на чорным, плылі таямніча і загадкава. Так яны прайшлі па дліннаму калідору, і ўвайшлі, прыгнуўшыся, у нізкія арачныя дзьверы невялікага пакою, які мяккая цемра ахутвала з вуглоў, напаўзаючы. Вакно, калі яно было, было закрытае шторамі, і таму ў пакоі стаяў суцэльны змрок.

Яны ўвайшлі, і спыніліся. Джаваньні зачыніў за імі дзьверы, і раптам вакол стала зусім цёмна, а потым запалала сьвяча – быццам бы нехта нябачны запаліў яе.

І ад убачаннага яна ўздрыгнула, сама ня ведаючы чаму. Раптам ёй захацелася плакаць, але ж сьлёзы гэтыя былі сьлёзы салодкія – нібыта пасьля разьвітаньня яна сустрэла кагосьці, хто быў для яе родны больш за роднага айца ці маці.

Бо перад ёй у глыбокім вялікім крэсьле сядзеў ён. А побач зь ім стаяла яна.

Мужчына сталых гадоў, стары, што было бачна па густых сівых валасах, белых, як сьнег, высокі, шыракаплечы, хоць крыху і сагнуты часам, з прамымі чорнымі бровамі над пранізьлівымі вачыма, з тварам пагрозным і прыгожым, і велічным такім, што яго позірк, здаецца, мог спапяляць, як маланка. Але ж калі ён убачыў яе, ён зрабіўся цёплым і лагодным. Побач зь ім стаяла яна – жанчына незямной, нечалавечай прыгажосьці. Яе доўгія чорныя валасы ліліся па плячах, заплеценыя на макушцы ў складаную касу накшталт кароны. Яе адзеньне ўсё зьзяла каштоўнымі камянямі. Здаецца, яно было залатым, ці барвовым, але ж бляск і жар, якія яно вылучала, вымушалі адводзіць ад яго вочы. Толькі твар жанчыны быў мяккі, сумны і сьветлы, нібы самотны месяц-маладзік, які сьвеціць, чыста адмыты вясеньнім даждом, адбіваючыся ў глыбокім возеры. Яе вочы былі вялікімі і зьзяючымі, прыгожымі, як у багіні, аточаныя доўгімі вейкамі, пад чорнымі тонкімі бровамі. Жанчына была яшчэ не старая, але ж таксама сталых гадоў, паміж трыццацью і сарака. Яе маленькая вузкая далонь ляжала на плячы мужчыны, і ён накрываў яе сваёй вялікай далоньню.

- Дачушка мая, падыдзі да мяне, - нягромка вымавіў ён. – І ты падыдзі. Сын мой. Ён кіўнуў яму, і яны наблізіліся да яго. Міхась за ёй апусьціўся перад ім на калені, і яна апусьцілася таксама. Раптам ёй захацелася плакаць, і яна прыпала да яго ног, палажыўшы галаву яму на калені. Яго вялікая рука гладзіла яе валасы.

- Нічога, дачушка мая. Ня плач. Ня крыўдзіць ён цябе? – ціха запытаў мужчына, гладзячы яе.

- Не, - прашаптала яна. – Я яго кахаю. Я так кахаю яго, Госпадзі! Мацней за ўвесь сусьвет. Бо ж ён – гэта ты, - раптам вымавіла яна, і ўзьняла на яго твар. У яе вачах стаялі сьлёзы. У вачах мужчыны сьвяцілася каханьне. Найвялікшае, такое, якому няма назвы.

- Ён – Дракон, - нягромка вымавіў айцец, - і яму яшчэ мае быць стаць мною. Але ж таму, што ў яго ёсьць ты, я спакойны за яго. Бо я тут, такі, які ёсьць, таму што мяне ўзьняла яна. Ён ізноў пагладзіў руку жанчыны на сваім плячы. Яна пяшчотна ўсьміхнулася.

- Сын мой, - ціха вымавіла яна. І Міхась пакорліва адказаў:

- Што, маці?

- Сын мой, любы мой. Я так сумавала па цябе. Жанчына зрабіла крок насустрач. Мужчына не затрымліваў яе. Яна падышла да Міхася, і абняла яго. Ён ахапіў яе рукамі, і схаваў яе твар у сябе на грудзях. Зь яго вачэй цяклі сьлёзы.

- Маці, - ціха вымавіў ён. – Чаго ты пакінула мяне, маці? Чаму ты сышла так рана? Ён асьцярожна гладзіў яе сьпіну.

Яна абдымала яго за талію рукамі, прыціснуўшыся да яго шчакой.

- У нас няшмат часу, каханая, - нягромка вымавіў мужчына, і ўстаў. Ён быў высокі, такі, што ў Летыцыі захапіла подых. Ён узьняў яе, і цяпер яна стаяла побач зь ім, і ледзь дасягала яго пляча. Ён быў буйнейшы і больш шырокі за Міхася, яго рукі,

грудзі, плечы, ногі, усё нагадвала волата са старажытнай казцы. Яго густыя белыя валасы пасмамі ляжалі на плячах. На поясе вісеў вялікі меч.

Мужчына зрабіў крок да Міхася, якога абдымала жанчына, і раптам ахапіў рукамі іх абодзьвух. Яго плечы ўздрыгнулі. Летыцыя разгублена стаяла побач. Яна нібыта адчувала гэтую боль – боль усіх траіх, якая была такой моцнай, што сатрасала сусьвет. Айцец, Сын, і Маці цяпер былі разам – толькі на імгненьне, каб ізноў адаслаць Сына на пакуты. Бо ж ён быў разам зь імі, і ў той жа час сыходзіў ад іх бясконца. Апускаўся, каб пакутваць у сусьвеце, дзе ён быў нядасканалы Бог. Бог, які быў асуджаны на тое, каб узыходзіць на крыж, пакуль ён не ўсьвядоміць сваю ўласную прыроду. Бог, які быў чалавекам – самым чалавечным з усіх людзей. Бо ж толькі ён мог кахаць па-сапраўднаму, так, як кахае Бог.

- Пайшлі, любая, .- ціха вымавіў ён, і жанчына ціха і пакорліва разьняла рукі. Разам яны падышлі да яе.

- Ідзі да яго, дзіця, - ціха вымавіла яна. – Пачакай, дачушка. Мужчына раптам спыніў яе. Яго моцныя рукі ахінулі яе, і прыцягнулі да сябе.

- Памятай, што я – таксама і твой айцец, любая. Бо жонка майго сына – мая жонка, і яго дачка – мая дачка. Бо ён ёсьць я, хоць ён яшчэ гэтага не асэнсоўвае поўнасьцю. Бо мы зь ім падзеленыя, і так застанецца да самага Страшнога Суда, пасьля якога я зраблю яго каралём, і ізноў сыду ў цень. Я – непраяўлены, і не магу кіраваць, бо мая рука надта цяжкая. Таму сьветам будзе кіраваць ён. І судзіць яго, і вынішчаць будзе ён – Дракон, які сам паўстане супраціў сябе ў абліччы Бога. Бо яны абодзьва – адзінае, і левая і правая старана.

- А хто такі Джаваньні? – ціха запытала яна.

- Джаваньні – той, хто сышоў у сусьвет раней. Стары пакачаў галавой, і ўсьміхнуўся. – Мой малодшы сын, які лічыць сябе старэйшым, створаны, каб спакушаць. Але ж у ім шмат сьвятла, маленькая. І ён – левая рука Яго, таго, хто стаіць з табой побач. Каго ты кахаеш, і жонкай каго зьяўляешся. У мяне ж няма ні

правай, ні левай стараны, бо я – непадзельны.

- А хто яна? – ціха запытала Летыцыя.

- Яна – яго маці, і мая жонка. Марыя і блудніца. Сьвятая і грэшная. І яна таксама з'явіцца напрыканцы сусьвету, калі будзе мець ад мяне ў чэраве, і народзіць дзівоснае дзіця, якое будзе пасьвіць народы.

- А я, хто я, Госпадзі? – ціха запытала яна.

- Запытай у яго, маленькая мая. Бо ён ведае тваё імя. Мае ж вусны надта цяжкія, каб вымаўляць яго. Калі я прамоўлю тваё імя сапраўднае, я забяру цябе, і ты станеш той, хто ты ёсьць, Сьвятым маім духам і подыхам, і пакінеш яго аднаго тут, у сусьвете, дзе ён будзе страшэнна пакутваць. Таму імя тваё павінен вымавіць ён, каб ты належыла яму, і толькі яму. Слову, Сыну, і Каралю ад пачатку сутварэньня. Ён – нябёсны Хрыстас і Мешыах, той, хто найбольш набліжаны да мяне са створаных, адзінанароджаны і аднасутнасны мне, дзяўчынка.

- Шэкіна, - ціха вымавіў Міхась. – Душа Бога. Ідзі да мяне. Яна ціха наблізілася да яго, і ён ахінуў яе рукою.

- Так я не дачка цябе, - вымавіла яна разгублена. Ён пакачаў галавой, і пяшчотна ўсьміхнуўся.

- Ты – большая за дачку, маленькая. Ты – мая жонка, і мая вучаніца. Ты – маё жыцьцё, і ўсё для мяне, каханая.

- Але ж ты і дачка мне – праз Яго, Айца, якому я адзінасутнасны ад нараджэньня. Ён мякка пацалаваў яе.

- Так Дракон – гэта я, Айцец? – нягромка і неяк сумна запытаў ён.

- Ты - Сын мой. Мешыах. Мі-ка-эль. Кіроўца нябёснага воінству. Дракон, які павінны перамагчы сам сябе, бо ж вы – заўсёды разам. Ты - Лючыпар, і Езус, а Джаваньні – Дыявал, Самаэль, які прыйшоў караць і спакушаць. Але ж Дракон болей за Д'ябла, бо ён стаіць вышэй створанага, і мае моц зьнішчаць усё, што я нарадзіў, бо на тое ёсьць мая воля.

Будзь жа літасьцівым, сын мой. І ў той жа час, будзь бязьлітасным. Я ведаю, гэта ня лёгка. Я сам цераз гэта прайшоў. Я быў і Лючыпарам, і Д'яблам, і Богам. Я быў усім, і прайшоў усе колы гэтага сусьвету так, як іх зараз праходзіш ты. Твая воля – сапраўды бязьмежная, і зло і дабро – у тваіх руках, Сын чалавечы. З гэтымі словамі ён працягнуў руку, і крануў яго чало, адвёў руку, зрабіў крок назад, і зьнік у цемры. А побач зь ім палыхнула і згасла зьзяючая залаціста-барвовая зорка.

Яны засталіся ў пакоі адны. Ён павярнуўся да яе, і абняў. Яго рукі былі цяжкімі і чалавечымі. Гарачыя, любімыя ёй рукі.

- Мы ізноў тут, у целах, - ціха вымавіў ён. – Як цудоўна мне трымаць цябе. Якая гэта асалода, каханая. Ты ведаеш, у мяне адчуваньне, што нам толькі што прысьніўся дзівосны сон. Сон, у якім я быў разам з табой, і гаварыў з Богам. Але ж аб чым мы зь ім гаварылі, я ня памятаю, любая. Ты памятаеш, каханая? – ціха запытаў ён яе.

- Памятаю, любы мой. Ён сказаў, што ты – Бог, і Сын, і Чалавек, і Дракон, і Лючыпар. І – Дыявал праз сваю левую руку, Джаваньні, які насамрэч Самаэль. Так ён сказаў, але ж можа, я чаго не памятаю.

- Менавіта так ён і сказаў, каханая. Ён пацалаваў яе вочы. Аднекуль збоч з'явіўся Джаваньні, і падыйшоў да іх.

- Пайшліце павячэраем, спадарства, - вымавіў ён, усьміхаючыся. – На гэтай віле шмат таямніцаў, і ўсе яны ў мяне выклікаюць дзікі апетыт.

Глава 12: Вячэра

Яны сядзелі ўтрох у невялікім пакоі, дзе зьзяла мноства сьвечаў, і гарэў камін. Тут было нават горача, і яна зьняла норкавую накідку, якой закрывала плечы. Яе тонкая постаць у цемры нібыта сьвяцілася, вылучаючы мірготкае зорнае сьвятло.

- Ты атрымаеш свой ганарар, Мікеле. Пяцьсот тысяч, як дамаўлялілся. І яшчэ пяцьсот за тое, што даў сябе ўкрыжаваць. Джаваньні шырока ўсьміхнуўся.

- Лічы, што я сябе ўкрыжаваў забясплатна. Не за грошы ж, сапраўды, чалавек ідзе на пакуты. А асабліва калі гэты чалавек – Бог. Чалавек заўсёды пакутуе за ідэю. Гэта – той бізун, які гоніць яго, як апантанага, так, што нават і крыжом не напалохаеш. У такім чыне пакуты – узнагарода, якую прагнуць, бо, пакутуючы, атрымоўваеш пацьверджаньне, што твая ідэя вартая і таго, каб зьняць зь цябе скуру.

- А якая была ў цябе ідэя, Мікеле? Проста цікава, дзеля чаго ты ўзыйшоў на крыж? Джаваньні глядзеў на яго зацікаўлена, круцячы ў пальцах бакал зь віскі.

- Узышоў, каб зразумець. Ён паціснуў плячыма.

- Зразумець што? Джаваньні ўсьміхнуўся.

- Зразумець, ці сапраўды Бог быў укрыжаваны. Ці ўкрыжаваны быў толькі чалавек, а Бог стаяў, і глядзеў побач.

- І што, зразумеў? – Джаваньні пільна глядзеў на яго.

- Зразумеў, што укрыжаваны быў чалавек. Бога ж укрыжаваць не магчыма. І калі ўцяміў гэта, апынуўся стаячым перад крыжом – вольным. На крыжы пакутваў Шымон. А я глядзеў на яго. Гэтае цела курчылася і сьцякала крывёю, але ж мне было ўсё роўна. Гэта проста скураное адзеньне, тое, што прыкрывае душу. Душа ж ведае Бога ў сабе, а калі так, то яна ня можа памерці.

- І як ты здолеў зразумець гэта? З усіх жывучых нікому яшчэ не ўдалося зьняць самога сябе з крыжа. Джаваньні адпіў глыток віскі, і апёрся рукой аб падлакотнік крэсла.

- Паклікаў яе. Ён накрыў сваёй рукой яе руку. Яна сядзела зь ім у крэсьле побач. Яе пальцы ціха варухнуліся пад яго пальцамі, якія пагладзілі яе тонкую скуру. Спыніліся на заручальным пярсьцёнку, які ён падарыў ёй адразу, калі заключыў першую зьдзелку – дарагі дыямант замест таго, што купіў на радзіме. Тое кальцо яна беражліва захоўвала, але ж цяпер яна насіла іньшыя ўпрыгожваньні, якія адпавядалі яго і яе статусу. Сьціплае калечка з невялікай дыямантавай кропляй засталося ў мінулым. Як і многа што іньшае, аб чым яна сумавала – як і аб тым, які ён быў: просты, зразумелы, адкрыты, шчыры і вясёлы. Цяпер жа ад яго таго, першага, засталося толькі яго каханьне да яе. Ён суцэльна зьмяніўся тут, і яна ня ведала, які зь іх ён быў сапраўдны – той, каго яна пакінула на радзіме, рупліва захаваўшы з пярсьцёнкам у памяці, ці той, які ён быў тут, побач зь ёй і з Джаваньні – незразумелы, няпросты, хаваючы шмат таямніцаў, аб якіх казалі толькі яго вочы, якія вясёлымі болей не былі. Наадварот, у іх плёскаўся боль. Ён жартаваў, што пасталеў, і можа, яно так і было. Кожны год жыцьця, кожны вопыт дадае нам нешта новае, прыбаўляе яшчэ адну грань да дыяманту нашай душы. І яго каханьне да яе стала балючым, але ж яна кахала яго яшчэ мацней, бо разумела, што цяпер яна яшчэ больш патрэбная яму, калі, усё набыўшы, ён сапраўды згубіў усё.

- Каханая мая, - ціха вымавіў ён. – Толькі праз цябе я змог узьняцца. Бо ты напоўніла мяне сьвятым духам. Шэкіна мая. Дзеля цябе я здолеў адарваць сябе ад крыжу. Бо я ня мог пакінуць цябе адну. Каханьне да цябе вырвала мяне з абдымкаў сьмерці. Я жывы толькі праз цябе, бо праз нашае каханьне я саступіў у бясконцасьць.

Памятаеш, некалі даўно, калі мы пісалі першую нашу кнігу, я сказаў табе, што каханьне ператворвае сьмерць у жыцьцё. Там, дзе ёсьць каханьне, няма сьмерці. Гэта сапраўды так. Кола замкнулася, як і казаў ён – той, хто, я ведаю, стаіць за мной. Ён накіроўвае мяне, і яго рука цяжкая. А можа, і сапраўды мы з

табой абудзілі цікавасьць Бога, і ён прыйшоў паглядзець на нас? Хто такія так моцна тузаюць яго за бараду? Ён шырока ўсьміхнуўся, і пагладзіў бараду рукой.

- У Бога няма барады. Яна ўсьміхнулася таксама.

- Як гэта няма? – абурыўся ён. – Ёсьць! Самая настаяшчая. Такая, як у мяне. Толькі длінней. Ня стрыжаная ў прэстыжнай цырульне. У яго многа чаго яшчэ ёсьць – усё, што ў мяне. Інакш чым бы ён уваходзіў у Марыю? І як бы яна здагадалася, што Бог – гэта мужчына? А ня нейкая там птушка накшталт голуба, ці прамень сьвятла?

- Гэта праўда. Джаваньні кіўнуў. – Пісаньне кажа, што Бог сатварыў чалавека па вобразу свайму і падабенству. А потым зь яго рабра зрабіў яму жонку. Такім чынам, у Бога былі рэбры, і тое, што мае ўсякі, каму патрэбная жонка.

- Вось бачыш, - ён усьміхнуўся, гледзячы на яе. – А ты кажаш, што ў Бога няма барады. Ёсьць золатка. У яго ўсё ёсьць, што трэба. Бог – гэта ня нейкі там неіснуючы абстрактны прынцып. Ён – жывы, жывейшы за нас усіх, бо ён перамог самое сьмерць.

Неіснуючы ж сьмерці не баіцца, яна яму не пагражае, і таму перамагчы яе ён ня можа. Такі абстрактны Бог наогул нічога ня можа. Але ж Бог сапраўдны можа ўсё, і ведае ўсё. Таму ён – наадварот, адзіны жывы і існуючы. Астатняе ж – толькі цені. Жывыя ж тыя, хто яго кахае.

- Я жывая праз цябе, каханы, - ціха вымавіла яна, паварочваючыся да яго. Ён пацалаваў яе вусны – мякка, доўга. Яго вусны памарудзілі на яе вуснах, яна адчувала яго дыханьне, вусы і бараду ля сваіх губ.

- Жывы я, каханая? – ціха запытаў ён яе.

- Жывы, любы мой.

Яго вочы ўсьміхаліся. Яна закрыла вочы, і аддалася пяшчоце яго губ, якія вывучалі яе вусны.

Ад яго пахла віскі, і яго язык меў гаркаваты смак, але ж вусны

былі салодкімі. Яго вялікая рука асьцярожна кранула яе плячо, спусьціўшы зь яго аддзеньне, агаліўшы грудзі.

Ён накрыў іх далоньню, і пяшчотна гладзіў, сьціскаючы. Яго вусны рабіліся ўсё больш і больш прагнымі, цалуючы яе ўсё гарачэй.

Джаваньні пільна глядзеў на іх, раз-пораз падносячы да вуснаў келіх зь віскі. Здаецца, аб нечым думаў.

- Яна так нагадвае маю сястру, Мікеле. Гэтыя словы ўжо былі гатовыя сарвацца зь яго вуснаў, аднак расталі, схаваліся ў карычневай залатой вадкасьці бакалу.

- Тут няма ні месца, ні часу, - ціха вымавіў ён замест гэтага. – Усё, што тут ёсьць – гэта вымярэньне нашых мараў. Яго вочы ўспыхнулі бурштынавым жаркім полымем, быццам бы ён успомніў яшчэ нешта. Але ж тое было даўно. Жанчына ў лесе, грудзі якой ён сьціскаваў, прыціскаючы яе да дрэва. Ён бачыў яе ў люстэрку. Яе прыгожы, напалоханы твар. Як даўно гэта было.

І ізноў яна належыць яму. Толькі цяпер усё па-іньшаму, бо тут яны – сапраўдныя, і ім не патрэбны болей маскі. Калісьці Д'ябал думаў, што згвалціў Еву, але ж сапраўды ён згвалціў толькі яе цень. Сапраўдная Ева належыць толькі Богу. Яна знаходзіцца ў вымярэньні іньшым.

Бог цалаваў Еву пад дрэвам ведаў. Бог уваходзіў у яе ў выглядзе Адама, а зьмей назіраў за імі, схаваўшыся ў вецьці.

- Хачу, каб ты распранулася, - хрыпла вымавіў ён. – Пакажы нам сваё цела. Яно прыгожае такое, як можа стварыць толькі Бог.

Яна ўстала, і сукенка ўпала на падлогу да яе ног бліскучай чорнай хваляй – цемрай, покрывам зорнай ночы, крысом нябёсаў. Асьцярожна пераступіла яе маленькай белай ступнёй. Яе туфлі таксама засталіся на падлозе ў грудзе тканіны.

Ён расшпіліў рубашку, і кінуў яе за крэсла, застаўшыся голым па пояс.

- Падыдзі бліжэй, - нягромка вымавіў.

Яна падышла, і стала перад ім. Ён зрабіў ёй знак рукой, спыняючы, і разглядаў яе ў полымі сьвечаў. Мяккія водбліскі таньчылі на яе малочна-белай скуры, пакрываючы яе залатым зьзянем. Яе грудзі, маленькія, узьняліся, ад узбуджаньня і сьвежага паветру, струменьчыкі якога таньчылі вакол.

Джаваньні ўстаў, і падыйшоў да яе, апусьціўшыся, і крануў вуснамі яе аголеную ступню.

Ён асьцярожна цалаваў яе ступні і лыткі, не ўзьнімаючыся вышэй, сьціскваючы іх рукамі, і яна стаяла, і глядзела на яго – у яго чорныя вочы, якія вывучалі яе. Яго твар быў задуменным, быццам бы ён разглядаў палатно, ці статую – твор мастацтва.

- Прыгожая, - ціха вымавіў. – Такая, як у жыцьці не бывае.

Яе доўгія валасы ліліся хвалямі па плячох, дасягаючы сьцёгнаў, на якіх бязвольна ляжалі яе кісьці.

Ён разшпіліў шырынку, і вызваліў свой чэлес, які пабліскваў у тусклым сьвятле сьвечаў.

- Хадзі да мяне, - ціха вымавіў ён. – Вазьмі яго.

Яна падышла, і стала перад ім на калені. Нахінулася, і кранула вуснамі яе чэлес.

Джаваньні апусьціўся за ёй, кранаючы яе сьцёгны. Яго твар паглыбіўся ў яе, і яна адчула яго вусны. Ён цалаваў яе ягадзіцы, прамежнасьць і похву, паглыбляючыся ў яе языком, у той час як яна адчувала, як напружваецца чэлес пад яе рукой.

Яго далонь лягла ёй на галаву.

- Станавіся на канапу, - ціха вымавіў ён, устаючы.

Дзьве пары рук узьнялі яе, і яна нахінулася, кранаючы грудзямі нагрэтую ім скуру.

Нечыя рукі, моцныя, крэпка ўзялі яе за сьцёгны, і яна адчула, як

у яе ўваходзіць напружаная плоць, і застагнала. Праз некалькі рухаў плоць выйшла, і ўвайшла ў яе ізноў, а потым яна адчула дакрананьне дзьвух галовак адначасова. Яны разам увайшлі ў яе, цесна прыціснуўшыся, рухаючыся побач, а потым адна зь іх выйшла, і ўвайшла праміж яе ягадзіц, і ўсё паўтарылася ізноў.

- Закрый вочы, - пачула яна, і падпарадкавалася.

Яе палажылі на канапу, прыціснуўшы ногі да грудзей. Нехта ўвайшоў у яе, па рухам і подыху яна адчула, што гэта быў ён. Ён доўга рухаўся ў ёй, пакуль другі чэлес дакранаўся да яе вуснаў, і, нарэшце, саступіў месца іньшаму. Яна ўскрыквала, і адкрыла вочы, але ж вакол стаяла суцэльная цемра. Усе сьвечы пагасьлі, толькі чулася цяжкое дыханьне і рух моцнага цела і шырокіх плечаў над ёй. Нехта, вялікі, стаяў побач, і яго чэлес кранаў яе твар. Яна лашчыла яго языком. Той, хто быў у ёй, выйшаў, і другі заняў яго месца. І ізноў яна спазнала яго. Ён гвалціў яе моцнымі штуршкамі, прыціскаючы да грудзей яе ногі, а потым выліўся ў яе з глухім рычаньнем. У гэты ж час семя акрапіла яе грудзі.

Яны ляжалі на дыване разам, і яна стагнала ад асалоды, пакуль яе сьцёгны і похву вылізвалі два языка. Нехта выпіў зь яе ўлоньня семя, і яна пачула стогн мужчыны, і яго цяжкі ўздых. Два цела апусьціліся побач, і накрылі яе сабой.

Сьвядомасьць пакінула яе, яна некуды ўплывала, і там яе трымалі моцныя рукі. Прачунался яна ад таго, што нехта нёс яе да машыны, прыкрытую футрам.

- Паехалі дамоў, сонейка, - пачула яна яго голас. – Таямніцы сьвятла сконьчыліся. Таямніцы цемры пачынаюцца.

Глава 13: Прыгажосьць

- Я хачу быць прыгожай для цябе, каханы мой, - ціха вымавіла яна, абдымаючы яго, зазіраючы яму ў вочы. Прыгожай ня толькі целам, але ж і душой. Што зрабіць мне, каб мая душа была годнай цябе?

- Проста кахай мяне, маё сонейка, - вымавіў ён, зазіраючы ёй у твар. – І гэтага будзе для мяне дастаткова.

- Сагрэй мяне, любы мой. Атулі сваім цяплом. Яна прыціснулася да яго, і ён ахінуў яе рукамі. Яны сядзелі на канапе ў сваім пакоі, і назіралі, як за вакном ідзе сьнег. Сьнег падаў на апельсінавыя дрэвы і шчодра агортваў мяккай бавоўнай ружовыя плады. Яна ня бачыла, але ж адчувала, як прахалодныя ліпкія сьняжынкі прыстаюць да пругкай чырвона-аранжавай скуры, і толькі бакі плодаў праглядаюць з-пад беласьці, як чырвоныя грудкі сьнегіроў. Раптам ёй захацелася поўначы – густога, хрусткага сьнегу і марозу, пухнатых сумётаў і заінелых елак і хвояў, і халоднага, марознага небу з цвічкамі зорак з колкімі ільдзістымі праменямі. Яна ўявіла сябе ў футры, стаяшчай пасярод гурбаў мяккага сьнегу. Яна падкідвае яго, і ён асыпаецца на яе дыямантавым дажджом, зьзяючы на сонцы. А зьверху таксама падае сьнег – павольна таньчыць, апускаючыся зь нябёсаў вялікімі разнымі сьняжынкамі-карункамі. Яны таюць у яе на вуснах, і ён сьмяецца. Пэўна, гэта ўжо калісьці было. Нечакана неба пачарнела, быццам бы аднекуль надышла навальніца.

- Навальніца зімой? – зьдзівілася яна.

Ён абняў яе, і прыціснуў да сябе. Раптам неба за вакном стала пагрозным – набліжаўся шторм. Завея. Яны сядзелі ва ўтульным пакоі, і слухалі сьпевы ветра за сьцяной. На драўляным паліраваным стале гарэла вялікая белая сьвяча. А побач – чорная. Яны кагосьці чакалі – быццам бы адчынялі браму.

- Для каго белая сьвяча, каханы? – запытала яна яго.

- Для Бога, любая, - ціха адказаў ён.

- А чорная для каго, любы мой? – вымавіла яна.

- А чорная – для мяне, і цябе, каханая. Ён пацалаваў яе, і агарнуў рукамі. – Бо нам прыйдзецца адчыніць з табой таямніцы ночы. Калісьці мы ўжо адчынялі іх. Мы падыходзілі блізка, і я ўжо вёў цябе праз Сітра Ахра да сьвятла. Чорнага сьвятла, якое ёсьць сапраўднае сонца, бо яно такім выглядае для ўласьцівых гэтаму сьвету вачэй. Але ж сапраўдны яно ня мае колеру. Гэта проста веды, якія працінаюць цябе, як меч. І яны спальваюць усё нячыстае ў табе. Усё залішняе, зямное. Яны патрабуюць шмат. Калі застанешся сам-насам з гэтым сьвятлом, яно выпаліць усё, што не належыць каханьню. Яно выпрабоўвае, і выпрабоўвае страшна. Больлю і страхам, і верай, і надзеяй, і радасьцю, і адчаем. Мала хто здольваў прайсьці праз яго жывым.

Калісьці мая рука правяла цябе праз таямніцы Таўміэль, і цяпер мы адправімся туды ізноў. Я ведаю, каханая – нешта ляжыць за сьвятлом. Нешта, што магутнее нават і за яго, і што нам мае быць вызваліць з-пад коркі сусьвету.

- Ці ж гэта дракон цемры, каханы мой? – вымавіла яна.

- Так, любая. І яго веліч і прыгажосьць ня маюць роўных. Бо ў абліччы Вялікага Дракона Бог войдзе ў сусьвет, каб біцца самому з сабой. І калі Бог забярэ сілу Дракона, сусьвет вызваліцца, і Сітра Ахра згарыць. Так жа, як згарыць і Дрэва Сефірот. Нічога не застанецца – яны зьяднаюцца. І гэта адбудзецца ў жыцьці, тут, і з усімі намі.

Сьвятло і цемра зьмяшаюцца, і пагасяць адно аднаго. І тады застанецца толькі Бог. І Бог запаліць сьвячу – кволую, здаецца, але ж ён захіне яе сваёй далонью. І з гэтай маленькай сьвечачкі народзіцца сусьвет. Новы, і больш дасканалы. Але ж не зусім дасканалы, бо Бог ніколі ня спынецца ствараць, і як і Шхіна – нараджаць праз яго, любая мая. Ён крануў яе лоб вуснамі.

Яго вочы глядзедлі на яе – прыгожыя, і яны ўмяшчалі сусьвет.

- Ты ведаеш, што я купіў дом? Дом на поўначы? – запытаў ён яе.
- Такі, як ты хацела, каханая. У густым лясу, ля дарогі, і вакол ёсьць горы, і мора – фьёрды. Недалёка ад Осла. Цяпер, калі нашыя справы тут скончаныя, мы можам паехаць туды. Як раз застанем сапраўдную зіму – як ты і хацела. А вясной можам вярнуцца сюды, і правесьці тут лета і пачатак восені. І так будзем рабіць кожны год. Будзеш мець сапраўднае Ражаство, і навагоднія сьвяты. І мы зможам запрасіць туды, каго ты пажадаеш.

- Як цудоўна, каханы! Яна абняла яго, і дакранулася вуснамі да яго шчакі.

- Ты ўся дрыжыш, дзяўчынка мая. Я запалю камін, - вымавіў ён. – Гэтага цяпла не хапае, каб пратапіць старую вілу.

І сапраўды, гарачае паветра з кандыцыянера нібыта кудысьці прасочвалася. Стары шчылісты камень быццам бы праглынаў яго, як губка. І яе раздражняў гук – гудзеньне. Ім абодзьвум хацелася цішыні, у якой бы патрэсквала полымя – шумела, разгараючыся. Ён падлажыў пад дровы паперы, і чыркнуў доўгай сьпічкай. Хутка вагонь узьняўся, і вясёла запеў.

- Як у старой хаціне! – вымавіла яна. Ён усьміхнуўся, гледзячы на яе. Супраць вагню ён выглядаў для яе дзікунскі прыгожым – чорныя валасы ляжалі на шырокіх плячах, вочы блішчэлі. На ім быў апрануты швэдар – пацёрты, нібы ношаны шмат год. Ён любіў такія рэчы, маючыя гісторыю, з адценьнем нядбайнасьці.

- Зусім швэдар знасіў, - усьміхнулася яна.

Ён зьняў яго праз галаву, застаўшыся ў адной майцы, і апрануў яе. Швэдар дасягаў ёй да каленаў. Яна закасала рукавы, і прысела ля вагню на нізенькую канапку. Ён сеў зь ёй побач. Прыемнае цяпло ахутвала іх.

- Сагрэлася? – запытаў ён.

Яна кіўнула.

- А ты, каханы? Табе не халодна ў майцы? – запытала яна яго.

- Не, любая. Ён крануў яе шчаку вуснамі. Яе шчочкі загарэліся, валасы былі заложаны за ружовыя вушкі. Яна была такая мілая, што яе хацелася агарнуць і проста зациснуць у абдымках. Яна выклікала ў яго пачуцьцё пяшчоты, замілаваньня. Цяпер, дома, у простым адзеньні, яна здавалася яму ня меньш прыгожай, чым у шыкоўным строі на прэм'еры фільма, але ж іншай, кранальнай, уразьлівай, маленькай дзяўчынкай – не таямнічай багіняй, ад якой захоплівала дух, якая быццам бы сышла да яго з зораў. Ён узьняў яе ручку, і паднёс да вуснаў.

- Цёплая, - ціха вымавіў, і прыціснуў да сваёй шчакі. Яна адчувала тыльным бокам далоні волас яго барады, яго вусны павярнулі яе руку, і пяшчотна кранулі яе запясьце. Яго губы вывучалі яе скуру, узьнімаючыся па блакітных жылках. Ён нахінуўся да яе рукі, узьняў рукаў швэдара. Яго губы падняліся вышэй, і кранулі ямку ля локця.

Ён ледзь адарваўся ад яе рукі, тонкай, бялюткай, з вускай кісьцю з маленькімі пальчыкамі.

Яна і сама была, як дзіця – танюткая, пяшчотная. Ды, насамрэч, яна і была для яго дзіцём. Колькі год ёй было? Дваццаць? Яны толькі нядаўна адсьвяткавалі яе дзень нараджэньня. Сапраўды, казерог – таямнічы знак, найбольш загадкавы, народжаны ў самай цемры зімы, кіруемый Сатурнам. Ён ведае ўсе таямніцы зямлі – чорнай і сухой, сьпячай пад сьнегам, ведае і загадкі начнога небу, бяззорнага і глыбокага. Яе чорныя валасы былі як ноч, а скура – як бялюткі сьнег, паблісквaючы пад месяцам. Калі ён сачыняў для яе казкі, ён сапраўды насалоджваўся, уяўляючы, як яна чытае каўдаўскія сшыткі, а ён сядзіць, і глядзіць на яе, і распранае позіркам. Усё ж, ён быў чараўнік, і маг – пусьць толькі і для яе, і ў сваім уяўленьні. Яна радавалася яго гісторыям, і ён ведаў, што яго казкі для яе ніколі ня скончацца.

Ён так кахае яе, што баліць сэрца, падумалася яму.

- Хадзі сюды, - ціха вымавіў ён. Яна прыціснулася да яго, схавалася пад яго рукой.

Яны столькі раз былі зь ёй блізкімі, ён ведаў усё яе цела, як і

яна яго, і ведаў яе душу – трапяткую, ранімую. Але ж у гэтай душы была схаваная моц, якая ўсё ж была для яго патаемнай, і глыбіні, якія ён усё больш і больш адкрываў для сябе. Жанчына – сапраўды як рашчыліна ў той, іншы сусьвет. Яна ведае, ня ведаючы. Усё, ад нараджэньня. І адразу мае тое, што мужчынам мае быць набыць, заваяваць, дасягнуць. Жанчына мае прыгажосьць, якую мужчына прагне. Яна мае сьвятло, якім ён запальвае, і асьвячае сваю душу.

Ён можа зрабіць зь ёй усё, што пажадае, як і ня раз рабіў, але ж гэтую яе прыгажосьць ён скарыць ня можа, ня можа поўнасьцю ўвабраць яе, зьліцца зь ёй, як зь яе скурай, яе похвай, бо яна – недасяжная. Яна не належыць гэтаму сьвету.

Ад яе тонка і чароўна пахла – нечым няўлоўным, таямнічым, загадкавым, нібы водар анёла – салодкі і пранізьлівы, густы і ружовы і томны. Яму хацелася распрануць яе, апусьціць на дыван перад камінам, выцягнуць за галавой яе рукі і прайсьціся вуснамі па яе целу, наносячы на сябе яе пах. Водар раю. Водар Евы.

У ёй усё было цудоўным, не было такой яе часткі цела, якую б ён не кахаў, не жадаў вывучаць вуснамі і рукамі, знутры ці звонку.

- Чараўніца мая, - ціха вымавіў ён. – Зачаравала мяне. Ён крануў вуснамі яе валасы.

- Раскажы мне пра Сітра Ахра, - папрасіла яна. – Я чула, што туды спускаюцца самыя цёмныя магі, самыя моцныя, якія паглыбляюцца ў цемру так, як ніхто іншы, хто вывучае таямніцы Дрэва.

Што яны атрымоўваюць там? Чаго шукаюць?

- Сьмерць, каханая. Яны прыходзяць туды, каб памерці. І праз гэта набыць адвечнае жыцьцё. Бо Сітра Ахра – гэта пекла, і таямніцы мёртвых. Гэта як апусьціцца глыбока пад зямлю, ці зазірнуць у глыбіні самога сябе. Там аднолькавая гарачыня, і ціск, але ж і там, і там фармуецца дыямант. Чым глыбей ты зазіраеш у сваю душу, тым больш каштоўныя камяні знаходзіш.

Таксама і зь Сітра Ахра. Таямніцы другой стараны бязьмежныя. Гэта такая веліч, і такі спакой, што нельга апісаць словамі. Чорныя, бязьмежныя зямля і нябёсы. Ва ўсякім чыне, гэта я так бачу. А ты, можа, убачыла б па-іньшаму. Але ж я правяду цябе туды сам. Жанчыне ня трэба адной уваходзіць у Сітра Ахра, бо сілы, якія яе насяляюць, прагныя жаночай крыві і цела. Трэба быць чыстым, зусім чыстым, празрыстым для іх. Яны адразу заўважаюць рэшткі плоцкага, і гора той душы, якая асьмеліцца несьці іх туды з сабой. Сітра Ахра – жорсткая, і плоць яна не прымае. Яе істоты - бязьлітасныя каты цела. І многія магі апускаюцца туды менавіта за пакутамі. Каб ачысьціцца праз іх. Мы самі шукаем сабе пекла, калі заўважаем сваю нядасканаласьць, і пекла для нас радаснае і жаданае. Таму ўваходзіць туды трэба радасна, і бяз страху. Бо той, хто нясе ў душы Бога, не баіцца нічога. Толькі чысты можа загадваць істотам Сітра Ахра, і прайсьці праз іх непашкоджаным, бо яны жорстка выпрабоўваюць душу, каб вызначыць, ці яна годная паўстаць перад сапраўдным Богам. Чорным Богам не-існаваньня, ад якога нарадзілася ўсё.

- А Кецер, каханы? – запытала яна яго. – Каббала кажа, што Кецер – гэта Бог.

Ён пакачаў галавой.

- На нябёсах Бога няма, каханая. Бо сапраўднае тварэньне пачынаецца зьнізу – зь цені. Адтуль нарадзілася ўсё. Ісуса расьпялі на крыжы, але ж Пётр пайшоў далей, бо ведаў больш. Хрыстос прыходзіў да вучняў, і гаварыў зь імі пасьля свайго Ўкрыжаваньня, калі прайшоў і зямлю, і нябёсы. І пасьля гэтага ён яшчэ шмат чаго адкрыў. Крыж, на якім расьпялі Пятра, быў перавёрнутым, бо ён ведаў, што гэта – крыж сапраўдны. Пётр першы сышоў у цемру Сітра Ахра, і яна паглынула яго. Таму царква Пятра – сапраўды чорная, а не сьветлая. Яна валодае найбольш дзейснымі таямніцамі цемры. Гэта ведалі катарас – чыстыя, якія пакланяліся сьвятлу. Яны адмаўляліся ад улады цемры, і яна зьнішчыла іх, бо цемра заўсёды мацней сьвятла, і зямнога, і нябёснага, бо яна мае ў сабе сьвятло сапраўднае – неіснаваньне, якое выпальвае вочы. І тады пустыя вачніцы бачуць, і зрэнкі адмовіўшагася ад сьвятла гэтага сьвету

ўспрымаюць сапраўднае, чорнае сьвятло. А потым у душы загараецца чорнае полымя. Але ж яно моцна небясьпечнае, бо адразу спальвае ўсё зямное, і ўтрымацца ў целе тады дужа цяжка. Выкінутая зь цела, душа проста сыходзіць. Зьліваецца з адвечным.

- А каханьне, любы? – ціха запытала яна. – Ці не спальвае чорнае полымя каханьне?

- Каханьне зямное яно спальвае, любая, і ачышчае душу для першаснага каханьня, якое адзінае – сапраўднае, чыстае і сьвятое. І якога баіцца, і не прымае зямля, а найбольш яго баяцца князі гэтага сьвету, бо яно адразу пазбаўляе душу іх улады. Бо набыўшы яго, душа ведае толькі Бога, і нічога зямнога ёй не патрэбна, і нікога яна не баіцца. Набыўшы такое каханьне ня ведае страху. Калісьці мы прайшлі праз другую старану. Я правёў цябе туды, але ж гэта было там, у Памежжы.

- Памятаеш? – ціха запытаў ён яе.

- Памятаю, любы, - адказала яна.

- Сагрэлася? – Так. Яна прыціснулася да яго пад рукою.

- Хачу цябе, - ціха вымавіў ён.

У пакоі даўно ўжо стала цёмна – апусьціўся змрок. Яна пакорліва ўзьняла рукі, і ён зьняў зь яе швэдар, топ, бялізну, не пакінуўшы на ёй нічога.

Распрануўся, і нахінуўся над ёй. Мяккі ворс дывана нібыта праглынуў іх. Яна выцягнулася пад ім, і ён лашчыў губамі яе грудзі, плечы і рукі, прынікаючы тварам да ўнутранай паверхні яе плечаў, убіраючы яе пах, яе тонкі водар. Яго жаданьне зрабілася сапраўды дзікунскім, цёмным, глухім, яно бязьлітасна абрушвалася на яе, як камень, як цяжар бездані, гатовае раздавіць яе, але ж гэты цяжар нібыта разьліваўся, сустракаючыся зь яе целам, і абцякаў яго, абдымаючы. Яго сьцёгны моцна прыціснуліся да яе сьцёгнаў, і ён увайшоў у яе сваім чэлесам, уздрыгнуўшы.

- Не хвалюйцеся, Ліліян, - раптам вымавіла яна. – Вы проста яшчэ мала ведаеце. Вы думаеце, што ведаеце, але ж вы памыляецеся. Усё, чым вы займаліся, гэта небясьпечная лухта, і дземанам і сапраўды нельга загадваць. Але ж яны цікавяцца намі. Яна замаўчала.

- Бяз Бога не магчыма кіраваць дземанамі, - ціха патлумачыла яна. – Чалавек, наогул, ня можа. Толькі Бог можа ім загадваць.

- Чалавек жа можа толькі прасіць Бога, - ціха працягнула яна. – Кольці б ён не гуляў у дземанскія гульні, ён прыйдзе да гэтага.

- Я ўмацаваў сваю волю так, што стаў роўным дземанам, - працягнуў ён, і пераўзышоў многіх зь іх. Але ж я так і застаўся слабым. Мяне кідала з сусьвету ў сусьвет, з краю у край ад адчаю да самай глыбокай бездані болю, які толькі мог спазнаць чалавек. Пакуль я не сустрэў яе. І яна вызваліла мяне зь пекла. Насамрэч, яе прывёў да мяне Бог. І калі я сустрэў яе, я стаў Ім. Богам, які прыняў адказнасьць за яе, і свой лёс. Я ўспомніў сябе, і жахнуўся. Мы зь ёй знаходзіліся ў пекле, бясконца блукалі па яго шляхах. Але ж цяпер мы былі разам. І марудна мы пачалі ўзыходзіць на крыж. Я разарваў гэты сусьвет – разарваў яго дзеля яе - каб нам вызваліцца. І здарылася дзіва - мы вызваліліся зь ёю. Цяпер жа мы – вольныя, і можам знаходзіцца адначасова і тут, і ўсюды, у бясконцы месцаў.

- Я ня буду спрачацца. Яна паціснула плячыма. – У вас мае быць сваё бачаньне астралу, у мяне – сваё. Я магу сказаць вам, што дземаны шмат разоў дапамагалі мне. Ён кіўнуў.

- Хай будзе так. Я таксама ня буду спрачацца. Вы пабудзьце разам, а я пайшоў. Крысьціян ужо стаміўся глытаць пыл у адзіноце. Я проста адчуваю яго гнеўныя астральныя вібрацыі. Ён шырока ўсьміхнуўся, паказаўшы белыя зубы пад чорнымі вусамі, дакрануўся да пляча высокай дзяўчыны, махнуў галавой, разьвярнуўся, і пакрочыў у бібліятэку.

- Пайдземце на кухню, Вівіян. Ой, прабачце, Ліліян. Там можна ўтульна пасядзець, там ёсьць канапа, і гарыць камін. Міхась запаліў. І я запалю для нас сьвечы.

Яна мякка ўсьміхнулася.

- Ліліт, - вымавіла Ліліян. – Называйце мяне Ліліт.

- Я не магу, - пакачала яна галавой. – Гэта імя дземана, і яго нельга вымаўляць дарма. Прайдзёмце, Ліліян. Я вам растлумачу. Усё, што вы жадаеце. Але ж спачатку прапаную выпіць кавы. Яна ўзяла яе за руку. Яе рука была мяккай і цёплай, але ж ўладнай і моцнай. Зьдзіўлена Ліліян заўважыла, што яна ня можа не падпарадкавацца ёй.

- Я маю моц Айца майго, - ціха патлумачыла Летыцыя. – Яго

рука кіруе маёй рукой, бо я цяпер заўсёды знаходжуся ў ім.

У дваіх яны прайшлі ў вялікі сьветлы і цёплы пакой, і Ліліян села на канапу.

- Дзіўны дом, і дзіўная сям’я, - падумала яна.

Глава 26: Яднаньне

- Госпадзі, ці ты чуеш мяне? – ціха вымавіла яна. Яна малілася, стоячы на каленях у халодным невялікім пакоі. За сьцяной-муром раскінулася далёкая пустка - безьмежныя палі. Над палямі лёталі птушкі: крумкачы сумна сьпявалі сваю адвечную пахавальную песьню. Каго хавалі? Тое было не істотна. Яны лятаюць так, і крычаць ужо даўно. Такія вось пякельныя анёлы – правраднікі самотных душаў, блукаючых у пакінутых месцах. І яна была такой жа душою – самотнай, пакінутай. Яна замольвала тут свае грахі. Якія – ужо і ня памятавала. Іх было шмат – дужа шмат, і ўсе яны заключаліся ў тым, што рабілі зь ёю іньшыя. Праз гэты гвалт і зьдзекі яе душа страціла памяць аб нябёсах. Яна згубіла розум, але ж зусім не шкадавала яго. Розум ёй толькі перашкаджаў. Бо цяпер, не маючы яго, яна была вольная. Вольная ад усіх – калі яна стала вар'яткай, яны яе пакінулі. І тут, у самоце, яна сустрэла і спазнала Бога. Яе тонкія рукі, складзеныя далонямі, былі ўзьнятыя – да яго. Тонкая ільняная кашуля зусім не падыходзіла для халоднага надвор'я, але ж холаду яна не адчувала. Уся яе душа поўнілася прадчуваньнем нейкай радасьці, сустрэчы, якую яна ўжо даўно чакала. Яе вялікія вочы болей ня бачылі зямнога – яны назіралі нябёсы. Сьвятло асьляпіла іх, і сьвет вакол зьнік, нібыта яго і не было. Толькі Бог застаўся вакол, ахінаючы яе адусюль.

- Хто ты? – ціха запытала яна. – Хто ты, мая найвялікшая радасьць, маё каханьне? Ці я ведаю цябе?

- Ведаеш, - прагучэў ціхі, ласкавы голас. – Ведаеш, золатка маё, бо ты – у маім сэрцы.

Ён увайшоў у пакой і ўбачыў самотную маленькую постаць ля вакна. Сьветла-шэры колер кашулі нібыта зьліваўся зь небам і колерам яе самотных вачэй, якія, ён ведаў, шэрыя, пазіраючыя ў ціхія бездані, дзе блукала яе душа. Дзяўчына малілася – як заўсёды, калі ён уваходзіў. Ён не турбаваў яе – ціха назіраў. Калі-некалі падыходзіў зусім блізка, так, што яна адчувала яго

подых, і клаў цёплую вялікую далонь на яе плячо. І тады зь яе веек капалі сьлёзы. Яна была прыгожай, гэтае дзяўчо. Летыцыя. Ён кахаў яе даўно - даўно зразумеў гэта. Яе чорныя валасы былі як сон. Як мара. Доўгія, яны падалі мяккім, шаўкавістым покрывам, бліскучыя і густыя, закрываючы яе сьцёгны. Казалі, што дзяўчына была вар'яткай. Але ж ён ведаў, што гэта ня так. Проста яе душа спала. І прыйшоў час абудзіць яе. Асьцярожна ён крануў яе за плячо, і паклікаў:

- Летыцыя!

- Што, каханы? – ціха адказала яна, нібы прачынаючыся ад сну.

- Пойдзем дамой, каханая. Пойдзем разам са мной, - ціха вымавіў ён. Ён апусьціўся перад ёй на калені, узяў яе твар у далоні, і паглядзеў ёй у вочы. Яе вочы набылі жыцьцё, і яна пагладзіла яго валасы – асьцярожна, мяккай далонькай.

- Пайшлі, Госпадзі, - ціха вымавіла яна. – Я так даўно чакала цябе.

Ён нахінуўся, і крануў вуснамі яе мяккія вусны. Яна абвіла яго шыю рукамі. Праз кашулю ён адчуваў яе тонкае цела, біеньне яе сэрца, як і яна, прыціскаючыся, адчувала яго вялікае цела, яго грудзі і гук яго сэрца ў іх. Іх сэрцы адно насупраць другога з'ядналіся, і загарэліся адным моцным полымем.

Яна адчувала жар яго вуснаў, і ўздрыгвала. У першыню яе цалаваў Бог.

Адзеньне перашкаджала яму, і ён сьцягнуў зь сябе кашулю. Кінуў яе на падлогу. Яна ўзьняла рукі, і ён агаліў яе цела – тонкае, амаль празрыстае, з маленькімі кропкамі ружовых саскоў і цёмным ценем пад мяккім улоньнем паміж стройных сьцёгнаў. Яе цела быццам бы сьвяцілася, і амаль таяла ў яго руках, празрыстае і лёгкае, як прывід, ці сон.

Ён накрыў яе трапяткую душу далоньню, і пад яго рукою гэтая зыбкая плоць суцішылася, і прытулілася да яго цяпла. Ён гладзіў яе грудзі, адчуваючы яе напружваючыяся саскі, пакуль яго вусны вывучалі яе вусны. Яе рука лягла яму на грудзі, і

пагладзіла скуру, крыху блытаючыся ў валасах пальцамі. Ён апусьціў яе далонь ніжэй, туды, дзе ўзьняўся яго чэлес, і яе тонкія пальцы кранулі яго плоць.

Тое, што адбывалася, не спыніць ні ёй, ні яму, разумеў ён.

Ён узяў яе на вузкім манаскім ложку, пакрываючы пацалункамі яе лёгкае цела, апальваючы яго вуснамі, рассоўваючы і раскрываючы сабой. Седзячы перад ёй, ён бачыў яе стройныя белыя сьцёгны, тонкія лыткі і маленькія ступні, якія ён кранаў губамі, сьціскваючы далонямі. Яна ўздрыгвала і стагнала, нібыта ў ліхаманцы, але ж ён разумеў, што гэта была ліхаманка жаданьня, якая ахапіла яе так жа, як і яго. Тут ніхто не патурбуе іх і не перашкодзіць, бо ён быў тут уладар, і сьвятар, той, хто мог уваходзіць да яе, і спавядаць яе ў любы дзень і час.

Не было такіх таямніцаў, якія б яна не распавяла яму – ён ведаў пра яе ўсё. І цяпер яму толькі засталося ўзяць яе – узяць так поўна, як толькі гэта магчыма. Бо ж ён быў Богам – яе адзіным, хто быў для яе істотным, і каго яна чакала і клікала ў самоце. У яго на грудзях яна засынала, і яго рукі былі для яе надзейным шчытом і аховай.

- Ты гатовая прыняць мяне ў сябе, анёлак мой? – ціха вымавіў ён, і яна адказала:

- Так. Я гатовая прыняць цябе, каханы.

- Будзе балюча, але ж ты пацярпі. Ён нахінуўся да яе, і пагладзіў яе твар далоньню. – Толькі крышачку, а потым мы адправімся з табой у рай. Гэта будзе новая зямля, і новае неба, каханая. Я абяцаю цябе. У першыню ён назваў яе каханай. Яна ўздрыгнула, быццам бы даўно чакала.

Ён нахінуўся над ёй, і асьцярожна ўвайшоў у яе, пяшчотна, але ж бязьлітасна працінаючы яе цела. Яна ўскрыкнула, і яе вочы закрыліся. Твар яе быў белы і прыўкрасны, як адляцеўшая душа, якая стаяла цяпер зь ім побач. Яго чэлес рухаўся ў ёй усё мацней і глыбей, і з кожным яго рухам яе працінала асалода нябёсная, не зямная, такая, якую і апісаць было нельга. Яна ўскрыквала пад ім, і яе белыя сьцёгны і прасьціна ложку

афарбаваліся яе крывёю. Пад сабой ён бачыў яе стройнае цела, маленькае і тонкае, над якім зараз сьведчыла сваю ўладу яго самасьць, яго магутнасьць і яго моц. Яго каханьне працінала яе жудасна, і яна выгіналася пад ім, прыціскаючыся да яго, прагнучы яго ўсей душою і целам. Праз некалькі рухаў усё было скончана. Ён выліўся ў яе, прынік, і ахапіў рукамі.

- Мы паедзем дамоў, любая. Паедзем да мяне, - ціха вымавіў ён. – Туды, дзе нас з табой ніхто ня патурбуе, і ня будзе нам перашкаджаць.

Ён узьняў яе на рукі, апрануўшы ў адзеньне белае, і чыстае, як сьнег. Праз імглістыя палі ў цемры чорны вершнік на аграменным вараным кані скакаў напрасткі, несучы ў абдымках душу. Яна прытулілася да свайго каханага, і ня чула і ня бачыла нічога.

- Куды мы едзем, Госпадзі? – ціха запытала яна.

- Дамоў, сонейка. Мы едзем з табой дамоў, - ціха вымавіў ён, цалуючы яе вочы. Ён крэпка прыціскаў яе да сваіх вялікіх грудзей, кіруючы вольнай рукой туга нацянутыя лейцы. Конь імчэў, прышпораны, і хутка яны будуць дома. Чорны замак над ракой узьняў высока свае гонкія вежы. Вось гарыць вакно, а гэта значыць, што іх чакаюць. Там Абель запаліў сьвечы, і верныя рыцары і жаўнеры стаміліся, выглядаючы свайго гаспадара. Але ж вось ён імчыць, несучы ў абдымках Душу, якая належыць яму адзінаму. Яго позірк чорны і страшны, аднак для яе ён – прыўкрасны і лагодны, як і яго рукі, і яго вусны. Бо яна ведае хто ён сапраўды – яе Бог, яе каханы, Цар і Ўладар сусьвету, той, хто яе знайшоў, і ніколі болей не пакіне.

Яна адкрыла вочы, вяртаючыся ў рэчаіснасьць, нібыта рыба вынырнула з вады. Яго вусны кранулі яе вусны, твар нахінуўся над ёй.

- Цябе прысьніўся сон, каханая? – ціха запытаў ён.

- Так, любы мой. Прыўкрасны, дзіўны сон. Ты нёс мяне на чорным кані ў наш замак, любы. І я ведала, што ты быў там сапраўдны. Як і я там была сапраўдная, - прашаптала яна,

абдымаючы яго.

- Золатка маё. Ён абняў яе, прыціскаючы да грудзей, цалуючы яе вочы. – Ты – маё жыцьцё. Мой маленькі анёлак. Я ж і тут сапраўдны, любая. Як і ты – сапраўдная. Птушаня маё. Ён абняў яе, і прыцягнуў да сябе.

- Ты – Ён, - ціха прашаптала яна. – Я ведаю, любы мой. Я была там. Я бачыла. Ты – мой Бог. Жыцьцё маё. Я ведаю, што мы вернемся туды, у той замак на пагорку пасярод лесу.

- Вернемся, любая. Ён пацалаваў яе. – Абавязкова вернемся, душа мая. Яго далоні гладзілі яе твар. – Усё, што ты ўяўляеш, усё праўда. Я ўсё ствару для цябе. Праўда ў тым, што нам хораша з табой разам, жыцьцё маё. Каханая. Я напішу для цябе самую прыўкрасную кнігу пра велічны замак на пагорку на ўскрайку лесу, пра сьвет, дзе ўсё для нас з табой магчыма, і дзе мы – сапраўдныя, такія, якія мы ёсьць, і якімі жадаем быць.

- Напішы, каханы. Яна абняла яго, хаваючы твар у яго на плячы.

- Не істотна, у якім мы сьвеце, любая, галоўнае, што мы – разам, - ціха, пяшчотна вымавіў ён, цалуючы яе.

- Цяпер ты ведаеш усё, каханая, - ціха вымавіў ён, трымаючы яе твар у далонях.

- Чаму Сафія павінна пакутваць у сьвеце, любы? - ціха запытала яна.

Яго позірк, такі любячы і пяшчотны, нібыта працінаў яе душу.

- Таму, што ты павінна ўзьняцца да мяне, любая. Пераўтварыць смерьць у жыцьцё, і спазнаць каханьне. Даведацца, што ў гэтым сьвеце яго няма, і імкнуцца да мяне ўсёй душой. Калі сьвет гвалціць цела, цела разумее, што яно – ня дом Душы, бо яна належыць нябёсам. І тады Душа ўзьнімаецца над целам, і ўзьнімае яго - да мяне. І я сыходжу, і ўваходжу ў яго. І болей няма розьніцы, бо я - усюды. Няма словаў, каб выказаць мяне. Я - той, хто я ёсьць, і я - крэпасьць і моц, і той, хто спазнаў маё каханьне, не баіцца сьмерці. Бо смерць для яго не існуе, і таму

не адрозьніваецца ад жыцьця.

- Куды мы пойдзем далей, каханы? - запытала яна яго. - Куды павядзеш ты мяне сваімі шляхамі?

- Мы пойдзем далёка ў цемру, любая. Бо наш шлях туды толькі пачынаецца. Сьвятло абмежаванае, цемра ж - бясконцая. Яе таямніцы можна спазнаваць адвечна. Ён ахінуў яе рукой у мантыі, як вялікім чорным крылом.

Яна прытулілася да яго, і ён укрыў яе сабой. На яго грудзях яна апынулася ў адвечнасьці. Каханьне калыхала іх - подых ненароджанага, у якім магчымае ўсё.

У пакоі стаяў вялікі крыж з чорнага дрэву. Было цёмна і злавесна, і ў той жа час - пакойна і радасна, так, што ў яе замірала сэрца.

- Ты гатовая ўзыйсьці на гэты крыж, каханая? - ціха запытаў ён.

- Гатовая, любы. Бо гэты крыж - мая любоў да цябе, - ціха адказала яна.

Яна стаяла аголеная перад ім, і ён працягнуў ёй руку, і падвёў да крыжу. Разьвёў яе рукі, і уставіў у кайданы на перакладзінах.

- Будзе балюча, любая, - ціха вымавіў ён.

- Я гатовая цярпець боль, каханы. Боль ад цябе - гэта падарунак, які ня мае кошту, - вымавіла яна сухімі губамі.

Ён падыйшоў да яе, і закрыў яе вусны сваімі. Яго пацалунак, прагны, апаляў яе. Вусны яе жадна пілі жыцьцё зь яго вуснаў.

Ён зьняў адзеньне, і застаўся стаяць насупраць яе аголены. Яго чэлес, вялікі, выглядаў з чорных валасоў, магутнае цела праглынала цемра. Яго цяжкая рука лягла ёй на грудзі, сьціснула іх і пагладзіла.

- Там, дзе я, няма цноты, - нягромка вымавіў ён. - Бо я пазбаўляю дзявоцкасьці і цела, і душу. Яго вусны наблізіліся да яе саску, і ён прыпаў да яго, сьціскваючы яе сьцёгны рукамі.

- Прыйдзіце, і піце ад Сафіі, - гучна вымавіў ён, і зь цемры да яе сталі падыходзіць постаці. Яна пазнавала рыцараў, якіх ведала, і бачыла. Усе яны падыходзілі да яе, і прынікалі да яе саскоў. Вусны пакрывалі яе цела, убіраючы скуру, прагна насычаючыся ёю, і так жа ціха адыходзілі ў бок, становячыся вакол.

Нарэшце ён падыйшоў да яе ізноў, нахінуўся і прынік да яе саску, доўга піў з адной і другой грудзей, а потым прыціснуўся да яе вуснаў.

- Я караную цябе цернем, - каханая, - ціха вымавіў ён, - і акраплю цябе крывёю.

Нехта падаў яму дзіўнай прыгажосьці пояс з шыпамі, які ён зацягнуў вакол яе тонкай таліі, і плець, з тонкімі языкамі, як полымя пекла. Ён узяў яе, і яго рука нанесла некалькі ўдараў. Хутка па яе грудзях пацяклі струменьчыкі крыві.

Ён прынік вуснамі да іх, і ўвабраў чырвоную кроў зь яе скуры, і цені выйшлі ізноў, і прычасьціліся яе крывёю.

- Апошні круг, каханая, - ціха вымавіў ён. - І хутка ты будзеш вольная.

Ён адсьцягнуў яе, і яна апусьцілася перад ім на калені. Ён прыцягнуў яе да свайго чэлесу, і яна пакрыла яго пацалункамі.

- Апусьціся, - ціха вымавіў ён. - Павярніся да мяне. Яна стала задам, і ён рассунуў яе ягадзіцы, і увайшоў у яе глыбока, так, што яго чэлес поўнасьцю схаваўся ў ёй.

- Плоць павінна пакутваць, - прагучэла ў яе вушах. - Зьневажаючы цела, узьнімаем душу.

Ён доўга гвалціў яе праміж ягадзіц, а потым адышоў, і стаў сьпераду. Яна прыняла яго чэлес, пакуль постаці зь цемры падыходзілі і бралі яе па чарзе так, як было заведзена ў Садоме. Некалькі дзясятаў чалавек пабывала між яе ягадзіц, і ўсе яны выліваліся туды, а потым прычашчаліся пацалункам.

Нарэшце ён павярнуўся, і нахінуўся, і яна прынікла да яго вуснамі.

- Цяпер я вазьму цябе ва ўлоньне, - вымавіў ён. - І буду мець цябе, як і яны, пакуль не атрымаю задавальненьня.

Яна апынулася на падлозе пад ім, і ён увайшоў у яе. Гвалціў яе доўга і жорстка, і, ня выліўшыся, стаў побач. Потым яе ўзялі ўсе, хто быў у пакоі, а ён назіраў зь цемры, гледзячы, як яна пакутвала ад іх. Калі ж іх зьдзекі сконьчыліся, ён даў знак, і яны пакінулі пакой. Ён жа падыйшоў і стаў перад ёй насупраць.

Яна ляжала перад ім уся пакрытая семенем і крывёй, з раскрытым улоньнем і адверсьцем пад ім. Яе цела набыло вар'яцкую, блюзьнерскую, тагасьветную прыгажосьць - прыгажосьць пакутніцкую і святую, велічную ў сваім умаленьні.

- Праз гвалт і зьдзекі Сафія падымаецца да мяне, - ціха вымавіў ён, і накрыў яе сабой.

Яго чэлес увайшоў у яе, і яна ўскрыкнула, адчуваючы страшны, жудасны боль, які быў такім салодкім, што ў яго не было назвы. Ён браў яе груба і жорстка, гвалцячы бязьлітасна, уваходзячы ўсюды, і нарэшце выліўся глыбока ва ўлоньне, куды ніхто не выліваўся да яго, з гукам рычаньня, ад якога скалануліся нябёсы.

Яна ляжала ў яго на руках, і ён нёс яе па калідорах замка аголеную, як і сам. Нёс у іх шлюбны пакой на царскі ложак, дзе ім і належала быць цяпер, пасьля чорнага шлюбу, які быў перавёрнуым адлютраваньнем нябёснага, да якога яна была гатовая.

Там, на ложку, ён аднавіў яе цноту і ачысьціў яе сваім Йодам, зрабіўшы адвечна цнатлівай для яго і ўскрытай ім для сябе, узяўшы яе, і пранікнуўшы ў яе душу сваёй моцай.

Глава 27: Апакаліпсіс

- Вызваленыя? Джаваньні, расьпяўшы Хрыста, людзі сталі адвечна праклятымі. Ім няма пазбаўленьня, няма прабачэньня. Ён горка рассьмяяўся.

- Пакуль яны ня зьменяцца, - дадаў ён.

- А гэта будзе ня хутка. Ва ўсякім чыне, яны наогул не зьбіраюцца. А Апакаліпсіс ужо пачаўся, і пачаўся даўно – адразу, як яны расьпялі Яго. І калі ўдарыла першая маланка. Толькі яны не пачулі, і не зразумелі. З таго часу Бог няспынна гаворыць з кожным зь іх, караючы незьлічонымі карамі – каб яны пачулі. І па вялікай сваёй літасьці дасылае знаменьні сваёй любові, не пазбаўляючы кожную душу магчымасьці ўзьняцца да яго. Яго літасьць ня мае межаў, але ж што ён сустракае ў адказ? Якімі заўгодна цацкамі займаецца чалавек, толькі б забыць пра Бога. Забыць пра яго расьпятага сына. Бог казаў кахаць – яны ненавідзяць і помсьцяць. Бог прапаведваў волю – яны ладзяць кайданы. Бог узьняў жанчыну да сябе, і пасадзіў яе побач з сабою, назваўшы сваёй Душой, каханай, Шхінай і Сьвятым Духам – яны яшчэ больш заняволілі жанчын, спальвалі іх на кастрах, гвалцілі і зьневажалі, робячы з жывой душы бесславесны скот. Ведаеш, як цяпер складана абудзіць жаночую душу?

- Ведаю. Джаваньні кіўнуў. – Але ж яна – не такая.

- Яна – суцэльная рана, Джаваньні. Калі ты поўнасьцю пазбаўлены скуры, ты робішся на дзіва чутным. Калі да твайго мяса дакранаецца вецер – подых Бога. Калі яго вусны кранаюць цябе знутры, тваё адкрытае сэрца, тваю крывавую ўскрытую плоць, тваю аголеную душу, дакрананьне да якой яшчэ больш балючае, чым да самага адчувальнага аголенага нерва.

Бог літасьцівы, Джаваньні, у тым, што ён катуе. Ён ніколі не пазбаўляе нас сваёй ласкі – абуджэньня нашых сьпячых душаў.

Яе душы Бог спаць не даваў. І яна ўдзячная яму за гэта.

Удзячная мне, што я знайшоў, і абудзіў яе. Як я яе кахаю, Джаваньні! Тое не магчыма апісаць словамі. Ён узьняў да твару рукі, і паглядзеў на свае далоні.

- Вось так, як люблю самога сябе. Бо ж чалавек найперш любіць сябе, Джаваньні. І гэта – нармальна. Правільна. Калі ў самом сабе чалавек любіць Бога – любіць яго падабенства і сьвяты яго подых: сваю душу. І калі чалавек напаўняецца любоўю да Бога ў сабе, ён набывае моц любіць іншых. Але ж яе я, здаецца, кахаў адвечна. Калі толькі яе ўбачыў, зразумеў гэта. Але ж маё каханьне для яе было страшным. Балючым. Я згвалціў яе, Джаваньні. І рабіў гэта мноства разоў, ва мноства жыццяў. Я так жадаў яе, што быў гатовы разарваць яе сваім чэлесам. Гэта была вар'яцкая прага, не на жыццё, а на сьмерць. І цяпер я яе кахаю так – да крыві, да болі, да смерці – і яе, і сваёй. Госпадзі, як я кахаю яе, як жадаю. Я п'яны Джаваньні. Віно зусім затлуміла мне галаву, а яна - горшая за віно. Вось прыду зараз дамоў, і вазьму яе – ізноў згвалчу, і буду рабіць зь ёй усё, што захачу, што задавальняе мяне, прыносіць мне асалоду. Бо ж яна і сама гэтага жадае. Яна жадае болю, і яе вочы просяць мяне аб гэтым. Яна прыціскаецца да мяне, і просіць зрабіць ёй балюча, катаваць яе, каб яна не паснула ізноў. І я ўваходжу ў яе – ва ўсе месцы, і ўшаноўваю, і зьневажаю яе цела. Але ж ніколі, чуеш мяне, ніколі я не зняважыў яе душы, і яе каханьня. Бо яна для мяне сьвятая. Я трахаю яе, і малюся ёй. Засаджваю ёй праміж ягадзіц, і адчуваю чэлесам Бога – Дух Сьвяты, Шэкіну. Я гвалчу Еву, і паўстаю перад ёй на калені. Мне яе цела патрэбнае, як хлеб, і як вада патрэбная яе душа. А яна сама патрэбная мне як паветра. Я дышу ў ёй, жыву ў ёй, і ёй. Трахаючы яе па-садомску, я зьневажаю і гэты сусьвет, і гэтае яе цела. І яе, і сваё. Мы ж – ня цела, Джаваньні. Мы – значна большае. Чыстае каханьне, узрыў універсуму, калі ён расьцёкся, разьлятеўся ў бясконцасьці подыхам з божых вуснаў. І мы ўвайшлі ў яго, а выйшлі мы з Бога. З яго вуснаў, і яго подыха, народжаныя яго Сьвятым Духам. Элахім зрабілі нам плоць, але ж не зямную – а дасканалую, нябёсную. Як мы ўпалі так нізка, Джаваньні? Як гэта адбылося? Мы ж народжаны, каб лятаць, а насамрэч ползаем па зямлі.

- Мы лятаем, толькі ў снах, Мікеле. Лятаем у марах. Джаваньні

глядзеў на яго вачыма цёплымі і разумеючымі. Адпіў віскі з бакалу.

- Няма ніякай заслугі, каб узьняцца, ня ўпаўшы. Прабач мне гэты сафізм. Але ж як можна сапраўды ўзьняцца, калі ты не паспытаў, што такое бруд і цемра зямлі?

Проста быць побач з Богам не магчыма, Мікеле. Бог адштурхвае ад сябе, і адначасова цягне. Гэта стварае напружаньне, і нараджаецца сусьвет. І ў яго сыходзім мы. Вар'яцкая прага каханьня, Бога ў душы, магчыма толькі тады, калі ты ад яго аддзелены. І мёд з'яднаньня назаўсёды атручаны ядам граху. Такое каханьне, Мігеле, мае горка-салодкі смак. Ты грэшны, і разумееш, што Бог літасьцівы. І кахаеш яго значна мацней, чым той, хто ня ведае, і ня ведаў граху.

- Як лічыш, Джаваньні, Д'ябал кахае Бога? – сур'ёзна запытаў ён, не кранаючы кубку з напоем.

- Лічу, што ты кахаеш Бога так, як ніхто не кахае ў сьвеце, Мікеле. Бо ж ты – Д'ябал. Шчыра кажучы, між намі, - мы с табой ведаем, хто ты.

- Я і сам ня ведаю, хто я, Джаваньні. Адчуваю сябе і Д'яблам, і Богам адначасова. Калі Бог уваходзіць у сусьвет, ён забывае сябе. І пачынае гуляць па агульных правілах. Якая б яго заслуга была, каб ён узьняўся, не ўпаўшы? Хрыстас паказаў нам шлях, умаліўшыся. І кожны чалавек, калі ён пасьледуе за ім, дасягне Бога.

- І трапіць на крыж, Мікеле. Джаваньні ўсьміхнуўся.

- Менавіта. Ён кіўнуў. – І такім чынам выкупіць свае грахі, якіх у яго безьліч, як і ў кожнага з нас.

- А ў яе – якія грахі, Мікеле? Твар Джаваньні быў сур'ёзны, строгі.

- Іх ведае толькі яна, Джаваньні. Я ж ведаю толькі тое, што яна кахае мяне. І гэтага мне, як Богу, дастаткова.

Ён узьняўся.

- Ноч будзе доўгай, Джаваньні – я адчуваю гэта. Ноч сусьвету, якая пачалася дзьве тысячы год таму.

- Запалі ў ёй сьвятло, Мікеле, каб верныя бачылі да цябе шлях. Джаваньні таксама ўзьняўся, і паціснуў яму руку.

Гэтай ноччу ён кахаў яе пяшчотна і беражна, з усёй любоўю, якую толькі меў у сваім сэрцы. Яму проста хацелася трымаць яе ў абдымках, гладзіць і цалаваць яе, прыціскаць да сябе. Яна адчувала гэтае ў ім – нешта новае, нешта такое, што, нарэшце вызвалілася зь яго. Яго жарсьць да яе ня стала меньшай – яна стала іньшай, набыла стрыманасьць і кантроль, замест жорсткасьці і драпежнасьці пераўтварылася ў пяшчоту, як пякучая сера, і ртуць перапраўляюцца ў філязоўскі камень.

Хутка пасьля гэтага яны з'ехалі, і вось, цяпер яны тут. У новым доме і новай краіне, з новымі выклікамі і таямніцамі.

Ён разьбіраў з Крысьціянам кнігі – старыя, спарахнелыя, і новыя, сучасныя, у багатых і простых вопратках, і дзіву даваўся, чаго тут толькі не было. Адных грымуараў было толькі некалькі дзясяткаў, ад найбольш старажытных да сучасных, аб якіх ён нават і ня чуў. Крысьціян толькі прысьвістваў і ўзьнімаў бровы, разглядаючы тую ці іньшую кнігі. Усе ключы і ключыкі Саламона, Абрамелін, Ганорый, і шмат, шмат іньшых, нават Некранаміконаў было некалькі, у таўстых скураных вокладках, багата аздобленых.

- Не жадаеш павыклікаць старых багоў, Крысьціян? – ён усьміхаючыся махнуў адным зь іх у хлопца перад носам.

- Не жадаю, Міхал, - сур'ёзна адказаў той. – Я цяпер наогул ніякіх багоў выклікаць не жадаю. Прайшлі тыя часы. Гэта Ліліян усё выклікае. Я ж, здаецца, ужо выклікаў усіх, каго толькі магчыма.

- Менавіта. Міхась усьміхнуўся. – Але ж я табе скажу, што Лаўкрафт ня быў так ужо далёка ад праўды. І істотаў, якіх ён апісваў, ён сапраўды бачыў. Так пераламляецца ў сваім уяўленьні непрыгатаваны розум, які замест Бога і праўды шукае монстраў ды дзівосаў. Чалавек мае тую ж моц, што і Бог –

стварaць. Таму Говард пасьпяхова стварыў, і надзяліў жыцьцём усіх гэтых Багоў, якія цяпер і самі ня рады, што існуюць. Бо ж ён памесьціў іх у даволі жорсткія і непрыглядныя ўмовы.

- Тады дабром было бы дапамоч гэтым істотам зразумець Бога ісьцінага і ўзьняцца да яго. Крысьціян усьміхнуўся.

- Дабром было б адпусьціць іх, і ня турбаваць. Хай паснуць. А ўжо Бог, ці хто іньшы, вырашыць, што рабіць зь імі. Надта ж яны чужыя для гэтага сусьвету. А можа, ён і праўда выклікаў іх з Хаосу, зь цемры, якая ляжыць па-за межамі сатворанага? Міхась паціснуў плячыма. - Можа, і чалавек, і Бог не ствараюць, а толькі выклікаюць з бездані магчымасьцей тое, што там ужо ёсьць.

- Можа і так, - пагадзіўся Крысьціян. Так яны разьбіралі кнігі, пакуль не натрапілі на адну, якая прыцягла іх асаблівую ўвагу.

Старая, шурпатая вопратка, на якой было напісана нешта.

- Mater Deorum, - прыглядзеўшыся, пабачыў ён. “Маці Багоў”. Цемра жаноцкасьці. Лона, нарадзіўшае Зеўса. Хаос і акіян Тыямат.

- Твой айцец быў жрацом Хаосу? – раптам запытаў ён.

- Мой айцец быў апантаным вар’ятам. Крысьціян скалануўся, нібы ад агіды. – Ён шукаў нешта ў старажытных культах, што было б найбольш істотным – першаасновай усяго існага.

- І Бог-Айцец яго не задавольваў? – усьміхнуўся Міхась.

- Не. Ён быў упэўнены, што народжаны ня можа быць сапраўдным Богам. Зеўс быў народжаны ад Рэі. І таму ён лічыў Рэю-Кібелу, Магна Мацер, сапраўдным бажаством, вытокам усяго існага, вялікім улоньнем, адкуль нарадзіліся ўсе Багі.

- А хто нарадзіў Айца усіх Багоў – Кронаса? – вочы Міхася глядзелі на яго зь цікаўнасьцю.

- Уран-неба ад Геі-зямлі, - падумаўшы, успомніў Крысьціян.

- А хто нарадзіў Гею? – Міхась глядзеў на яго, усьміхаючыся.

- Яна існавала ад веку. Па мяркаваньню грэкаў. Крысьціян таксама ўсьміхнуўся. Урана ж, па лягендзе, Гея нарадзіла ад Хаоса, успомніў ён.

- І таму ў твайго бацькі ў галаве адбыўся хаос. Разумею. Але ж, пачакай. Гэта – ня кніга. Гэта толькі вопратка. Ён адкрыў пажаўцелыя старонкі.

- Ня ведаю, ці маю я права гэта бачыць. Усё ж, гэта твая спадчына. Падобна на запіскі твайго айца. Ён працягнуў Крысьціяну дзёньнік. Той зьбялеў.

- Яны шукалі гэта, - ціха вымавіў ён.

- Твой айцец валодаў гэтым домам, Крысьціян? – запытаў Міхась, гледзячы яму ў вочы.

- Мой дзед валодаў. У айца ж тут была бібліятэка. Ён сыходзіў сюды, калі жадаў папрацаваць над нечым асаблівым.

- І пісаў тут свае назіраньні. Міхась кіўнуў.

- Вы можаце прачытаць гэта. Я не жадаю кранаць праклятыя старонкі. Крысьціян уздрыгнуў.

- Добра. Міхась узяў невялічкую кнігу, і адклаў яе ў бок на край сталу. Яны працягнулі разьбіраць і сартыраваць кнігі і паперы, у той час як Летыцыя зь Ліліян бавілі час, ведучы гаворку.

Глава 28: Відзеньні

Яе грудзі пругкія і налітыя, бо яна нараджала ад яго шмат разоў, і яны поўныя малака, з набухлымі і чырвонымі, як вішні, саскамі. Ён дакранаецца да іх пальцамі, лашчыць яе скуру, і яна сьхіляе галаву яму на плячо. Залатыя каралі на яе шыі паблісквающь, яркія, упрыгожаныя камянямі, яны спадающь ёй на грудзі да самага ўлоньня, сьцякаючы між імі, як зьзяючая рака, у ваду якой глядзяцца дзьве горда паўстаўшыя чырвонакаменныя вежы з крутых прыбярэжных халмоў.

Ён сьцісквае яе саскі пальцамі, цалуе яе шыю.

Яго рукі лажацца на яе, скараючы, прыцягваючы да сябе.

- Каханая, - вымаўляюць нягромка яго вусны. - Вось ты і ў доме маём - нашым доме, які ты абрала, і ў які я ўвёў цябе каралевай, любая мая жонка. Тваё цела дасканалае, і твар твой як сонца, а позірк як месяц, і вусны - як віно. Ён цалуе яе, і ў яе захоплівае подых ад яго жарсьці. Яго пацалунак запячатвае яе вусны як цяжкая пліта, замыкаючы іх каралеўскай пячаткай. Брама зачынена і таямніца захавана, і скарб апушчаны ў скарбніцу, і ўсё вярнулася на месца і знаходзіцца ў доме сваём ля яго, і ў ёй.

Яна нічога ня бачыць, акрамя яго, але ж вось яе вочы вылучаюць - нешта рушыць у цемры, і цяжкая постаць выходзіць адтуль да яе.

- Нікіфар! Ён усьміхаецца - нябачна.

- Так, мой кароль.

Чалавек становіцца на калені, і яго вялікая галава, нагадваючая ільвіную, сьхіляецца перад ім - Уладаром.

Яго густыя валасы кудзерамі спадающь на плечы, закрываюць сьпіну грывай, позірк тура з-пад шырокага ілбу узьнімаецца, і бачыць яе. У яго вачах жаданьне. Прага яе такая, што яе нібы

апальвае вагонь.

- Час прыйшоў прысягнуць табе, Нікіфар - прысягнуць мне, Уладару Цемры, якая, бязьмежная, ляжыць за народжаным сьвятлом сусьвету.

Ты жадаў яе на зямлі, але ж ты ня мог узяць яе, бо яе там не было. Цяпер жа яна - тут, на маіх грудзях, і каленях, і ты можаш зрабіць зь ёй тое, што так прагнеш.

Яна - маці табе. Вазьмі яе грудзі і яе ўлоньне, выпі малака і адчыні браму.

Яго голас ракоча, як гром, і чалавек скаланаецца. Марудна ён падыходзіць да яе.

- Панна! Я прагнуў цябе ўсё жыцьцё, і атрымаў пасьля сьмерці. Сапраўды, узнагарода мая найвялікшая, як і мая ўдзячнасьць майму Гаспадару і Пану. Ён паўстае перад ёй на калені, і яна ўкладае яму ў вусны чырвоны сасок. Яны змыкаюцца вакол яго, і зь іх зрываецца глухі зьвярыны стогн. Ён убірае яе сасок вуснамі, і яна нахінаецца да яго. Яго рука сьціскае яе грудзі, ён цяжка дыша, выпіваючы яе да кроплі, да болю ў туга нацягнутых сасках, якія сьціскаюць яго вусны.

- Раскрыйся, - чуе яна Яго голас, глухі, нізкі. - Расчыніся, брама.

Яна адкідваецца ў яго на каленях і разводзіць ногі. Нікіфар паўстае, і яна бачыць яго чэлес, які выклікае ў яе жах. Ён аграменны, і ўзьнімаецца з чорных валасоў, як вялікая вежа над лесам. Марудна ён падыходзіць і нахіляецца над ёй. Уцісквае ў яе свой чэлес, і яе ногі рассоўваюцца шырока, быццам бы яна зьбіраецца нарадзіць ад яго. Яго моц неймаверная, плоць цяжкая, і больш нагадвае цела быка, жывёлы, такое яно вялікае і мускулістае, напоўненае семенем, якое, здаецца, кіпіць у яго чрэслах. Ён выліваецца ў яе і апаляе, нібы полымем. Яна стогне, і ўсё уплывае, зьмешваецца вакол. Яна бачыць цяпер Яго твар, твар свайго Пана і каханага, яна ляжыць пад ім, і ён выліваецца ў яе, і яго чэлес яшчэ больш вялікі, магутны, як вялікая зьмяя, якая працінае яе наскрозь. Ён нешта кажа, і яго словы калышуць прастору вакол, і яе залівае яго семенем. Яна

скаланаецца ў сутаргах жарсьці, і два семені зьмешваюцца, і выцякаюць зь яе у чашу. Нечая рука ўзьнімае яе, і дае Яму, ён адпівае і дае Нікіфару. Той апускаецца перад Ім на калені. Адпівае з чашы. Грукоча гром. Яна адкрывае вочы.

Ліліян глядзіць на яе, чакаючы адказу. Яна марудна праводзіць па твары рукой. На яе скуры застаецца вільгаць – маленькія кропелькі поту.

- Што вы запытвалі, Ліліян? Прабачце, я, здаецца, згубіла ўвагу. Прабачце мяне, - шчыра кажа яна. – Мне стала дрэнна.

- Тут душна. Ліліян ківае. – Пэўна, трэба адкрыць фортку.

- Так. Я зраблю. Яна паўстае, і адчыняе акно. У пакой урываецца халоднае сьвежае паветра, вецер кідае жменю сьнега, і ён разьбіваецца, разьлятаецца вакол яе, кранаючы яе таньчачым вэлюмам.

Ён адкідвае яе чорныя валасы, віецца вакол яе віхурам, цалуе яе пяшчотную скуру белымі вуснамі, дакранаецца да грудзей, якія нібыта не адчуваюць яго ледзяных пацалункаў.

- Як хораша! – ціха вымаўляе яна на незнаёмай Ліліян мове.

- Як цудоўна, і вольна дыхаць!

Ліліян глядзіць на яе, нібыта замарожаная ледзяным дыханьнем ветру. Доўгія валасы дзяўчыны ля вакна калышуцца, быццам водарасьці ў ледзянай вадзе, і Ліліян здаецца, што яна ўсплывае на паверню з-пад ільду, ці ўзьлятае высока, каб згубіцца ў белых аблоках. Яе цела стройнае і прыгожае, аксамітнае плацьце барвовага колеру ахутвае яе, узьнімаючыся ад подыху колкага, ледзянага паветра, якое ўварвалася з вуліцы ў пакой. Уздыхнуўшы, дзяўчына прыкрывае адчыненае вакно, пакідаючы толькі шчыліну, праз якую ужо не трапляе сьнег. Яна ідзе да кава-машыны, і націскае кнопку.

- Яшчэ кавы, Ліліян? – гасьцінна запытвае яна.

- Да, калі ласка. Ліліян спраўляецца з наважэньнем, устрахвае

галавой. Паводзіць плячыма. Дзіўны дом. Дзіўнае месца. Дзіўная дзяўчына. Але ж яна пытаецца быць гасьціннай, талерантнай. Летыцыя ставіт перад ёй чашку, і талерачку з кавалкам пірагу.

- Я сама пякла, - тлумачыць яна.

Яблычны пірог духмяны, ад яго ідзе моцны пах карыцы. Ліліян з задавальненьнем адпівае кавы, і кладзе ў рот кавалак.

- Крысьціян мне расказваў пра вас, - працягвае яна. – Ён проста ў захапленьні, толькі пра вас і гаворыць. Рад, што ў яго з'явіліся суседзі. Скажыце, Летыцыя, а чым вы займаецеся акрамя гаспадаркі? Яна намагаецца стрымаць пагарду, але ж у яе ня дужа атрымоўваецца.

- Нічым. Летыцыя паціскае плячыма.

- Я гатую ежу – тры разы, потым я раблю хатнія справы, мы не нанялі прыслугу: дом не вялікі, і я магу з усім справіцца сама. Да таго ж, Міхась ня любіць, калі ў доме ходзяць чужые. Звонку ён усё робіць сам, а калі трэба, мы выклікаем сервіс. У вольны час я чытаю, і крыху пішу. Гляджу паказы моды, фільмы. Слухаю музыку. Займаюся шопінгам. Мне гэта дужа падабаецца, захапляе. Яшчэ я пазірую яму. Міхась – скульптар і мастак. Вясной, калі ён пабудуе майстэрню, ён хоча зрабіць вялікую скульптуру. Данаю. Я буду Данаей, ён ужо зрабіў шмат накідаў.

А яшчэ я люблю таро. У Міхася шмат калодаў, і ён мяне зацікавіў.

- Вы любіце рабіць расклады? – Ліліян узьняла на яе вочы. Летыцыя сядзела на канапе, апёршыся на сьпінку. Мяккі цёмна-чырвоны аксаміт падкрэсьліваў выгібы яе цела, тонкага, нібы цякучага, як пераліваючыся хвалі аксаміту, якія густой крывёй спадалі з канапы, нібы капаючы на падлогу.

- Так, люблю. Але ж я больш люблю разглядать карты. Расклады я раблю дужа рэдка. Калі мяне папросяць. Аднак большай часткай я адмаўляю. Людзям не патрэбна ведаць пэўныя рэчы, і

яны не сур'ёзна ставяцца да картаў, - патлумачыла яна.

- А вы да картаў ставіцеся сур'ёзна? – Ліліян кпліва паглядзела на яе.

- Так. Летыцыя кіўнула. – Ён дапамагае мне, - вымавіла яна. – Я запытваю яго, і ён адказвае.

- Хто – ён? – пацікавілася Ліліян.

- Ён. Мой каханы. Я запытваю яго, і ён гаворыць са мной.

- А хто твой каханы? – Ліліян сапраўды насалоджвалася гаворкай.

- Мой каханы – Усё, і ўсе яго называюць па-рознаму. Для мяне ж ён – Бог. Адзіны, хто існуе. Я ведаю, што нікога і нічога няма, акрамя яго. Я проста запытваю яго, і ён адказвае. Міхась – ён Бог. Проста тут ён выглядае чалавекам. Але ж там, па-за межамі гэтага сьвету, ён сапраўдны. Тут жа мы бачым яго, як твар у вадзе. Бог адлюстроўваецца ў сусьвеце, і такім чынам набывае цела. Але яно – не сапраўднае. Яно як туман. Ілюзія. Сапраўдны жа Бог бязьмежны. Я кранаю яго руку, і адчуваю яе цяпло, але ж ён значна, значна болей, чым гэта. І я ведаю, што я там таксама ёсьць, і я таксама бязьмежная, але ж ня роўная яму. Я – подых на яго вуснах. Подах яго жыцьця. Ён сам мне пра гэта сказаў.

У голасе Летыцыі не было нічога такога, што выдавала б асаблівасьць моманту. Яна гаворыла пра Бога звычайна, быццам бы пра кагосьці, хто заўсёды знаходзіўся зь ёй побач.

- Прабач, але ж таро – гэта ведьмаўство. Ліліян перайшла на ты, бо так было больш натуральна ў датычаньні да маладой дзяўчыны.

- Не. Таро – гэта мапа Бога, - ціха адказала Летыцыя, задуменна, разглядаючы нешта перад сабой.

- Гэта як сусьвет, куды Бог сыходзіць, каб казаць сваю волю. І яны ня могуць ілгаць. Карты ніколі ня ілгуць, Ліліян. Як толькі

ты дакранаешся да іх, ты грукаеш у дзьверы Госпада.

- А які ён – Бог? – пацікавілася Ліліян. Яе пачала забаўляць гэтая размова.

- Ён – прыгожы. І ён мае яго рысы – майго каханага, майго мужчыны. У яго чорныя валасы, і ён магутны. Толькі ён большы, цяжэйшы, больш цёмны. Ён – як чорная цень за ім, магутная і страшная, пагрозная. І вакол яго віруе полымя. Мой Бог - такі, - ціха працягнула яна.

- Ён бярэ мяне, і я не магу адмовіць. Ён уваходзіць у мяне. Я адчуваю ў сабе яго чэлес, і мяне кранаюць яго рукі і вусны. І я зьліваюся зь ім цалкам. Ён бярэ мяне так глыбока, што працінае нават і сэрца. І яго плоць дарыць мне незвычайную асалоду.

Мяне гвалцілі, шмат разоў. І я жадала памерці. Але ж ён прыйшоў да мяне, і выратаваў. Ён – мой айцец. І мой муж. І мы зь ім заўсёды разам.

- Ты гаворыш пра Міхала? – Ліліян узьняла на яе зьдзіўленыя вочы. – Як гэта – ён твой айцец?

- Так. Ён – мой айцец. Летыцыя нібыта ня чула яе. Яе вочы быццам бы блукалі недзе, твар быў прыўкрасным, экстатычным, напоўненым сьвятлом.

- Я думала, Міхал – твой муж.

Пэўна, Крысьціян памыліўся. Але ж так, менавіта так і мае быць, - падумала Ліліян. Бо ж мужчына старэйшы за яе больш чым на трыццаць год. Яму ўжо за пяцьдзесят. А ёй толькі споўнілася дваццаць. І гэта, канешне ж, больш натуральна і падобна на праўду, чым тое, што яна – яго жонка ці каханая. Наўрад ці такі сталы мужчына стаў бы так адкрыта жыць з дзяўчынай, больш чым удвая маладзейшай за яго. І наогул, чамусьці, ёй здавалася, што ў Летыцыі наогул ня можа быць мужчыны – асабліва такога. Наўрад ці ёй нехта зацікавіцца. Яна прыгожая, але ж дзіўная, і такая худая, анарэксічная. Мужчыны ж любяць сэксуальных жанчынаў, з формамі, як у яе.

Але ж гэта азначае, што Крысьціян ёй схлусіў, і яму яна ўсё ж падабалася. І ходзіць ён сюды ня проста так. Пэўна, мае нейкія пляны.

- А табе нравіцца Крысьціян? – прама запытала яна.

- Так, - Летыцыя паціснула плячыма. – Ён – добры хлопец. Прыгожы і разумны. Мне цікава зь ім.

У гэты час пачуліся крокі, і ў пакой увайшлі Міхась з Крысьціянам, якія спусьціліся з другога паверху.

- Ну як вы тут? Пасябравалі? – запытаўся Міхась, падыходзячы.

- Так, каханы. Летыцыя ўстала, і ён абняў яе, прыціснуўшыся вуснамі да вуснаў. Яго пацалунак быў глыбокім і жаркім, пяшчотным. Ён затрымаўся на яе губах, і яго рука лягла ёй на сьпіну, пагладзіла, і прыцягнула да сябе.

Яна прыхілілася да яго цела, нібыта растаючы ў яго руках.

Ліліян глядзела на іх, адкрыўшы рот.

- Што з табой? – запытаў яе Крысьціян па-нарвежску.

- Ён – яе айцец. У іх гэта так прынята? – ня верачы сваім вачам, вымавіла яна.

- Хто табе такое сказаў? Яны жанатыя. Крысьціян зьдзіўлена глянуў на яе.

- Яна сама. Ліліян паціснула плячыма.

Крысьціян утаропіў у яе позірк, а потым зразумеў - нібы ўспомніў нешта.

- Не, Ліліян. Я потым табе растлумачу, - ціха вымавіў ён.

- Дзякуй за гасьціннасьць, Міхал, - зьвярнуўся ён да іх.

Міхась нарэшце адарваўся ад Летыцыі, якая крыху адсунулася ў бок, усё яшчэ абдымаючы яго.

- Няма за што, Крысьціян. Прыходзьце да нас часьцей. Мне і ёй будзе весялей. Міхась паціснуў яму руку.

- А праўда, што вы можаце выклікаць дземанаў? – раптам запытала Ліліян.

- Магу. Міхась павярнуўся да яе, і агледзеў зьверху да нізу.

- А можаце правесьці для нас абрад? – Ліліян сьмела глядзела на яго.

- Зараз? – ён глянуў на яе, і шырока ўсьміхнуўся.

А якога дземана шаноўная панна жадае выклікаць?

- Я падумаю, - вымавіла Ліліян. – Прама так я не скажу вам.

- Добра. Калі прыдумаеш, кажы. Я табе выклікаю каго заўгодна. Міхась, улыбаючыся, глядзеў на яе, але ж яго вочы былі сур'ёзнымі, і, яна б сказала, страшнымі. Раптам за яго сьпіной ёй пабачылася высокая, цёмная постаць, якая нібыта накладалася на рэчаіснасьць, з'яўляючыся ёй чужой і варожай, і сапраўды языкі полымя ўзьняліся вакол, і нават падыхнула серай.

- Ён – Д'ябал, - раптам зразумела яна. – Ніякі ён ня Бог. Сатана. Лючыпар. Самы сапраўдны. Такога наступу цемры яна ніколі ня ўяўла, ня бачыла і не адчувала раней.

- Я бачу вас, - нягромка вымавіла яна, гледзячы яму ў вочы. Ён пакачаў галавой.

- Не, дзяўчынка мая. Ты толькі думаеш, што мяне бачыш. Бо той, хто бачыў мяне, памёр для сьвету. Жывым мяне бачыць не магчыма. Ён вымавіў гэта бяз словаў, але ж яна зразумела яго.

- Яна вас бачыць, - ціха вымавіла яна ў думках. І тут жа прыляцеў адказ.

- Яна мяне ведае. І яна … тут яе вушы нібыта ўзарваліся, быццам бы па ім моцна хлопнулі, ці пачуўся нейкі громкі гук, альбо выбух.

На яе вачах твар Летыцыі пачаў мяняцца, набываючы такія жудасныя, тагасьветныя рысы, што ў яе закружылася галава. Яна была незвычайна прыгожай, і ў той жа час такой палохаючай, што ніколі Ліліян не магла і ўявіць такой істоты. Гэты твар пакрываўся плямамі разлажэньня, і ў той жа час рассыпаўся і складаўся нанова ў нешта такое, што нагадвала і бажаство, і анёла, і дземана, і тое, што наогул чалавечая сьвядомасьць не магла ўмесьціць. Раптам на яе вачах цела Летыцыі пачало пакрывацца мноствам шнараў, сачыўшыхся крывёю, сэрца і вантробы раскрыліся, а твар пабялеў, толькі вусны засталіся чырвонымі. Яна працягнула да яе руку, і Ліліян папяцілася. У руцэ Летыцыя трымала чорную стальную ружу, моцна сьцісквачы шыпы, зь якіх на падлогу перад тварам Ліліян хутка закапала кроў. Міхась правёў рукой, і відзеньне сышло. Летыцыя набыла свой ранейшы прыгожы, пяшчотны воблік, і быццам бы пахіснулася, і прытулілася да яго. Ён пяшчотна падхапіў яе рукамі.

- Мне блага, каханы, - ціха прашаптала яна.

- Ведаю, сонейка. Хутка мы пойдзем адпачыць. Прабачце, Ліліян. Крысьціян, - ён кіўнуў.

- Так, да пабачэньня, Міхал. Летыцыя. Ліліян, пайшлі. Крысьціян цьвёрда ўзяў яе за руку.

Глава 29: Разам

Яго вусны прыціскаюцца да яе вуснаў, і яна задыхаецца ад жарсьці, ахопліваючай яе, як полымя. Ён пяшчотна кранае яе губы сваімі, убіраючы верхнюю, а потым ніжнюю, і ізноў закрываючы іх. Яна адчувае смак яго языка і губ, ён гладзіць яе ліцо рукамі, пакрываючы яго пацалункамі. Яна гладзіць яго шчокі, яго валасы, прыціскаючы яго да сябе. Ён нагадвае вялікага зьвяра, цяжкі, магутны, яго рукі крэпка сьціскаваюць яе, гуляючы буграмі цяглаў. Ён горача шэпча ёй словы каханьня, пяшчоты і жарсьці, і, ласкавыя, яны мяшаюцца з брудныміі блюзьнерскімі.

Яна ўздрыгвае і стогне, пакуль яго вусны лашчаць яе саскі, яго вусы і барада колюць яе мяккую скуру, рукі прыціскаюць яе ўлоньне да яго твару.

- Хочаш мяне? Хочаш мяне, каханая? Красуня мая? Золатка маё, прыгажуня мая… анёлак мой. Я – цёмны, і ты – такая ж. Я – цемра, і я так хачу твайго сьвятла. Ува мне – усё, і я дам табе ўсё, толькі асьвяці мяне, мая Шхіна, дух мой сьвяты, сыйдзі да мяне, апусьціся нізка, і ўзьніміся разам са мною. Я – верх і ніз, нябёсы і бездань, цёмны лес і верхавіны гораў, і ты – трапяткая лань у маіх нетрах, і галубка, лунаючая ў маёй вышіні. Я – той, чый подых хавае гушчар, і той, хто выходзіць з бездані, і паражае маланкай. Я – Аід і Зеўс, і Д’ябал і Бог, і Жыцьцё і Смерць, і дзень, і чорная цень ночы. Я кахаю цябе, і закалыхваю цябе на сваіх грудзях, і я ўваходжу ў цябе ўладна, запаўняючы і зьвяргаючы ў бездань. Падай разам са мною, падай да мяне, і я падхаплю цябе. Апусьціся на маіх руках, і ўбач, што глыбіня – гэта вышыня, недасяжная нікому са сьмяротных.

Ён узьнімаецца над ёй, і яго цень накрывае яе, і вочы яе засьцілае цемра. Праз цемру яна бачыць яго – яго плечы, грудзі, чорную грыву валасоў, чэлес, такі вялікі, што яна закрывае вочы. Зараз ён войдзе ў яе, запоўніць яе сабой.

- Вядзьмарка, вядзьмарачка мая. Чараўніца, - шэпчуць яго губы.

Ты – адзіная такая, хто можа задаволіць мяне, і толькі табой насычаецца мая душа. Яна адкідваецца на падушкі, і ён нахінаецца над ёй нізка-нізка. Яго плоць дакранаецца да яе, націскавае, і яна ўскрыквае, бо яго чэлес апальвае яе знутры, як распалены мятал. Ён рычыць і гвалціць яе, задыхаючыся ад пяшчоты, і яна стогне, быццам бы ён яе забівае, бо насамрэч так яно і ёсьць.

Яна бачыць яго – ён вялікі, цёмны. Вакол цёмна, і дым, і смурод ад паходняў, пах смажаніны і віна, і далёкія галасы. Яна падыходзіць да яго, і ён здымае зь яе тонкі покрыў, агаляючы. Гладзіць яе чорныя густыя валасы, кранае пальцамі вусны. Яго пальцы паблісквaюць ад лою, і ад яго пахне віном. Яго грудзі шырокія, моцныя, пакрытыя чорным воласам.

Яна стаіць перад ім, і яго пальцы кранаюць яе грудзі, маленькія саскі, мяккі жывот, апускаюцца ніжэй і асьцярожна ўваходзяць у яе – пяшчотныя. Але ж ёй балюча, і яна ўскрыквае. Ён усьміхаецца.

- Цнатлівая, - кажуць яго чырвоныя вусны, цёмныя ад віна і крыві. Ён прынікае да яе шыйкі, і яна ўздрыгвае, пакуль яго губы ўбіраюць яе скуру.

Яго рука паглыбляецца далей, і яна стогне.

- Ня бойся, - ціха кажа ён. – Зараз станеш жанчынай. Гэта ня страшна. Ён вызваляе сваю плоць, і кладзе яе руку на яе. Яна цьвёрдая і вялікая. Яго грудзі ўзьнімаюцца, і ён прыціскае да сябе яе галаву, адкідваючы твар.

- Пацалуй мяне там, - ціха шэпчуць яго вусны, і яна апускаецца, і кранае вуснамі яго плоць, адчуваючы шчакой яго вялікую руку. Ён стогне і ўзьнімае яе. Кладзе на стол, пакрыты чырваньню віна, і высока зьгібае яе сьцёгны. Ён кладзе чэлес ёй на жывот, і рухаецца, сьлізгаючы па яе скуры, закрыўшы вочы. Яна бачыць яго галоўку, уздрыгваючую плоць.

- Ня тут, - хрыпла кажа ён. Бярэ яе на рукі, і нясе кудысьці, праз лябірынты цемры яны ўваходзяць у пакой. Ён кладзе яе на ложак, і губляе розум, як драпежны зьвер насалоджваючыся яе

целам. Яна ўскрыквае і плача, але ж яе тут ніхто ня чуе, і яе крыкі губляюцца пад стольлю, адбіваюцца ад яе, і падаюць мёртвымі птушкамі ўніз, засьцілаючы сабой падлогу.

Нарэшце ён бярэ яе – груба, моцна, спачатку ўціскаючы ў яе свой чэлес, а потым націскаючы і рухаючыся ўсё мацней і хутчэй. Ёй здаецца, што яе ірве на часьці вялікая жывёла, леў ці тыгр, ці бык, які працінае яе сваім рогам. Зь яе ліецца кроў, і боль ад яго блізкасьці страшэнны, але ж ён такі прыгожы, і моцны, і няўтаймавальны, што яе сэрца выскаквае з грудзей, і ірвецца яму насустрач. Ён рычыць, уціскаючы яе ў ложак сьцёгнамі, і яго муды біюцца аб яе ягадзіцы, ён узьнімае іх, выходзіць, і ўваходзіць туды, ніжэй, працінаючы яе зад акрываўленым чэлесам. Нарэшце ён стогне, і працінае яе апошнім ударам, апускаючыся побач. Яна ляжыць, ледзь жывая, і ён кладзе галаву ёй на грудзі, і бярэ вуснамі яе сасок, пяшчотна яго сьціскаючы. Яна гладзіць яго валасы, і ён засынае, як дзіця, з яе саском у вуснах. Яна ляжыць, і ўглядваецца ў цемру, гладзіць яго валасы, плечы, адчуваючы на сваіх грудзях яго твар, яго вусны і яго подых. Яго рукі ахопліваюць яе, і цемры болей няма. Цяпер яна здаецца ёй сьвятлом. Яна наяўна бачыць праз яе – яго і сябе. Яны лунаюць у бясконцасьці. Яе сэрца біецца мерна і ціха, і яе ахоплівае пяшчота, і вялікая радасьць – ад зьліцьця зь ім, ад яго блізкасьці, ад асалоды болю і жарсьці, якая пераўтвараецца ў нешта высокае, такое, што зносіць далёка іх абодзьвух.

- Яна – вар'ятка! Зусім, а не крышчаку. Яна жа поўнасьцю з'ехала з глузду. Згубіла розум. Крысьціян, як ты можаш мець зь імі справу? Гэтая дзяўчына – яна ахвяра, і гэты чалавек карыстаецца яе бяздапаможным станам. Можа, і ты карыстаешся?

Ліліян зь нянавісьцю глядзела на яго, сьціснуўшы вусны, склаўшы на грудзях рукі.

- Паслухай, усё, што зьвязана з магіяй – гэта рацыя. Розум. Воля. І толькі гэта. Гэта ўсё ужо растлумачыла навука. Ты проста прылагаеш сваю волю да сьферы верагодных магчымасьцяў, і паварочваеш яе патрэбным для цябе бокам.

Можна сказаць, што перамяшчаешся ў сусьвет, які табе патрэбны. І няма ні Бога, ні Д'ябла. А дземаны – гэта наш унутраны сьвет, тое, што хаваецца ў нас саміх. І, выклікаючы іх, мы проста зазіраем сабе ў душу. Вучымся выкарыстоўваць волю, якая – адзіны інструмент, з дапамогай якога ўсё немагчымае магчыма. Ты ж чытаў Алісьцера Кроўлі.

- Чытаў, Ліліян. І гэта – поўная лухта. Дземаны ёсьць, і яны такія ж рэальныя істоты, як і мы з табой. А воля чалавеку патрэбна толькі для аднаго – каб ад яе адрачыся. Чалавеку патрэбны той, хто павядзе яго. Бог, Ліліян. Ці – Д'ябал, бо гэта адное і тое ж. А не Сатана Лавэя, які проста тэатральны маскарад для багатых дурняў. Чараўніцтва, а не магія, Ліліян – чорнае, бо сьветлым яно не бывае, гэта дужа сур'ёзна. Гэта – сьмяротная атрута, якая забівае цела, і вызваляе зь яго душу, ставячы яе аголенай перад такімі сіламі, што душа падае на калені ў жаху. І тады душа моліцца да Бога, і той прыходзіць да яе – чорны, як ноч. Мой Бог – гэта Д'ябал, Ліліян. І ён – Бог адзіны. Добры Бог сусьвету – ня мой Бог. Ён і сапраўдны не існуе. Гэта – міф, міраж. Спакуса. Насамрэч, існуе толькі Ён – адзіны, і ён і цемра і сьвятло, і пазбаўлены ўсякага граху, бо грэх і ён ня могуць існаваць побач. Грэх – няведаньне, ён жа – суцэльныя веды. І ён цяпер тут, з намі. Побач са мной і ёй, як і быў ад пачатку сатварэньня. Яна – Ева, і яна бачыць яго, і ведае яго. Яна сьпіць зь ім, і яна – жанчына, адзіная сапраўдная, створаная Богам для сябе. Ева, Ліліт – гэта Жыцьцё, і рэбра, якое прагне вярнуцца ў Бога. Яна прагне прытуліцца да моцнага мужчынскага цела. Да моцнага духа, які яна запальвае язычком полымя сваёй жарсьці, і тады ён узрываецца Ўніверсусамам. Зеўс прагне пяшчотнага жаночага цела, німфаў і багінь, і зямных прыгажунь, але ж толькі Шхіна можа насалодзіць Бога. Усе міфы кажуць пра адно – жанчыну адвечную, у якую ўваходзіць вогнены стоўп – йод, чэлес, які стварае сусьветы.

Жанчына павінна скарацца, павінна прымаць. Толькі тады яна атрымае асалоду сапраўдную, нябёсную, тагасьветную, тую, што Бог падарыў ёй ад яе сатварэньня.

Ён замаўчаў.

- Такім чынам, ты трахаў яе. Трахаў разам зь ім? Ліліян з

пагардай прышчурылася.

- Ну і як яна табе?

- Яна? Як Ева. Як віно, ці наркотык, якога будзеш прагнуць усё жыцьцё. І я болей не належу сабе. Я належу ёй, і яму. Я – іх воін і слуга. Слуга Божы. Калі ён, ці яна, загадаюць мне ахрысьціцца, я ахрышчуся. Скажуць маліцца і біць сябе плецьцю – буду катаваць сябе. І дзеля яе цела і душы я адракуся ад сябе цалкам. Аддам сябе Богу, толькі б ён даў мне насалоджвацца ёй. Я нічога ад яе не запатрабую, толькі буду кахаць яе, і клапаціцца аб ёй. Але ж яна належыць яму, і таму я стану манахам. Я буду ачышчаць сваю душу, і маліць Бога, каб мне стаць годным такой жанчыны. І ён пашле мне яе. А калі ня ў гэтым жыцьці, то не істотна. Я буду ведаць, што яна сустрэне мяне і пасьля сьмерці. Ён адкінуў з ілбу чорныя зблытаныя валасы. Яго вочы палалі сінім, незнаёмым Ліліян агнём.

- Ты хочаш сказаць, што ўсё, чым я займаюся, лухта? І што я, па-твойму, не жанчына? – запытала яна яго.

- Лухта, Ліліян. А ў датычаньні жанчыны, ты ж сама сказала – ты дземан. Ліліт. Таму якія могуць быць размовы на гэты конт?

- Я і сапраўды Ліліт, а ты – раб. Ліліян з пагардай сплюнула. – Служы, каму хочаш. Я знайшла сабе больш зручную кампанію. Там ёсьць і сапраўдныя веды, і моц, і воля. Мы перавернем гэты сьвет, вось убачыш. Ты яшчэ аба мне пачуеш.

- Татачка, любы мой, каханы, я так кахаю цябе – ціха шэпча яна праз сьлёзы і боль, адчуваючы нешта там, нешта, што болі болей не належыць, бо яна прайшла яе мяжу. Гэта – яно, каханьне сапраўднае, разумее яна – калі ў яе ўваходзіць яго цела, і яна прымае яго, аддаючыся, ахвяруючы яму сябе, каб ён мог зрабіць зь ёй тое, што ён зараз робіць. Каб мог вызваліцца, і тым самым вызваліць яе. Яго плоць рассоўвае яе, рухаючыся, сьцёгны апускаюцца і ўзьнімаюцца. Ён болей ня кажа ёй словаў каханьня, ён пераўтварыўся ў некага, каго яна болей ня ведае, як і яна пераўтварылася ў нешта, што цяпер з'яўляецца яго часткай, адзіным, аднасутнасным яму. Іх дуэт – яго асалоды і яе болі, яго жарсьці і яе ахвяры закручвае прастору ў нейкую шалёную віхуру, якая адрывае іх ад зямлі. Яна стогне, громка, так, быццам бы яе забіваюць. Яе тонкае цела выгінаецца ў яго руках. Яе ўлоньне скарочваецца, адчувае ён – яе б'юць сутаргі. Асалода накрывае і яе, і яго. Яна болей не дзіця – жанчына, жанчына прагная і ўладная, зводзячая яго з розуму, якой хочацца аддаць усё – і жылы свае, і кроў, і ўсё жыцьцё бяз рэштку. Усё, усё на сьвеце дзеля яе. Дзеля гэтай яго і яе асалоды, дзеля гэтай цемры, за якой яны абодзьва зараз сустрэлі Бога, і зьліліся ў ім. Цяпер забраць яе ў яго не магчыма, і спыніць яго немагчыма. Той, хто паспрабаваў яе – вар'ят. Ева. Сафія. Боская сутнасьць, адзінародная яму. Ён цяпер поўны – поўны ёю. Ён выліваецца ў яе, і апускаецца, абдымаючы. Яна ўздрыгвае ў яго руках. Жанчына. Шхіна. Яго каханая. Яго любае дзіця.

Ён адкрывае вочы, і яна нібыта вызваляецца зь нябыту. Машына нарэшце спыняецца. Яна выходзіць зь духмянай цемры аўто, і ўзьнімаецца на ганак шпіталю, прыціскаючы да грудзей вялікі партфель з бліскучай кракадзілавай скуры. Яе крокі аддаюцца ў яго скронях, як пульсацыя яго ўласнай крыві. Ён адчувае, як яна набліжаецца. Хутка яна ўвойдзе ў пакой –ў яго нострах ужо лунае яе духмяны пах.

- Татачка. Тата, любы мой, родны. Я хачу жыць з табой, толькі с табой. Пераехаць да цябе. Зь яе вачэй бягуць слёзы. Ён абдымае

яе, і прытуляе да грудзей.

- Сонейка маё, як доўга я цябе чакаў. Любая мая дачушка. Жыцьцё маё. Ён прыціскае яе, яго рукі гладзяць яе сьпіну, нахінаецца да яе, кранае яе шчаку вуснамі.

- Каханая, - чуе яна яго ціхі голас, ледзь чутны, словы, якія толькі вымаўляюць губы, і ў іх зусім няма голасу. Яны кранаюць яе, як пацалунак – мяккі, пяшчотны. Шчакой яна адчувае яго бараду, сваім подыхам ловіць яго подых. Яна глядзіць у яго вочы, а ён – у яе. Яго вочы – карые зь зялёным, як лясны покрыў, працінуты сонцам. Яе вочы – вялікія, як шэрыя вазёры, задуменные восеньскія нябёсы.

- Летыцыя. Каханая мая. Дачушка мая. Мая адзіная, венчаная са мной перад Богам. Яго вочы распавядаюць ёй гісторыі, вусны ўсьміхаюцца. Яна ўздрыгвае ў яго руках.

- Я хачу назаўсёды застацца с табой. Заўсёды быць с табой разам. Мне ніхто болей не патрэбны. Яе сьветлы тварык узьнімаецца, і пазірае на яго. Яна такая прыгожая, што яго вачам балюча. – Толькі ты, ты адзіны. Я кахаю цябе, - ціха кажа яна, і ён нахіляецца да яе вуснаў.

- Я ведаў, што ты прыйдзеш да мяне. Верыў. Я маліўся – Яму.

- І я малілася, любы.

Ён сьцісквае яе рукамі. Яна ахоплівае яго за шыю, і ён нахіляецца да яе вуснаў. Гэта ня Алекс – куды там. Яго пацалунак – гарачы, глыбокі, прагны, такі, што ў яе заходзіцца сэрца. Ён ізноў мяняе рэальнасьць – усё мяняе, уладна, бязьлітасна. Так, як можа толькі ён. Ён забірае яе – выратоўвае яе ад усіх.

Яны сядзяць на кухні, і яна п’е гарбату – з малаком і мёдам. На вуліцы халодна, і яна прадрогла. Яна проста распавядае яму – усё. Ён глядзіць на яе, і яго вочы становяцца цёмнымі, амаль чорнымі. Яна ня ведае, але ж ён зазірае ёй у душу, і яе душа кажа яму значна больш, чым могуць сказаць словы. У яе душы ён бачыць бездані, і страшны гвалт, які зрабілі зь ёю. Яна не

разумее ўсю ступень таго блюзьнерства, той жорсткасьці, зь якой апаганьванілі яе душу і цела. Яна проста распавядае, не шкадуючы яго пачуцьцяў. Але ж за словамі ён бачыць тое, сапраўднае, што ня могуць сапраўды бачыць вочы. Цяжкая, чорная нянавісьць падымаецца з глыбінь яго душы. Так нараджаецца той, другі Ён – Д'ябал, і гэта адзінае, чым ён можа адказаць сусьвету. Яна сыйшла ў яго, і была там, і пакутвала. І цяпер – вось, зьвярнулася. Вярнулася да яго.

- Яны гвалцілі мяне. Распраналі. Яны рабілі са мной усё гэта. Яе голас ціхі, нейкі тусклы, як маленькі званочак, гук якога губляецца ў завеі. І тады ты прыслухоўваешься, каб пачуць яго ізноў, каб працягнуць туды, у холад і сьмерць, цёплую чалавечую руку.

- Я заўсёды памятавала цябе, - ціха кажа яна.

- Я ведаю, каханая. Проста час яшчэ не прыйшоў, каб ты прыйшла да мяне. Бо ж цябе трэба было падрасьці. Ён ківае. – А цяпер ты – тут, са мною. І я нікуды не адпушчу цябе. Хадзі да мяне, - ціха кажа ён. Яна падыходзіць, і ён абдымае яе, садзіць сабе на калені. Яго вусны сустракаюцца зь яе вуснамі, рука накрывае грудзі. Яна такая маленькая, такая пяшчотная – як птушачка, - ціха шэпча ён. – Птушаня маё. Ён гаворыць зь ёй так, як толькі ён можа, на мове, якая ліецца зь яго вуснаў, як крынічная вада ў сьпякоту. Яна закалыхвае яе, як лясны сьпеў, і качае, як бурныя хвалі глыбокага возера. Яго грудзі шырокія, а рукі – магутныя, цьвёрдыя, як камень, як скалы, якія пакінуў леднік, адступаючы на поўнач.

- Хачу цябе, - ціха кажа ён. – Я чакаў столькі год, каханая. Ён узьнімае яе на руках, і нясе на ложак. Пакрывае пацалункамі яе цела. Яна даверліва прыціскаецца да яго, абдымаючы.

- Каханы, - ціха шэпча яна. – Мой каханы. Адзіны мой у цэлым сьвеце.

Раніцой пачынаюцца званкі. Спачатку – ён, гэты Алекс. Дзе яна? Што яна тут робіць?

- Алекс, я ня буду жыць з табой. Я буду жыць са сваім айцом.

Прабач, але ж нашыя адносіны скончаны. Зь ім яна размаўляе цьвёрда, суха. Потым званіць яе маці, і яе голас раптам зрываецца на сьлёзы.

- Я буду жыць з татай. З сапраўдным. Ён мяне заўсёды любіў. Ён мяне ня кінуў. Адкуль я ведаю? Адтуль. У мяне яго адрас – быў заўсёды. Ён даў. Ён прыходзіў да мяне. Гэта ты яму забараняла. Мама, я кахаю яго. Я буду жыць зь ім. Усё. Мне ужо васемнаццаць год. Хутка дзевятнаццаць. Ніхто ня можа вырашаць за мяне. Я ведаю, што я шлёндра.

- Дай мне трубку, - нягромка кажа ён. На яго скулах ходзяць жаўлакі.

- Усё, што вы толькі што казалі ёй, вы можаеце сказаць мне.

- Ведаеце, мяне гэта не цікавіць. Яна так вырашыла, я прымаю за яе поўную адказнасьць. Нічога страшнага. Знаеце, у гэтым сьвеце – шмат вар'ятаў. Можна сказаць, што і ўсе. І хворых шмат. Толькі здаровых – мала. І яна – адна зь іх. Катаржына, так вас клічуць? Я прашу вас зазірнуць у яе пасьведчаньне аб народжаньні. Хто там запісаны айцом? Нейкі Юзаф Марковіч? Ну і што вы мне хочаце сказаць? Праўду? Праўду мы з вамі ведаем. І яна, гэтая праўда, у кожнага застанецца сваёй.

Калісьці ты забрала яе ў мяне, а цяпер – я забіраю яе ў цябе. Толькі я літасьцівы, не такі, як ты. Ты ж ведаеш, дзе яна, і зь кім. Можаш яе бачыць. Нават у госьці прыходзіць. Тешча. Калі будзеш званіць ёй і хваляваць, ты ведаеш, хто я, і што я магу зрабіць. Калі толькі даведаюся, не дай Божа, што ты нешта такое ёй кажаш, ад чаго ёй можа стаць горш, ты яе болей ніколі не пачуеш.

Бывай, Катаржына.

Памылка юнацтва. Ён усьміхаецца. Проста ён абраў гэтую жанчыну, каб яна стала сасудам. Носьбітам яго волі. Каб яна прыйшла праз яе ў гэты сьвет. Гэтае дзіця ня мае зямных бацькоў. Ён – адзіны яе айцец. Яна была зачатая толькі ім, і зямной крові ў ёй наогул няма. Таму яна тут так і пакутуе.

Нарэшце, крокі прагучэлі зусім блізка. Яе пах стаў проста чароўным, ап'яняючым, абвалакваючым. Дзьверы расчыніліся, і яна ўвайшла ў пакой, прытрымліваючы вялікі чорны партфель з паперамі. Ён ужо сядзеў на ложку. Калі б не правадкі, дык і ўстаў бы, але ж – нельга. Трэба падпарадкоўвацца парадку.

Яна ўбачыла яго, і радасна ўсьміхнулася. І ў той жа час – гаротна, жаласна.

Падышла да яго, паставіла партфель на стул, нахінулася і пацалавала. Яе рукі пяшчотна кранулі яго, ахапілі за плечы. Ён асьцярожна абняў яе.

- Ну як ты, красуня мая? Прабач, што абудзіў цябе з ранку.

- Нічога, каханы, - вымавіла яна. – Шмат спаць – блага. Я прывезла ўсё, як ты папрасіў. Яна раскрыла партфель, і дастала вялікі запячатаны канверт.

- Як ты сябе адчуваеш? Яе позірк нагадваў дзьве журботныя вялікія зоркі, якія міргателі на зацягнутым хмарамі небе.

- Добра, сонейка маё. Ужо вось – бачыш, сяджу. А хутка ўстану, і дамоў прыйду. Ды я і так хаджу, - пажартаваў ён. – Толькі цяпер – у снах.

- Я адчуваю цябе, калі ты прыходзіш. Яна прыціснулася да яго рукі ілбом. Ён гладзіў яе валасы.

- Што будзеш рабіць, каханая? Раскажы мне.

- Прыеду – буду спаць, - шчыра прызналася яна. – Але ж спачатку да Ганны трэба заехаць. Нешта там ёй патрэбнае, нейкія лекі. Сьпіна баліць. Куплю ёй мазь.

- Чары не памагаюць. Ён усьміхнуўся.

- Ну якія там чары. Гэта ж свая сьпіна – уласная. Яна ўсьміхнулася таксама.

- А заўтра мы дамовіліся з Крысьціянам – ён на нейкую выставу мяне прапанаваў завесьці. Сучаснае мастацтва.

- Ну вось і раскажаш мне, чым цяпер тыя мастакі дыхаюць. Я ж – не сучасны. Ты ж ведаеш.

- Ведаю, любы. Як я сумую безь цябе! – яна прыціснула яго руку да сэрца, накрыла яе сваёй.

- Родная мая, а як я сумую. Як я хачу засынаць і прачынацца з табой побач. Ён узьняў яе кісьць, і паднёс да вуснаў. Яе рука смачна пахла – ружай, на ёй паблісквалі залацінкі.

- Кветачка мая, - ціха вымавіў ён. – Каханая. У палату заглянуў твар у масцы і шапачцы.

- Прашу калі ласка завяршыць наведваньне. Хер Михал, у вас – працэдуры. І праз пяць хвілін – абыход.

- Добра, каханы. Я паехала. Мне яшчэ ў аптэку. Яна пацалавала яго. – Звані, калі ласка. Бо ж я баюся турбаваць цябе.

- Добра, золатка. Ты адпачывай, не напружвайся ты дужа з гэтай гаспадаркай, і з Ганнай. Ён пацалаваў яе. Яна абняла яго, і сышла з палаты. На парозе як раз сустрэла доктара.

- Як ён, хер прафесар? Скажыце, калі ласка. Мне трэба ведаць праўду, - ціха вымавіла яна.

Чалавек у павязцы на твары паглядзеў на яе – позіркам, які ня раз сьлізгаў раўнадушна па такіх тварах – заплаканых, усхваляваных. Але ж цяпер яго позірк крыху зьмягчыўся. Перад ім стаяла прыгожая, як мадэль, дзяўчына, з чорнымі валасамі, зь белай скурай, але ж відавочна ўсходняй зьнешнасьці. Басьнійка ці турчанка, як і гэты мужчына. Южная Еўропа, ці нават далей. Для пакістанкі ці сірыйкі надта сьветлая скура. Панаехала іх тут. Але ж гэтая жанчына чамусьці выклікала ў яго пачуцьцё жалю – тонкая, слабая, заплаканыя вочы. Яму раптам стала яе шкада. Па адзеньню было бачна, што дзяўчына ня бедная, але ўсё ж, было зразумела, што яна суцэльна і поўнасьцю залежыць ад гэтага мужчыны. І згубіць яго для яе – як згубіць усё, увесь сусьвет.

- Ведаеце, спадарыня, праўду з нас ня ведае ніхто – яе ведае

толькі Бог, - ціха вымавіў ён. – Як доктар, я магу ўпэўніць вас, што аперацыя прайшла добра, і пацыент ідзе на папраўку. Але ж яму патрэбны час – так, як і ўсем нам ён патрэбны. Ён пагладзіў яе рукой па плячы – міжволі атрымалася. Яна яго руку быццам бы і не заўважыла. Кіўнула.

- Добра. Я разумею. Я буду за яго маліцца, - ціха вымавіла яна. Разьвярнулася, і сышла па калідоры, ён жа колькісь імгненьняў стаяў, і глядзеў ёй усьлед, а потым пацягнуў ручку, і зайшоў у палату.

Глава 43: Замак

Яна рухалася з пакою ў пакой, праходзіла з пласту на пласт рэальнасьці. Праходзячы, бачыла людзей – яны сядзелі, апусьціўшы твары ў калені, ахапіўшы рукамі галовы, закрыўшы далонямі вушы. Яна ж імкнулася міма іх, туды, дзе было Сьвятло. Яна бачыла яго твар, і цягнулася да яго, ці, дакладней, гэта ён моцна цягнуў яе, так, што яна не магла ўтрымацца, і ня рухацца наперад.

- Чаму яны ўсе ня бачаць яго? Чаму павярнуліся сьпінамі, закрылі твары? Яна не магла зразумець. Бо ж яны ўсе шукалі яго. Шукалі яго ў сабе, але ж знайсьці не маглі. Чаму б не павярнуцца тварам да Сьвятла, і адкрыць яму вочы? Чаму вы ня глядзіце ў Сьвятло? – запытала яна аднаго зь людзей. Той адарваў рукі ад вушэй, і з жахам узьняў на яе твар.

- Дзе ты бачыш сьвятло, ведзьма? – пачула яна яго голас, сухі, рыпучы. – Там, куды ты імкнешся, куды паказваеш – цемра! Той, хто ўбачыць яе, навечна страціць зрок, і будзе праклятый. Таму мы закрываем вочы свае, каб ня бачыць, і вушы, каб ня чуць яе. Яна спакушае нас. Ці ты ня чуеш? Гэтая цемра – сьмерць! Ён зь нянавісьцю глядзеў на яе, і яна ўбачыла на яго вачах – бельмы. Са страхам і агідай яна адступіла прэч.

- Там – Сьвятло, - ціха вымавіла яна. – Там – Ён адзіны. Цемрашальства і нявер'е выпалілі вам вочы, і закрылі вушы, і вы не жадаеце ні бачыць, ні чуць Яго. Але ж мне няма калі стаяць тут, з вамі, бо ён чакае мяне, каханы мой, вочы каго я бачу, і вусны каго клічуць мяне да сябе.

З гэтымі словамі яна руханулася далей, чуючы за сьпіной ціхі, злосны шэпт, і праклёны. Але ж яны не маглі дасягнуць яе, бо там, дзе яна была, іх не магло быць. Усё хутчэй і хутчэй яна рухалася, усё больш прагна імкнулася, і вось, нарэшце яго твар апынуўся так блізка, што здаецца, адлегласьці між імі не было. І тады яна працягнула да яго рукі, і адчула, як ён ахапіў яе, проста падаючы ў яго абдымкі. Ён моцна прыціскаў яе да сябе, і

яна сьмяялася і плакала.

- Я прайшла, прайшла да цябе! – ціха вымавіла яна. – Я знайшла цябе, каханы. Сусьвет болей мяне не трымае.

- Любая, я нікуды ад цябе не сыходзіў, - вымавіў ён, прыціскаючыся да яе вуснаў вуснамі. – Я быў з табой ад нараджэньня, і чакаў, калі ты ўбачыш мяне. Я ж заўсёды стаяў побач. Яго рукі, моцныя, ахапілі яе цела, і ёй стала лёгка і радасна, так радасна, што яна заплакала ад шчасьця.

Яна прачнулася ад свайго ўласнага плачу. Вакол стаяла цемра, але ж цяпер яна была для яе сьвятлом, бо ў гэтай цемры быў ён.

Яна адчувала яго, яго цяпло, яго дыханьне побач. Праз сон яна прыціснулася да яго, утульна схаваўшыся ў коле яго рук.

- Каханая, я тут, - ціха вымавіў ён. – Я нікуды не сыходзіў. Як я магу пакінуць цябе.

- Я ведаю, каханы, - адказала яна. Сон ужо амаль заплюшчыў ёй вочы. – Але ж ты быў там, у шпіталі. Яна прытулілася да яго шчыльней.

- Я там і ёсьць, каханая. Ды вось, прыйшоў да цябе. Ён мякка пацалаваў яе. – Пачуў, як ты плачаш у сьне, і ня мог не прыйсьці. Пацярпі яшчэ крышачку, любая. Я хутка папраўлюся. Хутка я буду дома. Толькі некалькі тыдняў. Ты ж моцная, дзяўчынка мая? Так? Ты мая гераіня, мая пераможца. Ты ўсё здолееш вытрымаць. Патрывай, яшчэ самую крышачку. Так трэба. Не сумуй, і ня плач. Проста ведай, што я – побач. Яна прыхілілася галавой да яго шырокіх грудзей. Паступова яе накрываў ціхі, мірны сон.

- Раскажы мне пра старую хаціну, - прашаптала яна, засынаючы.

- Жыў-быў адзін гаротны стары чараўнік, - нягромка вымавіў ён, - які адчайна шукаў каханьня. Ён згубіў сваю каханую недзе на прасторах бясконцых жыцьцяў, і адзінае, аб чым марыў, адшукаць яе ізноў, і прыціснуць да грудзей. І так здарылася, што, калі ён зусім адчаяўся, яна знайшла яго сама. І з гэтага

моманту яны ніколі не раз'ядноўваліся. Заўсёды былі разам.

Ён ляжаў у палаце, і моўчкі глядзеў у цемру. Яе цела ўсё яшчэ было ў яго ў руках. Яе галоўка ляжала на яго плячы. У думках ён наведваў яе, абдымаў, цалаваў, і высушваў сьлёзы. Калі-некалі жыцьцё вымушае нас цярпець выпрабаваньні. Але ж насамрэч усе пакуты, якія мы сустракаем на шляху жыцьця – ілюзія. Яны ня могуць пазбавіць нас рэальнасьці, а рэальнасьць у гэтым сьвеце адзіная: Ён. Ён – Бог сапраўдны, які ачышчае і выпраўляе душы, накіроўваючы іх да сьвятла. Хто мог раз'яднаць яго са Шхінай? Хто мог раз'яднаць Шхіну з Богам? Ён усьміхнуўся. Няма такіх сілаў ні ў сусьвеце, ні за яго межамі. Як бы яны не намагаліся, ці то драконы, ці то анёлы, ці то сам Творца, які лічыць сябе адзіным і дасканалым. Адным рухам, адным сваім подыхам ён мог зьнішчыць сусьвет, і вызваліць яе. Але ж сапраўды ў гэтым не было патрэбы. Як можна зьнішчыць тое, што не існуе? І раз'яднаць Адзінае? Пазбавіць жыцьця Існуючае? Ён закрыў вочы, і ўздыхнуў. Яму дыхалася лёгка, і сэрца білася роўна. Вялікі канверт ляжаў на стале побач. Заўтра ён працягне чытаньне. Але ж і тое, аб чым ён даведаўся, вызывала ў яго шмат пытаньняў, на якія ён думаў, як яму адказаць. Бо цяпер на ім ляжала адказнасьць – чалавек запытваў у яго шлях. Аднак куды, і навошта – тут была праблема. Чалавек жадаў прайсьці ў Сітра Ахра, і першую палову рукапіса проста выліваў на яго веды – ці тое, што ён імі лічыў. Насамрэч, ён прайшоў далёка. І сапраўды бачыў тое, што бачыў. Але ж праблема заключалася ў тым, што тое, што ён бачыў – гэтага насамрэч не было.

- Сітра Ахра – гэта пусты пакой. Сьветлы і белы, у якім няма нічога, - падумаў ён. – Толькі вялікае вакно, і дзьверы, якія вядуць унутр. А за вакном – бясконцасьць. Матэрыялізаваць жа ў пакоі можна што, і каго заўгодна. І ў гэтым заключаецца таямніца Сітра Ахра – бо яе насамрэч няма. Гэта – точка сінгулярнасьці, праз якую чалавек саступае ў нябыт, і сустракаеца з Богам. Гэта і ёсьць і Адхлань, і пекла, і падзеньне, глыбокае, як космас – праз увесь створаны сусьвет да Яго. Яна гэта зразумела, і для яе цяпер цемры няма, і дземаны паснулі. Ён жа дарма ўзрушвае пустэчу, выклікаючы зь яе мірыяды

розных формаў. Што іх выклікаць? Іх там безьліч. Можна напоўніць імі некалькі такіх сатвораных сусьветаў, і яшчэ застанецца на бясконцасьць, і плюс адзін у дадатак. Ён усьміхнуўся. Гэта і ёсьць Трон Таўміэль – чысты белы Сьвет, і пустата, напоўненая множаствам непраяўленых магчымасьцяў. Туды прайшоў, і адтуль некалі сыйшоў Фенрыр. Цёмна жа там толькі для тых, хто ня бачыць духоўнымі вачыма. Ці проста абірае Цемру – на свой густ. Як, напрыклад, ён. Але ж апошнім чынам яму было здатней ўяўляць гэты пусты белы пакой, куды ён уваходзіў, і садзіўся перад маленькім і простым прамавугольным алтаром. Запальваў адзіную белую сьвечку, і размаўляў з Богам. У акно ж ён бачыў усё – увесь сусьвет, любую яго частку. Калі ж жадаў, пакой разшыраўся, разсоўваўся, і ён трапляў у бязьмежнасьць – чорныя пусткі магчымасьцей, дзе стаяў яго замак. Дзе быў яго сапраўдны дом, у якім ён цяпер жыў зь ёй. Яму было там камфортна. І зручна прымаць гасьцей. Вось туды ён і запросіць гэтага чалавека. Але ж потым, як вернецца дамоў. Бо тут, у шпіталі, надта шмат нетрывалых душаў, хістаючыхся паміж гэтым і тым сьветам. Яшчэ здуе ў бездань небаракаў. Ён усьміхнуўся, адчуваючы, як яго накрывае сон – ціхі, мірны, такі прыемны, чалавечы. Зь якога там добра прачнуцца раніцай, і ўбачыць яшчэ адзін дзень – новы і радасны, у якім яго чакае каханьне, цішыня і спакой, якія яны нарэшце дазволілі сабе заслужыць.

Глава 44: Сэрца

Яна бачыла яго сэрца, і ад яе да яго цягнуліся патокі цяпла. Яго сэрца пульсавала, калыхалася, лунала, нібыта дзіця ва ўлоньні, у абалонцы з чырвонага сьвятла, якое яна выдыхала подыхам вуснаў.

Гэтае сьвятло было яе ўлоньнем. Яго сэрца знаходзілася ў яе чэраве – спакойна, мірна спала, напітваючыся яе крывёю, і яна між волі паклала руку сабе на жывот, ніжэй, там, дзе пад яе сэрцам білася ягонае. Ён быў яе дзіцём, і яна калыхала яго, ахапіўшы жывот рукамі. І адначасова яго сэрца білася ў ім – напоўненае яго і яе каханьнем, якое віравала ў ім рубінавым полымем.

Перад ёй стаяла вялікая белая сьвечка – гарачы агонь, праз які яна напаўняла яго сэрца жыцьцём.

Яна кахала яго, і гэтае яе каханьне мякка і ўладна агортвала яго сэрца, робячы яго ход роўным і спакойным. Яна бачыла, як на ім загойваюцца рубцы і раны, як яго сэрца наліваецца прыгожай, роўнай чырваньню, як зь яго сыходзяць плямы, месцы якіх запаўняюцца сьвятлом і пачынаюць зьзяць. Яна дакранулася да яго сэрца вуснамі, і адчула прыемную, шаўкавістую цяплыню. Гэты агонь, які мог бы спаліць сусьвет, зусім не апаляў яе – ён яе песьціў, і яе сэрца налілося радасьцю. У думках яна раскрыла грудзі, і тады яе сэрца выйшла зь яе, і ўвайшло ў яго. Яна аддала яму сваё сэрца, новае, маладое, гарачае, і яго сэрца з'ядналася зь яе сэрцам, зазьзяўшы яшчэ мацней. Цяпер іх абодьзва сэрцы біліся роўна, з'яднаныя, і нішто не магло аддзяліць іх адно ад другога.

- Ты не памрёш, каханы, - ціха вымавіла яна. – Бо я не дам табе. Ты будзеш жыць. Бо маё каханьне стане для цябе жыцьцём.

Яна ўбачыла яго грудзі, і дакранулася да іх вуснамі. Доўга і пяшчотна цалавала іх, мякка, пакрываючы вуснамі ўсё яго цела. Яны роўна ўзьнімаліся, і яна запячатвала іх пацалункамі. Чырвоны шнар на яго грудзях, там, над сэрцам, яна цалавала

найбольш пяшчотна, накрыўшы яго грудзі рукамі, адчуваючы, як яго саскі кранаюць яе далоні. Яна нахінулася, і цалавала іх, і скуру вакол, і ізноў – шнар, і ўсяго яго, грудзі, рукі, плечы. А потым апусьціла на цела твар, ахапіўшы яго рукамі, і адчула, як яго далонь накрывае яе.

- Любая мая, каханая, - пачула яна яго ціхі голас. – Золатка маё. Птушаня маё. Анёлачак. Яна адчувала, як зь яе вачэй бягуць сьлёзы, і гэтыя сьлёзы амывалі яго, як вада жыцьця, беглі па яго грудзях, пабліскваліна валасах, нагадваючы дыямантавыя кроплі.

Яны зьзялі і выпараліся, ахутваючы яго дзівосным сьвятлом, калыхаючы яго, узьнімаючы, нібы анёльскія крылы. Яго душа мірна спала ў калысцы, сплеценай зь яе сьлёзаў – танюткіх праменьчыкаў сьвятла. І ў той жа час яго рукі ахіналі яе, гладзячы яе плечы.

Цяпер ён стаяў перад ёй, і яна прытулялася да яго. Ён гладзіў яе па валасах, і яе шчака прыціскалася да яго грудзей.

Яна ўзьняла твар, і ён усьміхнуўся, і накрыў яе вусны сваімі.

- Каханая, любая мая. Дзякуй, што даёш мне жыцьцё, - пачула яна яго голас. Яна прачнулася, лежачы на стале. Сьвяча дагарала перад ёй. Калі яна паснула? Яна ўзьняла твар. Было ўжо далёка апоўначы. Яна ўстала, затушыла агеньчык, а потым – і вялікае сьвятло, пакінуўшы толькі малую лямпу збоч на сьцяне.

Яе ўлоньне пульсавала, і грудзі балелі, быццам бы яна карміла дзіця. Калісьці гэта ўжо было. У яе і яго было дзіця. Яна адчула яго вялікую руку на сваім улоньні, і ўспомніла боль, які раптам сьціх, калі дзіця варухнулася, а потым руханулася, і яе ўлоньне раскрылася, быццам бы брама, ці дзьверы – зь нябыта ў жыцьце. Болі яна не адчувала – яна адчувала радасьць, і яго рука дапамагала ёй і вяла яе – праз пакуты народжаньня - ў сьвятло. Яна бачыла, як ён трымаў гэтае дзіцё на руках – іх сына. Які ў яго быў радасны твар, і як зь яго цяклі сьлёзы. Яна працягнула да яго руку, і ён апусьціўся перад ёй на калені. Яна гладзіла яго валасы, і ён прыціскаўся да яе рукі тварам. Ён быў усё для яе,

зразумела яна. Нічога не было акрамя яго, толькі яна ў ім, і ён – у ёй, схаваны глыбока пад яе сэрцам.

- Не пакінь мяне ніколі, каханы мой, - ціха вымавіла яна, апускаючыся на калені. Яна ахапіла яго ногі, прыціснулася да іх, і заплакала, адчуваючы, як яго рукі ўзьнімаюць яе, як ён прытуляе яе да грудзей, адчувала яго подых і тое, як роўна і спакойна яго сэрца білася. Ён будзе жыць, зразумела яна. Будзе жыць дзеля яе, бо іх справы тут яшчэ ня скончыліся. А потым яны сыйдуць – разам, рука ў руцэ. Пайдуць туды, у месца, аб якім ён казаў, дзе стаіць яго замак – іх адвечны дом.

Глава 45: Мыла

Заўтра яны дамовіліся, што яна прыедзе ў другой палове дню, пасьля абеду. Прайшло ўжо амаль два тыдні, і яго зьбіраліся выпісаць. Трэба было сабраць адзеньне, і прыгатаваць тое-сёе. А яшчэ ёй патэлефанавала сяброўка, і радасна паведаміла, што на днях яны з мужам будуць у Осла – па справах фірмы. Прапанавала сустрэцца, і Летыцыя не магла ёй адмовіць. Дарэчы, яна і сапраўды сумавала па радзіме, і жадала ўбачыць каго-небудзь з блізкіх ці знаёмых, бо ж сама яна іх наведаць не магла – вяртацца было небясьпечна.

- Дорогой, помнишь, я тебе про девочку рассказывала? С которой я дружила в школе? Странную такую? Имя такое, не русское.

Глеб узьняў на яе вочы.

- Ну да, помню. А что? – ён запытальна глядзеў на яе.

- Да так. Знаешь, мне кажется, у неё проблемы. Яна паціснула плячыма.

- В чём я совершенно не сомневаюсь. Глеб з пагардай магнуў галавой. – У таких девиц всегда проблемы. Они – сами себе проблема, Агнесса. Ты же помнишь всё, что с ней случилось. Что про неё говорили.

- Ну да. Агнеса паціснула плячыма.

- Она – шалава какая-то, ей Богу. И что у тебя за подруги, что за интересы такие? Вообще, заканчивай ты с этой … дружбой с непонятно кем. А что с ней, кстати, случилось?

Ён кінуў пытаньне неяк абыякава, быццам бы справа яго наогул не цікавіла. Летыцыю ён бачыў адзін раз, ды і тое – мелькам. Нешта яна перадавала такое Агнесе – нейкія кніжкі, здаецца, падручнікі па ангельскай мове, нейкія рэдкія, якія тая ніяк не

магла набыць.

Высокая, амаль зь яго ростам дзяўчына, худая, як мадэль, з тонкімі белымі рукамі і вузкім нярвовым тварам, здаецца, нафарбаваным, выбеленым, зь ярка чырвонымі вуснамі і падведзенымі вачыма, валасы, доўгія, расчасаныя на прабор, амаль да пояса, апранутая дзяўчына была ў дарагі белы касьцюм, які шчыльна аблягаў яе точаную фігурку. Туфлі на абцасах сантыметраў дзесяць, ня меней, яшчэ дадавалі ёй росту. Яна, усьміхаючыся, глядзела яму прама ў вочы, не адводзячы і не хаваючы позірк.

- Наглая какая-то, - падумаў ён. – Дешевка. Дорогая дешёвка. Гэта вызначэньне яму спадабалася. Нравілася адчуваць, што гэтая дзяўчына ня вартая яго, прынізіць яе ў думках.

- Надо же, даже не учится. И книжки её не интересуют. Ён з пагардай узяў зь яе тонкіх рук вялікі пакет.

- Глеб, тут усё, что Агнеса прасіла – рэдкія выданьні, мне бацька прывозіў з Ізраілю. І яшчэ падручнікі, якія болей не выпускаюць, але ж дужа добрыя. Спадзяюся, што Агнесе яны дапамогуць. Яна ж рыхтуецца ў ВУЗ, я чула.

- Рыхтуецца. В отличие от тебя, - пра сябе дадаў ён. Гэтая дзяўчына яго раздражняла, палохала. І ад яе невыносна пахла нечым рэзкім, духмяным, салодка-горкім.

- Что это за запах? – падумаў ён. І нечакана сам для сябе запытаў:

- Что у вас за духи?

Чамусьці яму хацелася назваць яе на вы, і вось – назваў. Само вырвалася.

- Гэта Том Форд. Чорная архідэя. Дзяўчына мякка, нібыта сарамліва ўсьміхнулася.

- Понятно. Ён кіўнуў.

- Очень резкие. Тяжёлый парфюм.

Ён глядзеў на яе прама, позіркам з-пад ілбу, вочы ў вочы.

- Майму мужчыне падабаецца. Яна ўсьміхнулася ізноў. Павярнулася, і памахала камусьці рукой. Ён убачыў – ля вялікай чорнай машыны стаяў высокі, шыракаплечы чалавек, немалады, усходняй зьнешнасьці, з чорнымі доўгімі валасамі да плечаў. Стаяў, склаўшы на грудзях рукі, і глядзеў на іх. Нешта такое было ў яго позірке, што Глебу не падабалася.

- Бандит какой-то, - адразу вырашыў ён. - У такой только бандит и может быть. Он про неё наслышан, и справки навёл. Потаскуха какая-то. Жила с наркоманом, спала со всеми подряд, по очереди, и сразу. Теперь вот – нашла себе какого-то деда старого, естественное развитие событий. Хорошо, что не бордель. А может, она и там побывала. А если нет, то обязательно побывает. И как нагло глядит на него! Совершенно не стесняется. Его Агнесса не такая – она приличная девушка. А эта, наверное, умеет всё, что хочешь. Такие, говорят, ничего не стесняются. И в рот она точно брала.

Дзяўчына глядзела на яго, усьміхаючыся. Раптам ён адчуў, як у яго пачаў уставаць. Добра, што ў руках быў пакет, якім ён хутка прыкрыўся. Але ж яна, здаецца, бачыла. І ўсьміхалася так зьдзекліва, што яго кінула ў жар.

- Агнесса говорила, вы таро раскладываете, - чамусьці запытаў ён.

- Рэдка. Дзяўчына ўсьміхнулася і пакачала галавой. І размаўляла яна не як усе – манерна, і на “мове”. “Сьвядомая”. Дождутся они проблем со своей мовой, - з’едліва падумаў ён.

- Раней – так, цяпер – нікому, - патлумачыла яна.

- Вы Агнесе раскладывали. Яго голас гучэў так, быццам бы ён жадаў яе абвінаваціць.

- Адзін раз. Яна кіўнула.

- И что, правда, что можно все увидеть по картам? – запытаў ён.

- Праўда. Яна мякка ўсьміхнулася. – Але ж я вам ня раю, -

раптам вымавіла яна, і яе твар стаў строгім. – Ведаць лёс – гэта дужа страшна. І дужа вялікая адказнасьць – казаць яго некаму. Да таго ж, большасьць зь людзей, нават і ведаючы свой лёс, і свае хібы, наогул не зьбіраюцца іх выпраўляць. Яны думаюць, што лёс можна падмануць. Перамагчы. Але ж гэта – ня так. Лёсам кіраваць можа толькі Бог. І калі ён кажа нешта праз карты, трэба прыслухоўвацца. Але ж людзі не паважаюць ні карты, ні Бога. Бо ж таро – гэта боскі інструмент. Чорны. Ён належыць Богу сапраўднаму, які для вас ёсьць Д'ябал. А для мяне – Бог, - ціха вымавіла яна. – Вунь ён. Ён чакае мяне. Прабачце, Глеб, мне трэба ісьці. Дарэчы, у вас моцнае імя, і яно дапамагае вам. Толькі будзьце асьцярожным. Вы яшчэ ня ведаеце сябе. Бойцеся сваіх жаданьняў. І, каб ведаць іх, мне ня трэба таро. І ад мяне ня трэба закрывацца пакетам. Бо ж праўда відавочная, і яна проста лезе знутры вонкі. Да пабачэньня, Глеб. Яна рэзка разьвярнулася, і пайшла на абцасах ад яго прэч, да машыны. Чалавек абняў яе за талію, і адкрыў перад ёй дзьверцу. Чорная бліскучая пашча праглынула яе, машына руханулася, а ён яшчэ стаяў, і глядзеў ёй у сьлед.

Ён доўга думаў, як зрабіць гэта, але ж потым вырашыў, і запытаў прама:

- Агнеса, слушай. Я хочу, чтобы ты … взяла у меня в рот.

Дзяўчына, не разумеючы, узьняла на яго вочы.

- Ну, я думаю, нашу сексуальную жизнь нужно как-то разнообразить. Другие же так делают.

Праз хвіліну ён ужо стаяў звонку пакою, з чырвонай плямай на шчацэ, як нашкодзіўшы шчанюк, якога выкінулі за дзьверы, і слухаў, як за імі, захлінаючыся сьлязамі, Агнеса скардзілася маці.

- Мама! Представляешь! Какой ужас! Глеб сказал, что мне нужно взять у него … в рот! Не знаю, у кого научился. Просто ужас. Что? Яна замаўчала.

- Взять? Правда? Можно? Нужно? Нууу, мама, не знаю…

хорошо. Я поняла. Всё, что муж просит, нужно делать. А то сделают другие. Хорошо. Нет. Он тут. За дверью ждёт. Что? Чтобы помыл? Конечно. Без мыла? А, ну да… мыло же горькое. Поняла, мама. Так, так. Хорошо, я поняла. Не волнуйся. Хорошо.

- Глеб, заходи! – паклікала яна. – Мама мне разрешила. Только вначале вымой. С мылом. И смой его хорошенько.

Глава 46: Дома

Дом стаяў перад ім пачарнеўшы, нібыта пасеўшы пасьля зімы – быццам бы падтаяўшая гурба сьнегу. Вакол густа пахла хвояй, мокрым вецьцем і глебай – прачынаючайся прыродай. Вецер моцна дыхаў на ўсе грудзі – гнаў па небу абрыўкі аблокаў, агаляючы яркі блакіт. Сонца выйшла з-за хмараў, і пацалавала яго твар. Ён прыжмурыў вочы. Неяк востра ён раптам адчуў жыцьцё – у паху, пачуцьці вільгаці, пацалунке сонца і ветру на твары. Пасьля амаль двух тыдняў у шпіталі было асабліва прыемна вярнуцца дамоў, і стаяць тут, пасярод глухога лесу, удыхаючы яго водар, чуючы гукі.

Гукі гораду не даляталі да іх. Затое было чутна мора. Яно плёскалася недзе зь кілямэтар ад іх дому, пад абрывам высокага фьёрду, які падточвала ўжо бясконцасьць год. На краі фьёрду, над морам, стаяла старая царква – дакладней, яе абломкі: сьцены. Столь адсутнічала, але ж пол захаваўся, як і трывалыя муры, у якіх аркі-вокны глядзелі, прыжмурыўшыся, у сінюю бясконцую далечыню. Караблі адплывалі і прыплывалі. Сучасныя караблі, не дракары. Царква ж стаяла, нібыта зраслася са скалой, ці, наадварот, вырасла зь яе. Дзіва, але ж на сьцяне яшчэ захавалася расьпяцьце – стары крыж з чорнага дрэва. А можа, яго прынёс і павесіў сюды нехта. Крыж глядзеў на мора ў шчыліну ў сьцяне, пусты, выгладжаны вятрамі і дажджамі. Чорныя доскі нагадвалі карабельны дуб. Можа, яго прынесьлі нейкія маракі: рэшткі судна, каб ушанаваць затануўшых таварышаў.

Яны знайшлі яе неяк на прагулцы, калі проста пайшлі на шум мора. Выйшлі, і спыніліся ад нечаканай прыгажосьці віду – сонца яркімі залатымі палосамі падсьвятляла хмары, абдымаючы глянцавую бліскучую паверхню стылай вады. І супраціў цямнеючага сьнегавымі хмарамі небу стаяла царква. Яна выглядала тут дзіўнай, чужой. Быццам бы нехта перанёс яе сюды зь Сірыі ці Палесьціны.

- Колькі ж ёй год? – нібыта пра сябе вымавіў ён. І працягнуў:

“Старая”. Болей нічога не сказаў.

Яна прытулілася да яго, ён ахапіў яе рукой.

- Ну вось мы і дома, каханая. Ён пацалаваў яе. Яна ахапіла яго рукамі, і прыціснулася да грудзей, як да магутнага дрэву, саграваючы яго шчакой.

Нарэшце ён вымавіў гэта. Цяпер ён адчуваў – яны і сапраўды былі дома. Шэрае паўночнае мора плёскалася ў далечыні, па небу ляцелі хмары. Тут вольна дыхалася, і можа было шырока расправіць плечы. Італія яму была сапраўды малая, тут жа ён адчуваў гэтую магутную моц, вялікае цела зямлі, якое не абмяжоўвала яго цела, а мора – яно было нібыта працягам яго душы.

- Сумавала па мне? Ён нахінуўся, і крануў вуснамі яе лоб. Яна ўзьняла твар, і ён прыпаў да яе губ, накрыўшы іх сваімі. Яе мяккія вусны нясьмела адказалі яму, прыадчыняючыся. Яна ніколі не вяла ў гэтым танцы – пацалунку, але ж яе рукі шчыльна, хоць і лёгка самкнуліся вакол яго цела. Яе далоні на яго плячах ціхенька гладзілі яго, пакуль ён па чарзе ўбіраў яе вусны сваімі. Нешта было ў гэтым блюзьнерскае, забароннае – цалаваць гэты юны твар, гэтыя мяккія губы, ружовыя, як пялёсткі. Яе пацалункі кветкамі падалі на яго, пяшчотна кранаючы, пакуль ён уладна не закрыў яе вусны, рассоўваючы іх, глыбока пранікаючы ў яе. Яе рукі на яго плячах сталі зусім лёгкімі, а подых, наадварот, глыбокім, нібыта яна захліналася і лавіла паветра.

Яе чорныя вейкі ўздрыгвалі проці яго вачэй, і ў якійсьці незьлічоны раз яго ўразіла, якая яна прыгожая. Як пяшчотная кветка, як мара. Як багіня, якую ён трымаў у руках. Ён адчуваў сябе богам, Торам, ці Одзінам, ці Зеўсам – не істотна. Ён быў імі ўсімі, і адначасова быў Богам сусьвету, Айцом-неба, які накрываў маці-зямлю, і нараджалася каханьне – дзіўная мроя душы аб недасяжным, прага прыгажосьці, якая не існуе, пакуль яе ня ўбачаць закаханыя вочы. І цяпер ён бачыў яе прыгажосьць так востра, што ў яго захоплівала подых. Яна была патрэбная яму – толькі яна, толькі гэтая жанчына, і ніякая іншая, палова яго душы і цела.

- Хачу цябе, - ціха вымавіў ён, нахіляючыся да яе.

- Цябе нельга, каханы. Пачакай, прашу цябе. Яна крыху адсунулася ад яго, гледзячы на яго з мальбой у вачах.

- Ну, калі нельга, тады пайшлі ў хату – павячэраем, - з жалем вымавіў ён, - а потым можа і пагуляць сходзім. Раскажаш мне, як справы. Як ты тут была безь мяне, як сябе паводзіла. Ён ахінуў яе рукой, і яны ўзьняліся на ганак.

- Выкараскаўся?

У мяне людзей – шмат! Процьма. Ганна глядзела на яго задаволеннымі, прыжмуранымі вачыма.

Ён жа, адкінуўшыся на сьпінку стулу, зь цікавасьцю аглядаў пакой. Летыцыя сядзела побач, ля яго, на зэдліку. Яны прывезьлі некалькі мехаў усяго – прадукты, нейкія гаспадарчыя рэчы, бялізну – тое, што яна прасіла, бо, як апынулася, з сабой яна прывезла ня шмат. Нават і спала апранутая на надуўным матрасе. Фёдар стрымаў сваё слова: выкінуў яе вон з грашыма, дастатковымі раўнюханька каб дабрацца да іх на таксі, але ж Ганна не сумавала. Яе слава ляцела наперадзе яе, і ўжо ў аэрапарту, калі яна ўключыла тэлефон, на яго пасыпаліся паведамленьні. Цягнучы за сабой чамадан, яна буркліва запісвала галасавыя – 50, 100, 200 еўра, і кароткія кансультацыі прама на хаду.

- Мужык гэты з табой ня будзе, я бачу, - громка вяшчала яна, прасоўваючыся праз натоўп. – Але ж можна, можна, даражэнькая мая, зрабіць так, каб быў. Дзьвесьце еўра. Рэзультат гарантаваны. Калі не? Не, такое не магчыма. Будзе. Давай так – калі ня верыш, дзьвесьце еўра за кансультацыю, а калі будзе – яшчэ мне дзьвесьце еўра заплоціш. Такім чынам адсутнасьць рэзультату не каштуе нічога. Але ж гатоў чатыраста, бо ён будзе тваім, гэта я абяцаю.

- Вылячу я яе, тваю хваробу. Нестаячка называецца. Гэта проста – мне толькі морква патрэбная, і пара цыбулін. Што такое цыбулі? Не твая справа. Сакрэтны інгрыдыент. Яна прыціснула

тэлефон шчакой, адной рукой залазячы ў кішэню, дастаючы паспарт. Мытны кантроль прайшоў хутка і без праблемаў. Бразгаючы чамаданам, згубіўшым кольца, яна нарэшце выбралася вонкі, і паправіла хустку. Аглядзелася, і громка закрычэла, машучы рукой:

- Таксі!

Назвала адрас.

- Колькі?

- Трыста пяцьдзесят еўра.

Рабіць не было чаго – яна толькі хмыкнула. Вадзіцель націснуў пядаль газу, і яны рухануліся з месца. Вызваліўшы рукі, зайшла ў паведамленьні, і задаволенна прысьвіснула. Пяцьсот еўра ўжо прыляцела на картку. Яна тут не засумуе – бо ж добрая бабка ўсім патрэбная.

Два паведамленьні прыляцелі адначасова. Яна адкрыла першае:

- Летиция, добрый день! Мы уже в Осло. Сегодня заселились в отель, а завтра Глеб целый день будет на семинаре. Можем, мы с тобой встретиться в первой половине дня? Во второй половине Глеб будет занят, у него практикум и деловая встреча. Буду очень рада с тобой увидеться.

Паведамленьне закрываў радасны смайлік. Агнеса любіла смайлікі, яны замянялі ў яе коскі і кропкі, і ўсё астатняе.

Яна напісала:

- Добры дзень! Канешне, я буду рада цябе ўбачыць. Дзе вы спыніліся? І дзе ты жадаеш сустрэцца?

- Отель “Марріоттт”. Мы могли бы поседеть в баре, в лобби, - прыляцеў адказ.

- Цудоўна. Міхась ужо дома, ён завязе мяне. Заадно і пазнаёміцеся.

- Ой, как неудобно … он же после операции, а я вам надоедаю… Паведамленьне закрываў сумны смайлік.

Яна хутка набрала:

- Нічога. Яму падабаецца сустракацца з маімі сябрамі. Ён наогул любіць новых людзей.

- А … ну тогда – хорошо. Давай завтра в десять! Мы сможем позавтракать, и пообщаться до обеда. А можем и погулять сходить. Вы сможете в десять? Или рано?

- У дзесяць для Міхася дык нават і позна. Ён у сем устае. Такая звычка.

- Ну тогда – отлично. Договорились.

Летыцыя закрыла чат, і адкрыла другое паведамленьне, якое пікнула адначасова з гэтым.

- Слушай, ты за секс деньги берешь? – прочитала она. Яе сэрца ўпала, і рукі раптам пахаладзелі.

- Глеб, ты памыліўся? Паведамленьне хутка сарвалася зь яе пальцаў. Праз імгненьне яно мірганула сінім – прачытана.

- Слушай, не прикидывайся. Я всё знаю, - прыляцеў адказ.

- Давай так. У меня есть деньги, и свободный вечер. Завтра. Я хочу, чтобы ты мне показала разные вещи. Которые ты умеешь. Чтобы я потом мог научить свою. Она ничего не может, как бревно. А ты, я слышал, мастерица в таких штуках. Заводить мужчин. Как ты это делаешь, кстати? У меня тогда сразу встал. Это фокус такой, что ли?

- Глеб, гэта атрымоўваецца між волі. Проста супадзеньне. І я не дару каханьне за грошы. Што б табе хто не казаў, гэта хлусьня.

- Не ври. Даёшь, я знаю. Сколько? Не думай, что у меня нет денег. Я накопил. Сколько в час? Сто? Или больше?

- Глеб, нікалькі. Гэта не абмяркоўваецца. Яна яшчэ не

адправіла, калі прыляцела наступнае:

- А я пра каханьне и не говорил. І шэраг рагочушчых смайлікаў – да сьлёзаў.

Яна націснула адказ, і хацела дадать:

- А Агнеса ведае? Пра тое, што ты такім чынам жадаеш павысіць яе кваліфікацыю?

Але ж не напісала, а проста заблакавала яго нумар.

На яе вачах зьявіліся сьлёзы.

Чаму гэта ўсё адбываецца зь ёй? Хто яшчэ што пра яе “ведае”?

Усе гэтыя рэчы, якія адбываліся зь ёй у жыцьці, у жахах і снах, у яе ўяўленьні і ў рэальнасьці, поўнасьцю пераблыталіся, але ж усе яны былі для яе рэальнымі, жывымі. Алекс, тыя двое, яго сябры, яго кампаніі, і проста незьлічоная колькасьць тых, хто запаўняў яе розум, яе памяць. Здаецца, кожны жадаў яе згвалціць, авалодаць ёй. Усюды яна бачыла пажадныя позіркі. Часам ёй здавалася, што ўсё гэта ёй здаецца, што так ня можа быць, яна перабольшвае, і нікога яна не цікавіць. Але ж усё гэта адбывалася ізноў, і кацілася, як сьнежны ком. І вось цяпер – нават Глеб. Ад каго яна такое чакала ў апошнюю чаргу. Сьціплы і зажаты праграміст, які заўсёды быў абыякавы да дзяўчат, наколькі яна ведала, увесь час рашаў нейкія задачы, нешта праграмаваў зь сябрамі, якіх у яго было можа пара чалавек такіх жа апантаных кампутэрамі хлопцаў.

Як жа ён да такога дадумаўся? Як насьмеліўся?

- Каханая, - пачула яна яго голас. – Што ты там заціхла?

- Іду, любы. Яна павярнулася, і выйшла з кухні ў залу. Яны ўжо павячэралі – аладкі картофельныя зь мясам, як ён жадаў. Яна прыбрала, вымыла посуд, і цяпер стаяла, разгубленая, з тэлефонам у руцэ. Апарат быццам бы паліў ёй руку. Глеб, канешне ж, быў нейкі дурань – хто такое запытвае, і, калі і запытвае, то менавіта так. Але ж што чакаць ад праграміста-аўтыста? – падумала яна. Ён камунікаваць наогул быў не

мастак, ні зь кім, акрамя кампутара, вось той разумеў яго з паўслова. Ён неяк і ёй ноўтбук глядзеў – вінду ўсталёўваў. Праўда, толькі адзін раз, і потым Агнеса ёй усю галаву адурыла – як Глебу было цяжка, што ў яго няма часу, і што ён потым вымушаны быў ня спаць ноччу, навёрстваючы нейкі праэкт, і ў яго ўзьняўся ціск, і ён ледзь не памёр, і яго наогул турбаваць нельга, а яна папрасіла, і канешне ж, яны не маглі адмовіць. Не адмовяць яны і ў наступны раз, але ж яна павінна ўлічваць усё гэта – усе цяжкасьці і рызыкі, і падумаць, ці вартае каштоўнае здароўе яе мужа такой дробязі, як нейкая вінда ў ноўце нейкай дурненькай дзяўчыны, якая нават ня здолела набыць хлопца, разумнага настолькі, каб зрабіць для яе гэта самому. Алекс наогул у ноўтах нічога не цяміў, ён яго можа толькі ўключыць мог. І тое – ня факт, што атрымалася б без дапамогі гуглу. Да таго ж, Алекс з'явіўся, і пільна глядзеў на яго, калі той сядзеў з ноўтам, і так яго сваім позіркам прывёў у шалёнства, што ад гэтага ціск можа і ўзьняўся, а Глеб проста такіх людзей, як Алекс, трываць ня можа, бо ж той нізкага маральнага вобліку, і проста нейкі бандыт, канешне, гэта іх зь Летыцыяй справы, і яна яе шануе як сяброўку, але ж … тады Летыцыя палымяна паклялася, што ніколі, ніколі болей Глеба не патурбуе, і ні аб чым не папросіць. І цяпер яна дужа зьдзівілася, што ён і нумар яе захаваў, і такія рэчы насьмеліўся пісаць. Але ж, пэўна, Глеб не такі просты, як Агнеса яго лічыць, падумалася ёй. Грошы псуюць чалавека, такое бывае, а Глеб пасьля інстытуту стаў хутка ўзьнімацца па кар'ернай лесьвіцы, знайшоў месца ў вялікай міжнароднай кампаніі, дзе яго праз кароткі час зрабілі кіраўніком аддзелу, а потым – і кіраўніком сектару, цяпер жа ён наогул чакаў пасады на пост дырэктара па міжнародным праэктам і каммунікацыям, а гэта была ўжо пасада зь акладам у некалькі тысячаў даляраў.

Цяпер жа - гэты семінар, які кампанія яму аплаціла для наведваньня разам з жонкай, з пражываньнем у дарагім гатэлі ў палепшаным нумары.

І вось ён вырашыў, што стаў годны яе. Раптам яна ўсьміхнулася. Гэта было б сьмешна, каб не было так жахліва. Агнеса думае, што ў яе самы лепшы на сьвеце муж, адукаваны, адказны, паслухмяны, безпраблемны хлапец. Яна ўжо і дзяцей плануе. А

гэты хлопец – вось што. Піша ёй, ды зь якімі прапановамі. Што ж там такое адбываецца ў яго галаве, ды і ў іх сям'і наогул?

Яна ўздыхнула, намагаючыся пакінуць думкі тут, выкінуць іх з галавы, і выйшла ў пакой. Ён сядзеў на канапе, па тэлевізару нейкі канал нягромка казаў нешта – нейкія міжнародныя навіны. Убачыўшы яе, шчоўкнуў пультам, і экран пагас.

- Хадзі да мяне, - ціха вымавіў ён. Яна падышла, і палажыла рукі яму на плечы. Ён глядзеў на яе карымі ўсьміхаючыміся вачыма. Яго вусны таксама ўсьміхаліся.

- Прыгажуня мая. Ён прысланіўся галавой да яе грудзей. Яна абняла яго. – Як я сумаваў па цябе. Праз тонкую шаўковую тканіну халату яна адчувала грудзямі яго подых, яго вусны, якія краналі яе скуру. Яго рукі гладзілі яе сьцёгны, сьціскваючы. Сьвет ізноў спыніўся, і ў ім засталіся толькі яна, і ён.

- Хачу цябе, - ціха вымавіў ён, паглыбляючыся вуснамі ў яе выраз, рассоўваючы тканіну. Яго губы кранулі яе ключыцы, і апусьціліся ніжэй, рука знайшла грудзі, і пагладзіла, губы кранулі сасок.

– Як я сумаваў па гэтаму. Па твайму целу. Як жадаў яго. Я цябе бачыў і ў сьне, і наяве. Таму так хутка і паправіўся, бо ж жадаў. Ён усьміхнуўся, неяк безабаронна, кранальна. Яго рукі сьцісквалі яе сьцёгны, прыціскаючы яе. Ён глыбока ўдыхаў яе подых, убіраў пах.

- Мая, толькі мая, красуня. Чараўніца мая лясная. Анёлачак мой маленькі.

Яго рукі апусьцілі зь яе плечаў халат, пацягнулі ўніз бялізну.

- Каханы, табе нельга, - ціха вымавіла яна, ледзь ня плачучы. Ад яго пацалункаў, яго паху, яго рук у яе кружылася галава. Яна жадала яго моцна, так, што ледзь не губляла прытомнасьць. Яе сэрца калацілася.

- А сэрцайка стучыць, - ціха вымавіў ён, накрываючы яе грудзі далоньню. Ты ж мяне хочаш. Хочаш мяне, каханая. Красуня

мая. Родная мая. Яго рука дакранулася да яе там, пальцы ўвайшлі ў яе. Яна ўскрыкнула.

- Нічога, нічога, - ціха вымавіў ён. – Нічога страшнага ня будзе. Я сябе добра адчуваю. А калі не зраблю гэта, буду адчуваць сябе блага. Ён усьміхнуўся. Яна не магла яму супраціўляцца, нават і зьняць рукі з плячэй, і сыйсьці ад яго не магла. Яго рукі ап'янялі яе, словы зачароўвалі. Ён меў поўную ўладу над ёй – над яе жыцьцём і сьмерцю, над яе лёсам. Як і яна мела над ім страшную, поўную ўладу, разумела яна – бо ж ён ад яе залежыў. Чалавек залежыў ад яе каханьня, і ад яе залежыла, ці яна пакахае, ці адкіне Бога. Бог жа будзе кахаць яе заўсёды, што б ня здарылася, і якой бы яна не была. Але ж толькі ад чысьціні яе думак, яе душы будзе залежыць, наколькі ясна і чыста твар Бога адлюструецца ў ёй. Кожная хваля на яе душы, кожнае скажэньне скажалі яго воблік, а яна жадала як мага поўна адлюстроўваць у сабе Яго прыгажосьць, і самой праз гэта быць такой прыгожай, каб быць годнай яго, радаваць яго, дарыць яму сваё наймацнейшае каханьне, якое толькі магло б нарадзіць яе сэрца.

Яго вусны краналі яе цела, і яна гладзіла яго твар, валасы, шыю, плечы.

- Не праціўся мне, каханая, - пачула яна яго ціхі голас, хрыплаваты, нізкі. – Ня бойся. Праз каханьне ня можа быць сьмерці – толькі жыцьцё.

- Хадзі да мяне. Ён апусьціўся на канапу, лёг галавой на сьпінку, і яна нахінулася над ім. Яго вусны лавілі яе маленькія грудзі, сьцісквалі саскі. Яна нахілілася да яго, і ён закрыў вочы. Яго губы ўбіралі яе сасок, і яе ўлоньне скарочвалася. Яна адчувала, нібыта карміла дзіця. Яго рукі гладзілі яе, прыціскаючы, яна абдымала яго галаву, якая ляжала ў яе на локце. Нахіліўшыся нізка, яна адчувала яго подых, яго дыханьне апаляла яе скуру, грудзі і ўлоньне балелі. Яго рукі пацягнулі яе ўніз, і яна адчула, як яго чэлес, узьняўшыся, кранае яе сьцёгны, і асьцярожна апусьцілася на яго. Ён пацягнуў яе ўніз, і на імгненьне замёр, яна адчувала, як яго плоць пульсуе ў ёй, расшыраецца, расьцягваючы яе похву. Нахіліўшыся, яна кранала грудзямі яго грудзі.

- Як я жадаў гэтага, - ціха вымавіў ён. – Каханая мая. Яго рукі ўзьнімалі яе сьцёгны, і яна падымалася і апускалася, нібыта на хвалях. Жаданьне ахоплівала яе, цёмнае, плоцкае жаданьне, і ў той жа час – каханьне, вострае, балючае, як лязо нажу. Яна кахала яго моцна, да болю, і боль ад гэтага каханьня ўваходзіла ў яе з кожным яго рухам, калі яна аддавалася яму так поўна, нібы паміралa ў яго руках, і ён атрымліваў асалоду, забіваючы яе, і нараджаючы яе нанова. Ён не зьневажаў яе, не жадаў ад яе нейкіх там асаблівых хітрых штукаў, нейкай асаблівай асалоды, якую магло даць яму яе цела, бо асалода ад іх зьліцьця сапраўды ня мела межаў. Адзінае дакрананьне яго да яе, і яе да яго зносіла іх некуды, дзе нябыт пераўтвараўся ў жыцьцё, а жыцьцё у нябыт, яго рукі моцна трымалі яе, гладзілі, і яна вострa адчувала іх на сваёй скуры – рукі мужчыны, які яе кахае, як і ён сваім дакрананьнем да яе адчуваў жанчыну, якая была для яго даражэй за жыцьцё. У гэтым і заключалася таямніца асалоды іх каханьня, якое заўсёды было новым і вострым, праз напаўняючае іх шчырае пачуцьцё.

Ён выліўся ў яе, і яна апусьцілася яму на грудзі, прыціснуўшыся да яго шчакой. Яго рукі гладзілі яе плечы, і ў цэлым сьвеце для яе не было нікога даражэй, чым ён. Ад гэтага каханьня, ад салодкага болю, якое яно прыносіла, ёй хацелася плакаць, і яна адчула, як ціхія сьлёзы кацяцца па яе шчоках.

- Анёлачак мой, як я сумаваў па цябе, - нягромка вымавіў ён. Яго вялікія рукі амаль закрывалі яе сьпіну – танюткую, адчуваючы косткі пад шаўкавістай скурай. Яе грудзі мякка краналі яго грудзі, і яму здавалася, што ў яго на грудзях ляжыць дзіця – яго роднае дзіця, плоць ад яго плоці і кроў ад яго крыві, якое ён нарадзіў, стварыў для сябе сам. Як атрымалася, што гэта дасканалая жанчына выйшла зь яго ўяўленьня, і цяпер ён уваходзіць у яе, быццам бы імкнучыся ўвабраць яе назад, у сваё цела? Гэта было дзіва, і гэта было шчасьце, меры якому ён ня меў, і не ўяўляў.

- Як я цябе кахаю, кахаю цябе ўсю, кахаю твае грудзі, сасочкі і похвачку, і вочкі, і губкі, і валасы, і твае пяшчотныя ручкі, і ўсю цябе, і твой анёльскі тварык, і тваю прыгажосьць, якая, сапраўды, ад Бога, і тваю пяшчоту, і безабароннасьць, і давер, і

- Так вот. Этот человек, мужчина, - зачымсьці ўдакладніла яна, - хочет, чтобы у нас было пятеро детей. Представляешь? Такой семейный, такой ответственный.

И я подумала, что нам тоже нужно будет повенчаться. Чтобы скрепить наш союз узами святости. Ведь пятеро детей - это очень ответственно.

- Конечно, дорогая. Семьи не может быть без детей. Вернее, то, что без детей, не может называться "семья". Ведь семья - это семь я, - ласкава вымавіла Агнеса.

- Точно. Мама, папа, и пятеро деток, - радасна пагадзілася Жаначка.

- Так ты считаешь, мне нужно соглашаться на его предложение? - насьцярожана вымавіла яна.

- Он мне прямо вот так сразу написал, и уже приглашает к нему ехать.

- Я думаю, обязательно нужно соглашаться, - пацьвердзіла Агнеса.

- Ты же не размещала в профиле легкомысленных фото?

- Нет, ты что. Только это. И вот это. Жаначка зрабіла прынт з экрану. Тэлефон Агнесы піскнуў, і ў месенджары з'явілася фота: Жаначка ў вялікім футравым капюшоне і бардовага колеру пухавым паліто, з-пад якога тырчэў чырвоны сьвіцер. На другім сьвіцер быў той жа, толькі пухавіка не было. Жаначка сфатаграфавалася па-сьвяточнаму - на фоне нараджанай цацкамі і дожджыкам елкі ў пакоі насупраць акну.

- Правда, помада ярковатая. Но я решила сделать акцент, - удакладніла яна.

На абодзьвух фота ў яе была ярка-ружовая перламутравая з бляскам памада.

- Не мог же он из-за этого сделать вывод ... працягнула яна.

- Нет, конечно. Успокойся. Всё очень пристойно, и сразу видно, что человек хороший.

- Да. Он мне вот это написал. Да Агнесы ізноў паляцеў скрын з экрану.

- Madam. You are so beautiful and look decent. I want to have five kids with you, - высьвятлілася на экране.

- Ого. Это какое-то чудо. Тебе просто Бог послал, - вымавила Агнеса задаволена. - Он увидел тебя, и сразу понял, что ты - пристойная девушка, созданная для серьёзных отношений.

Вот и написал. Ты знаешь, хороший человек виден сразу. Он разглядел в тебе душу. И глубокую личность. Мать своих пятерых детей. Это серьёзно, Жаночка. Поздравляю тебя! Вам срочно нужно повенчаться, - вымавіла Агнеса шчыра.

- Да, я тоже так думаю, - пагадзілася Жана.

- Очень важно как можно раньше создать прочную семью с хорошим человеком. Семейным.

- Именно. Агнеса кіўнула на тым канцы - сама сабе, бо ж Жана яе ня бачыла.

- Ты знаешь, я думаю, её психическое расстройство прогрессирует, - раптам вымавіла яна.

- Она зациклена на любви. Постоянно говорит о ней. О какой-то невероятной космической любви между мужчиной и женщиной.

Небесный брак, половинки одного целого, Бог и Шекина.

Мне кажется, она бредит.

- Она, наверное, думает, что этот её мужчина - Бог. Жаначка ўсьміхнулася. – А она – конечное же, … Шкина. Кстати, а кто это?

- Шхина, или – Шекина. Это – вторая половина Бога по иудейской Библии – Торе. Жена Яхве. Я погуглила, - патлумачыла Агнеса аўтарытэтным тонам.

- Подожди, а причём тут Яхве? Она что, еврейка? Или … он еврей? У голасе Жаначкі прагучэла агіда.

- Да, Жаночка. И она, и, я думаю, он. У неё же отец в Израиль уехал, ты что, забыла?

- Так он же не родной был. Я не поняла. Жаначка, здаецца,

зусім заблыталася ў складаных лябірытнах радства, якія ўвесь час усплывалі ў размове.

- Ай, родной, не родной, какая разница, - цярпліва патлумачыла Агнеса.

- Просто у евреев много наследственных генетических заболеваний. Ну, бутылочное горлышко. Они же все родственники.

- Слушай, а точно – всё сходится! – раптам вымавіла Жаначка з жахам.

- Что сходится? – не зразумела Агнеса.

- Ну как! Её заболевание, психическое. И то, что на самом деле он - её отец – ведь евреи часто вступают в брак с родственниками. И инцест, он даже в Библии описан. Лот с дочерьми. Я помню – ты знаешь, я как-то ходила на занятия свидетелей Иеговы – библейская летняя школа. На самом деле они очень хорошо знают Библию. Я, конечно, не вступила в их секту – ещё чего. Я же не дурочка. Я просто у них обучалась – почему бы не использовать возможность. Так вот, они много чего рассказывали такого, что позволяет лучше понять реальность. Ведь Библия – книга книг. Это же Святое Писание.

- Конечно, конечно, - пагадзілася зь ёй Агнеса. - Слушай, но если это правда – она же живёт с отцом? – усклікнула яна.

- Да, живёт. И поэтому он не может быть её мужем. Она тебе всё солгала. Просто из-за зависти. Из-за комплексов. И с Глебом она из-за этого переписывалась – хотела его у тебя отбить.

- Какой ужас… значит, она … не просто развратная. Она – разлучница. Воровка. Хотела разлучить меня с Глебом. Боже, как это низко. Агнеса замаўчала.

- Слушай, а если всё-таки она живёт с этим мужчиной … с отцом, - зь цяжарам вымавіла яна, … - то выходит, что она … спит со своим отцом? Как это возможно? И при этом ещё пишет Глебу?

- У сумасшедших и не такое возможно. Жаначка на тым канцы падціснула вусны.

- Она не просто сумасшедшая. Она же называет его Богом. А это – богохульство. Она проклятая, Жаночка. Какой кошмар. Да она – настоящая ведьма. Воплощённое зло.

- А он тогда кто? – зьдзекліва запытала Жаначка.

- Он? А ты догадайся! – раптам голас Агнесы абарваўся амаль на шэпт.

- Не могу что-то. Совсем запуталась. Помоги мне. Жаначка вырашыла дабіць сяброўку.

- Ну как, кто? С кем обычно сожительствуют ведьмы? Кому обычно они продают душу?

- Ой…, - нечакана голас Жаначкі таксама ўпаў.

- Дьявол? – паўзадушана вымавіла яна.

- Именно. Она – ведьма, а он – Дьявол.

- Ого… ледзь прашаптала Жаначка.

Агнеса на тым канцы маўчала.

Глава 53: Навіна

Раніцой ён устаў як звычайна – рана. Хоць і ня спаў амаль усю ноч: Габрыэль вырашыў захварэць. Нешта зь ім такое здарылася – спачатку плакаў, потым узьнялася тэмпература. Яны пазванілі Моніцы – так звалі жанчыну, якая дапамагала Паола. Моніка выслухала іх, і параіла нейкія лекі – у сьвечках. І паназіраць да раніцы. Калі тэмпература ня будзе падаць – везьці ў шпіталь, калі спадзе – то добра. Ён з'ездзіў за лекамі – сам. Шчыра кажучы, ня мог слухаць гэты бясконцы Габрыэлеў плач. Калі вярнуўся, Летыцыя ледзь ня падала ад стомы – амаль увесь час качала яго на руках. Аднак лекі дапамаглі – Моніка не падманула. Праз гадзіну Габрыэль паснуў – ціха, мірна. Засапеў, быццам бы нічога не было. Потым яшчэ раз яна ўзьнімалася – паставіць сьвечку. Потым ён захацеў есьці. Потым – яшчэ нешта. Грудзі ён забараніў ёй яму даваць. Яшчэ прывыкне – адвучай яго потым. Ня трэба. Летыцыя, здаецца, засмуцілася. Але ж ён падрабязна растлумачыў ёй, што зь ёй будзе, калі яна пачне яго карміць грудзямі. Да таго ж, навошта? Ён жа ўжо добра есьць, і сумясь п'е. Хай і далей п'е з бутэлячцы. І наогул, трэба наняць яму няньку. І ўладкаваць у асобным пакоі. Што гэта такое – ні сну, і нічога яшчэ. Яна зусім розум згубіла з гэтым дзіцём – проста ўвесь час падскоквае, глядзіць, правярае. На кожны яго піск узьнімаецца. А ня ўзьнімешся – то піск пераўтворыцца ў такі роў, што хоць сьвятых вынасі. Яму і шкада яго было, а яе – яшчэ больш шкада. Сёньня ж трэба патэлефанаваць у агенства.

А пакуль ён насалоджваўся цішынёй. Тры дні прайшло з таго дню, калі адбыў Фёдар, і час быццам бы спыніўся. Яна займалася дзіцём, ён жа быў заняты перапіскай. Кліент, які перадаў яму канверт з драконам, апынуўся дужа дапытлівым. Яго цікавіла проста ўсё, што было зьвязана з каббалай, тэургічнай і гаэтычнай магіяй, і ён цярпліва адказваў на яго бясконцыя пытаньні. Яны дамовіліся аб пэўнай сумме за яго кансультацыі – не малой, і, здаецца, кліент быў гатовы выкарыстаць яе на поўную катушку. Трэба павышаць таксу, - падумаў ён, усьміхнуўшыся.

Пакуль што размова ішла аб пэўных гістарычных фактах – удакладніць, параіць літаратуру. Дапамагчы перакласьці. Ды і яму самому, насамрэч, было цікава. Ён забаўляўся са сваім кліентам, як Летыцыя з Габрыелем – шчыра. Яго забаўлялі наіўнасьць і пытаньні, якія той задаваў, адказваць на якія было добрым сродкам паразьмяць мозг. Ды і проста – з людзьмі цікава. Усё ж, шмат таямніцаў схавана ў кожным – і ніхто іх поўнасьцю ня ведае, ні Бог, ні Д'ябал, ні, пэўна, сам іх уладарносьбіт.

Летыцыя крэпка спала, як і Габрыэль – абодзьва за ноч стаміліся. Ён выпіў стакан малака, з'еў халодны аладак зь мясам – есьці, наогул, не хацелася – мо, з-за бяссоннай ночы. Запаліў цыгарэту, пакурыў у адчыненае вакно. Тут ужо ва ўсю панавала вясна – квітнелі дрэвы. Было так ціха, прыгожа, і хораша проста немагчыма – проста сэрца пела. Такая ціхая, чароўная раніца. Ён узяў планшэт, зрабіў сабе кавы, і пачаў чытаць навіны. Нічога новага, ці асабліва цікавага – вайна ідзе ні шатка, ні валка. Санкцыі па крысе абыходзяцца – з гэтым таксама праблемаў не было. Эканоміка ўсталявалася па абодзьвы бакі, і сьвет набыў новыя, больш-меньш трывалыя рысы.

Нечакана, праглядаючы механічна навіны на адным з сайтаў, ён спатыкнуўся позіркам аб загаловак. Адкрыў, і прачытаў:

- Учора, апалудні, у самым цэнтры сталіцы адбыўся выбух. Узарваўся аўтамабіль дэпутата і памочніка … ён прачытаў вядомае імя… Фёдара Алексеева. Паліцыя дасьледвае прычыны здарэньня. Асноўнай версіяй з'яўляецца няўмыснае пападньне дрону. Па выніку апазнаньня цела памочнік … і дэпутат Фёдар Алексееў загінуў на месцы. Ён механічна адпіў кавы. Адкінуў валасы з ілбу. Устаў перад адкрытым вакном, і запаліў яшчэ адну цыгарэту. Доўга назіраў за воблачкам дыму, якое марудна таяла супраціў пачынаючых ружавець нябёсаў.

- Ах, Федзя, Федзя, - падумаў, амаль вымавіў услых. – Вось такі цябе напаткаў лёс. І ці ж ты яго ведаў. Яго нават і я ня ведаў – а вось як адбылося. Неяк ты прысьпешыў сабе яго, хутка дайшоў да канца свайго жыцьця. І манахам так і ня стаў. Ды і навошта. Цяпер ты, Федзя, сам насам са сваёй душой, і з Богам, і ня

трэба табе ні царква, ні поп, ні малітвы. Навошта гэта ўсё Яму? Яму ж патрэбная толькі нашая шчырая душа. Вось вырашыў ён цябе забраць, а значыць – так тое і трэба. Мо, ты б пражыў сваё жыццё і па-іньшаму. Але ж кожны наш учынак – крок кудысьці. Ты ж да Бога хацеў – вось ты да яго і трапіў – і тыдня не прайшло. Ён яшчэ пару хвілінаў пакурыў, затушыў акурак. Пэўна, лепей патэлефанаваць не ў агенства, а Моніцы – мо, яна каго параіць. Вось праз пару гадзінаў і набярэ яе – як надыдзе прыстойны для званку час. Ён закрыў акно, каб не студзіць пакой, і ўзьняўся наверх па лесьвіцы. Яшчэ пару гадзінаў можна было паспаць.

Глава 54: Ізноў

Калі ён спусьціўся ў лобі ізноў, на канапе перад ім сядзеў Фёдар.

- Вярнуўся? – коратка запытаў ён яго. Той кіўнуў, і застыў нерухома, апусьціўшы галаву, вывучаючы нешта на падлозе перад ім – маленькую цёмную лужыну, якая раптам зьнікла, быццам бы яе ўсмактаў чорны цень пад канапай, зь якога на Фёдара глядзела бясконцасьць.

- Вернулся я. Фёдар махнуў галавой. – Не магу я там, Господи. Попробовал – не получилось. Вот, видишь. Он развёл руками.

- Да я бачу. Ён сеў побач зь ім на канапу. – Вып'еш?

- Нет. Спасибо. А в прочем, давай. Давай, друг. Выпьем. Ты со мной выпьешь?

Фёдар узьняў на яго вочы.

- Чаму ж не. Ён паціснуў плячыма. – Час ужо апалудні. Можна і каньячку. Устаў, дастаў бутэльку Хенесі, наліў сабе і Фёдару па келіху, простаму, шкляному. Дастаў зь лядоўні жменю кубікаў, і кінуў у напой.

Яны з прыемным булькатаньнем пайшлі на дно, пакідаючы бурбалкі ў бурштынавай вадкасьці.

- Ну, за ўваскрошаньне. Ён узьняў келіх. Фёдар узьняў свой. Яны стукнуліся. Тонка запела шкло.

- За жыцьцё сапраўднае. Ён адкінуўся на сьпінку канапы, выцягнуў ногі, дастаў цыгарэты – чорны "Палмал", і закурыў.

- А почему я снова тут? – раптам запытаў Фёдар.

- Ты ж хацеў вярнуцца. Ён паціснуў плячыма. – Вось я цябе і вярнуў. Ты калі паміраў, аба мне думаў. А Богу. Жадаў Бога ўбачыць. Убачыў?

- Увидел я тебя, Господи. И что теперь? – Фёдар разгублена глядзеў на яго.

- А цяпер, Федзя, шмат чаго. Усё, што ты жадаеш – усё магчыма. Ты – у месцы, дзе ўсе магчымасьці становяцца рэальнасьцю. Вось і падумай – што ты сапраўды жадаеш?

- Преобразиться хочу, Господи. Новым хочу стать. Не таким, как был.

- А якім ты быў, Федзя? Ён зь цікавасьцю глянуў на яго.

- Скотиной я был, Господи. Дурной гнусной скотиной. А теперь – человеком хочу стать. Фёдар залпам асушыў келіх.

Ён узьняў свой, і паднёс да вуснаў. Бурштынавая вадкасьць, здаецца, палыхнула ў яго вачах вагнём.

- Чалавекам – гэта можна. Ён кіўнуў. – Я адчыню табе праход, Федзя. Адчыню браму. Насамрэч, ты сам сабе яе ўжо адчыніў.

- Татарочка? – запытаў Фёдар, узьняўшы вочы.

- Яна. Яна – брама, сьмерьць і жыцьцё. Каханая мая. Ён ізноў паднёс келіх да вуснаў, напоўніўшы Фёдараў келіх каньяком з бутэлькі.

Фёдар працягнуў руку, і ўбачыў, што ў келіху палае вагонь. Бурштынавае полымя завівалася ў віры. Яго рука нерашуча застыла.

- Пі, - пачуў ён глухі, нізкі голас. Вочы чалавека, чорныя, як ноч, і палаючыя, як вуглі, глядзелі на яго. Чорныя валасы закрывалі яго твар, лажыліся на плечы. Шырокія пліты грудзей рухаліся, як зямля, сатрасаемая землятрусам. Вагонь не апаляў яго вуснаў – ён зь іх сыходзіў, і ўваходзіў у келіх, які яго рука працягвала Фёдару.

Фёдар прыняў палаючую вадкасьць, і закрыў вочы. Жыдкі вагонь не апаліў яго, а прыемна сагрэў знутры. І раптам усё стала так, як і было некалькі дней таму. У дваіх яны сядзелі на канапе. Галава Фёдара патрэсквала пасьля ўчорашняга, і ён

прагна прыпаў губамі да запацелага шклу.

- Слушай, ну и сон мне приснился, Мишаня. Будто помер я. Взорвали меня в машине. А ты меня воскресил, и сюда вернул. Прикинь? И приснится же такое. Истинно, пить меньше надо. А может, и наоборот – не допил я. Вот и снилась всякая чушь.

А татарочка где? Ён павярнуўся, і агледзеўся вакол.

- Сьпіць яшчэ. Малой ноччу плакаў, тэмпература. Сёньня нянька прыйдзе. Бо мне ўжо гэта надакучыла. Яна зусім зь ім дойдзе. І так у чым душа трымаецца. Вось пагулялася, як зь лялькай, і хопіць.

Раптам позірк Фёдара ўпаў на экран тэлефону перад ім. Ён заўважыў нешта такое, ад чаго ўзьняў на Міхася вочы, і на імгненьне замаўчаў.

- Мишаня, слушай. Число какое сегодня? – раптам запытаў ён.

- Дваццаць трэцьцяе. Дваццаць трэцьцяе марта. Міхась паціснуў плячыма.

- А што такое?

- Так я что, два дня проспал, Мишаня? – Фёдар зьдзіўлена глядзеў на яго.

- Ня ведаю, аб чым ты кажаш. Ён ізноў паціснуў плячыма.

Фёдар кінуў позірк на экран. Гадзіньнік на ім паказваў лічыбы: 21.03.

- Ну да, привидилось что-то, - разгублена вымавіў ён.

Яны дапілі келіхі, і яшчэ пасядзелі некалькі хвілінаў у цішыні. Кожны думаў аб нечым сваім. Яго тэлефон нечакана завібрыраваў.

- Пронта. Ён націснуў на громкую сувязь.

- Сіньёре, да вас жанчына. З агенства. Кажа, вы выклікалі яе.

- Пусьці. Дзьверы раз'ехаліся, і на парозе з'явіўся тонкі жаночы сілуэт.

Высокая дзяўчына з кошыкам косаў на макушцы, нагадваючых цюрбан, прайшла ў лобі, і спынілася перад імі.

- О! Шоколадка! Фёдар узьняў на яе вочы.

- Сіньёре, мяне завуць Імані. У агенстве сказалі, вам патрэбная нянька. Яна замаўчала.

- Патрэбная. Ён кіўнуў.

- У вас ёсьць вопыт, рэкамендацыі, Імані?

- Ёсьць. Канешне ёсьць, сіньёре. Яна сьцвярджальна нахіліла галаву. – Я працавала ў некалькіх вядомых дамах. Прыстойных сямействах, сіньёре. Бо ж вы – ня просты чалавек, сіньёре. Мяне папярэдзілі. Сіньёр Джавані зьвязваўся са мной.

- Так, Імані, - вымавіў ён, вывучаючы яе позіркам. Прыгожая, як чорная багіня, жанчына. Стройнае, дасканалае цела. Высокая і годная постаць. Тонкія, але ж моцныя рукі, вузкія сьцёгны, вочы нагадваюць вочы зебры – чорныя ў аточаньні доўгіх веек. Простая белая ўніформа, як у медсястры. Яна прыйшла ўжо апранутая ў ёй.

- Я бачу, вы гатовы да працы, Імані. Пачакайце крышачку. Ён набраў нумар.

- Каханая, тут нянька прыйшла. Будзе табе дапамагаць. Аддаю яе пад тваю каманду. Ты там прачнулася? Гатовая прыняць яе?

- Узьніміцеся наверх, Імані. Ён палажыў тэлефон на стол. – Там – адзіныя дзьверы. Адчыніце іх. За імі – пакой. У пакоі – мая жонка, і сын. Яна раскажа ўсё, што вам трэба будзе рабіць. Калі коратка – то ўсё, што патрэбнае, каб даглядаць за дзіцём. За маім сынам. Мой сын – чорны. Такі ж, як вы. Так што не зьдзіўляйцеся. І не запытвайце шмат. Проста рабіце сваю справу. Так?

- Так сіньёре. Імані нахіліла галаву. Хутка яе тонкая высокая

постаць – белае на чорным мякка растварылася ў паўзмроку вядучай наверх лесьвіцы.

Глава 55: Маці

- Ты хочаш ад мяне дзіця, каханая? - ціха запытвае ён яе.

- Хачу, любы, - адказвае яна. Яе вочы зазіраюць яму ў твар - дыяманты, амытыя сьлязамі.

Яна абдымае яго за плечы, і ён нахінаецца над ёй, кранаючы яе вусны сваімі. Яго пацалунак просты, як хлеб, які ўваходзіць у яе вусны - хлеб жыцьця, якога яна так прагне, і ня можа насыціцца.

Ён нахінаецца над ёй, і яна лажыцца, пакорлівая яго волі. Яна адчувае яго над сабой - цяжкога, вялікага, і закрывае вочы. Яна гатовая прыняць яго. Ён уваходзіць у яе - адразу, глыбока і поўнасьцю. Глыбока ў сваім улоньні яна адчувае яго напружаную плоць. Ён некалькі разоў рухаецца, і выліваецца, прыціскаючыся да яе там, нібыта намагаючыся прасунуцца далей, у самыя недасяжныя, патаемныя глыбіні яе цела.

Яна адчувае, як яго чэлес уздрыгвае, запаўняючы яе, і яго цяпло і гарачыню, якія напаўняюць яе ўлоньне.

Ён крэпка трымае яе, прыціскаючы, прыцягваючы да сябе, быццам бы ўзмацняючы іх з'яднаньне там, дзе яе ўлоньне зьліваецца зь яго плоцьцю. Яго рукі моцныя і крэпкія, трымаючыя яе.

Яны губляюцца ў бясконцасьці прасторы і часу, і сусьвет зьнікае - застаюцца толькі яна, і ён.

Праз сьвет золка ён бачыць яе вочы - мокрыя вейкі. Яе дзіцячыя вусны, яе мяккі твар у празрыстым сьвятле, высьвятляючым і ўпячатваючым у бясконцасьць кожную яго рысачку, такую любую для яго.

Ён пяшчотна кранае вуснамі яе шчаку, гладзіць яе валасы рукой.

- Вось і ўсё, каханая, - ціха кажа ён. - Вось і ўсё. Усё адбылося.

- Я зрабіў для цябе гэта, бо ты сама папрасіла мяне, і таму ў цябе ўвайшла мая воля.

- Цяпер у нас будзе дзіця? - ціха запытвае яна. - І я стану маці?

- Цяпер ты - маці, любая. Каханая мая. Ён цалуе яе, убірае губамі яе вусны, трымаючы ў руках яе мяккі твар, абдымае, прыціскаючы да сябе, і яна хавае твар ў яго на плячы. Ён ахоплівае яе плечы рукамі, і ляжыць, слухаючы яе подых, і тахканьне сэрца над сваім сэрцам. Яна гладзіць і цалуе яго шнар - там, на месцы яго рэбра, працінутага дзідай, вынутага, калі яна з'явілася на сьвет - для яго. Яго каханая, у якую ён увайшоў, раз'яднаўшыся, каб ізноў з'яднацца, запоўніўшы яе сабой - сваім сынам, выліўшыся ў яе цёмныя глыбіні, як дажджавыя кроплі раніцой напітваюць чорную глебу зямлі, пітаючы зародыш жыцьця, які сьпіць у яе вантробах.

Яна адчувае гэтае біеньне і пульсацыю ў ёй яго крыві - яго семені, яго жыцьця, дзівосным чынам з'яднаўшагася зь яе жыцьцем, каб стварыць новае.

- Вось і адбылося, - ціха кажа ён. - Вось і адбылося, любая. Яго рукі, прытуляючы, гладзяць яе, і яна ціха плача - плача на яго грудзях ад шчасьця.

Мужчына, высокі, чорнавалосы, строга глядзеў на яе.

Імані ўвайшла ў паўцёмнае лобі вілы, і яе, відаўшую віды, зьдзівіла багацьце вакол. Антыкварныя рэчы – няброскія, і ня шмат, але ж іх выгляд казаў аб баснаслоўнай каштоўнасьці, і старажытнасьці, годнай найлепшага з музеяў. Вялікая чорная скураная канапа падковай, сучасная, дзіўна вылучалася супраціў залачонай раскошы і тонкіх постацей скульптураў. Высокая крутая лесьвіца, абабітая барвовым дываном, аточаная каванымі парэньчамі, упрыгожанымі лістотай і кісьцямі вінаграду ў “дыянісійскім” стыле, вяла некуды ў цемру высокага другога паверху, які паўкруглай пляцоўкай з бронзавай агароджай навісаў амфітэятрам над яе галавой.

Яна нерашуча спынілася, а потым прайшла наперад,

падпарадкаваўшыся знаку рукі, зробленаму чалавекам, які сядзеў на канапе, і пільна глядзеў на яе, вывучаючы.

- Вы – Імані? – запытаў ён.

- Так, я прыйшла з агенства. Яна прадставілася, ён запытаў рэферэнцыі. Высокі, цёмнавалосы, шыракаплечы, мужчына ў лёгкім белым касьцюме – вольныя штаны, рубашка, ільняны жакет, вылучаўся на чорнай крыху глянцавай скуры, якая падкрэсьлівала яго незвычайныя памеры. Нават калі ён сядзеў, было бачна, які ён высокі і магутны. Калі б устаў, то рост яго быў бы ня менеў чым пад два метры, як у баскетбаліста НБА, падумала яна. Незвычайнымі былі і яго прапорцыі – шырокія плечы, моцныя грудзі, крэпкія ногі і сьцёгны, усё – ідэальна сбалансаванае, такое, што яна між волі залюбавалася ім, як вялікім прыгожым зьвяром, прыгожым стварэньнем прыроды, які мякка рухаецца ў звыклым яму вольным асяродзі. Так і на гэтай віле чалавек быў, як тыгр у гушчары, ці воўк альбо мядзьведзь, якія мякка ступаюць па вядомым толькі ім сьцяжынам. І гора таму, хто незаўважыць, і перойдзе яму дарогу, падумалася ёй. Чалавек прыгубіў каньяку з бакалу, і паставіў яго на бліскучы столік. Узяў тэлефон, і паглыбіўся ў яго. Здаецца, нешта чытаў, такое, ад чаго ссунуў бровы. Яго вялікая рука адкінула назад валасы, якія ізноў звaліліся на лоб. Вакол тонка пахла водарам нейкага дрэву – яго парфюмай, і пахам для дому, які пэўна падаваўся праз сістэму кандыцыяніраваньня, як у дарагіх гатэлях.

Парфюму яна вылучала па больш жывёльнай, крыху саланаватай ноце крыві і поту, штучна зробленых і выдатна зьміксаваных з вострым духмяным пахам.

– Прыгожы мужчына, - падумала яна. І бачна, што багаты. А яшчэ – небясьпечны, такі, што ня будзе казаць два разы. Аднак і нейкага пачуцьця страху ад яго не сыходзіла. Побач зь ім адчувалася спакойна. Яна нахіліла галаву, выслухаўшы яго кароткія указаньні, і ўзьнялася наверх па лесьвіцы.

Там яго жонка, і сын. І сын – чорнаскуры. Такі ж, як яна. Пэўна, і жонка такая ж, падумалася ёй. Нічога незвычайнага тут не было. Яна ведала некалькі багатых французскіх і амерыканскіх

сем’яў, дзе супругі мелі розны колер скуры. І таму, калі яна ўвайшла ў пакой на другім паверсе, яна сапраўды зьдзівілася. І, можна сказаць, што аслупянела ад уражаньня.

Яна пагрукала ў дзьверы перад тым, як увайсьці ў пакой.

- Адчынена! – пачуўся дзявочы голас, нягромкі і мілагучны. Голас, які належыў зусім маладой дзяўчыне. Яна адчыніла вялікія дзьверы чырвонага дрэву, цяжкія, узяўшыся за круглую бронзавую ручку, якая ціха клікнула ад яе націсканьня.

Перад ёй адкрыўся пакой спальні – вялікі, такі, што цемра хавалася ў кутах, ахутваючы іх мякка, накшталт аксамітных парцьераў у колер навальнічае хамары, якія фалдамі апускаліся з вакон на падлогу. Цюлі на вокнах не было – толькі жалюзі, якія цяпер былі адчынены. Від за вакном быў шыкоўны – густы зялёны сад, апельсінавыя дрэвы проста заглядалі ў вакно, а вакол баўкону віліся ружы. За дрэвамі адкрываўся від на сіняе мора, якое плёскалася далекавата за зьбягаючымі да яго пагоркамі. Віла стаяла на скале, і зь яе адкрываўся шыкоўны пейзаж.

Сьцены пакою былі абцягнуты цёмна-пурпуровай, амаль сіняй тканінай, бялізна на ложку таксам была ў колер цёмнага вінаграду, у тон якому быў тоўсты і мяккі дыван на чорнай паркетнай падлозе, які сваім адценьнем нагадваў сьпелы гранат, ці запечаную кроў. На сьцянах віселі малюнкі ў цяжкіх залатых рамах – старыя. На іх былі намаляваны нейкія пустынныя краявіды, і рэлігійныя і антычныя сцэны. Вялікі цёмна-карычневы палірааваны стол стаяў ля адчыненага вакну. Сучасны экран плазмы на ўсю сьцяну выглядаў чужынцам у гэтым сярэднявечным асяродзі – сапраўды каралеўскім. Яшчэ тут была невялікая канапка ў стыле ракако, і дзіцячая краватка – бялюткая, засланая чыстай дарагой сьветлай бялізнай у карунках. На цёмным палірааваным дрэве сталу стаяла мікрахвалёўка і вялікая каробка з цацкамі, і стойка з бутэлячкамі. Побач – у кошыку на падлозе – упакоўка памперсаў, на стуле – акуратна складзеныя пялёнкі. Было бачна, што пакой не прыстасаваны для дзіця. Быццам бы дзіця тут не чакалі. Быццам бы яно толькі што звалілася аднекуль у гэты шыкоўны, але ж такі змрочны і халодны, мужчынскі пакой.

З канапкі перад й узьнялася дзяўчына, якая сядзела ля калыскі, і качала перад вачыма дзіця яркай цацкай.

- Як добра, што вы прыйшлі. Мы вас даўно чакалі. Зусім змучыліся, - нягромка вымавіла яна.

Яна ветліва кіўнула. Імані адказала.

- Дзень добры, донна. Донна?

- Летыцыя. Завіце мяне проста Летыцыя, - вымавіла дзяўчо.

- А вы – Імані. Так?

- Так. Яна кіўнула ў адказ, і наблізілася да пары, стаўшы перад калыскай.

Цяпер яна магла блізка разгледзець дзяўчыну, якую больш не хаваў ад яе ліловы густы цень. І ўбачыла, што янп была прыгожай – такой, што ў Імані раптам захапіла подых. Высокая, тонкая, з доўгімі чорнымі валасамі, густымі і дагледжанымі, як мяккі расчасаны шоўк, з правільнымі рысамі вузкага твару і вялікімі вачыма. І – белай скурай. Скура дзяўчыны была белай, як малако. Як сьнег. Мужчына, хоць і чорнавалосы, таксама ня быў каляровым. Італьянец ці гішпанец, можа, з усходу. Аднак – не негрыцянскае расы. Хлопчык жа ў калысцы быў чорны і курчавы. Смуглявы, са скурай шакаладнага колеру, і густымі тырчашчымі спіралькамі валасамі. Ён глядзеў на Імані, і шырока ўсьміхаўся – пазнаў знаёмы твар.

- Мама!- раптам вымавіў ён, і пацягнуўся да яе ручкамі.

- Вы можаце ўзяць яго, Імані, - вымавіла дзяўчына. – Вы яму спадабаліся, гэта бачна адразу. Яна прывабна ўсьміхнулася. Не было бачна, каб яна адчувала нейкія асаблівыя эмоцыі да дзіця – ня болей, чым да кацяня, здалося Імані. – Яна не яго маці – зразумела яна. – Пэўна, маці ў хлопчыка іньшая. Пэўна, ранейшая жонка, аб якой чамусьці ня прынята размаўляць услых. І Імані ня будзе запытваць, бо гэта – прыватныя справы.

- Яго маці памерла, - ціха вымавіла дзяўчына. – Ня так даўно. Мне жаль, што так адбылося. Нам усім жаль. Міхась ня ведаў,

што гэта яго дзіця. Што ў яго – у нас – ёсьць дзіця. Яго маці нічога не сказала. Так атрымалася. Нажаль, гэты анёлак – сірата. Я хацела б любіць яго, але ж я – не яго маці. І мне яго дужа шкада. Яна нахінулася над калыскай, і пагладзіла хлопчыка на галаве – асьцярожна.

- Ён – такі мілы. Яна мякка ўсьміхнулася. – Ён есьць з бутэлячцы. Я хацела карміць яго грудзямі, але ж Міхась забараніў мне. Ён кажа, гэта не здарова. І яму ня трэба. Але ж я спрабавала, і яму спадабалася. У вас няма малака, Імані? – раптам запытала яна.

- Не, - Імані ўсьмінулася. – Але ж у мяне шмат вопыту.

- Я ўсё роўна хацела б яго карміць, - ціха вымавіла дзяўчына. – Ён такі харошанькі. Такі прыгожы, як Амурчык. Мілы. Габрыэль. Яго завуць Габрыэль – як арханёла, які прынёс Марыі вестку аб непарочным зачацьці. Яе тонкая рука пагладзіла Габрыэля па шчацэ. Дзяўчына была апранутая ў дарагую шаўковую піжаму-касьцюм, абшытую карункамі па рукавах і краі штаноў мяккага чорнага колеру, пад пояс. На яе шыі і ў вушах пабліскквалі дыямантавыя ўпрыгожаньні, як і на танюткіх доўгіх пальцах вытанчаных рук.

І яна была маладой – зусім. Можа, няма і дваццаці гадоў. Але ж калі сьвет падаў так, як цяпер, ахутваючы яе ліловым ценем, яна сдавалася сталай, пражыўшай доўгае жыцьцё жанчынай, прыгожай і дагледжанай, з ідэаяльнай парцалянавай скурай, над якой быццам бы ня быў уладны час. Аднак у сьвятле ранішняга сонца яе твар ізноў набываў дзіцячыя рысы. Гэта было дзіўна – гульня часу на мяжы цяпер і бясконцасьці, імгненьня і адвечнасьці. Раптам Імані зразумела, што справа – у яе твары. Гэта была адвечная прыгажосьць, прыгажосьць сталай, можна сказаць, што і старай, старажытнай душы, якая дзівосна жыла ў гэтым маладым, юначым целе.

Мужчына ўнізе быў стары, значна старэй за яе, аднак і яго зьнештасьць ня мела адбіткаў часу. Яны абодзьва здаваліся адвечнымі, трывалымі, як Бог і Багіня, сышоўшыя з Алімпу, дзе ім надакучыла, каб пазабаўляцца, гуляючы ў гульні сьмяротных.

- Вазьміце яго, Імані. Ён хоча да вас, - ціха вымавіла дзяўчына, і Імані працягнула да яго рукі. Узьняла хлопчыка, і ён ахапіў яе за шыю, і рассьмяяўся.

- Усё – тут. Калі што патрэбна, званіце. Ванная – вунь там. Яна паказала ўбок. – Я пайду ўніз, бо мой муж ужо гадзіну чакае сьняданку. Яна ўсьміхнулася.

- Мужчыны – як дзеці. Заўсёды – дзеці, - ціха вымавіла яна з прывабнай усьмешкай на ружовых вуснах.

Дзяўчына павярнулася, і сышла, ціха зачыніўшы дзьверы. Імані засталася стаяць зь дзіцём на руках – чорная мадонна, нібыта выразаная з абенавага дрэву.

- Яна так спакойна гаворыць аб гэтым, - падумалася ёй. – Аб тым, што яе муж меў адносіны з іншай жанчынай, ад якой нарадзіў дзіця. І якая памёрла. Можа – менавіта па-гэтаму. І можа, што дзяўчына была пераможцай у гэтай жаночай гульні – канкурэнціі за выдатнага самца. Яе малады ўзрост і незвычайная прыгажосьць выдавалі густ мужчыны да прыгожага жаночага целу, ён быў эстетам, і яго не палохала розьніца ва ўзросьце. У такім прыгожым асяродзі гэтая юная багіня здавалася часткай малюнку, які быў прапісаны дасканалым мастаком для сябе – для свайго задавальненьня. Цікава, дзе ў гэтым ідэальным мужчынскім сьвеце месца ёй? – падумала яна. – І ёй, Імані, таксама. У агенстве сказалі, што ёй прыйдзецца жыць тут увесь час – па крайняй меры, пакуль дзіця не падрасьце. Што ж, яна ня супраць, бо ісьці ёй сапраўды некуды. Яна мякка ўсьміхнулася дзіцячаму тварыку насупраць яе твару. Апусьціла Габрыэля ў калыску. Разьмяшала і падагрэла сумясь. Раптам тэлефон на стале зазваніў – унутраны. Яна зьняла трубку.

- Імані, прабачце, я забыла сказаць. Калі я вызвалюся, я пакажу вам ваш пакой. І будучы пакой Габрыэля. Сёньня павінны прывезьці мэблю. І я хацела б паказаць вам каталог. Пакуль вы можаце прагуляцца зь ім, там, у калідоры, каляска. І аддзеньне – у сумцы за сталом на падлозе. Тэлефон хутка адключыўся, і яна глянула ўбок – вялікая сумка на калёсіках стаяла, дзе было сказана. Яна нахінулася, і пачала разьбіраць рэчы. Габрыэль

нешта засьпяваў на сваёй малечай мове – распавядаў ёй пра сваё жыцьцё, зразумела яна.

- І я такая ж, як ты, Габрыэль, - ціха адказала яна. – Чужая ў гэтай краіне, і ў гэтым багатым, незразумелым нам сьвеце. А там, адкуль я родам, шмат пяску. І ён такі прыгожы і залаты пад ранішнім небам.

Дзіцё замёрла, прыслухоўваючыся да яе, пакуль яна распавядала яму казцы – аб сьпякотнай краіне, адкуль яны выйшлі, яе старыя казкі і легенды, і яго закалыхваў яе мяккі, напеўны голас.

Глава 56: Люстра

Пакінуўшы Імані ў пакоі разам з Габрыэлем, яна апусьцілася па ступеньках уніз, мякка ступаючы па барвоваму дывану. Ён сядзеў, трымаючы тэлефон у руцэ. Потым адлажыў яго ў бок, і задумаўся аб нечым. Сонечныя промні з вакна наўскось краналі яго твар, высьвятляючы адныя рысы і паглыбляючы другія, робячы чарней вочы, вастрэй скулы і масіўней лоб, надброўныя дугі і нос, падбародак, надаючы профілю выраз драпежнай птушкі з вострымі, пільнымі вачыма. Яго чорныя валасы хваляй ляжалі на шырокіх плячох, вугальныя на сьветлай ільнянай тканіне.

Ён сядзеў, закінуўшы нагу на нагу, і сонечны праменьчык адбіваўся ў начышчанай глянцавай паверхні бацінку. Рука зь цяжкім гадзіньнікам ляжала на сьпінке канапы, расслабленая, вялікая кісьць яе метадычна пастуквала пальцамі па скуры.

Другая рука, пакінуўшы тэлефон на канапе, пагладжвала, пашчыпвала бараду - густую, чорную, пакрываючую шчокі.

Пачуўшы яе крокі, хоць і асьцярожныя, і мяккія, ён павярнуўся, і ўсьміхнуўся ёй.

Яна сышла па ступеньках, і падышла да яго. Кранула сьпінку канапы, і ён накрыў яе руку далоньню.

- Хадзі да мяне, - нягромка вымавіў. - Птушаня маё.

У ранішнім сьвятле яна выглядала яшчэ больш кранальнай, маленькай, танюткай у сваім чорным шаўковым строі, яе рука была гладкай і прахалоднай, белай, як лілея апоўначы на чорнай вазёрнай гладзі.

- Ну, як табе дапаможніца? - запытаў, гледзячы ёй у вочы.

Яго вочы, ласкавыя, песьцілі яе твар, гладзілі яго позіркам, як прамені гладзяць блакіт небасьхілу, праганяючы аблокі смутку.

- Усё добра, каханы. Бачна, што ў яе ёсьць вопыт. І Габрыэль палюбіў яе адразу - нават назваў мамай.

- Добра. Ён кіўнуў. І раптам замаўчаў. Прыцягнуў яе да сябе.

Яго вусны знаходзіліся насупраць яе вуснаў, твар - зусім блізка ад твару, так, што вочы, здаецца, пазіралі ў самую яе душу.

Моўчкі ён наблізіў яе да сябе рукой, так, што яго губы кранулі яе губы. Яна закрыла вочы. Яго рукі гладзілі яе сьпіну, вусны мякка дакраналіся да вуснаў. Яна пагладзіла яго твар рукой, адчуваючы далоньню колкі волас яго барады, і мяккасьць і цяплыню яго скуры.

Яна нешта ўспамінала, нешта ірвалася з глыбіняў яе памяці. Ён ужо цалаваў яе так - даўно. Прагна і пяшчотна, горка і салодка, уліваючы ў яе ўсё сваё каханьне, перадаючы ёй свае сілы, полымя сваёй душы, якое мякка агортвала яе сакалінымі крыламі.

Яна ахапіла яго за шыю, прыціскаючыся да яго грудзей.

- Ты хочаш дзіця? - ціха вымавіў ён, гладзячы яе.

- Так. Яна закрыла вочы, адказваючы на мяккія рухі яго вуснаў.

- Ты сама - як дзіця, - ціха вымавіў ён. Яго рука ўзьняла яе блюзку, накрыла пад тканінай грудзі. Яго далонь адчувала яе мяккае пяшчотнае цела, набухлыя саскі, тонкую шаўкавістую скуру. Яе жаночую бездапаможнасьць перад ім, яе адданасьць яму, яе пакору, тое, што яна пойдзе за ім усюды, і аддасі яму ўсю сябе, толькі за адное - яго каханьне, болей за якое ёй ничога не было трэба.

Ён разшпіліў гузікі яе кашулі, апусьціў яе з плечаў, палажыў рукі на сьцёгны, і зьняў шаўкавісты ніз піжамы. Цяпер яна была поўнасьцю аголеная перад ім - так, як ён любіў. Ён нахіліўся да яе мяккіх уздрыгваючых грудзей, дакрануўся вуснамі да прыпухлага ружовага саску. Яе цела рабілася жаночым, яшчэ больш мяккім, яшчэ больш прывабным.

У яго руках яна была поўнасьцю ў яго ўладзе, тонкая і гібкая,

далікатная, здаецца, яе магла перахапіць адна яго далонь. Яго рукі былі цёмныя, цяжкія насупраць яе белай скуры, тонкага цела. Грубыя, вялікія рукі. Але ж зь ёй яны былі далікатнымі, быццам ён кранаў матылька. Быццам бы яны гладзілі паветра - анёльскі вобраз у прасторы, якім яна была для яго.

- Лажыся, - ціха вымавіў ён, і асьцярожна апусьціў яе на канапу. Яна лягла, адкінуўшыся на сьпінку галавой. Яе чорныя валасы зьвешваліся покрывам, сасьлізнуўшы па чорнай скуры. Белае цела на чорнай глянцавай паверхні, чотка акрэсьленае, выляпленае мяккімі плаўнымі контурамі, крыху вільготнае ўнізе, крыху бліскучае ад яго і яе поту, запрашала паглыбіцца ў сябе, уціснуцца тварам, ахінуць рукамі, прыціснуцца грудзямі да грудзей.

Ён разшпіліў кашулю, і зьняў, кінуўшы збоч на сьпінку. Вызваліў свой чэлес, і нахінуўся над ёй, рассунуўшы яе сьцёгны, надзьвігаючыся на яе, як навальнічная хмара надзьвігаецца на край небасьхілу - няўмольна, закрываючы яе сабой, як цемра перад бурай закрывае чыстае неба, гасячы яго сьвятло. Нахіліўся над ёй, апёршыся на руках, прыціскаючыся грудзямі, і ўвайшоў у яе, уціскваючы ў яе свой чэлес, моцна націскаючы, рассоўваючы яе сьціснутыя мышцы, адчуваючы, як яе ўлоньне робіцца вільготным ад руху ў ёй яго плоці.

Яна глуха ўскрыквала, прыціскаючыся да яго, і між волі адштурхваючы, і тады ён прыціскаў яе да сябе рукамі. Ён, пэўна, рабіўся грубым, бо цяпер жадаў узяць ад яе ўсё, і нават болей, цяпер яго жарсьць вяла яго, яго асалода. Маланкі сатрасалі зямлю, удараючы ў яе ўсё хутчэй, запальваючы самыя яе нетры.

- Я - Пярун, - шаптаў ён горача. - Ці ты чуеш? Чуеш, як грыміць навальніца? Як яна набліжаецца?

- Я чую, як Бог уваходзіць у мяне, каханы, - ціха прастагнала яна. - Бог мой. Ты - Бог мой, айцец неба і муж зямлі.

Яе ўзьнятыя калені сьцісквалі яго, яна ўскрыквала, сатрасаючыся ад удараў яго плоці.

Ён быў Богам паганскім, Богам камянёў і дрэваў, нябёсаў і маланак, апладняючым глыбіні маці, працінаючым яе вантробы ў поўным, апантаным зьліцьці, ня ведаючым межаў прыстойнасьці і дазволенага. Сарваў зь сябе ўсе аковы, запаліўся сам, і запаліў яе. Яе цела ўздрыгвала пад ім, быццам яна паміралa. Нарэшце, яго семя пацякло вонкі, запоўніла яе і вылілася вакол. Ён прыпаў да яе, гладзячы яе сьцёгны рукамі.

- О, татарочка! Красавица! - узрадваўся Фёдар, убачыўшы яе. Яна спусьцілася па лесьвіцы, і падышла да яго. Пацалавала. Ён адказаў ёй і нягромка запытаў нешта. Што - Фёдар ня чуў. Яна села яму на калені, і яны пачалі цалавацца. Яго рукі ляглі ёй на грудзі.

Быццам бы яны яго ня бачылі. Нібыта яго тут не было.

- Яна ня бачыць цябе. Ён пачуў голас, і нібыта прачнуўся. Гаспадар сядзеў перад ім - цяпер ён называў яго Гаспадар. Яму здавалася - так правільна, і іньшага імя ён ня мог вымавіць.

І ў той жа час ён, Гаспадар, Пан, лашчыў і распранаў яе цела. Быў там, і адначасова быў перад ім, і размаўляў зь ім.

- Как это возможно, Господи? - ціха запытаў Фёдар.

- Магчыма, - усьміхнуўшыся, адказаў ён. - Для цябе я адзін, а для яе - я другі, Федзя.

Я ж існую для ўсіх, і для яе, і для цябе, таксама.

- А какой ты для меня, Господи? - ціха запытаў яго Фёдар. У вачах яго дрыжэлі сьлёзы.

- А вось пра гэта ты хутка даведаешся, - вымавіў ён. І ўсьміхнуўся. Фёдару здалося, што ў яго вачах ён бачыць полымя - полымя пекла. І раптам яму стала жудасна, горка і страшна, як ніколі не было ў жыцьці.

- Перад сабой ён бачыў, як іх целы зьліваюцца - цемра і сьвятло, ноч і дзень, апантанасьць буры і лятучыя ў ёй яблыневыя пялёсткі. Яна гучэла ў яго руках, як струна, на якой у бязьмежжы космаса гуляла рука Бога. Цяпер, калі іх целы

зьліваліся, ён бачыў яе не татарачкай. Яна была - багіняй. Цёмнай, небясьпечнай, пагрознай, пякучай і апаляючай, як удар пугі. Той жа, хто рухаўся на ёй, быў Богам у цемры, апладняючым ноч сьвятлом, полымем, запальваючым зоркі.

За сьпіной яго Гаспадара і Пана віравала бязьмежнасьць космасу, сутыкаліся і нараджаліся галактыкі, праносіліся каметы, і сонцы, народжаныя, узрываліся, каб нарадзіцца ізноў.

- Что это? - прашаптаў ён ціха, ледзь чутна.

- Цяпер ты бачыш сьвет так, як бачу яго я, - прагучэў ціхі адказ.

- И он - такой? - запытаў ён здзіўлена-недаверліва.

- Ён - такі. Чалавек перад ім кіўнуў.

- Мишаня, понять я не могу. Фёдар разгублена пачухаў патыліцу. - Так Бог ты, или нет?

Чалавек перад ім усьміхнуўся. Простай, прывабнай усьмешкай. Ён выглядаў зусім па-звычайнаму, і нагадваў яму некага - кагосьці, каго ён добра ведаў у жыцьці.

- Мишаня, ты это? Или - Бог? Фёдар запытаў зусім ужо маркотна, засмучана.

- Я. Ён коратка кіўнуў, і ўсьміхнуўся. - Я гэта, Федзя. А зараз мы з табой пойдзем.

- Куда? Фёдар схамянуўся.

- Уніз. Ён паціснуў плячыма. - Туды - да мяне.

- В ад? У голасе Фёдара жах мяшаўся з асуджанасьцю.

- Уніз. Ён устаў, і паклікаў яго рукой. Фёдар ціха, пакорліва пакрочыў за ім.

Павольна яны прайшлі вялікае лобі. Гаспадар таўкануў незаўважныя дзьверы ў сьцяне, і запаліў сьвятло. Па нізкаму, цёмнаму ходу яны апусьціліся ў сутарэньні – шырокі доўгі

калідор, уздоўж якога па абодзьвы бакі былі высокія крэпкія дзьверы, выразаныя з дрэва такога старога, што яно, пэўна, ужо пераўтварылася ў вугаль на гэтакай глыбіні. Што яны глыбока, значна глыбей, чым самае глыбокае сутарэньне гэтага сьвету, ён проста адчуваў скурай, хаця яны прайшлі ўніз толькі некалькі лесьвічных пралётаў.

- Гэта тут. Міхась, нарэшце, таўкануў дзьверы рукой. Яны ўвайшлі ў вялікі цёмны пакой, які ярка асьвятліла электрычнае сьвятло.

- Где бы я ни был, но свет тут горит, - узрадваўся Фёдар. А гэта значыць, што ня ўсё гэтак блага, як ён спачатку ўяўляў.

У пакоі не было нічога асаблівага – цёмныя драўляныя куфары ўздоўж сьценаў – старыя, разьбяныя, каваныя.

- Я знайшоў гэты пакой, калі аглядаў вілу, - патлумачыў Міхась. – Ты мне яе прадаў, а Джаваньні паказаў яе таямніцы. Джаваньні Гамбіні. Ведаеш такога?

- Конечно, знаю. Одна из наиболее могущественных мафиозных семей Италии. Фёдар насьцярожана глянуў на яго.

- Только откуда он знает всё это про виллу? И откуда ты знаешь его?

- А ты ня ў яго яе пакупаў? – цяпер прыйшла чарга зьдзіўляцца ўжо Міхасю.

- Нет. Фёдар ашалела пакруціў галавой.

- Ладна, тады праехалі. Міхась махнуў рукой. – Слухай, а ў каго ты купіў гэтую вілу? – пацікавіўся ён.

- У агенства. Фёдар паціснуў плячыма. – Она заброшеная была. Почти разрушилась. Я её отреконструировал с нуля. Ну, как я. Специалисты. Я нанял. Просто позвонил в агентство – Машка позвонила. Секретутка. Ну, она нашла по интернету. Они сказали – да, всё классно, вилла 15-го века. Можно брать. И скидка хорошая. Почти даром отдали, при условии реконструкции. Ну, реконструкция мне обошлась не дорого –

несколько миллионов. Только разве это деньги? – ён паціснуў плячыма.

- Ладна. Разумею я, што ты нічога не разумееш, і нічога ня ведаеш. Міхась усьміхнуўся. – Толькі апынулася так, што гэта – мая віла.

- Конечно, твоя. Фёдар кіўнуў. – Я же тебе её подарил.

- Так, толькі яна была мая, - удакладніў Міхась.

- Нет, она и сейчас твоя. Я от своих слов не отказываюсь. Фёдар пакруціў галавой.

- Ня ў тым сэньсе. Была мая ў 15-м стагоддзі. Я яе купіў. Для сына. Сын мой тут жыў, калі зь Літвы прыйшлося з'ехаць. Прыкладна, як і цяпер. Міхась спакойна глядзеў на яго.

- Мишаня, ты что? Ошалел? Ты шутишь так? Ты так не шути. А чего ты меня в подвал завёл? – Фёдар раптам пачаў насоўвацца на яго.

Міхась спакойна спыніў яго, палажыўшы руку на плячо. Рука трымала яго крэпка – ня ськінеш.

- Значит, с ума сошёл, - задаволена вымавіў Фёдар.

- Не. Міхась пакруціў галавой. – Не звар'яцеў я, Федзя. І ня з'ехаў з глузду. Гэта ты, Федзя, нічога не разумееш. Але хутка зразумееш – усё, і нават болей. Ты ня бойся. Стой тут. Я цябе не крану. Толькі пакажу нешта.

Ён спакойна прайшоў наперад, пасунуўшы Фёдара рукой, і адкінуў цяжкі аксамітны покрыў зь нечага, што здавалася чарговым куфарам ці шафай, але ж насамрэч апынулася вялікім люстэркам, якое стаяла перад імі ў цяжкой залочанай раме ў весь іх немалы рост.

- Что это? Зеркало какое-то, - зьдзіўлена вымавіў Фёдар, пазіраючы на яго.

- Да ты падыдзі, паглядзі. Ён лёгка штурхануў яго наперад.

Не жадаючы непакоіць вар'ята, Фёдар зрабіў некалькі крокаў, і апынуўся прама перад цёмнай, крыху парэпанай паверхняй старога шклу. У люстры нічога не адлюстроўвалася. Зусім нічога. Там панавала цемра. І раптам праз гэтую цемру Фёдар пачаў нешта бачыць. Але ж – не сябе. Зьдзіўлена ён назіраў, як перад ім з'яўляюцца твары – мужчынскі і жаночы. Ня гледзячы на старажытнае, здаецца, сатлелае, хоць і багатае адзеньне, ён спазнаў яе, і яго.

- Татарочка! – зьдзіўлена вымавіў ён, заглядаючы ў глыбіню шклу. – И – ты! Ты, Мишаня! Ты с татарочкой в зеркале, и одеты как-то … прикольно. А чё, классно вы одеты. Шикарно выглядите. Круто. Вот теперь вы как будто настоящие. Ён наўпрасткі прыціснуўся да шклу носам.

- Ой, а что это? Ёлки какие-то вокруг. Лес там, что ли? Слушай, а как это? Фокус такой? Экран там какой-то? Фёдар зьдзіўлена павярнуўся да яго.

- Настаяшчыя мы, Федзя. Самыя што ні на ёсьць, - спакойна вымавіў Міхась. Ніякага фокусу. І ніякага экрану. Гэта – Памежжа. Толькі ты туды ня трапіш. Ты, Федзя, трапіш у іньшае месца – тут, на зямлі. Аднак час будзе другі. Цікавы час. Нябесьпечны, праўда. Ну, а калі нам было лёгка. А ведаеш, Федзя. Я цябе нават зайздрошчу. Чэсна. Раптоўна твары ў люстэрку перад імі зьніклі, і толькі елкі засталіся.

- І я там буду. І яна – таксама. Так што ты не хвалюйся. Я цябе прыму, не пасьпееш і да трох далічыць. Фёдар глядзеў на яго, адкрыўшы рот. Але ж не пасьпеў сказаць нічога – Міхась моцна штурхануў яго наперад, у адчыненыя ў прасторы дзьверы. Шкло нібыта правалілася, рама разышлася, і зьнікла, і Фёдар апынуўся ў лесе. Глухім, цёмным. Восеньскім ці вясновым, бо было мокра, і вакол хлюпала, а пад нагамі ляжаў сьнег. Рэшткі сьнегу на чорнай мокрай зямлі. Што яна мокрая, ён адчуў адразу, бо пальцам стала халодна. Раптам ён заўважыў, што стаіць пасярод гушчару босы. А калі ўзьняў позірк крыху вышэй, то зразумеў, што да таго ж і голы. Можа, на ім і была якая кашуля, толькі рэшткі яе сатлелі – адныя ніткі засталіся на плячах. Прыкрыўшы срам рукой, Фёдар аглядаўся, нічога не разумеючы. Раптам аднекуль здалёк пачуўся конскі тупат.

- Упалявалі мы яго, княжа! Вось ён! Чараўнік! Ваўкалака! Той, што дзевак порціў, і худобу рэзаў! – пачуліся галасы. З-за елак паказалася сьвятло – да яго з паходнямі беглі людзі.

- Я никого не портил, ничего не резал! – Кто вы? Фёдар прыкрыў вочы рукой.

- Ня трож яго! Жывым браць! Акружыць у кола! – пачуўся нечы густы, нізкі, уладны голас.

- Живым, живым меня брать! Я всё объясню! Я только что на вилле был! – Фёдар з крыкам кінуўся да вялікага чорнага каня, на якім сядзеў магутны цяжкі вой, апрануты ў скураныя латы зь металёвымі пласьцінамі і высокі шэлом на галаве.

- На вілы ты яшчэ пасьпееш. Не сьпяшайся. Раптам вой ашчэрыўся ў вусьмешцы. І адразу Фёдар спазнаў яго голас.

- Миша! Мишаня! Ты ли это? – асьцярожна запытаў ён, пассоўваючыся бліжэй. Адначасова ў яго упёрліся некалькі дзідаў. Князь узьняў руку.

- Княже Ўсяславе, вязаць яго? – пачуўся хрыплаваты мужчынскі голас. – Чарцяка праклятy Гаспадара кліча.

- Ня трэба. У гэтым лесе – адзін гаспадар. Я.

Чалавек на кані павярнуўся некуды ў цемру. – Гэта не ваўкалака. Варяже. Звар'яцеў, пэўна. Яны грыбы ядуць, потым па лесе голымі шляюцца. Дзевак палохаюць. І скот могут драць. Ты ачуняў, ці вязаць цябе? – павярнуўся ён да Фёдара.

- Ачуняў, - пакорліва вымавіў той.

- Яр, з табой на кані паедзе. Я яго ведаю. У чудзінаў бачыў. З урманаў ён.

- Geeht zee aber ridet? – запытаў ён яго – здаецца, па-нямецку.

- Gut. Drive. Horse. Фёдар раз'вёў рукамі.

Глава 57: Воўк

- Мара. Дзяўчынка мая прыгожая. Мой трапяткі вагеньчык. Яго вусны пяшчотна кранаюць яе вусны. Закрываюць пацалункамі вочы. Яна яшчэ не разумее, што ён кажа. Але яна разумее мову яго рук, яго вуснаў, яго позірку і яго цела.

Ён асьцярожна распранае яе, гладзіць яе скуру, пакрывае яе цела пацалункамі, ад якіх у яе кружыцца галава.

- Сонейка маё, - ціха шэпча ён. - Каханая. І яна абмякае ў яго руках, пакорлівая, як ягня перад ільвом. Ён і сапраўды нагадвае ільва - агнявым позіркам суворых вачэй пад нізкімі бровамі, доўгай грывай чорных густых валасоў, моцай і гуляючымі цягламі, і цяжкім, апальваючым яе дыханьнем. Льва пустыні, які, ласкавы і пагрозны, сьхіляецца над яе целам. Яго вусны кранаюць яе, язык аблізвае плоць.

- Не баішся мяне болей? Ня бойся мяне, дзяўчынка мая каханая. Анёлачак, птушачка мая. Яна абдымае яго шыю, і ён нахіляецца да яе грудзей, прыціскаючыся да іх вуснамі.

- Скарыся, скарыся, - ціха шэпчуць яны: ня словамі. Яны гавораць пацалункамі, моваю шапаценьня кветак, калі па ім дробна біюць дажджавыя кроплі. Моваю вятрыскі. Моваю анёлаў.

Ён доўга цалуе яе саскі, уздрыгваючы ад жаданьня, якое гуляе па яго целу гарачай хваляй, намагаючыся як мага далей адцягнуць гэты час, калі ён ня зможа болей трымацца, калі будзе вымушаны прычыніць ёй боль ад зьліцьця зь яго вялікім целам. Ён цалуе яе вусны, грудзі, жывот, дакранаецца да яе рукой, адчуваючы, што яна ўжо вільготная там, у глыбіні, куды так прагне паглыбіцца яго чэлес.

- Футра, і ўсё, што панна жадае. Што яшчэ ў цябе ёсьць. Краскі, упрыгожваньні, бялізна, тканіны. Сонейка, не саромься - бяры, што падабаецца. Што хочаш.

Ён крута паварочваецца, і высыпае на стол прыгаршню залатых дукатаў. Купец акругляе вочы. Мала хто так шчодра адзяляў яго манетай, нават не лічачы яе. Гэты высокі, цяжкі чалавек палохае яго. І можа быць так, што, круты норавам, шчодры і лагодны, праз імгненьне ён выхапіць шаблю з похваў, і ураз перарубіць шыю. Ці проста секане. Так, дзеля шуткі. Забярэ і грошы, і тавар, і яго бедную галаву. Яго вочы шалёныя, рука цяжкая. І бачна, што забівала яна ня раз. Але ж калі гандляр пераводзіць вочы на дзяўчо, то яго думкі сьцішваюцца, і лагаднее позірк. Бо перад ім сядзіць, і пазірае на яго анёл. Маленькая, танюткая, як сьцяблінка. Мо, гадоў пятнаццаць ці шаснаццаць, ня болей. Паўднёвая кветачка, расквітнеўшая пасярод суворай літоўскай зімы, ластаўка, пасеўшая на шырокія грудзі магутнае гары. Мужчына выглядае побач зь ёй, як каменны кумір страшнога паганскага бога. Яна ж - прыгожая як Прачыстая, ці - як пэры, агнявая прыгажуня са сказак, якія распавядае пустыня, шапочучы барханамі.

- Ну, дай паглядзець, што ты абрала. Каралеўна мая. Ён усьміхаецца - яна радуе яго сэрца. Ён гладзіць яе вялікай рукой, і прыжмурвае вока, калі гандляр раскладае перад ім пакупкі: чорнае сабалінае футра на ядвабным падкладзе з аграфам з гарашчых як жар каменьчыкаў, цяжкую парчовую верхнюю сукню ў колер старога золата, лазурна-блакітную і травяніста-зялёную атласную сукенку, і багата аздобленыя карункамі ніжнія кашулі з танюткага белага ільну. Асобна выкладае каралі са скрэпленых ланцужкамі залатых бляшак з лалам. І завушніцы - доўгія, з "рамеяў", якія будуць ціхенька шапацець, лашчачы яе тонкую шыю.

Ён прыдзірліва аглядае ўсё спрактыкаваным вокам.

- Годны тавар. Не схлусіў. Сумленны ты. Ён сыпе на прыгаршню манетаў яшчэ некалькі. Купец нізка нахіляецца, выціраючы пот з ілбу.

Яны застаюцца адны, і ён садзіцца ў крэсла, адкінуўшыся, гледзячы на яе. Яго вусны ўсьміхаюцца - ледзь заўважна, самымі вугалкамі, якія хаваюць густыя вусы.

- Падабаецца табе, прыгажуня мая?

Ён робіць ёй знак падыйсьці рукой.

- Так …, - яна набліжаецца, чырванеючы ад яго позірку. Яна яшчэ крыху палохаецца і саромеецца яго, хоць яны ўжо колькісь часу тут, дома. Вялікія пакоі драўлянага палацу, у якім яны спыніліся, яго гарадскога жытла, пакуль ня сталі для яе сваімі. Але ж ён - ён ужо для яе родны, любы, адзіны і самы каханы. Гэта яна даўно ведае, і памятае. І яна такая шчасьлівая, што ён знайшоў яе, а яна дачакалася яго. Толькі словаў яшчэ ведае мала - ён зрэдку пераходзіць на лаціну, але ж цяпер, тут, мова яго незнаёмая, лагодная і мяккая, як ручай.

- Апраніся, - кажа ён. - У новае. Пакажыся мне. Яна здымае сукенку і сарочку, і раптам застывае пад яго позіркам. Яго вочы пякучыя і ласкавыя, яны і вабяць, і палохаюць яе. Ён усьміхаецца, і яна чырванее - здаецца, усім целам. Яна такая прыгожая і пяшчотная, ружовая кветачка, думае ён. Стаіць перад ім, як сьцяблінка, маленькая, танюткая, такая, што, здаецца, сонечныя промні зьзяюць скрозь яе, апранутая ў яркае палудзённае сьвятло. Яна сама ня ведае свайго хараства - прыгажосьці юнага дзявочага цела, якое - сама чысьціня, сама цнота, і ласка, радасьць для яго вачэй. Так, ён ужо даўно не юнак. Але ж гэта і добра. Яе абароніць яго вопыт і сталасьць, і жарсьці яго дзікай душы даўно ўжо падпарадкоўваюцца адзінаму руху яго думкі. Некалі даўно ён ужо згубіў яе - цяпер гэтай памылкі ён не дапусьціць. Крый яго божа, каб зьняважыць ці зганьбіць яе. Яна для яго - сьвятая. Яна - яго жыцьцё.

- Хадзі да мяне, - ціха кажа ён. - Ня трэба апранацца. Яна набліжаецца да яго, і ён прыцягвае яе да сябе. Яго крэпкія рукі моцна ахопліваюць яе, гладзяць яе сьцёгны. Ён асьцярожна кранае вуснамі яе цела, падхоплівае, і ўзьнімае. Апускаецца зь ёй на ложак. Яна прыкрывае вочы, заміраючы ў яго руках, уздрыгваючы, калі яго жарсьць робіцца ўсё больш і больш гарачай. Ён накрывае яе сабой, і яна ціха ўскрыквае, пакуль ён рухаецца, узьнімаючыся над ёй, і нахіляючыся, каб прыпасьць да яе вуснаў вуснамі. Яго цела, вялікае і цяжкое, рассоўвае яе цела, ірве яго, паглыбляючыся, як меч, у похвы яе плоці.

- Памятаеш? – шэпча ён.

- Памятаю.

- Не забудзешь?

- Не забуду.

- Ты - мая мара, каханая. Ён з рычаньнем выліваецца ў яе, уздрыгвае і замірае.

Цяпер яны ляжаць, абняўшыся. Яе галава - на яго плячы.

- Мне так хораша, каханы, - ціха кажа яна. Ён цалуе яе вочкі-зорачкі. Прытуляе яе да сябе.

- У цэлым сьвеце няма нікога, даражэйшага за цябе, любая. Яго голас і рука - тое, што дае ёй жыцьцё.

- Ты - мая Мара. Яна гладзіць яго па шчацэ - чалавека-ваўка, абдымае і кладзе яго галаву сабе на грудзі. - Усё мінула, каханы, - ціха шэпча яна. І цяпер ты - са мной, а я - з табою.

Яго вусны ўсьміхаюцца, і ён мякка кранае яе шчаку. Ахінае яе рукой. Сонечны праменьчык падае яму на твар, і адтуль пераскоквае на яе – казыча скуру. Яна жмурыцца. Ён цалуе яе ізноў. Ён такі пяшчотны зь ёй, ласкавы. Быццам бы і не было тых момантаў дзікунства, драпежнасьці, калі яго рукі сьцісквалі яе цела, вусны прагна ўбіралі скуру, а яго плоць ірвала яе плоць, паглыбляючыся ў яе, як драпежнік паглыбляецца ў вантробы.

Яна выцягваецца ўздоўж яго, прыціскаючыся да яго ўсім целам, і ён ізноў цалуе яе – мякка, прытуляючы да сваіх грудзей. Ёй так хораша ляжаць ля яго, адчуваць яго гарачыню, пругкую скуру і крэпкія цяглы, густы волас на яго грудзях і жываце сваёй шаўкавістай скурай, калі ён гладзіць яе сьпіну, ягадзіцы, плечы, кранае губамі яе шыю, апускае твар у ямку паміж плячом і яе шчакой, і яго вусны цалуюць яе там – цалуюць горача, пяшчотна, палка. Ён шэпча ёй ласкавыя словы, ні для кога не зразумелыя, якія нічога ня значаць, але ж значаць усё – і для яе, і для яго. – Птушаня маё. Любая мая. Каханая. Яны проста ляжаць, прыціснуўшыся, зьліўшыся адно з адным на

ложку, купаючыся ў дзённым сьвятле.

- Чаму ты зрабіў мяне Марай, каханы? – запытвае яна яго, пазіраючы ў вочы.

- Таму, што ты – Мара. Сьмерць і жыцьцё, забойства, і нараджэньне герояў. Ён глядзіць у яе вочы, і яго твар – хлапечы, а вакол вачэй – маленькія праменьчыкі-зморшчынкі. Яго вусны выгнуты дугой – як лук Амура, пачуцьцёвыя, цяпер – ня жорсткія, такія, да якіх хочацца прыціснуцца сваімі, каб не раз'ядноўвацца ніколі.

- Гэта ня так, і я – усяго толькі дзяўчынка, - ціха кажа яна. Яе твар перад ім зьзяе прыгажосьцю такой дзівоснай, што яго вочы, здаецца, сьлепнуць, і перастаюць бачыць сьвет. Яны бачаць толькі яе – лашчаць яе, асьвятляючы кожную яе рысу, быццам бы праменьчыкі сонца песьцяць дзівосны крышталь.

Яна такая прыгожая, што яго сэрцу балюча. Яго каханьне глядзіцца ў люстра яе каханьня; адлюстроўваючы адно адно, яны зьліваюцца, і паміж імі загараецца полымя, у якім згарае ўсё, што не належыць гэтаму іх пачуцьцю. Ён гладзіць яе шчаку рукой – яна вялікая, цяжкая. Цёмная. Яна прыціскаецца да яе вуснамі, і яе пацалунак жжэ яго, нібы тонкае, пяшчотнае джала, лязо, працінаючае яго ў самай глыбіні – аж да сэрца.

- Чараўніца мая, - ціха кажа ён. – Ты – і сьмерць, і жыцьцё. І ўсё магчымае, і немагчымае для мяне. Я б аддаў табе цэлы сусьвет, але ж такая маласьць ня годная цябе. Таму я аддаў табе сябе самога – усяго цалкам. Я – увесь твой.

- А я – уся твая, - ціха кажа яна. Яе вочы зьзяюць шчасьцем, і пяшчотай.

- Як гэта магло адбыцца, што мы сустрэліся? – ціха запытвае яна. – Што ты мяне знайшоў?

- Я ніколі не губляў цябе, каханая. Яго вочы мякка пазіраюць у яе вочы, вусны дыхаюць насупраць вуснаў.

- І нічога страшнага насамрэч не было? – ціха запытвае яна.

- Было. Але ж – ненасамрэч. Гэта былі сны – страшныя, і прыўкрасныя. І заўсёды, у кожным зь іх я быў з табой побач. Ён кранае яе шчаку, і яна прыціскаецца да яго рукі губамі. Ад яго прыгажосьці ў яе захоплівае сэрца.

- Уся мая, - ціха кажа ён. – Мая – цалкам і поўнасьцю. Да кожнай жылачкі, да кожнага ўздыха. Да кожнага руху тваёй душы, і іскры духа. Толькі мая, і нічыя болей. Бо ж мая ўлада над табой моцная – мацней за ўсе сілы сусьвету.

- Ты авалодаў сьмерцю, каханы? – ціха запытвае яна яго, усьміхаючыся.

- Я авалодаў жыцьцём, любая, - сур'ёзна адказвае ён. Яго вочы – акіян сьвятла, у якім яна тоне, і губляецца ў бясконцасьці. Яна плыве на ім, як на лодцы, губляецца ў сьвятле, лежачы на яго грудзях. Яе шчака прыціснута да яго шчакі, і іх подых зьліваецца, і грудзі рухаюцца разам.

- Фенрыр, - ціха шэпча яна. – Воўк мой, скаланаючы сусьвет.

- А ты – тая, каму няма назвы. Красуня мая. Багіня над усімі багамі. Бо ж Мара валодае ўсім, і яе серп жне, і адчыняе браму, і калі падаюць каласы, агаляецца зямля, якая гатовіцца прыняць плоць і семя айца. Ты – зямля мая, цёмныя глыбіні, бязьмежнасьць космасу.

- А ты – маланка, працінаючая мяне, вогнены стоўп і залаты дождж, які ахінуў Данаю. Вагонь, які гарыць у маіх вантробах, веліч і слава сусьвету. Яна ня ведае, што яшчэ сказаць яму – у яе болей няма словаў. Ён – усё, воўк, і воран, і дрэва, і конь, і леў, і навальніца, і трон, і калясьніца, і той, хто ёй валодае, і хто сядзіць на троне, і кіруе конямі, і скарае ільва, і каму вораны сьпяваюць свае чорныя сьпевы мудрасьці. Той, хто праглынае і разрывае плоць, каб вызваліць зь яе птушку Сірын – дух жывы і гарачы. Ён – Бог чорны і белы, і Род, і Стрыбог – вецер вольны, і самое неба, і тое, што вышэй за яго, тое, назвы чаму яна ня ведае, ды затое ведае ён. Веды яго бязьмежныя, але ж якая пяшчотная яго рука, і якія салодкія яго вусны, зь якіх яна п'е ваду жыцьця. Праз вусны яго сьвятая кроў уваходзіць у яе, і яна прымае яго семя, якое яе апладняе, і з'ядноўвае зь ім.

Яна гладзіць яго чорныя валасы, і укладае яго галаву на сваіх грудзях, і ён ахоплівае яе рукамі.

- Фенрыр, Фенрыр, - ціха шэпча яна, і ўсьміхаецца, і ён сьмяецца, утыкаючыся тварам у яе цела, прыціскаючыся да грудзей ілбом і шчакамі, убіраючы носам яе пах.

- Я хацеў бы быць тваім ваўком, - ціха кажа ён ёй. – Я б украў цябе, і ўзяў бы цябе ў ваўчынай шкуры. І ты б нарадзіла ад мяне ваўчат. Ён ціха рычыць, і яна сьмяецца. Яго вусны блукаюць па яе целу. Ён сьцісквае яе рукамі, убіраючы яе тонкае цела, пяшчотныя грудзі і рэбры, праводзячы па ёй языком.

- Калі я воўк, то магу з'есьці цябе, - горача шэпча ён. – Ты такая салодкая, такая духмяная. Мая багіня.

- З'еш мяне. Праглыні. Разарві. Я гатовая на ўсё, толькі каб задаволіць твой голад. Спатоліць тваё жаданьне, - ціха кажа яна, заміраючы і адкідваючыся ў яго руках.

- Спатоліць маё жаданьне не магчыма, - ціха кажа ён. – Яно бясконцае, як калодзеж Міміра. Як сам сусьвет. Як бездань, у якую цягнуцца карані яго дрэва.

- Ты добра ведаеш старыя паданьні – начныя казкі поўначы. Воўк мой. Яна ахоплівае яго нагамі.

- Калі ты хочаш, я буду ваўком. Бо ж – так. Былі часы, калі я насіў ваўчыную скуру. Я ж – пярэварацень, памятаеш? І я не жартую, красуня мая. Ён паўстае над ёй, нахінаецца, і яго валасы кранаюць яе твар. Ён ціхенька рычыць – так, што у яе валаскі ўстаюць на скуры, а потым апускаецца, і кранае вуснамі яе ўлоньне. Ён вылізвае яе там, як вялікі воўк, і яго рукі ахопліваюць яе сьцёгны. Ён ціха стогне, стогне і яна. Узьнімаецца над ёй ізноў, і паглыбляе ў яе свой чэлес. Яна адкідваецца, узьнімае сьцёгны яму насустрач, і ён груба бярэ яе – так, як узяў бы зьвер, суцэльна аддаючыся жарсьці, якая валодае ім цалкам, запальваючы і яе. Яна стогне, прыціскаючыся да яго сьцёгнаў. І ўсё ж, ён – чалавек, чалавек, які адпускае на паляваньне зьвяра – драпежную істоту, і зьвер – яго скакун, і зброя, і аблічча, у якім ён блукае па цёмных лясох.

- Ты народзіш ад мяне ваўчат, - ціха кажа ён, выходзячы зь яе, і яна закрывае сваё ўлоньне рукамі – цёмную пячору, шчыльную плоць зямлі, выхад з кургана, дзе хаваюцца багі, цёмныя, старыя, драпежныя, і адвечна маладыя – багі новага народжанага сьвету, маладога і гарачага. Яна – Гея, а ён – Уран, і Кронас – айцец Багоў. Тытан, які ахінае яе, чыі пяшчотныя рукі здымаюць зь яе зорны покрыў, калі Нюкта пераўтвараецца ў Гемеру, зьзяючы аголеным целам, прыгажосьць якога выпальвае дзёрзкія вочы. Толькі ён – Айцец, Бог маланак, можа кранаць яе, бо яго сьвятло мацнейшае за ўсялякае сьвятор створанага сусьвету.

Яна засынае на яго цёмнай поўсьці, густой, як лес. – Фенрыр, Фенрыр, - ціха шэпча яна. Яе сьцёгны распахваюцца перад ім, похва прымае яго чэлес.

- Усё ж, я ўзяў цябе, - ціха шэпча ён, і голас яго нізкі, як рычаньне, калі з гор валяцца вялікія камяні.

- Я забраў цябе ў яго, бо я – больш, чым чалавек. Я – ён, і я – зьвер, і Бог. І цяпер ты гатовая ўмесьціць мяне ўсяго – айца нябёсаў і пекла, вогненнага ваўка і аднавокага бога-забойцу, які дзвевяць дзён вісеў на дрэве. Бо адно маё вока бачыць сьвятло, а пусты мой глаз бачыць цемру, і таму я – тут, і там, і мне вядомыя таямніцы перавёрнутага сусьвету, тыя, што хаваюцца ў яго каранях.

- А яшчэ я – леў, ляжачы ля ног баранка – ля тваіх пяшчотных ножак. Ён нахіляецца да яе, і кранае яе стапу вуснамі. Яго губы ўбіраюць яе пальчыкі, і яна сьмяецца.

- Твая ножка – маленькая, як у дзіця. І такая ж салодкая і мяккая. Ці ты ходзіш па зямлі, птушаня маё? – пэўна, што не. Ён прыціскаецца да яе скуры вуснамі, цалуе яе ступню, шчыкалатку, лытку, сьцягно. Яна сьмяецца, і упіраецца стапой у яго далонь – яго рука напалову больш за яе нагу, і ён пяшчотна сьцісквае яе ножку ў далонях, прыціскаючы яе да сэрца.

- Птушачка мая. Маленькая мая багіня. Велічная і пагрозная. Ён усьміхаецца.

- Я – твой раб і твой слуга. Я стварыў цябе, каб пакланяцца табе. Каб убагаўляць цябе, дзяўчынка мая.

- Я створана для цябе, каханы мой, - ціха кажа яна. Яны ляжаць побач. Яна выцягвае нагу, і прыціскае сваю ступню да яго. Яго скура цёмная, і грубая ў параўнаньні зь ёй, а яе – белая, пяшчотная, мяккая. Яна сьмяецца, калі бачыць іх ступні побач.

- Як можна быць такім вялікім? – зьдзіўлена запытвае яна. – Мая нага ўпалову меньш за тваю!

- Гэта не я вялікі, а ты – маленькая, золатка маё. Птушачка. Ён ахоплівае яе, і яна хавае галаву ў яго на грудзях.

- Ты раскажаш мне казкі? – ціха запытвае яна.

- Канешне. Любыя, якія жадаеш. У мяне шмат казак. Ты ж ведаеш. Ён цалуе яе густыя чорныя валасы.

-Мая маленькая вучаніца. Мая каханая.

- Бог мой, айцец мой, мой настаўнік, уладар майго сэрца, - ціха адказвае яна. Шчасьце ахоплівае і яе, і яго – бязьмежнае, чыстае, салодкае і балючае, калі ўсё непатрэбнае, неістотнае засталося ззаду і цяпер вакол зьзяе толькі чысьціня іх каханьня – адзінае, што існуе ў сьвеце.

Глава 58: Узлом

- Ты – грязное животное. Примитивное, грубое, и – тупое. И место твоё – в лесу. Говорят, у тебя много денег. Что ж, сейчас посмотрим – где, и сколько. Глеб хутка набраў пароль, і ўвайшоў у Сістэму – месца, дзе ўсе ведаюць пра ўсіх усё. Усе – гэта такія, як ён, а астатнія – гэта ўсе астатнія. Тыя, хто думае, што нешта на гэтым сьвеце можа заставацца таемным. Ён суха рассьмяяўся і ўвеў у страку пошуку фамілію, імя і імя па бацьку. Ня шмат на зямлі Міхаілаў Альгердавічаў Ваўковічаў – як і Іванаў Іванавічаў Івановых, насамрэч, няшмат. Хутка экран перад ім мірганўў, і на ім з'явіліся лічбы.

- Слушай, а ты в курсе, что Один в тюрягу присел? Из-за этой твоей бабы.

Сябар глядзеў на яго, прыжмурыўшыся. Алекс выцер пот з ілбу, і адпіў глыток з запацелага піўнога бакалу. Вясна толькі пачалася, а ўжо сьпякота накрыла горад. Мінск проста плыў гарачых сонечных праменях, як вялікі плаўлены сырок.

Алексу спадабалася, што той сказаў – тваёй. І сапраўды – яна яго баба. Была, і будзе заўсёды. Бо так, як ён трахаў яе, яе ніхто і ніколі ня трахаў, і ня трахне. Як бы яна не намагалася сыйсьці ад яго, з'ехаць – ад сябе ня сыйдзеш. Бо ж толькі ён ведаў яе сапраўдную – ведаў усе яе таямніцы, і цела, і душы – яе страхі і жаданьні, яе боль, яе ўразьлівасьць, яе пажаднасьць, чорную, ненажерную. Гэта не жанчына – монстр, пачвара, якая зьвядзе з розуму каго заўгодна. Яна і праўдна не чалавек – проста белае тонкае цела, якое выкручвае цябе ня горш за барабан пральнай машыны. Выжымае да апошняй кроплі, выпівае ўсе сокі. І ўсё роўна яе хочацца трахаць яшчэ і яшчэ. Усе, хто яе бачыў, становяцца проста апантанымі ёю. А хто ў яе ўваходзіў, той лічы што прапаў. Стаў яе пакорлівым рабом, халопам. Толькі ён, Алекс, здолеў вырвацца. Ён адзіны яе скарыў, і яна ня мела над ім улады – сваёй чорнай вядзьмарскай улады. Бо ён забараніў сабе яе кахаць. І гэта ён трахаў яе, а не яна яго. Ён

указаў ёй яе сапраўднае месца. Трымаў, як сучку на ланцугу. Забараніў сабе бачыць у ёй чалавека. Бо ж тады б ён прапаў таксама. Стаў бы проста яшчэ адным прагным херам, уваходзячым у яе похву, якім бы яна круціла, як жадала. Але ж ён здолеў перамагчы яе, і стаў яе гаспадаром. Як яна плакала ля яго ног, як маліла. Нішто не кранала яго – ніякія сьлёзы, жальбы. Гэты прыўкрасны твар, гэтыя вялікія вочы, нагадваючыя вочы анёла. Сьвятая дзева. Ён крыва ўсьміхнуўся. Толькі ён насамрэч ведаў, якая яна была сьвятая. Кожны раз, калі яна прасіла яго каханьня, ён зьдекваўся зь яе, трахаў супрацьпрыродным спосабам, аддаваў яе іншым, і з задавальненьнем глядзеў, як яна апускалася ўсё ніжэй і ніжэй. Ён ужо амаль перамог яе, і вось раптам з'явіўся той, другі, які проста забраў яе ў яго. І зь ім яна набыла моц незвычайную, нечалавечую. Бо яна нарэшце атрымала тое, што так жадала – каханьне. Каханьне Д'ябла. Падпісала зь ім дагавор. Цяпер яны натвораць разам справаў. Толькі ён будзе назіраць збоч – бо ж ён вольны ад яе чараў. Ды вось Одзіну ён не зайздросьціў. І здарылася ж так, што гэты дурань перайшоў ім дарогу, ня ведаючы, хто з гэтай пары больш небясьпечны. Зь Д'яблам можна было б дамовіцца. Зь ёй жа – не. Бо ж яна – сьмерць, што адбірае жыцьцё, і прага жыцьця, страшэнная смага, жаданьне паветра, якое ахоплівае паміраючага, калі ён прагне яе цела, якое ніколі не атрымае. Бо яе цела, насамрэч, мёртвае. Не існуючае. Яно не належыць гэтаму сьвету – гэта ён ужо зразумеў. Яно належыць толькі яму – Д'яблу, як і яна толькі яму належыць, як і належыла заўсёды. Так што ён з задавальненьнем паслухае, што ў Одзіна атрымалася.

Ён адпіў яшчэ глыток, і махнуў галавой:

- Працягвай. Я – увесь увага.

Лічбы ня дужа вялікія. Нейкія дзясяткі тысячаў еўра – у сэрядняй рукі італьянскім, і буйным нарвежскім банку. Ніякімі мільёнамі ня пахла наогул. Можа, калі абагульніць усё, то сума састаўляла крыху болей за тры сотні тысячаў. Пэўна, гэта ўсё, што засталося ад пакупкі дома, - зразумеў Глеб. Ці – варухнулася ў яго думка: грошы ёсьць, але схаваныя. І канешне ж, не на яго сапраўднае імя. Бо хто ж будзе афіцыйна паказваць

у сусьветнай банкаўскай сістэме не зусім чыстыя грошы. Ён думаў так, і між тым праліставў манітор. Лічбы плылі і плылі. Хутка пайшлі нейкія транзакцыі. І суммы гэтых транзакцыяў хутка пачалі перавышаць парог маючыхся на рахунках грошаў. Частка зь іх была аплачана налічнымі, у касу, другая – з розных рахункаў, якія цяпер, відавочна, былі закрытыя. А вось і зьдзелка з пакупкай дому – буйное нарвежскае агенства нярухомасьці аформіла дом на імя Летыцыі Юзафаўны Ваўковіч. Яны і сапраўды жанатыя, яна нават і фамілію памяняла, зразумеў ён. Аплата за дом паступіла зь нейкага складанага акаунта. Клікнуўшы па ідэнтыфікацыйных данных, ён паглыбіўся ў дэталі. Акаунт быў афіцыйны. Назва кампаніі не казала яму шмат. Дом для прыватнай асобы быў набыты нейкім інвестыцыйным фондам, зарэгістраваным у Мілане. Цікава было б паглядзець, што гэта за фонд. Ён запісаў назву ў невялікім чорным блакноце, які заўсёды меў з сабой на такі вось выпадак. Спадзяючыся на хуткую ўдачу, закінуў назву ў гугл. І – нічога. Гугл такой кампаніі ня ведаў. Ён набраў у страце пошуку запыт – знайсьці кампанію ў Італіі па рэгістрацыйнаму нумару і назве. Зайшоў у адкрыўшыйся сайт рэестру кампаній. Набраў імя. Рэзультаты, якія зьявіліся, відавочна не былі тым, што ён шукаў. Трэба было б нумар, аднак такія данныя з банкаўскай сетцы ён пакуль выўдзіць ня мог – трэба было капаць больш глыбока. Што ж гэта за фонд такі? Ён ссунуў бровы, і пачаў шукаць далей. Цяпер ужо не Ваўковіча, а назву невядомага фонду. Хутка на экране ізноў пабеглі строкі лічбаў. І чым болей ён чытаў, тым больш халодны пот бег па яго скуры. Тыя транзакцыі, што ён цяпер бачыў, былі зьдзелкамі з крупнымі канцэрнамі ваеннай прамысловасьці. Нарэшце ён пачаў нешта разумець. Ды і насамрэч, зразумеў хутка. Так хутка, што кашуля на сьпіне пад касьцюмам раптам прыліпла да цела. Як шалёны, ён перапісваў назвы і суммы ў блакнот – шчыра кажучы, сам ня ведаў, навошта. Цяпер ён разумеў, што забраўся некуды, куды насамрэч зусім не зьбіраўся. Думаў, што зьбірае грыбы на рэдкаватым ўзьлесьсі, ды вось неяк зайшоў у такі непралазны гушчар, што ўжо ня ведаў, як зь яго выбрацца. І ў гэтым гушчары былі зьвяры, разумеў ён. Ён наяўна адчуваў скурай іх цяжкі подых, яго вушы, уздрыгваючы, лавілі крокі мяккае хады. І гэтыя зьвяры вывучалі яго, і зусім не здаваліся ні тупымі, ні

прымітыўнымі. Наадварот. Раптам ён адчуў сябе заблукаўшым у лесе хлапчуком, які сам не заўважыў, як трапіў у ваўчынае логава. Тое, што ён шукаў праз сістэму даркнету, ніхто не адсочыць, ды толькі ён зрабіў адну вялікую памылку, калі пачаў шукаць назву кампаніі ў пошукавай страце гугла. Хоць і праз VPN, і бяз захоўваньня гісторыі, але ж ён ведаў, што ўсе гэтыя хітрыкі могуць абмануць толькі таго, хто іх выкарыстоўвае. Інтэрнет маланкай праглынуў запыт, і палажыў яго на палічку – недзе ў бясконцых шэрагах такіх жа палічак многіх і многіх шэрагаў шафаў. Аднак, нешта ён расхваляваўся, усьцешыў ён самое сябе. Насамрэч, што такога ён зрабіў? Набраў імя кампаніі. Якой не было нідзе, нават гугл аб якой ня ведаў. Раптам яму захацелася ўтапіць свой ноўтбук, кінуўшы яго недзе з фьёрдаў у глыбокае халоднае мора. – Спакойна, - суцішыў ён сам сябе. – Нічога страшнога не адбылося. Ён проста робіцца вар'ятам-параноікам. Да таго ж, яго механізмы шыфраваньня дазвалялі яму прабірацца і не ў такі інфармацыйны гушчар. Праўда, шантажыраваць ён дагэтуль нікога не зьбіраўся. І не зьбіраецца. Толькі зачым ён запісаў усе гэтыя данныя ў блакнот? Звычка. Хай будуць. Ён адчуваў, што выкарыстаць іх у яго яшчэ будзе шанец. Ня мог прайсьці міма кавалака золата, які ляжаў проста ў яго пад нагамі. Цёмнай ноччу пад праліўным дажджом, які змывае ўсе сьляды чалавек, шчыльна захінуты капюшонам, падабраў на дарозе абронены некім скарб, і адразу растварыўся ў цемры. Ён раптам рассьмяяўся. А ў яго у руках – і сапраўды золата. Можа адбыцца і так, што яму наогул болей ня прыйдзецца працаваць. Толькі чаму? Працу сваю ён любіў – яна была яму цікавая. Дарэчы, час ўжо зьбірацца на абед, успомніў ён.

Чыстая кашуля ўжо была прыгатаваная.

- Штаны мне пагладь. Ён зьняў ніз, і кінуў на крэсла. Агнеса сядзела ў тэлефоне насупраць, уважліва праглядала ленту буйной сацыяльнай сеткі, якая размаўляла зь ёй рознымі галасамі.

- Тупая баба. У думках ён скрывіўся. Глядзіць не зразумей што. Усіх інтарэсаў – толькі плёткі, навіны ды зоркі. Ды яшчэ – камедыйныя ролікі, якія яму зусім не здаваліся сьмешнымі. А, і

яшчэ – Псіхалёгія! Думае, што навучыцца ім кіраваць. Думае, што ён апынецца ў яе пад абцасам. Толькі пад абцасам насамрэч апынулася яна. Вось і цяпер, пакорліва ўстала, адлажыла тэлефон, і пайшла са штанамі па этажу ў гаспадарчы пакой. Ён жа ў адной кашулі адкінуўся ў крэсьле, прыкрыў вочы, і аддаўся прыемным думкам.

Дом набыла, глядзі ты. І думае, што раз у яе мужык, замешаны ў нейкіх брудных справах, дык яна жорава за хвост злавіла. Толькі ён сваё апошняе слова яшчэ не сказаў.

Падумаўшы хвіліну, ён узяў тэлефон. Зайшоў у соцсетку, знайшоў яе акаунт. На ўвесь профіль – толькі адно фота: сядзіць у адкрытай летняй сукенцы – чорнае зь белым, за столікам у нейкай кавярні. Вакол віюцца вінаградныя лозы. І назва акаунта – Goddess_Mara. Ну канешне ж. Усе яны – багіні.

- В твоих интересах встретиться со мной. У меня на тебя кое-что есть. И на твоего супруга тоже. Если хотите спокойно жить тут и дальше, думаю, нам нужно пообщаться.

Праз некалькі хвілінаў акаунт адгукнуўся.

- Дзе, і калі? – прачытаў ён.

- Умная девочка. В отеле. Скажешь, что моя дура хочет с тобой попрощаться.

Ён задаволена выцягнуўся ў крэсьле, адчуваючы, як напружваецца пад кашуляй яго вольны ад штаноў чэлес.

Сябар, якога ён даўно ведаў – просты, неблагі хлапец, які займаўся музычнай апаратурай і электронікай, таксама адпіў піва з доўгага вузкага кубка. Прыжмурыў ад асалоды вочы.

- Да что тут расказывать. Придурок – он придурок и есть. Прикинь, притащился к ней в хату – точней, к ним. Она там с мужиком живёт.

- Отец её. Она с отцом за границу уехала. Алекс махнуў галавой.

- В смысле, отец? А я слышал … сябар паглядзеў на яго зацікаўлена. Спыніўся, і працягнуў:

- Он же вроде скульптор какой-то? Известный довольно. Он памятник этому сделал … тут ён назваў скульптуру аднаму зь літоўскіх князёў у адным з нявелікіх райцэнтраў. – Ну, тот, что снесли потом, почти сразу. Там что-то литовцам не понравилось, не захотели сориться. Типа – это их князь, а чего у нас памятник. Ну, как всегда, делят кости гедиминовичей, ты ж в курсе.

- Да не курсе я. Это ты вечно в курсе всякой чуши. И этот твой историк, который в бега подался. Олег, или как там его? Которого из Литвы выгнали, Польша не приняла, и он теперь в Германии мыкается?

- Ну что ты так, мыкается. Он в университете какой-то курс по истории восточных славян и балтов ведёт. А в Польшу он сам не захотел ехать – в Германии всё же больше перспектив, и заработки выше.

- Слушай, а вы – историки, народ ушлый. Без мыла везде влезаете. И чего я не доучился. Бросил на первом курсе. То же б гедиминовичей бы сейчас откапывал. И закапывал. Алекс хрыпла рассьмяяўся.

- А чего их закапывать? – сябар таксама ўсьміхнуўся. – Што выкапана, тое ўжо назад не закапаеш.

- Ну, так. Алекс кіўнуў. - Так что ты про Одина откапал? Рассказывай. Распавядай, - падштурхнуў ён сябра.

- Ну, короче, придурок этот припёрся к ним домой. Там ещё баба какая-то была, норвежка. Его баба.

- Кого – его? – удакладніў Алекс.

- Одина. В общем, как-то она скорифанилась с ними. С Летицией этой. И как-то она рассказала этому придурку. Ты ж знаешь, он одержим ею, бабой этой твоей.

- Ну, знаю. Алекс махнуў валасамі.

- Он же и уехал из-за этого.

- От меня сбежал. Алекс сашчапіў рукі так, што пабялелі касьцяшкі.

- Ну да. Согласен, говно он редкостное. Сябар сур'ёзна глянуў на Алекса. Твар таго не адлюстроўваў нічога. – Короче, - працягнуў ён. – Припёрся он к ним. И не знаю, что там такое случилось – в общем, пробыл он там не долго – эта, твоя, тревожную кнопку нажала. У них там всё оказалось, как в лучших домах – и охрана, и видео, и тревожная кнопка в кухне под столом. Полиция, конечно, приехала. Только после всех, как всегда. Ещё раньше сосед зашёл – увидел какие-то чужие машины во дворе, потом сказал – интуиция. А муж её… тьфу, отец. Короче, мужик этот, он тоже как раз домой приехал. А потом – в лучших традициях Тарантино – просто какая-то кровавая баня случилась. Не знаю, кто там что первый начал, но Один подстрелил этого мужика, мужик – Одина, а сосед – окно рассадил. В общем, полиция приехала как раз вовремя. Чтобы всех принять. Ну, поскольку Один оказался в чужом доме, к тому же эта твоя против него свидетельствовала, всё повесили на него. Только он тоже оказался пострадавшим, и адвокат ему посоветовал давить на самозащиту. Типа он ничего не хотел такого, пистолет – да, был с собой, признаётся, кается. Когда этот мужик на него ствол направил, он на опережение выстрелил. А с бабой этой он просто поговорить хотел. Так вышло. Его подруга в его пользу свидетельствовала. Короче, там слово против слова, все живые, и у Одина незарегистрированный ствол. Его, конечно, закрыли, какое-то время он был под следствием, а потом за него залог внесли, и его выпустили. Ну, ходит под наблюдением.

- А этот, скульптор, живой? – запытаў Алекс. Абыякава, каб не бачна было залішняй зацікаўленасьці.

- Живой. Сябар паціснуў плячыма. - Мужик этот в больнице потом лежал. Выписался. Слушай, а ты уверен, что он – её отец? – раптам запытаў ён.

- Уверен. Алекс узьняў на яго позірк. – А что такое?

- Да они расписались, … вроде. Той паціснуў плячыма. – И в костёле венчались.

- Откуда знаешь? – Алекс узьняў на яго вочы.

- Слухамі зямля поўніцца.

- А я тебе теперь скажу не слухи, а факты. Она – его дочь. Я, вообще-то, знал. Она сама мне рассказывала. Что у неё есть отец, который с ними не жил, только приходил к ней когда-то давно. Так давно, что она его даже не помнит толком. И оставил ей визитку. Она эту визитку лет с десяти хранила. А потом, когда мы с ней разосрались, она вдруг собрала вещи, и поехала просто в никуда. По адресу на визитке. Я потом ездил за ней – думал, одумается. Но она … послала меня. Ну, в общем я её не виню. Я б себя и сам послал. Ён крыва ўсьміхнуўся. И мамка её знает, что это её отец. Я с ней потом разговаривал. А что они там поженились – это полная чушь. Может, она сама сочиняет, чтобы цену себе набить – что она мужика крутого нашла старого. И теперь – жена олигарха. Ён зарагатаў.

- Слушай, ну, тебе виднее. Ты ж её лучше знаешь. А я так, слышал просто … всякое. Ну, если это отец, то у тебя значит есть шанс. Сябар вясёла ўсьміхнуўся. – Так что ты не грусти. Ну, уехала, подумаешь. Ещё приедет. Или - ты к ней.

- Как Один? – ён крыва ўсьміхнуўся.

- Зачем, как Один? – просто придёшь к ним, поговоришь с ней. И с ним. Ну, что у тебя самые серьёзные намерения. Суразмоўца паціснуў плячыма.

- Я уже разговаривал с ним, и не один раз. Алекс махнуў валасамі. – Только толку нікакого. Ён ужо відавочна п’янеў. Пасьля піва яны заказалі па віскі – вечар набліжаўся, прыемна пахла сьвежасьцю, колеры рабіліся глыбейшымі, цяплейшымі, быццам змазанымі. Вясёлыя дзявочыя галасы зьвінелі вакол – за суседнім столікам кампанія дзяўчат нешта шумна сьвяткавала.

- Она с ним и правда спит. Или – он с ней. Ён узяў цыгарэту, і

зацягнуўся – сядзелі яны звонку.

- Наплёл мне какой-то чуши – про судьбу, про то, что она ему принадлежит, чуть ли не много веков. И так серьёзно всё. Сумасшедший какой-то. Она ж тоже не в себе. У них, видно, наследственное.

- Так ты его видел? Разговаривал с ним? – сябар зацікавіўся.

- Ну да. Я ж говорю. Пару раз встречался. Один раз – сразу, когда она уехала, туда к ним поехал. Она не скрывалась. Дом такой крутой, правда. У озера. А второй раз – в кабаке. В ресторане. Он там дела с одним чуваком вёл, я его знаю хорошо, у него несколько клубов, и ресторан он свой с россиянами открыл. Чувак этот. А с этим у них какие-то отдельные тёрки. Он вроде в реконструкции в вашей.

- Да, я слышал – крутой товарищ. Известный очень в определённых кругах. И правда – бешеный, я тебе скажу. Что-то в нём такое есть, необычное. Ты б видел, как он мечом махал. Я как-то раз видел на турнире, и, знаешь, не хотел бы я ему в руки попасться, или столкнуться с ним на поле боя. Он ребят обезоруживал мгновенно. Даст помахать, а потом просто выбивает меч, и смеётся. И вещи он такие рассказывал – закачаешься. Просто часами. А бывало и так – скажет: там копайте. Там - интересное. И правда, находим такие вещи, что в жизни не догадался бы, что они там есть. У него там у озера, за курганами, мы целый комплекс раскопали: и замок, и остатки собора какого-то с криптой. Никогда бы не подумал, что в глухом лесу такое найдём. Здоровый такой. Ну, ты ж его видел. Волосы эти, борода. Прямо страшно. И разговаривает строго «на мове». Ни слова по-русски никогда от него не слышал. Будто он и не знает. Грэбуе.

Ён замаўчаў, нібы прыпамінаў нешта.

- Слушай, а он и правда на неё похож. Мужик этот. Вот я никогда не задумывался, а теперь думаю – а может, и правда, отец. Вот как представлю их рядом – просто копия. Она ж у тебя и высокая такая же, и волосы чёрные, густые. У нас вообще чёрные волосы – редкость, у славян, я тебе скажу.

- А чего ты решил, что она славянка? Алекс усьміхнуўся.

- В каком месте, она, интересно, славянка? Еврейка она. Это ж видно. Или – татарка. Мать её видел? Типичная татарка, чёрная, невысокая, с грудью. Летиция, правда, в этом не в неё. У неё от силы первый.

- Ну, не знаю, какая там мать, а с мужиком этим они очень похожи. Ты знаешь, я даже сейчас вспоминаю. Но то, что ты с ним встречаться больше не хочешь, мне тоже понятно. Я б десять раз подумал прежде, чем с таким встречаться. Да ещё и по щекотливому вопросу. Вот и Одину не повезло. Он, кстати, знаешь, чего съехал?

- Кто? Один? Алекс ужо пачаў губляць ніць апавяданьня.

- Да не Один. Мужик этот.

- Ну и чего? – Алекс узьняў на сябра вочы.

- Того, что он менту руку сломал. Пистолет выхватил. Ну, это дело потом замяли. Мент тоже не совсем прав там был. Перегнул, скажем так, палку. Только я тебе ещё знаешь, что скажу? У него опыт в горячих точках имеется – это факт. По нему видно, что он воевал. Не рядом стоял, как всякие там, журналисты и типа того, или копатели окопов. А действительно – в боевых действиях участвовал. Взгляд у него страшный такой. Жёсткий. Я б сказал, даже жестокий. Вот ты – ты с ним разговаривал. Неужели не заметил?

- Да не очень я его рассматривал. Мужик как мужик. Высокий такой, чёрный. По мне, так больше на блэкаря какого-то похож. Типа Rotting Christ. В нём есть что-то такое … от грека, или от македонца, не пойму. Откуда-то оттуда.

Ён замаўчаў, нібы задумаўся. Сябар таксама думаў аб нечым сваім, цягнуў піва з бакалу. Потым размова пацякла ў іншае русла, а яшчэ потым яны ўжо сядзелі за столікам вясёлай жаночай кампаніі насупраць. Прыйшоў у сябе ён ужо дома, на канапе. Вакол было цёмна – стаяла глухая ноч. І ў гэтай начы яму было ціха, утульна. Ноч была для яго сваёй, сяброўкай, як і

ён быў для яе сваім. Калі гэты Міхась – воўк, то ён – крумкач. Кружыць, раськінуўшы крумкачыныя крылы, над пусткамі, глядзіць уніз зь нябёсаў, спазірае навакольле. І ніхто яму ня пан, ня цар, ня ўладар – сам ён сабе і цар, і Бог, у пранізьлівым імкненьні туды, за далячынь, дзе адкрываецца нешта вялікае, невядомае, магутнае, як віхура. Месяц глядзіць на яго аднавокім Одзінам, паветра лашчыць крылы. Вось ён ляціць над лесам. Вось яе хата – чорны драўляны дом, які атачае глухі бязьмежны гушчар. Ён апускаецца ніжэй: вось яна – выйшла на ганак. У руках яе – вялікі кубак кавы, чорны, бліскучы, як цёмны міміраў калодзеж. Яна – вёльва, беласкурая, чорнакосая, празрыставокая. Яе тонкія рукі сьціскаюць гладкую гліну, нібы лепяць з кавы нябыт – афармляюць цемру ў сілуэт кубку, зь якога прыгубляюць яе вішнёвыя вусны. Як бы ён хацеў перакінуцца ў кубак, каб яна ўпілася ў яго гліняную плоць губамі. Каб выпіла зь яго ўсё жыцьцё – духмяную чорную вадкасьць, якая б адурыла ёй мозг. Ён яшчэ помніць смак яе вуснаў – мяккіх, прахалодных, чыстых. Ён жа таксама кахаў яе. Кахаў, і кахае моцна – мацней, чым той. Бо яго каханьне набыло сілу адчаю. Адлегласьць узмацняе напружаньне каханьня, нябыт жа даводзіць яго да сілы, мацнейшай за моц атамнага выбуху, мацней за ўзрываючаеся сонца, мацней за выбух, нарадаючы сусьвет. Гэты голас гучыць у яго ў вушах – і гэта не яго словы. Мужчына выходзіць на ганак разам зь ёй. Абдымае яе за плечы, і яна прытуляецца да яго. Запракідвае галаву яму на плячо. Ён пяшчотна гладзіць яе грудзі.

- Мне здаецца, там птушка, каханы. Я бачу крумкача, які кружыць у цемры, - ціха кажа яна. – Быццам бы за мной назірае хтосьці. Нечая самотная душа. Яна прытуляецца да яго. Ён ахоплівае яе вялікімі рукамі.

- Тут лес, любая. А ў лесе многа і птушак, і зьвяроў. Ён абдымае яе, прытуляючы да сябе. – Можа, там і крумкач. Толькі ты яго ня бойся. Нікога ня бойся, бо ж я – тут, з табою. Ён мякка кранае яе валасы вуснамі. Алекс бачыць іх дакладна, ва ўсіх самых маленькіх дэталях. Цяжкая, цёмная рука мужчыны накрывае дзявочыя грудзі, яе шчака даверліва прыціскаецца да яго шыі, і ён узвышаецца над ёй, як магутны ідал старажытнага бога, паганскі кумір, ахутаны цемрай, чорнавалосы і

чорнабароды, шырокаплечы, магутны. Здаецца, што ад яго подыху варочаецца зямля, дыхае, і ўзьнімаецца, а разам зь ёй – і лес, і нябёсы, якія дыхаюць подыхам навальніцы, хмараў і буры. Вось і маланка бліснула недзе над лесам – першая вясновая зарніца працінула нябёсы.

Алексу здаецца, што чалавек бачыць яго – бачыць яго лёт праз цемру. – Ты згубіў сваё шчасьце, крумкач. І цяпер ты – самотны, цень чалавека. І ў сэрцы тваім – ноч, а пад крыламі – бездань, і няма на што аперціся. Так і будзеш кружыць крумкачом, пакуль сілы ня скончацца, і ня звалішся ў рашчыліну між гораў, пакуль цябе не схавае чорны бяскрайні гушчар, не праглыне багна.

Яе вочы, сьветлыя, мяккія, пяшчотныя і сумныя, як зоркі, глядзяць на яго зьнізу, і ў іх ён бачыць жаль, і спачуваньне яго самоце. Чалавек гладзіць яе руку сваёй, і таксама вывучае яго позіркам.

Яго вусны ўсьміхаюцца.

– За ўсё трэба плаціць, крумкач. А асабліва ж трэба плаціць за свае грахі. Калі выплаціш іх, то тады будзеш вольны.

- А калі я іх выплачу? – запытвае ён яго.

- Тое ведаеш толькі ты. Яго голас, густы, нізкі, сьціхае, як рокат навальніцы за небасьхілам. Алекс прыходзіць у сябе, прачынаецца на канапе.

- З'еду, - пра сябе вырашае ён. – Не хачу тут заставацца. Хоць куды – далей. Раптам позірк яго падае на тэлефон, на якім міргае паведамленьне.

- Добрай раніцы! І смайлік з чашкай кавы. Інга. Дзяўчына, зь якой ён пазнаёміўся ўчора ў бары. Неблагая дзяўчына – поўная процілегласьць Летыцыі. Сьветлыя, як кудзеля, валасы, паўнаватая, але ж зграбная постаць. Яна казала, працуе недзе бухгалтарам. Ці некім накшталт – ён ужо і забыў. Ледзь варухнуўшы галавой, ён націснуў, і адправіў смайлік ёй у адказ.

Кулакі яго былі зьбітыя – даў у зубы нейкай п’янай дрэні. Як раз падвярнуліся пад руку. Апынулася, што да таго ж, зрабіў добрую справу, бо яны заляцаліся да дзяўчат, да гэтай вось – пухлявай, сьветлавалосай прыгажуні. І цяпер яна шле яму “добрай раніцы” – удзячная. А можа, гэта і добра – час ужо яму забыць яе. Час пачаць сваё жыцьцё, якое яно ні ёсьць, з пачатку. Можа, нешта і атрымаецца, думае ён. Не магчыма, каб не атрымалася.

- Ты раскажаш мне казку, каханы? – ціха просіць яна. – Казку аб тым, як шуміць вецер? І пра лес, як ён сьхіляецца перад подыхам навальніцы. Пра мора – вялікае і неабсяжнае, халоднае, па якому плыве маленькі карабель, узьлятаючы на хвалях. І пра нас з табой. Дзе мы с табой ізноў апынемся? Бо ж у нас было шмат жыцьцяў, я ведаю.

- Шмат, каханая. Ён цалуе яе. – Шмат жыцьцяў, і шмат гісторый. Хочаш, я раскажу табе гісторыю пра паганскага жраца, крыве, які можа перакідвацца ў ваўка і лётаць крумкачом пад аблокамі. І пра князя-пярэваратня, пра глухую пушчу і яе таямніцы. Пра багоў, якія жылі тут так даўно, што іх ніхто нават і ня памятае. І пра істотаў, душы якіх ня жадаюць сыходзіць. Бо ж іх справы яшчэ ня скончаныя, а шлях – не завершаны.

- А там буду я? – ціха запытвае яна.

- Канешне, мая прыгажуня. Ты будзеш там, бо ты – усюды, дзе я, каханая. Сонейка маё. Маленькая мая птушачка. Ён ахінае яе рукамі, прыціскаючы да грудзей. У яе вачах стаяць сьлёзы – сьлёзы шчасьця. Як ёй утульна і хораша ў яго цёплых вялікіх руках. Як яна любіць слухаць яго бясконцыя казкі. Здаецца, ён ведае ўсё на сьвеце, бо ж гэты сьвет стварыў ён – стварыў для яе, з усімі яго гісторыямі і таямніцамі сьвятла і цемры, радасьці і смутку, і болю, і адчаю, і каханьня, такога вялікага, што за яго не шкада аддаць усё, і прайсьці ўсімі шляхамі, якімі б цёмнымі і страшнымі яны б не былі.

Ён абдымае яе, і яна паўляжыць у яго руках, прытуліўшыся.

- Я – старой чараўнік з закінутай хаціны. А ты – мая маленькая вучаніца. Ён мякка цалуе яе вочы.

- Гэта казка мая самая любімая, - ціха кажа яна. – Ты прыйшоў да мяне, і забраў мяне з сабой.

Яго вусны асьвятляе вусьмешка – мяккая, прыгожая.

- Ты верыла ў мяне, і я стварыў для цябе новы сьвет. Верыш, што такое магчыма? Насамрэч, усё так і было. Маленькая дзяўчынка сустрэла старога чараўніка-ваўкалака ў лесе.

- А ён стаў богам, - ціха адказвае яна. – Богам для мяне, каханы. Бо я ня ведала, што сустрэну ў лясу бога.

- А для бога няма нічога немагчымага. Я ж казаў табе – той, хто кахае, пераўтворвае сьмерць у жыцьцё. Калі ты пакахала мяне, ты мяне ажывіла, а потым я ажывіў цябе. І забраў з сабою – туды, дзе наш сапраўдны дом, каб быць нам заўсёды разам. Ён качае яе на каленях, а яна – лодачка на хвалях, утульна разьмеціўшася ў яго руках.

- Праўда, што ў курганах сьпяць волаты? І старыя багі ёсьць, і яны чакаюць свайго часу?

Яна ўзьнімае на яго вочы – прыўкрасныя, і зьзяючыя, як зоркі.

- Праўда, дзяўчынка мая. Праўда. Ён гладзіць яе валасы вялікай рукой.

- Мы адправімся туды? Туды, дзе дзяды? У лес, глыбокі і старажытны? Там, дзе жывая казка? – ціха кажа яна. Яна ўжо засынае на яго плячы.

- Канешне, любая. Ён кранае яе лоб вуснамі. Яна закрывае вочы.

Яго крэпкія рукі моцна трымаюць яе. Яна для яго – даражэйшая ва ўсім сьвеце. Перад сабой у цемры ён бачыць твар Мары – пяшчотны і прыўкрасны. Яе вочы закрытыя, чорныя вейкі стрэламі апусьціліся на шчокі. Яго маленькая багіня. Якая можа ўсё, але ж вось – абрала яго, і цяпер ляжыць у яго на руках, прытуліўшыся, накрыўшы яго кісьць сваёй маленькай

далонькай. Ён гладзіць яе чорныя бліскучыя валасы. Ён – яе рыцар, яе адданы пёс, і воўк, і ўладар, і абаронца, і кароль, і дракон у цемры. Бо ж каралева годная толькі караля. Ён усьміхаецца. Усё ж, ён атрымаў яе. І яна цяпер зь ім шчасьлівая. Няма таго, што б ня змог атрымаць годны рыцар. Няма такой кабеты, сэрца якой бы ён не дабіўся – хоць бы то была і багіня. Ён быў сьмяротным, а яна была Марай – а цяпер ён – Бог, і яна – птушаня ў яго далоні. Баранак у яго абдымках. І ўсё гэта зрабілася зь ім праз вялікае дзіва каханьня. Бо той, хто адкрывае ў сабе каханьне, насамрэч адкрывае ў сабе Бога – сапраўднага ўладара сусьвету, і для таго няма нічога немагчымага. Ён адчувае, як вакол іх паўстаюць сьцены замка – іх уласнага, агульнага ўладаньня. Замка, у якім яна была самотнай, але ж цяпер яны ў ім – разам. Ён прыйшоў у замак Мары, і яна прыняла яго, саступіла яму гаспадарчае месца, і ён падзяліў зь ёй трон. Блукаць у лясах з Марай – якая асалода. Ён мог бы везьці яе на кані бясконца, і яе чорныя косы віліся б вакол яго, як зьмеі. Ён прыціскаецца ілбом да яе ілбу, удыхае яе пах – і сапраўды, як воўк.

Усьміхаецца. Каханая, каб я мог, я б стаў бы для цябе і воўкам, як той каралевіч Ян, які, перакінуўшыся, скраў чароўную красуню, і зьвёз яе са трыдзевяць мораў. Ці так яно менавіта было, ці не – не істотна. У яго ўяўленьні - гэта ён вязе прыгажуню, якая прытулілася да яго шэрай поўсьці, бясконца імчыць праз глухі гушчар на вядомым усім малюнку. Канешне ж, ва ўсім вядомай казцы было, насамрэч, ня так. Але ж толькі ён ведае, як яно было на самой справе.

Адна прыгожая дзева дужа любіла гуляць па лясных сьцяжынках, глядзецца ў вазёрную гладзь, ды таньчыць пры месяцовым сьвятле. Ён жа пачуў яе пах, і выглядзеў, і ўпаляваў, і спакусіў выйсьці на ганак, калі поўня наліваецца крывёю, і тады ён скраў яе, і яны паскакалі ў гушчар, у такія таямныя яго глыбіні, адкуль сьмяротнаму няма вяртаньня. Там яна пераўтварылася ў багіню, чараўніцу, уладарку лясных нетраў, і сьмерці, і жыцьця, пра якую сталі складаць паданьні, і пець песьні, і распавядаць казкі.

- Ты скарылася чалавеку, Мара. Скарылася мне. І я абараню

цябе ад усяго сусьвету – і ад людзей, і ад багоў, і ад самага галоўнага бога, якому я болей не слуга. Ён ціха цалуе яе, гладзіць яе плечы рукою. Бо там, дзе ёсьць каханьне, няма сьмерці, і цяпер Мара на яго руках – Жыва, сьветлая і радасная, і адначасова – таямнічая, гаючая, як прахалодная вада ў зрубе лясной крыніцы, якую толькі зьлёгку кранаюць праменьчыкі сьвятла, чыстая, лядзяная. Яе скура мяккая і прахалодная пад яго рукой.

Сьпі, чараўніца мая! Сьпі, дзяўчынка. Плячамі ён адчувае вакол муры – высокія, надзейныя сьцены, якія бароняць іх ад ночы. Яны ўжо ня тут, не ў Нарвегіі, не ў лясной хаціне. Яны – там, дзе ўсё магчыма, у сьвеце Мары, казак і сьненьняў, таямніц і загадак. Багоў і герояў. Ён бярэ яе на рукі, і кладзе на вялікі ложак. Сам лажыцца побач. Хутка ў царстве Мары надыдзе раніца. Надыдзе новы дзень, а зь ім – новая казка. Якая яна будзе, ён яшчэ ня ведае. Толькі ведае, што – абавязкова цудоўная. І абавязкова – пра іх.

Глава 59: Мара

Яго вялікія рукі цёплыя, родныя, ласкавыя. Яны гладзяць яе, абдымаюць, і яна прыціскаецца да іх, прытуляецца, падносіць да вуснаў, а з вачэй яе бягуць сьлёзы ад пачуцьця. Тут няма нічога забароннага, і яна можа быць зь ім сабой, а ён зь ёй - сабою. - Любы мой, каханы, - ціха шэпча яна, абдымаючы яго, прыціскаючыся да яго шырокіх грудзей. Яна адчувае яго далонь на сваёй сьпине, яго подых ля сваёй шчакі, калі ён нахіляецца да яе, і яго вусны кранаюць яе валасы, поўныя пяшчоты і ласкі.

Месца і час болей не істотны, і ён - не ваўкалак, не чараўнік і ня дземан, не д'ябал і не анёл - чалавек, проста чалавек, які для яе стаў больш за Бога, якому яна малілася, і моліцца што дня - за сябе, і за яго - чалавека. У яе ўяўленьні чалавек і Бог зьліліся, і болей не раз'яднаныя, яна не аддзяляе ад боскай яго чалавечую суць. Пакрывае пацалункамі яго рукі, і проста кахае яго - у велічы і ў нястачы, у здароўі і балезьні, які б ён ня быў. І ў яго боскасьці яна яго кахае, проста і шчыра, як дзіця кахае свайго айца. Толькі для яе ён яшчэ і яе каханы, адзіны, абаронца і збаўца, даражэйшага за каго для яе няма на сьвеце.

Дзе б ён ні апынуўся, яна пакрочыць зь ім побач. Яна заўсёды знойдзе яго, як і ён не пакіне яе.

- А памятаешь, як ты быў чараўніком, каханы? - запытвае яна яго.

- І яшчэ ваўкалакам, і д'яблам, і ўладаром дземанаў. Кім я толькі ня быў, любая. Ён усьміхаецца, нахінаючыся да яе. Прама перад сабой яна бачыць яго твар - сьмяючыеся вочы. Яна закрывае вейкі, і адчувае яго подых на сваёй скуры. Яго вусны кранаюць яе павейкі - закрытыя. Але ж яна бачыць праз іх, і бачыць яго наўяве. І ён ёсьць Сьвятло.

Сьвятло, у якім чалавек і Бог больш непадзельныя, бо гэта ёсьць адное і тое ж. Бог - чалавек, праяўлены ў сьвеце, разумее яна. І гэты чалавек для яе сьвяты. Яна бярэ яго твар у далоні, і ўсьміхаецца яго ўсьмешцы.

- Дачушка мая. Жонка мая любая. Ён гладзіць яе па шчацэ, нахінаецца, і яго губы зьліваюцца зь яе вуснамі. Яна адчувае смак яго пацалунка - ён салодкі, чароўны, хьмельны. Ён мае смак малака і мёда, віна, і вады жыцьця. Яго язык салодкі ў яе роце, і яна прымае яго ў сябе, поўная асалоды. Яна ня ведае, як яшчэ паўней умесьціць яго - яна хоча стаць ім, і каб ён стаў ёю, і разам каб яны сталі адным - адным цэлым, аднім целам, з'яднаным, неразрыўным целам каханьня. Яна прымае яго, і задыхаецца, і плача ад шчасьця і пяшчоты, а ён улівае ў яе жыцьцё, пераўтварае і ўзьнімае яе - высока, прытуляючы да сваіх грудзей.

- Ну што ты, што ты, каханая. Ня плач, любая мая. Усё што было, прайшло. Рэальныя толькі мы з табою.

- Ты ніколі не пакінеш мяне? - ціха запытвае яна.

- Ніколі, дзяўчынка мая любая. Ён качае галавой, прыціскаючы яе да грудзей. Яго далонь гладзіць яе валасы - вялікая, надзейная, і яна замірае, прытуліўшыся да яго, як маленькае птушаня.

- Он же твой отец. Ты с отцом своим спишь. Ты в курсе? Трахаешься со своим родным отцом. Это как? Нормально? С родным отцом ебаться?

Алекс глядзіць на яе - прама. Яго вочы цёмныя. Іх засьцілае гнеў, і адчай - вецер, які гоніць узбураныя навальнічныя хмары. Яго твар смурны, цёмны, цені заляглі пад вачыма, абвастрыліся скулы. Ёй і шкада яго, і прыкра. Прыкра ад гэтай размовы, якая не павінна была адбыцца, ды вось - адбылася.

Алекс сустрэў яе на выхадзе з салону, куды яна звычайна езьдзіла. З раніцы яна наведвала маці, потым - салон, магазіны. Дамоў - да іх дамоў, яна мусіла быць зьвярнуцца толькі вечарам. Катаржына хацела падвесьці яе, але ж яна адмовілася, і вырашыла ўзяць таксі. Міхась быў заняты - нейкія ў яго былі справы. Спачатку прывезьлі матэрыял, потым мела быць сустрэча з кліентам - чакаўся буйны заказ: каваныя вароты для багатага дому. Ён наогул быў увесь час заняты, у хату

прыходзіў толькі рукі памыць, ды позна ў вечары. І палуднаваў у кузьні. Толькі што ня спаў.

- Ня сумна табе, птушаня маё? - запытваў яе, цалаваў, і зноў сыходзіў. - Не, каханы. Яна качала галавой. Калі-некалі наведвала яго ў кузьні, але ж ня будзеш жа сядзець і глядзець увесь час на чужую працу.

- Мне здаецца, я бачыла тут Глеба …, - раптам вымавіла яна ледзь чутна.

- Мілая, ты нікога не магла бачыць. Ні тут, ні дзе яшчэ. Цябе прывезьлі ў непрытомнасьці. Калі хочаш, я запытаю запіс з камеры ў гатэлі – як цябе п'яную ці абколатую ведуць два ладныя січылійскія хлопцы, а ты на іх вешаешся, як апошняя шалава, і рагочаш пры гэтым. Закіс азоту, пэўна. Эйфарыя, а потым поўная страта сьвядомасьці. Толькі ў нумары іх было значна больш, чым два. Гэта таксама засьнята, толькі я табе

глядзець ня раю, і ў самога мяне жаданьня глядзець няма.

- Цябе ня трэба нічога баяцца. Ты пабудзеш тут, візу я табе прадліў – зрабіў працоўную. Па кантракту ты мая сакратарка. Перакладчык на ангельскую мову. Усё робіцца дужа проста, як бачыш. У гэтым сьвеце наогул мала што складанае. На пэўным узроўні ўсё наадварот – простыя рэчы амаль недасяжныя. А недасяжныя – простыя, як заказаць сабе каву ў кавярні за вуглом.

- Каханая, пакажы ёй. Летыцыя кіўнула, устала, і вярнулася з пачпартам. Адкрыла. На развароце і сапраўды быў бачны штамп нарвежскага іміграцыйнага дырэктарата. На год.

- Можаш пазваніць сваім бацькам, і расказаць ім, што ты застаешся. Скажы ім, што выехаць у цябе пакуль няма магчымасьці, а тое від на жыхарства анулююць. Такія тут законы. А пра Глеба скажы, што вы пасварыліся, і ён цябе кінуў. І некуды з'ехаў. Уладкаваўся ў нейкую фірму, ты нават і ведаць, і чуць пра яго ня хочаш. У якасьці пацьвержаньня перашлеш ім гэты скрын – зь яе соцсеткі. І з вайберу. Я думаю, ім гэтага будзе дастаткова. Растлумач нешта, што ты была шакаваная, і што Летыцыя, шкадуючы цябе, і сумуючы па дому і па вашаму сяброўству, прапанавала цябе працу ў мяне. А я – вядомы мастак і калекцыянер, і мне трэба дапаможніца весьці перапіску і перакладаць, бо ангельскую мову я ведаю дужа блага, і такі шанс, як у цябе, наогул атрымоўваюць раз у жыцьці.

- А что я действительно буду делать? – ціха запытала яна. Чамусьці яна зразумела, што выбару ў яе цяпер няма. І яе бясьпека і жыцьцё поўнасьцю ў руках гэтага страшнога чалавека. Настолькі ж страшнога, наколькі ён быў прыгожы.

І сапраўды, куды ёй ісьці? Дамоў яе цяпер ніхто не адпусьціць, - гэта яна зразумела добра, хоць ён і не казаў нічога на гэты конт.

Раптам ёй стала ўсё роўна. Яна скарылася, і раптам ёй стала лёгка, неяк нават утульна. Цяпер думалі, і рашалі за яе. І ён усё зробіць так, як трэба, зразумела яна.

- Скажите, я действительно буду вашей помощницей? – запытала яна яго.

- Не. Ён усьміхнуўся. – Хіба толькі крышачку. Самую маласьць. Ты ж узяла калоду, памятаеш?

- Да. Яна кіўнула.

- Вось і будзеш вядзьмаркай. Медэя. Ён усьміхнуўся. Яго позірк быў цяжкім, доўгім. – Тут на такія паслугі попыту шмат. У мяне і настаўніца для цябе ёсьць. Вось, будзеш ёй дапамагаць. А жыць будзеш тут, у нас. Жыльлё тут ня таннае, а заробак у цябе пакуль не вялікі. Тысяча еўра на карманныя расходы. Нічога, Медэя. Усё у цябе атрымаецца! Ён шырока ўсьміхнуўся, і ўстаў.

- Пайшлі, каханая. Зрабі ты мне чаго паесьці, і пайду я працаваць, пакуль мая дапаможніца адпачывае.

- А ты ляжы пакуль. Заўтра доктар прыедзе, здымаць швы. Ты ж нікуды не зьбяжыш, прыгажуня мая?

Яго позірк працінаў яе, як рэнтген.

- Не. Яна пакачала галавой.

Медэя. Вось яна і вярнулася на гэты сьвет. Сьвет быў той жа, толькі яна цяпер другая. Толькі вось якая яна? Яна адкінулася галавой на падушку, адчуваючы, што ізноў правальваецца ў сон – прыемны і лёгкі.

Глава 65: Апіс

- Хадзі да мяне, - ціха кажа ён. Ён сядзіць на ложку, рассунуўшы ногі - вялікі цёмны цень у неяркім полымі начной лямпы. Яго вусны ўсьміхаюцца белазубай вусьмешкай. Яна падыходзіць, і становіцца перад ім - вагаючаяся, нібы полымя. Ён глядзіць на яе, і яго вочы як зоры, запаленыя жаданьнем ствараць сьветы.

Яна стаіць перад ім, і ў яе захоплівае подых - як заўсёды: ад страху і жаданьня, якія абодзьва яна ня можа пераадолець. Яе грудзі - дзьве пругкія паўкруглыя чашы, сьцёгны вузкія, але ж талія яшчэ вузейшая, ногі і рукі доўгія і тонкія. Яна нагадвае яму аленя - пяшчотнае, трапяткое. - Гэтае цела не для таго, как даваць жыцьцё. Яно для таго, каб даваць каханьне, - думаецца яму. Цела зусім юнай жанчыны, прыгожае, як сон.

- Калі б ты бачыла тое, што бачу я, - ціха кажа ён.

- Ты - багіня, і тваё харство належыць нябёсам.

- Я бачу цябе, каханы мой, - ціха кажа яна, - і хачу ўшаноўваць цябе усей душой і целам. Усё, што ёсьць у мяне, для цябе, любоў мая. Ён бярэ яе за руку, і прыцягвае да сябе. Яна абдымае яго галаву рукамі. Яе грудзі маленькія і белыя, з ружовымі набухлымі саскамі, якія ён марудзіць крануць. Ён прыціскаецца да яе грудзей тварам, праводзіць па ім, убіраючы яе водар - пах чыстага дзявочага целу, прыродны малады мускус, які ўзрушвае ў ім зьвяра. Ён хоча ўпіцца зубамі ў гэту мяккую белую плоць, разарваць яе на кавалкі, заліць свой твар яе крывёю. Але ж замест гэтага ён пяшчотна цалуе яе - доўга, кранае вуснамі, аблізвае языком. Яна стогне і ўздрыгвае ад яго дакрананьняў. Жорсткі волас яго барады коле яе скуру, ён нешта шэпча, прыціскаючы яе рукамі.

- Мая, толькі мая ... красуня мая, пяшчотнае маё ягня, кветачка мая, баранак мой лагодны, дзяўчынка мая маленькая ...

Яго шэпт нагадвае стогн, ён зачароўвае, закалыхвае яе. Ён сьцісквае яе сасок, і нібы маланка праходзіць па яе целу. Рукой

яна дакранаецца да яго там, адчуваючы, якая напружаная яго плоць. Яна закрывае вочы, адчуваючы, як яго рукі цягнуць яе, ён прыцягвае яе да сябе, кладзе рукі на яе сьцёгны, цягне ўніз, і яна апускаецца на яго. Яго плоць уваходзіць у яе - шчыльна, балюча рассоўваючы яе. Яна ўскрыквае, і ён замірае, прыціскаючы яе да сябе.

- Цішэй, цішэй, дзевачка мая. Цішэй, красуня мая. Пацярпі, пацярпі мяне, - ціха шэпча ён, горача, пакуль рухае яе ўверх і уніз рукамі. - Ты ж мая красуня, сасочкі мае, маленькая мая, грудкі мае салодкія, анёлачак, похвачка мая. Ён цалуе яе шыю, вусны, твар, вочы, пакуль яго чэлес рухаецца ў ёй, і яна стогне і ўскрыквае, адчуваючы, як змыкаюцца вакол яе яго рукі. Ён апускае яе на ложак і апускаецца на яе, накрываючы яе сабой. Яго сьцёгны рухаюцца, як поршні, і цяпер ён суцэльна забывае і сябе і яе. Застаецца толькі адна яго жарсьць, жар, нябёснае полымя, якому падпарадкоўваецца ўсё, якое ліецца ў яе, апаляючы.

- Бог мой, адзіны ў цэлым сьвеце, хто падобны на Бога майго, ідучага на аблоках, чый чэлес, як маланка, і каханьне - як сусьвет. Яна выкручваецца пад ім, паўтараючы яго імя, пакуль ён працінае яе сабой, пакуль не выліваецца і не рычыць, як навальнічны гром, закрываючы яе твар цемрай - сваімі валасамі. Яна бачыць яго праз завесу дажджу сваіх сьлёзаў, і іх целы - вільготныя ад поту, ці ад нябёснай вільнаці. Яна ляжыць на зямлі, і ён уціскае яе ў сьвежую баразну сваім целам, упіраючыся ў глебу рукамі, выліваючыся ў яе моцна, бурным патокам, запаўняючы сваім семенем. Ён - бык, Апіс, і яго чэлес з агню, а муды з жалеза, Зеўс, скраўшы чароўнай красаты дзеву, каб апладніць яе на мяккай чорнай зямлі, утаптаць яе ў бруд, зьмяшаць са сваім семенем, каб яна зьлілася з гэтай чорнай плоднай глебай, увайшла ў яе, разарваная яго плоцьцю, і ўвільгатніла яго семя сваёй крывёй, а потым узьнялася дрэвам, працінаючым яго душу, раскрываючым яго рукі веткамі і ўзьнімаючым крону да небу.

Гарачая завеса закрывае іх, засьцілае ім вочы, яго галава ляжыць на яе грудзях. Часу і месца няма. Ёсьць толькі нябёсная пашня, на якой ён бярэ яе бясконца.

- Яе не магчыма не жадаць, Джаваньні. Яго вочы, задуменныя, нібыта бачылі мроі. - Ня ведаю, што цяпер мне рабіць. Ён усьміхнуўся. - Бо ж гаспадар, неяк так адбылося, стаў рабом.

- Сам стварыў, а цяпер ня ведаешь? - Джаваньні ўсьміхнуўся таксама.

- Менавіта так. Твой чэлес ніколі не ўваходзіў у яе, і ты не ўяўляеш, якая гэта асалода. Ты ж трахаў толькі Еву зямную, Джаваньні. А я меў Еву нябёсную.

І вось уяві, яна сядзіць, і закахана глядзіць на мяне, з пашанай, найвялікшай, уздрыгвае ад яе кожнай жылкай, прыгожая, як сьвяты дух, бо яна і ёсьць ён, толькі пра гэта ня ведае. Сярод анёлаў няма нікога, хто можа параўнацца зь ёй. Яна просіць ведаў аб стварэньні сусьвету, і як сусьвет працуе, і хто ў ім яна, і хто такі я, і як ёй мяне спазнаць, і я павінен адказваць на ўсе гэтыя запыты, а мне проста хочацца трахнуць яе. Заваліць яе прама там, на мяккую райскую траву, і адпярдоліць. Выебаць так, каб муды балелі. Але ж - нельга. Бо яна прагне ведаў. Яна чыстая, цнатлівая - ня целам, у душы. Ды і целам таксама. Бо ж я стварыў яе так, што яна заўсёды цнатлівая. Колькі б разоў я яе ня браў, у яе заўсёды зарастае нейкім дзіўным чынам. І яна заўсёды нявінная, чыстая, сьвятая. Толькі каханьне мае да мяне ў сваім сэрцы. Беззаганна ахвяруе сябе мяне. І што ты думаеш? Гэта я, Бог, цяпер жадаю ўшаноўваць яе. Пакланяцца ёй - адзінае, што мне патрэбна. У гэтым - мая найвышэйшая асалода. Я кветкі гатовы цалаваць, якія растаптала яе пяшчотная ножка. Проста гадам за ёй поўзаць.

Ня ведаю, што цяпер мне рабіць. Вось стварыў, дык стварыў. Можна сказаць, што натварыў. Ён рассьмяяўся, пацёршы лоб рукой.

- Выгані яе з раю, ды і ўсяго справаў. Джаваньні спачувальна глянуў на яго.

- Не магу. Ужо спрабаваў - у думках. Пралічыў: пайду за ёй сьледам - сам сябе выганю. Я гэты сцэнар прагуляў дасканала - нічога добрага. Усё яшчэ горш. Каб знайьці яе і вярнуць, спатрэбіліся мільёны лет. Ды яна заўсёды ўскользвала ад мяне.

Толькі схаплю яе за руку - раз, і зьнікае.

- А чаму - зразумела. Джаваньні зарагатаў. - Бо ж ты яе затрахаў.

- Ну, так. Але ж нарэшце я знайшоў яе, і цяпер трымаю крэпка. Ён усьміхнуўся ізноў.

- І яна прагне ведаў, і каханьня, а ты хочаш трахацца. Прагнеш увайсьці ў яе. Дылема памерам у сусьвет. Можа, растварыць яе абратна? Ты ж усемагутны. Ты - Бог. Ты ўсё можаш. Што табе кагосьці растварыць.

- Ты што, зусім здурнеў? Ён зьдзіўлена раз'юшана глянуў на яго. - А трахаць я каго буду? Прабач - кахаць? Цябе, дурня рагатага і хвастатага?

- Не, на такое я ня згодны. Няма ў мяне для гэтага прыстасаваньняў. Джаваньні пакруціў галавой.

- Дык я зраблю. Ствару. Я ж Бог. Усё магу - любую дурасьць па тваёй просьбе.

- Госпадзі памілуй! Джаваньні шчыра ўзьняў руку да ілбу. - Калі так, то трэба цярпець. Еву. Ты ж цярплівы. Колькі ты там вытрымаў на крыжы?

- Часоў шэсьць. Ён паціснуў плячыма.

- Тры. Я засякаў. Джаваньні сварліва падціснуў вусны.

- Яе я гатовы цярпець бясконца. Гэта мне пакараньне за ўсе грахі сусьвету. Ён усьміхнуўся, і ўзьняў келіх. - Амброзія - віно багоў.

- Добры пярвак. Джаваньні кіўнуў, прыгубляючы.

- Вінаградны, - пагадзіўся ён. - З райскага ўраджаю.

- Ева будзе ругацца. Джаваньні пакачаў галавой.

- Ня будзе. Хіба толькі крышачку. Ён з задавальненьнем

прыгубіў духмяны напой.

- Ну, калі што - прыходзь. Пекла адчынена, - Джаваньні прапанаваў, шчыра, і зарагатаў:

- І адасьпішся, і адпачнеш.

Глава 66: Вар'яцтва

Паступова яна ўскользвала ў свой сьвет, дзе быў толькі ён, і сьвятло. Яна не пазнавала нікога і нічога, акрамя яго, і ён насіў яе на руках, як дзіця, а яна прытулялася да яго грудзей. Яе рукі абдымалі яго шыю, слабыя і пяшчотныя, як зрэзаныя кветкі, і ён цалаваў іх сваімі вуснамі. Яе вочы, паўзакрытыя, здаецца, бачылі анёльскія сны, на губах блукала вусьмешка. Але ж калі яна ўзьнімала вочы на яго, о, колькі ў іх было каханьня, неабсяжнага, бязьмежнага, такога, якое, здаецца, праглынала яго, зацягвала ў бясконцыя глыбіні, вылівалася на яго патокамі сьвятла. Гэты твар набываў пазачасавыя рысы, ён быў юным, і ён быў адвечным. І ён глядзеўся ў яго, і ня мог наглядзецца, захоплены яе хараством.

Яна казала, што раней такое ўжо было зь ёй, і пакуль яны былі разам, некалькі разоў надыходзілі перыяды трызьненьняў, калі яна нібыта выпадала з рэальнасьці, то сьмяялася, то плакала, адмаўлялася пакідаць пакой, адказвалася ад ежы, і амаль ня спала, ці спала незвычайна доўга, і, здаецца, не заўважала яго, але ж насамрэч толькі яго яна і жадала ў гэтыя часы, калі яна ўзьнімалася па-над сьветам, выходзіла за яго межы ў бясконцасьць. Сьвет ціснуў на яе, ён быў для яе малы, душны, вузкі, як труна, крышку якой яна намагалася пасунуць. Ці, наадварот, ён быў для яе вялікім, халодным, і пустым – яна не магла растлумачыць. Сьвет адмаўляўся ад яе, а яна адмаўлялася ад сьвету, з пагардай адкідвала рэальнасьць, якая пераставала быць для яе рэальнай. Яна жадала толькі яго, толькі яго адзінага, і толькі яго рэальнасьць яна жадала ўспрымаць. Спачатку ён думаў, што яна пакутуе зь ім, што тое, што ён робіць зь ёй, для яе балюча, і што безь яго, пэўна, яна б была шчасьлівейшая, і ўтрымліваць яе побач - насамрэч катаваньне і грэх, абмежаваньне яе волі, бо яго воля была значна мацнейшая за яе, і ён гэта ведаў. Сваёй воляй ён зьвязаў яе жыцьце зь яго жыцьцем, зрабіў яе нібыта часткай сябе, і ў такія часы ён думаў, што ён яе забівае, разбурае, што ён і сапраўды для яе стары, і яго сьвет надта жорсткі, і яна б магла вучыцца, гуляць з равесьнікамі, мець адносіны з маладым

хлопцам, сталець разам зь ім і пражыць сваё, уласнае жыцьце, на якое ён ня меў права, не зьвязанае зь ягоным. Але ж у той жа час ён разумеў, што да яго жыцьця ў яе не было, як і ў яго не было жыцьця да яе. Пакутвала яна, і ён таксама пакутваў. І яшчэ ён шукаў яе, і зваў яе, як і яна шукала і клікала яго. Ня проста так яны былі разам. Гэтае жыцьце наплывала на яго, закрывала яму вочы як цяжкі, дурны сон, адзіным праменьчыкам сьвятла ў якім была яна. Так было з кожным зь яго зямных жыцьцяў – зямля мае такую ўладу над душой, што яна моцна падпарадкоўвае яе сабе. Страшэнна прывязвае. І, ў той жа час, ад гэтай зямной пакуты, ад гэтага цяжара прасыпаецца прага – жаданьне ўспомніць, веды аб нябёсах, аб тым, што ляжыць там, далёка, па-за жыцьцём зямным, за яго межамі – жыцьцё адвечнае, якое ёсьць адзіная праўда, і праўдай гэтай з'яўляецца каханьне – перамога жыцьця над сьмерцю.

Таму, калі яна не пазнавала яго, ён цалаваў яе. Цалаваў яе халодныя вусны, і яны рабіліся гарачымі. Цалаваў яе рукі, і яны гладзілі яго твар, і ён цалаваў і гладзіў яе валасы, і называў яе імя зноў і зноў, і сваё імя, кладучы яе руку сабе на вусны, каб яна адчувала іх рухі, бо яна, здаецца, ня чула яго. І толькі вуснам яго яна верыла, і прыціскалася да іх, і тады сьлёзы ліліся зь яе вачэй. А яшчэ яна ўспамінала, і ціха плакала, ці напалохана ўскрыквала, ці сядзела, сьціснуўшыся ў камок, і тады ён абдымаў яе, і прыціскаў да сябе. Толькі яго рукам яна верыла, і яго губам, яго словам, яго дыханьню, яго каханьню, якое адчувала вакол сябе як цяпло і сьвятло. Але ж і ад рук яго яна ўздрыгвала, як ад болю, бо боль, які ахопліваў яе знутры і звонку, быў страшэнны, нібыта яе паліла полымя, і адначасова ахопліваў ледзяны холад.

- Дзе ты, каханы? – ціха запытвала яна яго, нібыта яго ня бачыла, нібыта вочы яе былі сьляпымі, выпаленыя сьлязамі, закрытыя покрывам цемры.

- Я тут, каханая. Птушачка мая, - ціха казаў ён, і цалаваў яе вочы. І хоць яна і ня чула яго словы, але ж адчувала яго пацалункі, і ціха плакала, ад радасьці і жалю да яго, і да сябе. І тады ён прытуляў яе, і цалаваў мацней, і абдымаў, ахопліваў яе рукамі, адчуваючы, што акрамя яе ў яго нікога няма ў гэтым

сьвеце, як і ў яе няма нікога, акрамя яго. Сьвет мізарнеў вакол, скурчваўся, таяў, рассыпаўся і зьнікаў, і заставаліся толькі яна, і ён. Ён распранаў і апранаў яе, карміў і насіў у ванную, і куды яшчэ было трэба, і цярпліва чакаў, калі неяк раніцой сонца асьвятліць яе твар, і яна ізноў прачнецца радаснай, усьміхнецца яму і пазнае яго, і назаве яго імя.

У такія часы яна памятала толькі свой боль, і, калі і гаварыла зь ім, то гаварыла насамрэч са сваім болем, сваімі пакутамі.

- Яны рабілі гэта, - ціха казала яна, ўзьнімаючы на яго вялікія вочы з расшырыўшыміся зрэнкамі. А потым заціхала, і не казала нічога, і ён абдымаў яе, і прыціскаў яе да сябе, шэпчучы ласкавыя словы – птушаня маё, я тут, з табою, нічога ня бойся, бо няма нічога, і нікога акрамя мяне, а ўсё, што было, было толькі сном, які прайшоў, пройдзе, калі ты прачнешся. Каханая мая. Здаецца, што за гэтыя дні ён старэў, і ў яго прыбаўлялася сівых валасоў, і шнараў на сэрцы.

Але ж вось яна прыходзіла ў сябе, і ізноў пазнавала яго, і ён ізноў адчуваў сябе маладым, а яго сэрца радавалася, быццам бы ён нарадзіўся нанова. Ён ня мог і ўявіць сабе, што б было зь ёй, калі б не было яго. Гэта быў сапраўдны жах. Дзе б яна была? У клініцы? Сярод вар'ятаў? Яна, сьвятая, Шхіна, яго каханая, яго багіня, жыцьцё, яго анёлачак. Але ж і не вар'яткай ён яе ўявіць ня мог, бо жанчына зямная яго не цікавіла. У зямных жанчынаў было надта шмат плоці, надта брудныя і цяжкія думкі, марудныя рухі, і хцівыя і прагныя позіркі. Ні ў воднай ён ня бачыў каханьня, калі яны глядзелі на яго. Здаецца, што пакахаць яго было немагчыма. Надта пагрозны ён быў для іх, надта страшны. Жорсткі. Яны закрываліся ад яго позірку, не давалі распрануць сябе, не давалі ўбачыць душу, якую адзіную ў іх ён жадаў бачыць. Яна ж адразу паўстала аголенай перад ім. Яе душа не хавалася, яна адкрылася яму ва ўсёй сваёй уразьлівай прыгажосьці, ва ўсім сваім пяшчотным харастве. Безумоўна, на зямлі было шмат прыгажэйшых целаў, і твараў прыгожых было ня мала, але ж ні праз воднае ня зьзяла такая прыгожая, пяшчотная, лёгкая і чыстая душа, якая была ў яе, душа-пярынка, душа-анёлак. І калі ён бачыў прыгажосьць яе душы, яе не было магчыма не жадаць. Яго жаданьне яе душы

ўзрастала бясконца, і юр гэты быў страшэнны, значна мацнейшы, чым юр цела. Да яе душы ён прыпадаў вуснамі, калі ён цалаваў яе пяшчотныя грудзі, яе сэрца, якое білася пад імі, і зьзяла для яго чыстым вагнём яе каханьня.

Ён трымаў яе ў руках, прыціскаючыся губамі да яе цела, і шаптаў ёй пяшчотныя словы, шалеючы ад асалоды і жарсьці, ад таго, што яна – маленькая, а ён – вялікі, яна – кволая, і ён – магутны, і яна суцэльна давярае яму, і не баіцца яго, і ня просіць, і не жадае ад яго нічога, акрамя яго самога. І таму яна атрымлівала ад яго ўсё – і яго каханьне, і ўсе шчадроты зямныя, якія толькі ён мог ёй даць. Ён захінаў яе ад усяго сьвету, палажыў сабе на грудзі, як сьвяты крыж, які насіў і ў дзень, і ў начы, ні на імгненьне не здымаючы, бо ж яна была яго жыцьцём, яго сьвятлом, яго каханьнем, яго абаронай перад самім сабою.

- Дзевачка мая, лялечка, - ціха казаў ён. Ён цалаваў яе рукі і ногі, усё цела, кожны маленькі танюткі пальчык. Яны былі халоднымі, але ж рабіліся цёплымі ў яго вуснах, і ён саграваў іх губамі і подыхам. Ён і кроў бы сваю лёгка аддаў ёй, і калі б яна пажадала, атварыў бы і вены, каб яна піла зь іх. Ён бы кавалкі адразаў ад сябе, калі б ведаў, што нічога больш ня зможа накарміць яе, уліць у яе сілы, вылячыць яе хваробу. Пацалунак яго вуснаў быў для яе жыцьцём і подыхам, быў яе ежай, і пітвом. І ён не сьпяшаўся, ён быў цярплівым. Гэтыя дні былі адзінымі, калі ён забараняў сабе кахаць яе плоцкай жарсьцю, уваходзіць у яе сваім чэлесам, бо яна не была гатовая яго прыняць. Яе ўлоньне спала, яе душа лунала далёка, і ён толькі калыхаў яе на руках, гладзіў і цалаваў яе, не сьпяшаючыся, ведаючы, што, калі яна прачнецца, яго чаканьне будзе ўзнагароджана шматразова.

Глава 67: Лекі

Цярпліва ён чакаў, калі змрок адыдзе, калі зімовая сьцюжа ў яе позірку зьменіцца вясновай цяплынёй, калі яна растае, лядзяная багіня, і глеба вызваліцца з-пад халоднага сну, гатовая прыняць семя, сагрэтая сонечнымі праменямі, як сэрца, гатовае прыняць сьвятло каханьня.

І таму, калі раніцой яна адкрыла вочы, паглядзела на яго, усьміхнулася, і вымавіла: “Каханы!”, і абняла яго за шыю, цалуючы яго, ён заплакаў ад шчасьця.

Ён шаптаў над ёй замовы, калі яна спала, і начытваў ёй ваду, і гладзіў яе далонямі, уліваючы ў яе сваё жыцьцё. Ён бы адабраў яе і ў цемры, і ў сьвятла, і не было такога бога ці чорта, перад якім бы ён ня ўстаў, захінаючы яе. Ён усё ж быў чараўніком, і чараўніком моцным, спрактыкаваным, страшным сваімі жудаснымі, тагасьветнымі сіламі. Калісьці было зь ім і такое – недарма ж яна сустрэла яго на сьвятым месцы, назделеным вялікай моцай яго народу, яго роднае крыві і костак. Ён быў ваўхвом, быў жрацом, каўдуном, які кінуў выклік самому Богу-творцы, зразумеўшы, што творца над ім ня ўладны, бо яго стварэньню ён не належыў. Ён сам стварыў і сьвет, і самога сябе, і таму і вецер, і зоркі, і полымя, і вада і зямля падпарадкоўваліся яму, бо ж ён меў над імі ўладу. Ён быў магутней за ўсе сілы сусьвету, бо ж ён быў чалавекам, які спазнаў у сабе Бога, і аддаў яго той, каго пакахаў каханьнем нечалавечым, боскім, больш гарачым, чым жар сонца, больш салодкім, чым самое жыцьцё, якое рабілася безь яе пакутай і горкім атручаным віном. Зь ёй жа яно рабілася нектарам.

Калі б яна ведала тое, што ведаў ён, ведала тыя шляхі, якімі ён прайшоў, пакуль здолеў адшукаць яе. Але ж яна ніколі не даведаецца пра гэта. Яго дзяўчынка, яго каханая. Яна прасіла яго навучыць яе чараўнічым ведам, адкрыць таямніцы. Ды таямніцы гэтыя адкрываліся зь яго крывёй. І тады ён нацадзіў поўны яе кубак са свайго сэрца, і працягнуў ёй.

- Пі, дзяўчынка мая, - ціха вымавіў ён, і яна паднесла яго кроў да вуснаў.

- Пі, бо з гэтай крывёй у цябе ўвойдуць усе веды сусьвету, і перад табой скарыцца ўся яго моц.

- Толькі цябе я жадаю, каханы мой, - ціха вымавіла яна. – Толькі ты мне патрэбны. І не патрэбен мне ні сусьвет, ні яго багацьці, ні каралі, зямныя, ці нябёсныя. Толькі с табой быць жадаю. Яна сказала гэта, і паднесла яго кроў да вуснаў, выпіла, і ўпала мёртвай на зямлю, і адначасова ачуняла жывой – на яго руках.

- Ешь плоць маю, любая, - вымавіў ён, і адрэзаў ёй кавалак свайго сэрца. І яна дакранулася да яго раны вуснамі, і прыняла ў сябе яго плоць, якая адразу стала яе плоццю. Цяпер яны былі з'яднаныя так, як ні адзіны шлюб ня здолеў бы іх з'яднаць, і сталі адным – адной плоццю, і адной крывёю. Яна ўвашла ў яго род, а ён праз яе вусны ўвайшоў у яе.

Гэта быў страшны, цёмны абрад, які, ён ведаў, назаўсёды прывязваў яе да яго. Яна адмаўлялася ад усяго сьвету, і ўсіх багоў, і ўваходзіла ў яго, як у браму, і яго рукі замыкаліся за ёй надзейным замком, паўставалі шчытом, баронячы яе ад усяго сьвету, і ад неба, і ад зямлі, і таго, што было пад зямлёй, і ўсіх нябёсаў над нябёсамі. Цяпер яна належыла толькі яму, і яны зь ёй былі ў бясконцасьці.

О, якімі страшнымі былі яго позірк і яго рука для тых, што бачыў яго, і адчуваў яго моц! І якім пяшчотным і лагодным ён быў для яе, бясконца цярплівым, бясконца кахаючым. Бо ж ён і сапраўды быў бясконцасьцю, і ў яго была бясконцасьць часу, каб кахаць яе. Каб вучыць яе, бо не было той меры, якой можна было б вымераць яго веды. Яе ж вучыць было бясконцай радасьцю. Яна радавалася ўсяму, як дзіця. Усё, што ён распавядаў ёй, было ёй цікава. Насамрэч ён шмат вучыў яе – вучыў гуляючы, так, як вучаць дзіця, калі авалоданьне складанымі ведамі адчуваецца лёгкім і цікавым. Ён не садзіў яе за парту, не задаваў хатнюю працу для выкананьня, і ня ставіў ёй адзнакі. Ён проста адкрываў ёй самога сябе, і яна вучылася ў яго праз яго пацалункі, праз зьліцьцё зь ім, калі яна ўваходзіла ў яго самога, і ён сам уваходзіў у яе, раскрываў яе, рабіў яе

прыдатнай для апладненьня глебай, у якую выліваўся бясконцую колькасьць разоў. І разам зь яго семенем у яе цяклі, пераходзілі яго веды.

- Як замаўляць ваду, каханы? – запытвала яна зь цікаўнасьцю, і ён браў, усьміхаючыся, яе далоньку, і накрываў ёй празрысты крышталёвы кубак, накрываючы зьверху сваёй вялікай далоньню, і яна зьдзіўлена адчувала, як ад яго праз яе ў ваду ліецца яго – яе – цяпло, і вада запальваецца, нібы полымя, і пачынае зьзяць, як сонца. Гэта было так прыгожа, што яна ўскрыквала, і сьмяялася ў захапленьні, і аддзёргвала далоньку, і тады ён пераварочваў яе, усьміхаючыся таксама, і прыціскаў да вуснаў – цалаваў у самае сэрца, сярэдзіну, доўга, а потым цалаваў вышэй. І вышэй. Дабіраўся да шыі, апускаўся да грудзей, і яна раскрывалася перад ім, ціха, сарамліва, затаіўшы подых, глыбока ўздыхаючы, уздрыгваючы ад яго блізкасьці і яго моцы. Насамрэч, урокі іх часта скончваліся так – замацаваньнем, калі ён выліваўся ў яе, і ляжаў, трымаючы яе на сваіх грудзях.

- А калі палажыць у ваду бурштын, красуня мая, то яна набудзе моц сонца. І тады яе проста можна паставіць на сонца, толькі ў самы гарачы паўднёвы час, і ненадоўга, толькі каб сонца асьвяціла яе. А потым паднесьці да вуснаў, і вымаваць слова – запаліць яе, і яна зазьзяе. Удыхнуць у яе свой подых. О, такая вада будзе моцным лекам, яна здольная вылечваць любую хваробу, любое запаленьне і трызьненьне, і душы і цела.

- А якое слова трэба вымавіць, любы? – ціха запытвала яна яго.

- Гэта слова я табе сказаць не магу, каханая, бо яго кожны знае сам у сабе. Тое слова, што прыйдзе да цябе, як маланка, і стане агнём у тваіх вуснах. І яно – найвялікшая таямніца. Калі яно прыйдзе да цябе, такое слова, ты нават і мне яго не кажы, бо яно – як пяшчотны матылёк, якога ня можна кранаць рукамі. Няможна яго і кранаць вуснамі, бо яно адразу памрэ, страціць сваю лякуючую моц. Толькі подыхам яго кранаць магчыма, і вымаўляць яго трэба подыхам, выпускаючы яго зь сябе, быццам бы нараджаючы. Але ж, каб дапамагчы табе, магу сказаць, што гэта можа быць і імя бога, ці багіні, ці нейкае іншае імя. Ці тое, што ты хочаш перадаць з кубкам, з вадой, і слова гэта можа

быць як белым, так і чорным, як жыцьцём, так і сьмерцю. Можа гэта быць і сьпеў, і малітва, і заклён, ці замова. Слова можа быць доўгім, як жыцьцё, ці кароткім, як імгненьне. І яно – гэта дар твой ад цябе да таго, каму прыназначаны гэты кубак.

І калі ты вымавіш – кроў, то вада ў гэтым кубцы стане крывёю. Разумееш?

- Разумею, каханы, - -ціха вымаўляла яна. Ён усьміхаўся.

- Ты мая разумніца! І цалаваў яе губы сваімі вуснамі.

- А раскажы, каханы, як ты быў чараўніком! – прасіла яна.

- Вось ты цікаўная, сонейка. Цікаўная мая птушачка-сінічка. Ён усьміхаўся, і ўспамінаў, і распавядаў, а яна ў захапленьні слухала.

Глава 68: Гісторыя

Ён убачыў гэтую дзяўчыну на лекцыі. Заўважыў адразу ў першы дзень. Яна крыху спазнілася, і зайшла ў залу ўжо пасьля ўсіх, калі амаль усе месцы былі занятыя, і ён пасьпеў раскрыць каньсьпект, і прыгатаваўся вымавіць тэму занятка - фарміраваньне ВКЛ. Падрыхтоўчыя курсы ішлі ні шатка, ні валка. Наогул, курсы ён ня дужа любіў, любіў паглыбляцца ў справу грунтоўна, гатаваць шмат дадатковага матэрыялу, разьмяркоўваць заданьні. І заўсёды знаходзіліся жадаючыя, якія іх бліскуча выконвалі - аматараў было шмат.

Курсы - гэта ж заўсёды курсы, нешта часовае, падагульненьне школьных ведаў, падбіваньне ітогаў і запаўненьне прабелаў, якіх часам было столькі, што ён жахаўся, як гэтыя людзі сконьчылі школу наогул.

Але ж курсы былі платнай паслугай, істотнай у шчыльнаватым універсітэцкім кішэні, якую трэба было прасоўваць і папулярызаваць. Ды і наогул, веды ёсьць веды, хоць бы і набытыя такім павярховым чынам, як перакус на хаду.

Таму ён рыхтаваўся, і рыхтаваўся добра. І цяпер ужо прыгатаваўся за пару акадэмічных гадзінаў умесьціць у слухачоў столькі інфармацыі, сколькі яе не змаглі ўмесьціць за чвэрць школьнага году.

Пачуўшы таропкія крокі, уськінуў позірк, павярнуў галаву, і ўжо прыгатаваўся вымавіць нешта вастравата-агіднае, каб зь першага занятку адвучыць спазьняцца, але ж раптам абамлеў.

Дзяўчына, якая ціхенька прасьлізнула ў дзьверы, была такой прыгожай, што ў яго захапіла подых. Яе чорныя валасы ліліся па плячох, як коўдра, шаўковы чорны шаль, ахутваючы яе амаль да таліі.

Яна была высокай і худзенькай, як кажуць, мадэльнай зьнешнасьці, але ж не выглядала тыповай глянцавай прыгажуняй, аднак і сьціплай школьніцай яна не выглядала.

Яна быццам бы была асобнай ад усяго, плыла па-над гэтым сьветам, накладвалася на яго, як малюнак на шкло. Сьвет быў размытым і блёклым. Яна была рэальнай. Раптам у яго моцна грукнула сэрца - чаму, ён і сам ня ведаў. Прыгожых дзяўчат вакол яго заўсёды было шмат, бо ж - малады выкладчык, і ўжо кандыдат навук, ды ён іх, шчыра кажучы, не заўважаў. Яна ж была адна. Такія не вывучаюць гісторыю, падумалася яму. Яны яе ствараюць. Пра такіх пішуць кнігі, складаюць легенды і паданьні, міфы, з такіх вырэзваюць і малююць багіняў. Якой бы багіняй яна магла быць? Хутчэй, німфай, сірэнай, нейкім дземанам ці прывідам, ламіяй ці суккубам. Нечым прызрачна-эфемерным, спакусьлівым і палохаючым. Можа, з-за яе чорных валасоў і белай скуры, а можа, з-за таго, што ў яго закалаціласа, забалела сэрца. Чаго - ён і сам ня ведаў.

Дзяўчына-прывід села на першы рад, бо астатнія месцы былі занятыя, акуратна расклала блакнот і ручку, і прыгатавалася слухаць.

Ён кашлянуў, неяк зьбянтэжана, і аб'явіў тэму - на экране з'явіўся першы слайд. Зарыпелі ручкі, нехта запісваў у дыктафон у мабільніку. Дзяўчына таксама апусьціла позірк на імгненьне. А потым прама ўставілася на яго.

І так і не адводзіла позірку да канца лекцыі - толькі быццам бы неахвотна прынімалася нешта чыркаць у вялікім блакноце з чорнай вопраткай, які сваім салідным выглядам не вязаўся да яе вытанчанага погляду.

Калі лекцыя сконьчылася, і ўсе пасьпешна зазьбіраліся, пакідачы аўдыторыю, яна адзіная засталася. Ён таксама спыніўся, і разгублена глядзеў на яе. Гэта дзяўчына мела ўладу - вялікую, страшную, раптам зразумеў ён. Уладу над жыцьцём і сьмерцю. Над яго лёсам.

- Вы жадаеце нешта запытаць, спадарыня? - неяк хрыпла, спатыкаючыся аб словы, вымавіў ён.

- Не. Яна пакачала галавой, і ўсьміхнулася. Прывабнай, мяккай вусьмешкай крыху падфарбаваных ружовым вуснаў.

- Я толькі хацела падзячыць вам за лекцыю. Вы - выдатны выкладчык, і мне было дужа цікава. Вы распавялі столькі, што я не даведалася за ўсе гады навучаньня. Яна шырока ўсьміхнулася - ізноў. Ён стаяў, зусім зьбянтэжаны. Ад дзяўчыны прывабна салодка пахла - нечым лёгкім, кветкавым, духмяным. Але ў глыбіні гэтай пяшчотнай кветкі пагрозна гудзелі пчолы - цэлы вулей, якія выляталі, і джалілі яго ў самае сэрца.

- Як вас завуць? - ціха запытаў ён.

- Летыцыя. Яна мякка ўсьміхнулася. - А вас?

- А мяне - Алег.

- Прыемна пазнаёміцца, Алег. Яна працягнула яму руку. Ён асьцярожна паціснуў яе тонкую кісьць.

Дамоў яны ішлі разам. Ён узрушана распавядаў ёй нешта, яна сьмяялася. Нешта запытвала, але ж ён не памятаў, што. Словы раптоўна сьціраліся ў яго памяці. Заставаўся толькі яе твар - мяккі, прыгожы белы авал зь вялікімі шэрымі вачыма пад чорнымі бровамі. Гэтыя вочы зацікаўлена пазіралі на яго, і ён бянтэжыўся, губляў словы, і тануў у іх глыбокіх прахалодных вірах.

А потым апусьціўся вечар, і словаў болей не засталося. Яны проста ціха шлі побач скрозь вечарэючы горад.

- Вы - дужа прыгожая дзяўчына, Летыцыя, - ціха вымавіў ён, асьцярожна кранаючы яе руку.

- Я ведаю, - ціха адказала яна. - Але ж гэта не прынесла мне шчасьця, Алег. Яна дадала яго імя, якое яна канешне ж ведала, але без імя па бацьку гэта прагучэла для яго так уразьліва, што ён ледзь не спатыкнуўся.

- Мы яшчэ сустрэнемся? - запытаў ён.

- Гэта залежыць ад вас. Яна ўзьняла на яго вялікія зьзяючыя вочы.

- Тады давайце заўтра. Заўтра ў музее выстава, і я буду рабіць

прэзэнтацыю: гісторыя ваярскага касьцюму, а потым мы з вамі можам схадзіць, куды вы жадаеце. У рэстаран, ці ... калі вы жадаеце, можам пайсьці да мяне. Я жыву адзін. Вялікая кватэра засталася ад бацькоў. Ён назваў адрас у самым цэнтры - прэстыжная старая высотка, архітэктурная каштоўнасьць гораду.

- Ад мяне адкрываецца цудоўны від - на плошчу, і далей. Калі б вы ведалі, якія цудоўныя захады, і ўсходы можна бачыць адтуль. Ён раптам пачырванеў.

- Вы мяне зацікавілі. Яна сур'ёзна глянула на яго. - Добра, Алег. Я згодная. Ён правадзіў яе да мятро, і ўвесь вечар, і наступны дзень, хадзіў, нібы ў сьне.

Назаўтра ўсё адбылося так, як ён і планаваў. Ён прачытаў лекцыю, яна стаяла сярод натоўпу ў шаўковай белай сукенцы і маленькам жакеціку, слухала ўважліва. Яе валасы былі ўзьняты ў высокую прычоску-пучок, адкрываючую шыю. Ён распавядаў з асаблівым жарам - баяры, рыцары... яму нават апладыравалі. Хлопала і яна. Дамоў да яго яны пайшлі разам. Ён хваляваўся, набыў вялікі букет чырвоных ружаў, купіў дарагога віна - дзяўчына была ня з танных прыгажунь, гэта ён разумеў. Вячэру заказаў у рэстаране - сам ён гатаваў ня дужа. Усё прывезьлі як раз калі яны прыйшлі ў кватэру. Кватэра была вялікая, са сталінскай стольлю, белай ляпнінай па вуглах, старой паліраванай мэбляй і шыкоўнымі дыванамі. Ён толькі канапу новую набыў, скураную, ды тэхніку. Астатняе ўсё было ад бацькоў - савецкай эліты. Абодзьва былі навукоўцамі, бацька - архіёлаг, маці - мастацтвазнаўца.

На сьценах, на барвовых з золатам абоях, віселі малюнкі ў залатых рамах, клясыка ў перамешку з рэалізмам - віды прыроды, твары людзей, відарысы старога гораду - Вільні.

Шафы поўніліся кнігамі і дарагім фарфорам. Яна зь цікавасьцю аглядала ўсё, быццам бы ён ізноў прывёў яе ў музей.

- Як у вас прыгожа, Алег. Як цікава, - нягромка вымавіла яна. І раптам распусьціла валасы, дастаўшы з пучку доўгую залатую шпільку.

- Галава баліць, - ціха патлумачыла. Ён застыў, любуючыся яе хараством. Яны ізноў размаўлялі, елі і пілі віно. Ён распавядаў ёй аб сваёй сям'і, яна слухала зацікаўлена, задавала пытаньні. Аб сабе не казала шмат - маці зь вёсачкі каля Іўя, бацька зь Менску, але ж з'ехаў, ды пакінуў ім хату. Куды з'ехаў, не казала, ён і не запытваў. У яе ўжо былі адносіны з хлопцам, няўдалыя. І вось цяпер яна хоча пачаць жыцьцё з пачатку. Ён таксама хацеў. Яго цяжарная невеста апынулася цяжарная не ад яго, яны разышліся мірна, яна з'ехалася з новым кавалерам, ён жа, наадварот, выдахнуў з палёгкай. Гэтая цяжарнасьць яго зусім не радавала, і жанчыну тую ён, шчыра кажучы, не кахаў. Проста разгубіўся неяк адзін пасьля сьмерці бацькоў, і яна апынулася побач. Лябарантка з кафедры, завочніца.

Цяпер жа ён адчуваў, што сьвет уходзіць у яго з-пад ног. Дзяўчына, якая сядзела перад ім, нагадвала багіню. Яна была прыгожай, дзіўна - і тонкай постацьцю, і бляскам вачэй і валасоў, точанымі рысамі твару. І яна слухала яго ўважліва, усё у ёй было сьціплым, жаночым, але ж поўным годнасьці і хараства. Яна ня фыркала, не крыўлялася як Ларыса - яго несастаяўшаяся жонка, аб якой ён успамінаў з жахам. Тая вылучала напорыстасьць, нахабства. Гэтая ж была пяшчотнай, ціхмянай. Жаноцкай. І - глыбокай. Ён разумеў, што далёка ў ёй хаваецца нешта, аб чым яна не кажа. Нешта патаемнае, сакрэтнае, і можа так, што і страшное. Нейкія таямніцы, аб якіх яна не казала. Яна наогул гаварыла ня шмат. Любіць чытаць. І клясыкаў, і сучасную прозу. Любіць гсторыю. Мову. Асабліва беларускую. Ведае і ангельскую. Марыць вандраваць. Каталічка. Вось і ўсё. Але ж ён ад яе п'янеў - не ад віна, яны выпілі, наогул, ня шмат. Яе цела, подых, бліскасьць ап'янялі яго.

Нарэшце, ён насьмеліўся: нахінуўся, і пацалаваў яе. Мякка, пяшчотна, ледзь кранаючы яе ружовыя вусны. Яе рукі абвівалі яго, як лаза. Мяккія, тонкія рукі гладзілі яго сьветлыя валасы, асьцярожна разшпільвалі кашулю. Ляглі яму на плечы. Ён цалаваў яе прыгожы твар, асьцярожна гладзіў грудзі.

Нарэшце, яны ўзьняліся, ён абдымаў яе, прыціскаючы да сябе.

- Прабач, я не гатовая сёньня, - ціха вымавіла яна. - Я не магу.

- Нічога, я разумею, - вымавіў ён. - Давай яшчэ пасядзім? Крышачку? Яму не хацелася разьвітвацца зь ёй, але ж гэтая прыгожая дзяўчына яго палохала. Ён не ўяўляў сабе, як ён распране яе, увойдзе ў яе дасканалае цела. Гэта здавалася яму блюзьнерствам, гэтая жанчына была не для яго, разумеў ён. Яна належыла камусьці іньшаму. Каму, ён нават і не ўяўляў.

Яны выпілі яшчэ па келіху.

- Вы дужа добры чалавек, Алег. Прыгожы мужчына. Вумны. Я жадаю вам шчасьця, шчыра. Вы годныя ляпшай жанчыны, чым я. Яна замаўчала. Ён запярэчыў – лепшай, чым яна, яму ніколі не знайсьці. Яна – самая найлепшая ў сьвеце.

- Не, Алег. Вы не разумееце, што кажаце. Віно закружыла вам галаву. І вы ня ведаеце мяне. Яе твар стаў сумным, а на вачах раптам паказаліс сьлёзы.

- Прабачце мяне, - ціха вымавіла яна. – Я не павінна была рабіць гэта – прыходзіць сюды. Вы – не такі, як я. Вы – чысты. Я ж – благая. Дрэнная. Вы нічога пра мяне ня ведаеце, і я вам ніколі не раскажу. І праблема – ня ў вас. Яна – толькі ў ва мне. Але ж болей я не магу сказаць вам нічога. Я ўдзячная за вячэру, і за ўсё. За вашую цяплыню. Калі жадаеце, мы застанемся сябрамі. Але ж цяпер мне трэба ісьці. Яна рашуча ўстала.

- Пачакайце, я выклікаю вам таксі, - вымавіў ён. Яны яшчэ пасядзелі з паўгадзіны, цяпер ужо размаўляючы, як шчырыя і даўнія сябры. Ён болей нічога не запытваў у яе. І раптам яму стала лёгка, і радасна. Ён і сапраўды разумеў, што ня здолее зьнесьці гэты груз. Гэтае цела прагла каханьня, ён адчуваў гэта і бачыў, але ж таго, што яно прагла, ён ня мог ёй даць. Яе вочы былі вар'яцкімі, і пал, які ішоў ад яе, палохаў яго. Яна была ціхая, і пяшчотная, як дзіця, але ж за зрэнкамі яе вачэй раскрывалася бездань. Калі прыехала машына, ён праводзіў яе, і пасадзіў, зачыніўшы за ёй дзьверцу. Пасьля гэтага ён яе ня бачыў, і на курсы яна не прыйшла. А потым яго зьнялі з падрыхтоўчага патоку, чаму ён нават узрадваўся. Усё ж, бачыць яе было цяжкім выпрабаваньнем.

Але ж потым адбылася яшчэ адна сустрэча, нечаканая. Неяк яго

запрасілі на кансультацыю для адной выставы – збройнай, якая праходзіла ў вялікім дарагім рэстаране. На кансультацыю прыйшоў адзін зь яго знаёмых, скульптар, які працаваў кавалём – высокі, мажны, змрочны мужчына гадоў каля пяцідзесяці, які жыў адзінокім на водшыбе у сваёй сядзібе. Пра яго хадзілі чуткі – наколькі таленавіты, настолькі ж ён быў нефарматным, і цяжкім у абыходзе. Тыя нямногія, хто маглі лічыцца яго сябрамі, адзываліся аб ім зь нейкай сумясьсю захапленьня і жаху. Пра яго хадзілі чуткі, што ён ці то не зусім у сабе, ці то сапраўдны чараўнік, і паганскі воўхв, зь нейкага старога каўдаўскога літоўскага роду. Ну, канешне ж усё гэта была поўная лухта і біцьцё языкоў аб зубы, чаму Алег ніколі ня верыў. Ды вось неяк гэты каваль і сапраўды паказаў яму рэшткі старога вялікага маёнтку, і нечага, што калісьці магло быць дужа вялікай будовай, саборам, фундамент якога захаваўся глыбока ў лесе. Былі там і рэшткі круглай вежы-данжона недалёка ад старых курганоў, дзе Алег праводзіў раскопкі. Мясьціны там былі і сапраўды цікавымі, старымі, ды Міхась усё болей адшучваўся і сыпаў байкамі, калі Алег паспрабаваў яго запытаць, ці то праўда, што ён ведае старыя замовы, і належыць роду чараўнікоў-паганцаў. Усё гэта цікавіла яго з этнаграфічнага пункту гледжаньня. Але ж Міхась, ці Міхал, як яго яшчэ называлі на літоўскі манер сябры, толькі пасьмяяўся. Лухту людзі кажуць, які я чараўнік. Так, падчароўваю – раблю нешта на адмысловых зёлках. І сапраўды, яны так тады накаштаваліся, што Алег раніцой ледзь ачуняў, Міхал завёз яго на станцыю, пагрузіў у цягнік, і болей Алег да яго на раскопкі ня ездзіў. Цяпер жа вось, ізноў сустрэліся ў горадзе – зьвёў агульны знаёмы. Але ж тут адбылося тое, што Алега сапраўды ўразіла, так, што сэрца ледзь ня вываліся на стол, за якім яны сядзелі. Бо побач зь Міхалам за стол села Летыцыя. Яна мякка, шчыра ўсьміхнулася яму.

- Дзень добры. Ён ветліва паздароваўся. Паціснуў кавалю руку – моцную, шырокую, нагадваючую молат.

Яна нічога не сказала, не дала нават паняць, што ведае яго. Чалавек побач ахінуў яе рукой.

- Летыцыя – мая жонка. Мужчына прадставіў яе. Сапраўды ж,

яна болей нагадвала яго дачку. Яна ўсьміхнулася, і моцная мужчынская рука накрыла яе вузкую далонь.

- Неяк мне давялося мець гонар выкладаць у спадарыні на курсах, - Алег усьміхнуўся. – Аднак – толькі адзін занятак. Потым мяне гэтага гонару пазбавілі.

- А я курсы кінула. Яна ўсьміхнулася – шырока. – Я проста зразумела, што гэта не зусім тое, што мне патрэбна. Хоць і было дужа цікава. Але ж так цікава, як выкладалі вы, пасьля не было.

- Алег – аматар сваёй справы, і адзін з самых сур'ёзных навукоўцаў, якіх я сустракаў. Міхась кіўнуў, і з павагай глянуў на яго.

- Але ж вы, Міхал, зьдзівілі нават і мяне. Таму ўсё ж, вы першы. Мне здаецца, вы ведаеце значна болей, чым гаворыце. Алег таксама нахіліў у адказ галаву.

- Можа, і так. Міхась усьміхнуўся. Але ж усё ведаць не магчыма. Нават і удзельнікі падзей ня ведаюць пра іх таго, што ведаюць гісторыкі-навукоўцы.

- Сапраўды, гэта так. Алег рассьмяяўся. – Бо калі б яны даведаліся, яны б гэтым навукоўцам языкі б павырывалі. І галовы паадкручвалі.

- Ну, яны да іх не даберуцца, гісторыя ў гэтай частцы значна больш бясьпечная, чым журналістыка. Міхась шырока ўсьміхнуўся.

Яны яшчэ пасядзелі, абмеркавалі дэталі выставы, выпілі па келіху віна.

Калі ж разьвітваліся, ён не ўтрымаўся.

- Вы – дужа прыгожая пара, - вымавіў ён. – І вы так падобныя. Калі б ня ведаў, падумаў бы, што вы – айцец з дачкой. Гэта вырвалася ў яго самое, ён не жадаў пакрыўдзіць ці ўкалоць ні яго, ні яе, і зьбянтэжана замаўчаў.

- Я чую гэта не ад вас першага. Мужчына ўсьміхнуўся ў чорныя вусы, і сьціснуў танюткую дзявочую руку. – Яна мне і сапраўды як дачка. Стары я для цябе, золатка? Ён павярнуўся да яе. – Пэўна ж, што так.

- Не, каханы. Яна ўсьміхнулася, і пакачала галавой. Ён пацалаваў яе ў мяккія ружовыя вусны. Мужчына і дзяўчына схаваліся ў кабіне дарагога чорнага аўтамабіля-джыпа, а ён стаяў, і глядзеў ім усьлед разгублена. Дачка, так. Але ж побач зь ім яна была шчасьлівая, тое было бачна. Ён устрахнуў галавой, нібыта прачынаючыся ад сну, і пакрочыў прэч.

Глава 69: Шчасьце

- Я хачу быць самай прыгожай для цябе, каханы. Хачу адвечна радаваць тваё вока. Яна абняла яго, яе рукі пяшчотна ляглі на яго плечы, і ён прытуліўся да яе шчакой, удыхаючы яе водар. Праз яе ў яго ўлівалася жыццё. Ён быў шчасьлівы - самы шчасьлівы зь ёй у цэлым сьвеце. Бо сьвета вакол іх не было - засталіся толькі яны. Усё сышло, адляцела як сон. Засталася толькі праўда. І гэтай праўдай для яго была яна. Як і для яе праўдай быў ён. Яна бачыла яго так яскрава - яго чорныя валасы з тонкімі срэбнымі ніткамі, смуглаватую скуру, гладкі лоб і ссунутыя густыя бровы, яго шырокія плечы, моцныя рукі, высокі прамы нос з крыху заўважнай гарбінкай, апушчаныя павейкі і доўгія пухнатыя вейкі пад імі, глыбокія складкі ад носу да жорсткіх вуснаў, чорную бараду і вусы, якія дакраналіся да яе цела. І калі ён усьміхнецца, яна ведала, то праз чорны волас бліснуць крэпкія белыя зубы - вясёлая, драпежная вусьмешка. Цяпер жа яго вочы былі закрытыя, яго ностры ўбіралі яе пах, яго вусны дакраналіся да яе скуры.

- Ты і так самая прыгожая, любая. Мара мая. Трымаю цябе, і ня бачу - быццам бы трымаю сьвятло.

Яна і сапраўды была для яго сьвятлом, якое расплёсквалася па яго руках, ахінала яго пяшчотным зьзяньнем, лашчыла і песьціла, запаўняючы цяплынёй яго душу. Яму здавалася, што яго пальцы зьмінаюць шоўк, пад якім трымціць пустата, нешта танюткае і пругкае, зьвінячае, нібыта абдымаеш сьпеў, шапаценьне анёльскіх крылаў.

Празрыстае кімано на грудзях не хавала яе цела, праз танюткую тканіну ў колер яе скуры ён бачыў яе маленькія саскі, узьнятыя пругкія грудзі, што нагадвалі яму дзьвух птушачак, якіх так хацелася накрыць рукой. Ён і накрываў, і цалаваў праз танюткую тканіну, якая рабілася вільготнай пад яго вуснамі, падкрэсьліваючы пругкія вострыя саскі, якія так жадалі яго губ, яго пацалункаў. Яе рукі гладзілі яго плечы, застаўлючы ўздрыгваць, так, быццам бы па цяглах прабягаў ток.

Ён пасунуў тканіну ў бок, кімано звалілася зь яе вузкіх плечаў, і цяпер ён цалаваў яе грудзі, пругкія і маленькія, грудзі зусім юнай дзевы, якая нарэшце адкрылася яму, саступіўшы да яго з ідэяльнага сьвету сноў. Яму нравілася адчуваць, як ён узрушвае яе, як яна стогне ад жаданьня, якое вымушае яе ўздрыгваць, становячыся пакорлівай глінай у яго руках.

Ён мог зрабіць зь ёй усё, што жадаў. Узяць яе ў любым месцы і любым спосабам, дакранацца ўсюды да яе цела, адвечна цнатлівага для яго, і ня маючага перад ім ні кроплі сораму. Яна не баялася яго - яна яго кахала. Што б ён не рабіў зь ёй, яна была рада атрымаць гэта ад яго рукі. І ён заўсёды жадаў яе. Некалькі разоў у дзень, і ў ноч. Здаецца, ён мог трахаць яе няспынна - суткі і болей. Крыху адпачыць, і ізноў трахаць. Столькі скапілася ў ім гэтага жаданьня за годы самоты, што ён сам сабе ня верыў. Як ён жыў безь яе? Гэта была загадка. Канешне ж, гэтага яму хацелася - трахацца. І жанчыны былі. Зрэдку, ды былі. Аднак іх ён не жадаў. Трахацца - так. Але ж самая іх прысутнасьць была для яго мукай. Жанчына была для яго толькі похвай, якая высмоктвала яго душу. І калі ён выліваўся ў жанчыну, ён нібыта пусьцеў. А пустата запаўнялася агідай. Таму яму ўсё роўна было, каго трахаць - хоць жанчыну, хоць кабылу. У яго ўставала на любую, і рабіў ён гэтую справу груба, жорстка, так, як бы і жывёлу ня трахаў. Чым больш грубая, жывёльная была жанчына, тым больш грубым і жорсткім станавіўся ён. Ён мог скарыць і атадраць любую бабу так, што самыя нахабныя пачыналі залівацца сьлязамі, і малілі яго адпусьціць іх жывымі і больш меньш непашкоджанымі. Гэтага ж пяшчотнага анёлка ён баяўся крануць. Ён асьцярожна гладзіў яе рукамі, кранаў вуснамі. Ад малейшага яго рэальнага дакрананьня на яе целе заставаліся сінякі, ён і косткі мог ёй паламаць, таму яго жарсьць пераўтваралася для яго ў пакуты і асалоду. Ад аднаго позірку на яе тонкае дзявочае цела ў яго ўставаў, як каменны. І пры гэтым сэрца разрывалася ад каханьня і пяшчоты. Калі ён быў зь ёй, у яго цяклі сьлёзы - сьлёзы ад каханьня, ад пачуцьця. Ён заліваў яе і семенем, і сьлязамі. І цяпер яна адчувала, што яго вейкі мокрыя. І рукой яна адчувала яго чэлес, які ўпіраўся ёй у далонь. Ён гладзіў яе і шаптаў ёй ласкавыя словы, сьцікваў саскі, аблізваў іх языком. А потым браў яе - спачатку асьцярожна, а потым груба,

жорстка, ледзь стрымліваючы моц свайго вялікага цела.

І тады ёй здавалася што яна памрэ. Але ж - дзіва! - яна не паміралa, а нараджалася. Бо яе трахаў яе ўласны айцец, які і браў яе як жанчыну, і любіў як роднае дзіця. Бо яе трахаў Бог, які сыходзіў да яе ў яго абліччы. Яна аддавалася яму і ў вязьніцы і ў катавальні, і адкінутаму ўсемі, зь целам, зьнявечаным праказай, і пакрытаму ранамі, і забытаму і праклятаму і багамі і людзьмі. Яна знайшла і ажывіла пакутуючае цела Бога, Бога сапраўднага, адзінага для яе, якое амыла сьлязамі, загаіла ўсе раны і язвы і ажывіла сваім подыхам. Ад яе дакрананьняў сухія косткі пакрываліся мясам і скурай, плоць налівалася моцай, і яна паварочвала працэс разлажэньня ўсьпяць, вымушаючы чарвей адрыгваць сваю ежу, робячы спарахнелае чырвоным і вільготным, а чырвонае - жывым. Ён паўстаў перад ёй з попелу і праху, з кастра і магілы. Бо яна была Марай, і яна перамагла сусьвет, і самое сябе ў ім. - Глядзі, любы, я - сьмерць - ажывіла цябе праз сваё каханьне, - ціха шаптала яна.

- Мяне вылечыла каханьне дзевы, - ціха вымавіў ён, кранаючы яе вочы вуснамі. - І цяпер я - кароль, а ня зьвер і ня цела, каханая. Але ж карону ўзлажыла на мяне ты. І, як кароль, я ўзводжу на трон цябе, бо толькі праз сьвяты дух Бог жывы, любая.

- Гэта каханьне такое вялікае, што яно вышэй за цела. Гэта зьліцьцё далёка па-за межамі ўсяго, што магчыма ўявіць, - ціха вымавіла яна.

Яны сядзелі з Агнесай на верандзе, і вясновы лес поўніўся маладым шумам дрэваў, абудзіўшыхся ад сну.

- Как можно так любить? Мне это не постижимо. Агнеса пакачала галавой.

- Магчыма. Яна кіўнула, сьцьвярджаючы. Ён выйшаў на пляцоўку вяранды, і падышоў да іх. Запаліў цыгарэту.

- Чаму Гараб згубіў сваё шчасце, каханы? - запытала яна яго.

- Ён нічога не згубіў, любая. Шчасьце згубіць не магчыма. Калі яно было - то яно і ёсьць. Усё дужа проста. Шчасьце - гэта тое, што ніколі ня згубіш, калі ўжо знайшоў. Ён стаў побач, па ветру, і выдыхнуў духмяны дым, які паляцеў над іх галовамі.

- Гараб стаў шчасьлівым, і памрэ шчасьлівым. І ў гэтым яму пашанцавала, у адрозьненьне ад іньшых, якія свайго шчасьця ня ведаюць. Насамрэч жа яно заўсёды побач - у кожным, і з кожным. Шчасьце - гэта здольнасьць кахаць, і калі ты вылучаеш каханьне, на тваё сьвятло абавязкова адгукнецца іньшае. Тое, што прыназначана табе.

- Я адгукнулася на тваё сьвятло, - ціха вымавіла яна.

- Яно клікала мяне праз ноч, боль і цемру. Я ішла, і ўбачыла ў густэчы касьцёр. Тваё сьвятло, якое ты запаліў. Я села ля яго, і да мяне выйшаў ты.

- Гэта ты вывяла мяне зь цемры да сьвятла, запаліўшы сваё полымя. І я ўбачыў яго - маленькі, але ж моцны агеньчык, які зьзяў, як зорка, праз змрок. Ён пацалаваў яе. Яго вусны мелі гаркавата-салодкі смак, і пахлі дымам.

- Ты ніколі не пакінеш мяне, любы? - ціха вымавіла яна.

- Ніколі, каханая. Ён абняў яе - вялікі цёмны цень, да якога яна прытулілася.

- Гараб - маладая душа, у першыню адчуўшая пал каханьня. Ён такі страшэнны, што спачатку душа пугаецца - бо гэтага зь ёй не адбывалася ніколі.

Але ж потым гэты жар суцэльна пераўтворвае яе. І тады з вугольля паўстае Фенікс - філязоўскі камень, дух, набыўшы боскія якасьці, які можа кахаць адвечна.

Увесь Тыбет поўны маладымі душамі. Яны насамрэч ня ведаюць, што такое Бог. Блуканьні ў цемры - вось іх лёс, пакуль яны не разарвуць кола самсары. Адзіны ж, хто здолеў разарваць яго на зямлі, быў Хрыстас. Людзі называюць яго Ісус, я ж называю яго Шымон, бо так ён адкрыўся мне.

Над тым, хто вызваліўся, ня маюць улады ні прарокі, ні зоркі, ні духі, ні дземаны. І люди ня маюць над імі ўлады. Яна пажадала, і знайшла мяне. Бога. Бо ж я - Бог. Як і ты, і яна, і ўсе мы. Калі ты ўспамінаеш, хто ты, ты пачынаеш жыць па-боску. Вось і ўсё. І тады ты ведаешь усё, і ніхто іньшы ня мае над табой улады. Цела памрэ - тут, на зямлі, але ж душа застанецца. І гэтая душа лёгка апранецца ў іньшае цела, падгоніць яго пад сябе, і хіба ж ты не спазнаешь душу, хоць і апранутую ў каралеўскія рызы ці рызьзё? Хіба ж дзіця не кінецца абняць айца, хоць у золаце, хоць у лахманах? Яно прыцісьнецца тварам да яго грудзей і пацалуе і рызьзё і каралеўскую мантыю з аднолькавай пашанай і радасьцю.

Так і я спазнаю яе - маю Шхіну - у любым абліччы. І яна таксама ў любым вобліку спазнае мяне.

Ён абняў яе, і яна прытулілася да яго грудзей. Вечар апускаўся на лес.

- Хутка ты пойдзеш ад нас, Медэя, - нягромка вымавіў ён. - Я дамовіўся з адной старой знаёмай - яна прытуліць цябе. Я таксама буду даваць табе даручэньні. І тысячу еўра ў месяц. Астатняе ж ты лёгка заробіш. У Ганны працы шмат. Ён усьміхнуўся.

Летыцыя ўзьняла на яго вочы. - Ты хочаш адправіць Медэю да Ганны, любы?

- А чаму не? Яна ж - вядзьмарка. Вось хай і папрактыкуецца. Ён усьміхнуўся, і запаліў яшчэ адну цыгарэту, гледзячы на лес - цёмны і глухі, як нечая неабуджаная душа.

Глава 70: Відзеньне Медэі

Мужчына абдымаў жанчыну пасярод ляснога гушчару. Высокая стройная постаць, магутная, з чорнымі длінными валасамі, прыціскала да сябе стройную высокую фігурку з валасамі цёмнымі, як ноч, і бліскучымі, як шоўк. Мужчына глыбока дыхаў, і жанчына замёрла, прыціснуўшыся да яго. Лес агортваў іх шлюбным покрывам. Жанчына і мужчына вытачалі неймаверную веліч, значна вышэй, чым то магло належыць зямным каралям. Яна зразумела, што сваімі вачыма наяўна бачыць багоў. Прастора вакол яе нібыта застыла. Сусьвет спыніў існаваньне. Па плячах і руках жанчыны струменілася сьвятло. Яно лілося полымем зь яе валасоў, і гублялася ў траве. Мужчыну ж агортвала цемра, чорная і глыбокая, як правал у нябыт. Рукі мужчыны ўздрыгвалі на жаночых плячах, і нарэшце жанчына ўзьняла твар, і пацягнулася да яго губамі. Нібыта глухі рык перарэзаў прастору вакол, і зямля пад яе нагамі скаланулася. Глуха застагнаўшы, мужчына прыпаў да пяшчотных вуснаў багіні. Яе рукі гладзілі яго валасы, твар, яго ж рукі моцна сьцісквалі яе цела, і пад яго жалезнымі пальцамі адзеньне разьляталася на ашмёткі, спадаючы зь яе плечаў, пакуль яна не засталася поўнасьцю аголенай перад ім, як і ён – аголеным перад ёю. Пяшчотна ён узьняў яе на рукі, і апусьціў на траву. Яго галава апусьцілася, і вусны накрылі яе грудзі.

Зьнямелая, яна назірала каханьне багоў, забароненае бачыць сьмяротным. Ён уваходзіў у яе, і яна ўскрыквала, раськінуўшыся пад ім, ахопліваючы яго рукамі, прыціскаючы да сябе. Яго рухі былі мернымі і моцнымі, і яна пасоўвалася яму насустрач, аддаючы сябе як мага больш поўна, каб не праліць ні кроплі яго каханьня. Усім сваім целам Медэя адчувала іх жарсьць, якая спальвала яе. Бяз сілаў яна апусьцілася на калені. Ёй здавалася, што гэта яна ляжыць пад ім і гэта яго чэлес уваходзіць у яе, моцна штурхаючы, працінаючы наскрозь. Яна ўскрыкнула, ціха, і апусьцілася на траву, бо больш не магла сабой валодаць. Дрэвы кружыліся над ёй, і яна крычэла. І тады вялікі воўк нахінуўся над ёй, і ўвайшоў у яе цела.

Гэта быў воўк, і адначасова – чалавек, лясны бог, якому яна ня ведала назвы, ня ведала яго імя. Яго рукі прыціскалі яе да зямлі, і ён браў яе з рычаньнем адначасова з тым, як там, на палянцы ў траве, бог браў багіню. А потым воўк нахінуўся, і прыпаў да яе шыі клыкамі. Яна ўскрыкнула, і выгнулася ад салодкага болю. Перад ёй быў лес, і цёмная яго глыбіня пагрозна жмурылася на яе.

Міхась сядзеў побач, задуменна курыў, і глядзеў у цемру. Летыцыя прытулілася да яго пляча, і ён ахінуў яе рукой. У далоні яна трымала нейкі чырвоны камень – упрыгожваньне, каштоўнае і старое, абвітае срэбнымі карункамі. – Адкуль яно ў яе? – падумала Медэя. І раптам Летыцыя закрыла далонь – нібыта зорка згасла. І тады Медэя з жахам зразумела, што воўкам быў ён. Ён быў і богам, а багіняй – тая, хто прытулялася да яго грудзей.

- Хто вы? – ціха прашаптала яна з жахам.

- Мы – сьмерць і жыцьцё, - ціха вымавіла Летыцыя.

– Каханая мая, - ціха адказаў ён ёй, гладзячы яе валасы.

А потым узьняў на Агнесу вочы – цёмныя, страшныя, зьвярыныя і боскія адначасова. Толькі чалавека ў гэтых вачах не было.

- Яна – мая жонка, - ціха вымавіў ён. І яна сышла дзеля мяне ў пекла. Яна прыйшла да мяне, калі я быў самотны і кінуты ўсімі, пакрыты ранамі і язвамі, і вылячыла і ўзьняла мяне, і ўваскросіла маю душу і цела. Я ж за гэта падарыў ёй каханьне такое, аб якім яшчэ ня ведаў сьвет, і богам сышоў дзеля яе на зямлю, прайшоўшы праз цемру і небыт. Яна – усё для мяне, мая маленькая вучаніца, мая Мара, багіня жыцьця і сьмерці, якая валодае ваўкамі і войскамі мёртвых. І я – воўк, і мёртвая душа ў мёртвым целе, але ж я – і Бог жывы, і ў маіх спарахнелых жылах бяжыць жывая кроў. Бо яна узьняла мяне з труны і надзяліла жыцьцём праз сваё каханьне, за якое я адарыў яе ўсімі магчымымі таямніцамі Пекла і памерлых, над якімі жывыя – толькі пена на марскіх хвалях. Я – мёртвы Бог мёртвых, Аід, і Д'ябал, і я – жыцьцё сапраўднае, якое ёсьць рэальнасьць па-за межамі жыцьця і сьмерці. Але ж я – і Бог жывы, я – расьпяты і

ўваскрослы Бог, бо яна ўваскрасіла мяне. Ты бачыш маю плоць, але ж яна – тлен, і ападае, як восеньскае лісьце. І яна, мая каханая, цалуе мой чэрап, абдымаючы яго рукамі, і ў яе ўваходзіць халодная плоць мерцьвяка, які так кахаў яе, што адкінуў самое сьмерць, каб заключыць яе ў абдымкі. Ці змагла б ты забыцца на сьвет у абдымках мёртвага, Медэя? Цалаваць яго гнілую плоць і цела, пакрытае ранамі і язвамі, праз каханьне такое вялікае, што і сьмерць, і хвароба, і праклён ня здольныя былі раз'яднаць нас. Яна знайшла мяне ў пекле, і ў месьцы, горшым за пекла, дзе я сядзеў, пакрыты прахам і попелам, у разарванным рызьзі, праклятy і забыты. Яна абдымала мяне рукамі ў вязьніцы, і сасьмяглы, я піў малако зь яе грудзей, аж пакуль зь іх не пачынала ісьці кроў. Я засынаў на яе грудзях, і мая кроў прысыхала да яе пяшчотнага цела, і чэрві з маіх ран елі яе жывую плоць, але ж яна не адкінула мяне. Нават і ў маім скажоным вобліку сьмерці яна спазнала каханага, якога шукала ад веку, і які зрабіў усё дзеля яе – якога ажывіла яго да яе каханьне.

Глядзі, глядзі і ўстрашыся, бо гэта мой сапраўдны твар, і імя яму – сьмерць. З гэтымі словамі ён павярнуўся да яе, і яна ўбачыла, як яго твар мяняецца. Сучаснае адзеньне зьнікла, і яго твар стаў белым і халодным, а потым пакрыўся трупнымі плямамі. Яго чорныя валасы спадалі на яго, як зьмеі, чорныя бліскучыя латы здаваліся халоднай вадой.

- Каханая, ці ты бачыш мяне? Ці ты любіш мяне, дзіця маё? – ціха вымавіў ён, нахінаючыся над пяшчотным дзявочым тварам, пазіраючы ёй у вочы.

- Так, любы мой. Я бачу цябе, і кахаю цябе. Ты – адзіны, і я бачу, хто ты сапраўдны. Хто ты ёсьць, - ціха вымавіла Летыцыя, і прыпала да яго вуснаў, абдымаючы яго. Праз яе далоні бегла чорная кроў, але ж яна яе не заўважала. І ён абдымаў і цалаваў яе так пяшчотна і асьцярожна, мякка, што ў Медэі з вачэй раптам пабеглі сьлёзы.

- Глядзі, сьмерці няма! Смерьць – гэта лож. Яна не існуе, калі зьзяе праўда каханьня, - пачула яна гучны голас.

І вось на яе вачах мёртвы рыцар нечакана стаў жывым, і яго

скура набыла прыемны смуглы колер, а латы зазьзялі, як сонца. Але ж замест дзяўчыны ён трымаў галубку ў сваіх руках, якая пяшчотна прыціскалася да яго, раскінуўшыся крыламі. Праз імгненьне на яго руках ляжала мёртвая дзева, прыўкрасная, як сон. Яна, здаецца, спала, але ж бледнымі былі яе шчокі, і халодным, мармуровым – цела. Ён жа нахінуўся над ёй, і пацалаваў яе, і колер стаў вяртацца на яе вусны. І ізноў усё зьнікла, і нічога не было. Толькі Міхась сядзеў, і курыў, і Летыцыя, як кацяня, сядзела на яго каленях, скурчыўшыся ў маленькі камочак, ахінутая яго моцнымі рукамі.

Ён гладзіў яе па плячы, і нешта ціха казаў, яна ж, здаецца, паснула.

- Яна – мая дачка ў гэтым жыцьці. Я – яе айцец, - нягромка вымавіў ён. – Яна ведае, але ж абрала пагрэбваць законамі гэтага сьвету. Я – Лот, упіўшыйся боскага віна, ап'янёны ёй – Шхінай, сваім любым стварэньнем. Ён ціха пацалаваў яе валасы.

- Дзеля мяне яна прайшла праз усё гэта. Таму памятай, хто яна ёсьць.

Я адпраўляю цябе ў вучаніцы да моцнай вядзьмаркі. Ты нават ня можаш і ўявіць, якой. Хоць яна і выглядае сьмешна, і я часта зьдзекваюся зь яе, але ж не забывай, хто яна сапраўдная. Яе ўзроўню адпавядае мала хто на гэтай зямлі. І тое, што яна творыць, сапраўды ўражвае нават і мяне. Таму ты будзеш мець добрага настаўніка. Настаўніцу, - выправіўся ён. – Заўтра я адвязу цябе да яе, самалічна. І прадстаўлю цябе адпаведным чынам. А цяпер, дзяўчаткі мае, нам пара ўжо ісьці адпачываць. Спаць, бо заўтра – доўгі і нялёгкі дзень. Ён уздыхнуў. Летыцыя пацягнулася, і прытулілася да яго. А потым узьнялася, і сабрала кубкі.

- Пайдзем, красуні. Ён ахінуў іх рукамі, і мякка накіраваў тварам да цёплага дамашняга сьвятла, прэч ад лесу і яго ценяў.

Глава 71: Як МІхась чараўніком быў

Твар яго адлюстроўваецца ў вадах хаосу, і ён бачыць самога сябе - чорнага і белага. Цемра, магутная і праіснуючая, паўстае перад тварам нанова народжанага сьвятла. Яго ўражвае яе моц - яго моц, узьнімаючаяся з глыбіняў. Чорны шчыт ударае ў белы, і ваяры застываюць. Ніхто зь іх ня можа перамагчы. І тады зь бездані ўзьнімаецца яна. Галубка. Шхіна. Трымценьне яе белых крылаў - адзінае, што парушае напружаньне раўнавагі бойкі дзьвух волатаў, якія скаланаюць сусьвет. На чый шчыт яна сядзе, той і пераможа, пахісьне іньшага. Сусьвет камянее ў жаху, але ж Шхіна марудзіць. Балансуючы ў кропцы ў сярэдзіне, яна абодзьвух ахінае крыламі, і раптам усё для яго пераўтвараецца ў адзінае зьзяньне - не цемру і не сьвятло.

Абуджанны разуменьнем нечага, што ня можна выразіць словамі, ён прачынаецца. Яна ляжыць на яго плячы, абняўшы грудзі рукой.

Ён адчувае цяплыню яе цела, і зусім не адчувае цяжар. Яна ў параўнаньні зь ім як пярынка, ранішні праменьчык сьвятла на яго руцэ. Ён асьцярожна гладзіць яе валасы, якія закрываюць яго покрывам, нахінаецца, і цалуе іх. Яны пахнуць ружай, і яблыкам - водарам раю. А ён - зьмей, які схаваўся пад дрэвам. І цяпер ён адчувае, як гэты зьмей узьнімаецца, узрушаны бліскасьцю Евы.

Яна прачынаецца, і ахоплівае яго рукамі. Усьміхаецца яму, заглядаючы ў яго твар.

- Дзевачка мая, ты такая прыгожая, - ціха кажа ён. Яна жмурыць сонныя вочы, і ўсьмешка на яе твары – як сонца, якое зьзяе з-за вакна.

Ён гладзіць яе рукой, лашчыць пяшчотныя грудзі, і асьцярожна пасоўвае яе ў бок, нахінаючыся. Цяпер яе твар зусім блізка, і яе вочы глядзяць прама ў яго вочы. Яе рукі ахопліваюць яго плечы,

і яна замірае, так, што ён ня чуе нават яе подыха – такі ён ціхі і лёккі.

- Ты кахаеш мяне? – ціха запытвае ён, сур'ёзна. Яго вочы глядзяць прама ў яе вочы, здаецца, пранікаючы ў яе душу.

- Так, - ледзь чутна шэпча яна. – Я кахаю цябе, мой любы, мой адзіны. Ён кранае вуснамі яе вочы, нос, шчокі, губы, якія, раскрываючыся, ловяць яго губы, і шалее ад яе мяккіх вуснаў, якія так блізка ад ягоных, што яе лёккі подых пераплятаецца зь яго подыхам, гарачым і цяжкім, як дыханьне зьвяра. Яе ж уздыхі – як крыло галубкі, тонкі вэлюм, падаючы яму на твар. Ён убірае вуснамі яе грудзі – цяпер раскошныя, як у Вянеры, хоць цела яе і танюткае, як цела дзіця. Яе пругкія ружовыя саскі нагадваюць маленькія бутоньчыкі персікавых кветак, скура аксамітная і прахалодная, і пахне морам.

Яна нібыта толькі што нарадзілася з марскіх глыбіняў для яго – выйшла сюды, у сьвет, з яго патаемных сноў.

Ён проста ірве вуснамі гэтае цела, мяккае, пяшчотнае, духмянае, уздрыгваючае пад яго губамі. Яму хочацца ўпіцца ў яго, як у сакавіты плод ці выкшталцоны дэсерт, які зроблены толькі з адной мэтай – насалоджваць вока і разьвіваць цукровую залежнасьць у слабых на асалоду душаў. Вось і ён ня можа ўтрымацца – проста жадае праглынуць яе, разарваць, а яшчэ пры гэтым і ўвайсьці, паглыбіцца ў яе там, дзе хаваецца сэрца гэтай яе салодкасьці, ад якой у яго проста перакручвае ўсё, цяглы зводзіць, так ён яе жадае. Яна закрывае вочы і ўздрыгвае – інстынктыўна, баіцца яго, баіцца яго нястрыманасьці, яго гарачыні, яго жарсьці і юру, таго, што ён можа прычыніць ёй боль сваёй неасьцярожнасьцю і палам, і ў той жа час жадае гэтага болю, гэтага яго юру і пажаднасьці, жадае насыціць яго сваім целам, сама сходзіць з розуму, і саромеецца гэтага свайго жаданьня, саступаючы яму, адкрываючыся, і ў той жа час заміраючы ад прадчуваньня таго, што адбудзецца зараз. Ён усоўвае ў яе руку – яе ўлоньне сьціснутае, і вільготнае ад выцякаючага зь яе соку, нагадваючага густы цукровы сіроп. Яму хочацца лізнуць пальцы, каб адчуць, якая яна, які ў яе смак і пах. Празрыстая вільгаць на яго пальцах мае водар, які ён ня можа апісаць

словамі – так пахне райскае дрэва ў поўным яго квітненьні, пах, які кружыць галаву, і вымушае саступіць граху. Цяпер волі ў яго няма – асалода зьмяняе яго волю, і яна ціха ўскрыквае пад ім, саступаючы напору яго плоці, ізноў і ізноў, пакуль ён не выліваецца, не залівае яе ўсю, і простыні, якімі яны накрытыя, і яе белую скуру, і чорныя валасы, якія разьмяталіся ля яе сьцёгнаў.

Яны лыжаць у абдымках, і яна ўсьміхаецца, прытуляючыся да яго грудзей.

- Сёньня павязем Мэдэю да Ганны, - ён гладзіць яе валасы, і ўсьміхаецца. – Яна ўжо мяне запытвала, калі дапаможніца прыедзе, бо справаў у яе чараўніцкіх зашмат.

- Як яна там? – цікавіцца яна.

- Як? Добра, сонейка. Лепей за ўсіх. Разьвярнулася. Да ты і сама пабачыш. Ён мякка кранае вуснамі яе шчаку, і пацягваецца. Надыходзіць новы дзень.

- Сусед, загавары мне ваду, каб я ня піў! – нягеглы мужычонка, хістаючыся, стаяў перад ім, ледзь трымаючыся на нагах. Ад яго ішоў густы пах перагару, такі, што, здаецца, паветра можна было рэзаць нажом.

- Можа, цябе, Іван, палячыць трэба? А не загаварыць. Можа, ты што пераблытаў? Ён зь цікавасьцю паглядаў на госьця, паціраючы вусы пальцамі.

- Як я цябе загавару? Ты ж ледзь жывы. Перад замовай тыдзень ня піць трэба.

- А калі не загаворыш, дык я памру. Іван прыасаніўся, выпяціў худыя грудзі. – І сьмерць мая на тваю душу ляжа.

- Ну, гэта не вялікі груз. Ён усьміхнуўся. – На маёй душы і не такое ляжыць.

- А можа, гэта апошняя кропля? – прыпугнуў Іван. – Вось памру я, і адправішся ты жыўцом у пекла, Мішка. За тваю жорсткасць і

няўдзячнасьць.

- За жорсткасьць – можа, а вось пры чым тут няўдзячнасьць? – не зразумеў ён.

- Пры тым, што я табе градкі дапамагаў капаць. А ты мяне гоніш. І тады ты мне нават не наліў.

- Калі тое было, каб ты мне градкі капаў? Я што табе, Ганна? Якія ў мяне градкі? Градкі толькі ў яе і засталіся з усей вашай вёсцы – вы ж толькі п'еце, хістаецеся вакол. У каго што блага ляжыць выглядаеце. Ён сплюнуў.

- І калі я табе не наліў? Ты кожны тыдзень з'яўляешся, як прывід які прыставучы.

- Налі, Міша, - заскуголіў Іван, але ж хутка выправіўся:

- Зачытай! Зачытай мне ваду, прашу Хрыстом Богам.

- Да Ганны схадзі. Я болей не чытаю. Ён пакачаў галавой.

- Ганна слабая. Іван пакруціў доўгай, пупырчатай, як у гусака, шыяй.

- Чаму яна слабая? Ён зьдзіўлена паглядзеў на яго.

- Таму што яна мяне не адшэпча. Не адчытае. Я – мацнейшы за яе. Я ж таксама чараўнік. Быў, некалі. Дзед мой чараваў, і зь лешым на кароткай назе быў. Ды я вось дар не пераняў, адмовіўся. Таму цяпер і пакутую – дзед пракляў, пэўна.

Іванавы вочы сталі сумнымі, твар – сур'ёзным, як у нябожчыка, які роўненька ляжыць у новай, пахнучай лесам труне.

- А можа, табе … да лешага пайсьці? Шоў бы ты… Але ж, убачыўшы адчайны выраз на суседавым твары, ён махнуў рукой.

- Ну ладна, праходзь. Зачытаю. Зашапчу я табе ваду, бо ты мяне дастаў. Алкаш. Ён разьвярнуўся шырокімі плячыма, і прайшоў у хату. Іван крочыў за ім.

Прыгожая чорнавалосая кабета ў белым фартушку зірнула ў бок – як паказалася Івану, з агідай. А потым узяла нейкую пшыкалку, і пачала пырскаць за імі ў паветры.

- Абрад ачышчэньня пачаўся, - патлумачыў ён.

– Сонейка, ты лепей акно адкрый. Не напырсквай ты гэтай хіміі, ужо галава ад яе баліць.

- У мяне галава баліць ад алкашэй. Кабета, маладая, прыгожая, з пухлявымі ружовымі вуснамі і вострым позіркам вялікіх вачэй пад доўгімі чорнымі вейкамі, надула губкі, і павярнулася да вакна, завешанага чыстымі бялюткімі шторкамі.

- Ай ай, ніколі бабу не завяду сабе. Толькі ад іх беспакойства. Іван пакачаў галавой, мармычучы, рушачы за ім ззаду.

- На ваду буду шаптаць, да мяне не заходзь і музыку не ўключай. Каб ціха было паўгадзіны, - вымавіў ён у бок красуні, і прайшоў наперад па калідору да цяжкіх драўляных дзьвярэй, якія вялі ў невялікі паўцёмны пакой.

Тое, што да яго прыходзілі людзі па такіх-сякіх чараўнічых справах, яна даведалася хутка. То адзін, то другі. Ён найперш адмаўляў, потым размаўляў, ды каго-некага і пагаджаўся “палячыць”.

- Такі ўжо мой лёс, сонейка. Ад дзеда. Да яго хадзілі, цяпер вось, да мяне пайшлі. І не адмовіш, і не схаваешся. Як толькі сюды прыехаў, дык і пайшлі. І ўсё болей і болей іх. І ідуць, і едуць, а калі адмовіш – у кустах чакаюць. Такі ўжо ў нас народ. Ён уздыхнуў, паціснуў шырокімі плячыма.

- Гэта таму, што ты – моцны чараўнік. Сапраўдны. Яна прытулілася да яго грудзей.

- Ну, хлусіць ня буду, нештачкі магу. Хоць я і ваўкалак, а не чараўнік. Пярэварацень. Ты ж ведаеш. Усьміхнуўшыся, ён нахінуўся, і пацалаваў яе валасы.

Цяпер жа яна заціхла, і між волі прыслухоўвалася. За

дзьвярыма адбывалася нешта. Нейкі таямнічы сьвет разгортваў свае крылы, нават і прастора, і паветра вакол мяняліся. За дзьвярыма адбывалася казка, падумала яна захоплена, працiраючы мыты посуд.

- Сядай, - вымавіў ён, лёгка адцягнуўшы ад сталу адной рукой вялікі дубовы стул з разной сьпінкай, і замест яго сунуўшы нагой табурэтку – трывалую, груба скалочаную са струганых дасок.

Іван, аглядаючыся, прысеў. Па вуглам яму пачалі мроіцца чэрці – яны мітусіліся, скокалі, і курчылі яму агідныя пысы.

Раптам яму стала неяк вусьцішна, самотна. Быццам бы хто халоднай кіпцюрастай лапай сьціснуў у страўніку.

- Толькі б не асраміцца, - напалохаўся Іван, але ж паварухнуцца баяўся. Абрад, ён зразумеў, будзе моцны. Таму яму і блага – чэрці мітусяцца. Але ж ён вырашыў трываць.

Міхась павярнуўся да шафы, адкрыў, і, пачухаўшы бараду, задуменна аглядзеў палічкі. На іх стаў акуратны шэраг бутэляк і скрынак, нейкія былі надпісаныя, але ж большасьць – не. У гэтым ён быў гаспадар нядбайны. Толькі Летыцыя потым узялася ўсё надпісваць і наводзіць парадкі, але ж да яго чараўнічай шафы яшчэ не дабралася. Цяпер ён нават і пашкадаваў аб гэтым, але ж – было позна. Іван сядзеў на стуле, і жаласна глядзеў на яго. Падумаўшы крыху, Міхась працягнуў вялікую руку, і асьцярожна ўзяў з палічкі бутэльчыну. - Пэўна, тут – ад гэтай яго хваробы, - падумалася яму. Вада з запаведнай крыніцы глыбока ў лесе, некалькі разоў пералітая праз срэбны посуд, ачышчаная кварцам і настоеная на сонцы, месяцы, і зорках па чарзе. Дужа моцная рэч на ўсялякія патрэбы. Хочаш – у гарбату ці каву падлівай, хочаш – зачытвай, ці проста так пі – блага ня будзе, будзе толькі добра.

Вагаючыся, ён узяў адну з бутэлек – з празрыстай чыстай вадкасьцю, якая проста зьзяла, пераламляючы прамені сонца. Дастаў просты шкляны гранёны стакан, паставіў перад Іванам. Наліў да краёў, не шкадуючы, вады. Вадкасьць прыемна

забулькатала, як лясная крыніца па каменьчыках, і Іван між волі зглытнуў сьліну.

Ён накрыў стакан далоньню, адчуваючы, як з-пад яе ў празрыстае зьмесьціва стакану бяжыць адчувальнае цяпло.

- Сонца, месяц і зоркі па небу гуляюць, Іванаву смагу забіраюць. Як месяц чысты ў вадзе адбіваецца, вядром выліваецца, так і хвор Іванава выліваецца, на сонца, на зоркі, на месяц, у лес, у балота, у раку, у ручай. Вада вадой, хвароба лесам. Каб табе віна ня піць, душу не губіць, чыстаму і цьвярозаму быць. Слова маё крэпка, няма таго, хто б яго пераламіў, як няма таго, хто каменны хлеб пераломіць, жалезны каравай згрызе і гарашчае мора вып'е.

Пярун закрывае, Велес бласлаўляе.

З гэтымі словамі ён узьняў руку, падняў стакан, і працягнуў суседу, які, скурчыўшыся, сядзеў на стуле.

- Трымай, але ж пачакай, - вымавіў. Узяў краюху хлебу, што захапіў з сабой, праходзячы праз кухню, адрэзаў вялікім нажом зь лязом і ручкай, пакрытымі рунамі, кавалак, палажыў на стол, і таксама накрыў рукой.

- Зямля-матухна, дай сілу, праз хлеб - тваё дзіцятка, каб ні чорт, ні ведзьма, ні мужык, ні баба, ні волат, ні сьвятар маё слова не зьнялі, маёй дарогі не перайшлі і сілу маю не забралі, табе аддаю, сабе забіраю, зямлёй сябе закрываю. Хто гэты хлеб ясі, маё слова ясі, зямля – замок, неба – ключ.

- Пі, - загадаў. Іван узьняў стакан, і паднёс да вуснаў. Прыгубіў, і закашляўся. Рука яго рэфлекторна сьціснула шкло, упялася, як клешчы, вусны пасінелі, вочы выкаціліся.

- Пі, я сказаў. Каб цябе трасца, каб цябе Пярун аб дуб шваркнуў. Каб цябе …

Іван, з жахам уперыўшы ў яго вочы, прыпаў да стакану, і прагна глытаў вадкасьць.

Нарэшце, асушыў да дну, і ўцёр рукавом вусны.

- На, заеш хлебам, - ён працягнуў яму лусту. Той машынальна ўзяў, і пачаў жаваць.

- Нейкая вада … гарачая… раптам вымавіў ён. - … у цябе, сусед.

- Ну дык канешне. Ён паціснуў плячыма. – Я ж яе замовіў.

- А тое можа быць, каб вада ў віно пераўтварылася? – раптам запытаў Іван. Яго вочы ўвільгатніліся, шчокі паружавелі, на вуснах з'явілася вусьмешка.

- Можа. А чаго не. Папы могуць, а я чым горш? Ён таксама ўсьміхнуўся.

- Ну што, палягчэла цябе?

- Ой, палягчэла, сусед. Паправіў ты мяне, ды так добра, і галава не баліць, і душа сьпявае. Іван узьняўся.

- Толькі … вось ногі ня йдуць, чамусьці. Вой, пачакай крышчаку… Добрая ў цябе вада, проста – жывая вада, суседушка. Іван схапіўся рукой за яго плячо, ён падхапіў яго пад пахі – той ледзь не асеў на падлогу.

- Лявоніху Лявон палюбіў … - раптам Іван запеў танюткім голасам.

- Ты што? Міхась зьдзіўлена глянуў на яго. Пакачаў галавой – нейкі пабочны эфект. І раптам адна думка апаліла яго. Ён асьцярожна ўзяў, і панюхаў стакан. Той адчувальна пах сьпіртам.

- Блядзь. Ён у думках скалануўся. Наліў Івану стакан чыстага дзевяностаградуснага спірту, які стаяў у шафе на гаспадарчыя патрэбы. Недзе там, канешне, была і вада зь лясной крыніцы. Толькі як ты іх адрозьніш, калі яны не надпісаныя. Іван хістаўся ў яго руцэ – ён трымаў яго за каршэнь. Нешта радасна напяваў – цяпер ужо не вядома што. Асьцярожна трымаючы яго пад рукі, ён выйшаў з пакою.

- Што гэта? – пахаладзела, як убачыла, Летыцыя. У яе голасе

было плоха хаванае абурэньне.

- Лячэньне. Ён паціснуў плячыма. – Закадыраваў я яго. Сьпіртам. Новы метад – паглядзім, як будзе працаваць.

Летыцыя толькі пакачала галавой.

- Іван, дарэчы, з той пары і сапраўды ў рот ня браў. Ён пасьля таго стакану на могілкі зайшоў, паваліўся, і на магілцы паснуў. А калі ачуняў, узьняўся, бачыць – перад ім шыльдачка – раб Божы Іван … і год, і дзень, усё сьвежае, учорашнее, яшчэ і зямля не абсела. І вяночкі вакол мяккія, і кветкі яшчэ не павялі.

Вось так бывае, золатка. Ён напалохаўся, проста з глузду з'ехаў. Неяк да вёсцы дакаціўся, вёрз невядома што, потым тыдзень калаціўся, толькі ваду піў, ды спаў. А калі ачуняў, на водку і глядзець ня мог.

- А потым што было? – вымавіла Летыцыя.

- Потым – ня ведаю. Бо ж мы з табой з'ехалі, сонейка.

- Піў твой Іван, як цяля, і ніякая замова яго ня ўзяла. Ганна злосна паглядзела на яго, ашчэрылася ў вусьмешцы. – Бо ты – чараўнік ніякі. І – алкаш. У цябе і замест сьвятой вады – куранае віно апынулася. Ты ўжо і забыў, калі ваду піў. Ты і каву пэўна на самагонцы варыш.

- Ай, Ганна. Што ты вярзеш. Саромееш мяне перад дзяўчатамі. Ён усьміхнуўся. – Зусім ужо нейкім алкашом мяне выставіла, і праўда. Хіба я такі, золатка? – павярнуўся ён да Летыцыі.

- Не, каханы. Ты не такі, - суцешыла яна яго.

- Ён – горш! Ганна злавесна рассьмяялася. – А ты – дурніца. Ну, каго вы мне тут прывялі. Дайце паглядзець! – пасунулася яна бліжэй да Медэі, якая, напалоханая да аслупяньненя, ціхенька сядзела на зэдліку побач.

Глава 72: У Ганны

- Мне Бог запавёў лячыць. І якія толькі да мяне ня йдуць, і касыя, і крывыя, і ўсякая халера і трасца. Па ўсялякай патрэбе. Хто с чым. І ўсех я лячу. Бо я такая адна. Яшчэ раней былі майстры, ды ўсе паўміралі. Са старых во, толькі я. А яшчэ была Пракопаўна ў Вяршках і Піліпаўна ў Малых Лужынах. І дзед яго быў, Альгерд стары, Даўмонтаў сын. А Даўмонт быў Вігандаў сын. А Віганд стары быў наймацнейшы чараўнік у акрузе, і па сю, і па ту старану. І іх такіх было шмат, і ўсе - моцныя чараўнікі, якіх не насіла зямля. І ўсе чорныя. Вось як ён. Толькі ён дар свой па ветру пусьціў, разбазарыў. І цяпер які зь яго чараўнік - аніякі. А я сваю сілу родавую зьберагла, і таму цяпер я мацнейшая. Вось ён і ня робіць, ведае, чаму, бо адрокся. А я раблю. А адрокся ён таму, што навесіў крыж. І які зь яго цяпер с крыжом чараўнік? Хоць ён яго і здымае калі чытае, а ўсё ж гэтае ня тое. Ён усе сувязі перарваў. А я кожны дзень хаджу ... хадзіла... Ганна перавяла дух. ... на могілкі, да родных, і ў лес, і ўсюды. На поле, на раку і на возера і да кожнай крыніцы я схадзіла нагамі і пакланілася зямлі. А ён толькі да старых камянёў дакульгаў ды і тое бяз толку. Бо хто яго хрышчонага прыме.

Ганна кпліва прыжмурыла вочы, перакінула цераз грудзі дзьве таўстыя рудыя касы, агладзіла. Міхась сядзеў, прыкрыўшы вочы рукой. Глянуў на яе праз далонь. Пакачаў галавой.

- Ганна, Ганна, ну што ты вярзеш. Моташна цябе слухаць. Увесь яго выгляд казаў менавіта гэта, але ж ён стрымаўся, толькі ўздыхнуў.

Ніякі чараўнік, ну і добра. Спадчыну згубіў, ад дзядоў адмовіўся. Хай яно так і будзе, што яму спрачацца.

- А ты ж таксама хрышчоная, Ганна. Як жа ты расхрысьцілася? Ён хітра глянуў на яе.

- Хрышчоная кручоная яловым суком ды асінавым калом. Я праз галаву цераз касьцёр перакулілася, ачысьцілася ад крыжу.

І цяпер мне ўсе сілы адкрытыя. Ганна ганарліва выпяла грудзі.

- Што за касьцёр? Як гэта? - зь недаўменьнем вымавіла Летыцыя.

- Яна іконы пажгла, а потым яшчэ ў попел памачылася. Міхась закрыў твар далоньню. Плечы яго трэсьліся. Нарэшце ня змог трымацца, устаў, і зарагатаў у голас.

- Чаго іржэш, як конь? Жарабец. Ганна сплюнула на падлогу.

- Я патыліцу ачысьціла. А ты так кляймо і носіш - я ж бачу. Жыд жыдом стаў і з жыдоўкай жывеш. Ты ўжо і забыў, хто ты. Толькі я табе напамінаю, перыядычаскі. Ваўчыная твая парода. А ваўкалак заўсёды ніжэй ведзьмы. Ты толькі і можаш па лесу бегаць, скаціну душыць ды дзевак сільнічаць. А я табой упраўляю.

Я табе што хочаш загадаць магу, а ты, дурань, і зробіш. Ганна зь перамогай паглядзела на яго.

Міхась толькі рукой махнуў. У казачным Ганнавым сьвеце, дзе ён быў ваўкалакам, а яна - наймацнейшай родавай ведзьмай у акрузе, лёгіцы месца не заставалася, і спрачацца было безкарысна.

- Дзяўчыну я табе ў навуку прывёў. Навучыш яе вядзьмарству, я заплачу. Міхась павярнуўся да Медэі, якая сядзела насупраць, і дрыжэла, як ліст.

- А цяпер жарты ў бок. І байкі свае засунь сабе, ведаеш, куды. Раптам яго твар стаў цёмным, жорсткім, страшным.

- Ты ж ведаеш, хто я. Ці табе напомніць?

- Мярцьвяк. Ганна падціснула вусны. - Чортава семя з курганоў. Не спалося табе.

Ён марудна кіўнуў.

- Не спалося. Я за ёй прыйшоў. Бо там, дзе я быў, няма сьмерці, Ганна. І попел і прах адпускаюць жывое цела. Там, дзе зьзяе яе

сьвятло, чэрвю болей няма ўлады.

- Нешта я сумняваюся. Ганна пакачала галавой. Ён сьціснуў руку Летыцыі сваёй гарачай. Яна была мяккай, цёплай, жывой.

- У маіх жылах бяжыць жывая кроў, - нягромка вымавіў ён, і злавесны вецер завыў, загрукатаў, узьняўшыся, кінуўся ў вокны і дзьверы.

- У тваіх жылах бяжыць вагонь пекла, Міхал. Раптам голас Ганны стаў сур'ёзным, страціўшы кплівыя ноты.

- Хай так. Ён кіўнуў. - Але ж я абручаны зь ёю. Я абмяняўся кольцамі са сьмерцю, і яна ўзамен дала мне сваё каханьне. Яе. Ён вымавіў гэта, і нібыта маланка ўдарыла ў стол між імі, асьвяціла твары.

- Мярцьвячка і мярцьвяк. Не жывыя, і не мёртвыя. І не на тым сьвеце, і не на гэтым. Ганна нахіліла галаву.

- Але ж яна - жывая. Яна павярнула твар у бок Медэі, якая даўно ўжо зьнямела, і скамянела ад жаху.

- Я адпусьціў яе ў жыцьцё. Ён кіўнуў. - Няма чаго рабіць жывым у свеце мёртвых, дзе паную я. Яна яшчэ не памёрла для сьвета. Але цяпер яна - мост. Ты ж ведаеш.

- Ты зрабіў? Ганна прыжмурылася.

- Я. Я і ня гэта яшчэ зраблю. І не такое рабіў.

Ён апёрся на стол, цяжка, і пільна глядзеў на яе. І Ганна ня вытрымала, і апусьціла вочы пад яго позіркам.

- Навошта ваўкалака ўзьняла? - раптам злосна кінула яна, павярнуўшыся да Летыцыі.

- Таму што я яго кахаю. А ён кахае мяне. Каб нам быць разам заўсёды. Летыцыя прама глядзела на яе, не адводзячы позірку.

- Ён яшчэ справаў натворыць, вось убачыш. Хаця, што табе. Ты ж - яго кроў. Ваўчыная жонка.

Ганна вымавіла гэта з пагардай.

- Яна - мая. Маё дзіця, мая малжонка, і мая душа. А за сваю душу я сьвету не пашкадую. Яна вызваліла мяне. Цяпер, як і яна, я вольны. А вось ты, Ганна, ты яшчэ падпарадкоўваешся сусьвету. Ён хлопнуў далоньню па сталу.

- Пяройдзем да справаў, - рашуча вымавіў.

Абучыш яе ўсяму. Што трэба. Што сама ведаеш. А потым яе буду вучыць я. Гэта - усё. Грошы я табе за яе заплаціў, і не малыя. Таму калі ўбачу, што ты хернёй страдала, і ад навучаньня твайго толку няма, я зь цябе спрашу па поўнай. Так, як я магу. Як ты ведаеш. Ён пагладзіў рукой бараду, адкінуў валасы.

- Абучу, не хвалюйся. Раптам голас Ганны стаў лагодным, спагадлівым.

- Усё будзе, як трэба. Жыць яна будзе пакуль са мной - вунь, у тым пакоі. Ганна махнула рукой.

- Мы ўсё там абустроілі, як трэба, - вымавіла Летыцыя, звяртаючыся да Медэі, і адначасова да Міхася з Ганнай - сьведкаў яе словаў. - Табе спадабаецца, вось убачыш. Там утульна, і месца шмат.

- Карты пры табе ёсьць? - вымавіла Ганна запытліва.

Медэя кіўнула.

- Ну вось і добра. Пачнем навучаньне з маёй калоды, а потым ты свае адпрацуеш. Спачатку будзеш глядзець, а потым я табе растлумачу, што ня ўцяміш. А потым ужо і сама. І шмат чаго яшчэ пакажу. Сумна - ня будзе! Раптам Ганна ўсьміхнулася, шчыра.

У дваіх разам яны прайшлі ў невялічкі ўтульны пакой з кніжнымі паліцамі, вялікім ложкам з яркай мохава-зялёнай вязанай коўдрай з каляровымі квадрацікамі, сталом і ноўтбукам на ім. У вуглу пры ўваходзе стаяла плацяная шафа, пустая, у якую была складзена чыстая пасьцельная бялізна. На

вакне віселі доўгія ізумрудна-зялёныя шторы. На белым стале ў сярэдзіне ў падсьвечніку стаяла сьвяча. Болей нічога ў пакоі не было, і позірку было няма за што зачапіцца. Раптам Медэя зразумела, што апынулася сам-насам са сваімі думкамі. І думкі гэтыя цяклі пакойна, вольна, як шырокая вясновая плынь. Яна пачынае жыцьцё нанова. Хай так. Хай хоць ведзьмай. Бо ж цяпер у яе будзе жыцьцё сапраўднае, а не прыдуманае, раптам зразумела яна. Прыдуманае і напісанае для яе некім іньшым, так, як гэтыя іньшыя лічылі, што трэба. Неяк яна запытала ў Летыцыі, што для яе галоўнае ў жыцьці. Ні хвіліну не вагаючыся, яна адразу адказала:

- Каханьне. Толькі быць зь ім, служыць яму, і ляжаць на яго грудзях. Болей мне нічога ня трэба. Я зраблю ўсё дзеля яго - праз яго найвялікшае каханьне да мяне, і ў гэтым - мая найвялікшая радасьць. Гэта ўсё, што мне было патрэбна - знайсьці яго, і быць зь ім разам. А яму патрэбны сусьвет. Яна ўсьміхнулася. Ён кажа, што дзеля мяне. Мужчыны. Яны любяць гуляць у гульні. Яе твар асьвяціла мяккая вусьмешка.

- Я ж прышла сюды, каб быць зь ім, і кахаць яго. Яе твар быў задуменны, спакойны.

Медэя паціснула плячыма. - А акрамя каханьня? Што яшчэ цябе цікавіць у жыцьці?

- Усё. Летыцыя паціснула плячыма. Але ж безь яго, без майго каханага, у маім жыцьці няма сэнсу. Усё жыцьцё я чакала яго. Добра, што чакаць мне давялося ня доўга. Ужо ў дзяцінстве я ведала яго. Ведала, што ён прыйдзе да мяне. У маіх мроях ён заўсёды быў побач. Я бачыла яго твар, і чакала. Пэўна, мая душа шукала яго, але ж я ня ведала сваю душу. Я проста жыла, і пакутвала безь яго. І калі мае пакуты сталі такімі страшнымі, што, здаецца, болей жыць было не магчыма, мне раптам стала ўсё роўна. Я проста рухалася, як цень, рабіла ўсё патрэбнае, быццам бы не прымаючы ў гэтым удзелу. Пэўна, я радавалася. Пэўна, я атрымлівала асалоду. Аднак я была мёртвая, разумееш? А потым прыйшоў ён, і ажывіў мяне. І цяпер мы заўсёды разам. Толькі ў гэтым - сэнс майго жыцьця, і нараджэньня на сьвет.

І вось я думаю, як гэта цудоўна. Як дзіўна, што мы сустрэліся. Цяпер я ведаю, што заўсёды бачыла яго твар - твар каханьня. Ён зьзяў для мяне, як сонца праз змрок, і калі я ўбачыла яго вочы, я адразу пазнала яго. Для мяне нібыта сонца ўсьміхнулася.

Медэя паціснула плячыма. Словы Летыцыі здаваліся ёй нейкімі блажнымі, нязрэлымі. Быццам бы тая хавалася ад сьвету ў гэтым сваім каханьні за яго плячом. Хавалася, каб нічога не рабіць. Жыць, як расьліна. Кветачка. Яна ўсьміхнулася. Мужчыны толькі такімі і жадаюць бачыць іх, жанчынаў. Слабымі, бездапаможнымі. Вязвольнымі сэкс-рабынямі. Але ж у яе, Медэі, будзе іньшы лёс. Яна атрымае ўладу. Моц. Ёй будуць падпарадкоўвацца стыхіі, прастора і час. Дземаны і анёлы. А каханьне ... навошта яно. Галоўнае, улада. Вось Ганна адна жыве, а як удала. І грошы, і павага, і воля - рабі, што хочаш. І сапраўды, чаму яна вырашыла паставіць на гэтага Глеба? Што б ён ёй мог даць? Сэкс зь ім быў аніякі, нудны і моташны, гэта яна ўжо зразумела. Грошаў ён таксама ня меў вялікіх. Нават яе, цяжарную, хацеў на работу ўладкаваць. Тое, што яна была цяжарнай, яна для сябе вызначыла, як факт.

Таму зьнік з канцамі, і дзякуй Богу. А гэтая Ганна ёй зусім не здавалася ні страшной, ні дзіўнай ці дуркаватай. У ёй адчувалася "глубінная мудрасьць", мудрасьць вякоў, якая вымушала адносіцца да яе з пашанай. Ганна нагадвала ёй яе бабку Марфу, якая лячыла народ на далёкім сябірскім хутары. Да яе з усяго краю прыязжалі, і яна выгадавала дзесяць дзяцей. З павагай Медэя ўспомніла чумазыя фота дзесяцёра рабят, якія ня надта адрозьніваліся адно ад другога. Усе былі ў кашулях, босыя, і без штаноў, з кудлатымі галовамі - што хлопчыкі, што дзяўчаты. Але ж вось - вырасьлі, дзякуй Богу. Хоць і спазналі галечу. Цяпер ва ўсіх былі крэпкія хаты, а хтосьці і ў людзі выбіўся, як яе маці. Хоць і апошнія, пасьледышы, атрымаліся ня дужа ўдалымі, пасьпіваліся ўшчэнт. Ды гэта - дапушчальны брак пры такой колькасьці. Таму Ганну Медэя дужа ўшанавала адразу. І вучыцца была гатовая ўсяму, і з жарам. І цяпер у яе ў жыцьці была мэта.

Летыцыя ж са сваім каханьнем здавалася ёй нуднай, і нецікавай. І яшчэ гэтыя яе вечныя жальбы пра гвалт, пра тое, як

зь ёй блага абыходзіліся. Яны проста бясілі. Што зь ёю самой адбылося, Агнеса начыста выкрэсьліла з памяці. У яе ўяўленьні сфармавалася чоткая карціна: Глеб улез у нейкую благую небясьпечную справу, яна ж здолела ўратавацца дзякуючы сваім асабістым заслугам. Яна сваечасова патэлефанавала сяброўцы, і яе супруг, які натуральна меў да яе высокую пашану, якую яна адчула зь першай сустрэчы, праз яе адукацыю, прыстойныя паводзіны і дагледжаны, інтэлігентны выгляд, канешне ж выратаваў яе ад страшных бандытаў, якія справядліва пакаралі Глеба. Яна ж у сваіх вачах яшчэ больш узьнялася на п'едэстал, і цяпер зьзяла сама для сябе, асьвечаная нейкім боскім арэолам - сьвятая дзева, жонка і амаль маці, якая лунала па-над хвалямі гэтага грэшнага сьвету. Канешне, праз стрэс яна згубіла дзіця, але ж гэта нічога. Нарадзіць дзіця самотнай маці ад злачынца на сьмех і сорам было б недапушчальным ударам па яе рэпутацыі. А рэпутацыя яе была для яе ўсё. Дзякуючы гэтай бездакорнай рэпутацыі, адукацыі і манерам яна цяпер заняла месца па правую руку мужа гэтага непаразуменьня, бядачкі імём Летыцыя. І, хто ведае, у будучым яна можа стаць сапраўды яго даверанай персонай, а там ... канешне, яна ня будзе сьпяшацца. Бо ж заваяваць гэтага мужчыну яна павінна выключна праз свае асабістыя якасьці, розум і характар, трывалую псіхіку і правільны псіхалягічны падыход. Бачна, што яго жыцьцё - гэта хаос, і яна прыложыць усе намаганьні, каб утаймаваць і "аблагародзіць" яго.

Летыцыя ж са сваімі скаргамі, хваробамі, нудотай і німфаманіяй, якой яна, відавочна, хварэе, заўсёды будзе заставацца на другіх ралях. Каму будзе доўга цікавая жанчына, якая ўвасабляе сабой клубок праблемаў, ды яшчэ да таго ж і шлюха.

Пры гэтай думцы ёй стала зусім радасна, прывольна. Будучыня раскінулася перад ёй каляровым дываном магчымасьцяў.

- Кыся-кыся-кыся! - раптам пачула яна лагодны Ганнін голас. - А дзе мая дзевачка-ведзьмачка? Дзе мая рыжуля? Дзе мая вучаніца? Ганна з'явілася на парозе пакою, усунуўшы рукі ў бакі. Выраз яе твару быў шчыра радасны, усьмешка шырокая.

- Пайшлі вячэраць, а ў бабушкі ёсьць і бутэлячка вінца.

Пасядзім пачырыкаем! Яна хітра ўзьняла адно, і апусьціла другое брыво.

- Дурань ён! Дурань. Як ёсьць. Ты яго ня бойся. Я яго ўжо колькі год ведаю. Нічога ён ня можа, акрамя дурноты. Алкашэй водкай ад п'янства лячыць.

Захмялелая, Ганна расчырванелася, аплыла на стуле, злажыла рукі пад вялікімі грудзямі. Яе твар быў лагодны і шчыры.

- А так можно? - пацікавілася Медэя. - От водки - водкой, это типа клин клином?

- Гэта таму, што ён сам алкаш. І палячыць можа толькі апахмелам. А шэптаў ён ніякіх ня ведае. Усе забыў. А вось я ведаю!

- А какие вы заговоры знаеце, Ганна? Якія шэпты ведаеце? - выправілася Медэя. Бачучы што мова тут у пашане, яна паступова пераходзіла на яе, бо ж любіла быць, "как все".

- Якія? А на гаўно! Ганна вымавіла гэта, і хітра прыжмурылася, гледзячы на Медэю, якая, уражаная, і шакаваная, глядзела на яе, адкрыўшы рот.

- Как это?? - нарэшце вымавіла яна. - На какое ... говно?

- А проста. На якое хочаш. Хочаш - на зьвярынае, а хочаш, на чалавечае. Ганна з лёгкай пагардай глянула на яе.

- Вучыць цябе ды вучыць. Яна падцягнула рукамі грудзі.

- Калі хто захварэе - усё роўна, хто, скаціна, ці чалавек, то трэба ўзяць лайно, і проста сказаць:

- Хвароба, хвароба, сыдзі на лайно. Хоць на якое, на кашынае - кот памрэ, на сабачынае - сабака падохне, а на чалавечае - ... тут яна злавесна прыжмурылася... Чалавек. Адыдзе. Хвароба на яго перакінецца. Толькі гэтым лайном, як слова скажаш, трэба тыдзень мазацца. І праз тыдзень убачыш рэзультат! Яна замаўчала - вытрымала паўзу.

- Я на каравінае лайно люблю рабіць. Яго лёгка знайсьці, усюды ляжыць. На кашынае дык мне катоў сваіх жалка. А каровы ўсе суседскія. У мяне каровы няма. Ты гэта, запісваеш? Запісвай. Мы з табой яшчэ такіх дзел натворым. Вучаніца! Ганна лагодна ўсьміхнулася.

- Вось былі ў мяне вучні - два, хлапец ды дзяўчына. Ня вытрымалі. Бо ж - слабыя. Ты ж - моцная. Мы з табой такіх справаў наробім, ой ё ёй!

Глава 73: Лекар

Яна адчувае прыемны цяжар яго рук. Яго далоні гладзяць яе, накрываюць яе грудзі, і ад іх ідзе цяпло. Яе нібыта калыша акіян сьвятла – цёплая вада, у якой таюць яе сны. Застаецца толькі ён. Яго цяпло, яго сьвятло, яго каханьне. Яна ляжыць перад ім, ён сядзіць побач зь ёй на ложку. Яго рукі праходзяць па яе целу, быццам ён агладжвае гліну статуі, шліфуючы яе моцнымі далонямі, яны быццам бы выляпляюць яе іншую, адраджаюць ізноў гарачынёй і любоўю, якая ліецца ў яе ад яго.

- Ты – чараўнік, - ціха шэпча яна. – Што ты робіш са мной, каханы. Ніколі я не адчувала такую асалоду, як ад тваіх рук, любы. Яны – сапраўды цудоўныя. Што гэта? Што адчуваю я? Мяне нябыта лашчыць сьвятло.

- Гэта – мая любоў, каханая, - ціха кажа ён. – Маё каханьне да цябе, якое ты адчуваеш праз мае дакраньні. Бо ж толькі той можа лячыць, хто любіць. А хто кахае, той здольны нават і сьмерць перавярнуць у жыцьцё. Той, хто ўмее кахаць, як Бог. Адзіная таямніца боскае лячэньня – гэта каханьне. Хрыстас любіў усіх, каго вылечваў. Любіў боскае любоўю. Аддаваў ім усяго сябе – і плоць сваю, і кроў, і душу, і цела. Так, як аддаю табе сваё каханьне я. Ён кажа, і гладзіць яе, песьціць і яе душу, і цела. Ад яго і сапраўды ідзе жар, як ад печкі, такі, што колер з'яўляецца на яе шчоках. Яе скура ружавее, саскі ўзьнімаюцца ад яго далоней. Яна закрывае вочы, адчуваючы яго рукі на сваім целе. Цяпер гэта пакалваньне, нешта пругкае, гарачае, як мноства маленькіх іголачак – гэта ўзьнімаюцца яе валаскі. Ён нахінаецца да яе, і кранае яе грудзі вуснамі. Яна адчувае яго вусы і бараду на сваёй скуры. Ён абдымае яе талію далонямі, і прыўзьнімае, прыціскаючыся губамі да ўлоньня. Ён праходзіць па яе целу зьверху да нізу, і нешта шэпча. Слоў яна разабраць ня можа, яны запаўняюць яе, асыпаюцца на яе тонкім срэбным пясочкам, дажджом з маленькіх зорак. Лунаюць вакол вагеньчыкамі, якія не кранаюць яе, проста таньчаць, лашчачы яе цела.

- Гэта – лячэньне? – ціха запытвае яна.

- Так, - ківае ён. Цяпер зь яго рук на яе ліецца яркае зьзяньне – быццам бы патокі дыямантаў, рубінаў, і іньшых камянёў выліваюцца, асыпаючы яе, пяшчотна кранаючы, зьзяючы на яе скуры.

- Ты так можаш, - шэпча яна.

- Я ўсё магу, - усьміхаецца ён. – Для цябе я гатовы перавярнуць увесь сусьвет. Цяпер яе цела зьзяе, дыяманты міргацяць на ёй, каралі, бранзалеты на руках і нагах, паяса і ланцужкі, нябачныя, танюткія, якія шапацяць ад кожнага яе подыху, кожнага руху, кідаюць мноства каляровых агеньчыкаў.

